Лідзія Савік

# Космас беларуса

*Жыццяпіс Барыса Уладзіміравіча Кіта, асветніка, вучонага, патрыёта*

Мінск Пейто 1996

УДК С 13 662.7+929 Кіт
Рэдактар Валерый Каліноўскі.

Савік Л.

Космас беларуса.: Жыццяпіс Барыса Уладзіміравіча Кіта, асветніка, вучонага, патрыёта,— Мн. Пейто, 1996,— 384 с.: іл.

Гэта кніга расказвае пра жыццёвы і творчы шлях славутага беларуса Барыса Уладзіміравіча Кіта — грамадзяніна Амерыкі, таленавітага матэматыка, фізіка, доктара філасофскіх навук, акадэміка Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі (Парыж), віцэпрэзідэнта Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, старэйшага сябра Амерыканскага астранаўтычнага таварыства, ганаровага сябра Брытанскага і Нямецкага міжпланетных таварыстваў, заслужанага прафесара Вашынгтонскага Мэрылендскага універсітэта, залатога медаліста нямецкага навуковага таварыства імя Германа Обэрта, ганаровага прафесара Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, ганаровага грамадзяніна горада Навагрудка.

ISBN 985-6024-05-6

© Савік Л., 1996

© OCR: Камунікат.org, 2014
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2014
© PDF: Камунікат.org, 2014

**Змест**

Уступнае слова
Прадмова аўтара
Нашчадак сялянскага роду
Дзіцячыя гады ў Санкт-Пецярбургу (1910-1918)
Ранняе юнацтва. Карэлічы (1918-1926)
Вучоба ў беларускай гімназіі ў Наваградку
Універсітэцкія гады ў Вільні (1928-1933)
Выкладчык матэматыкі, дырэктар беларускіх гімназій у Вільні, Наваградку (1932-1939)
Дзейнасць Барыса Кіта ў беларускім школьніцтве
Эміграцыя і навуковая дзейнасць у ЗША
Германія (1944-1948) Злучаныя Штаты Амерыкі (1948-1972)
Заснаванне беларускай калоніі ў Саўт-Рыверы (штат Нью-Джэрсі, 1948-1950)
Каліфарнійскія часы (1950-1958).
Пачатак навуковай дзейнасці Вашынгтонскі перыяд.
Навуковая дзейнасць (1958-1972)
Пераезд у Германію.
Педагагічная, прафесарская дзейнасць ва ўніверсітэтах Еўропы (з 1972 года)
Вяртанне на Бацькаўшчыну
Расказы Барыса Кіта
Я - хадзячы сведка стагоддзя
Вершы, прысвечаныя Барысу Ўладзіміравічу Кіту
Дадаткі
Кароткае рэзюме дзейнасці Барыса Кіта ў галіне астранаўтыкі ЗША
Гонары і становішчы ў прафесійных арганізацыях
Бібліяграфія прац пра Барыса Кіта
Доктарская дысертацыя Барыса Кіта
Са шматлікіх аўтографаў
Віншаванні з нагоды 85-годцзя
Радавод сям'і Аляксандра Кіта
Дакументы і ўзнагароды
Біяграфічныя матэрыялы на англійскай мове
Пра аўтара
Імянны паказальнік

*Змагарам за адраджэнне Беларусі прысвячаю*

Аўтар

"Беларусы ва ўсім свеце могуць ганарыцца дасягненнямі прафесара Барыса Кіта, колішняга выкладчыка матэматыкі Віленскае беларускае гімназіі, а пазней прафесара многіх універсітэтаў на Захадзе, аднаго з вядучых амерыканскіх даследнікаў у ракетных палівах..."

Вітаўт Кіпель ("Беларусы ў ЗША")

## Уступнае слова

Зусім выпадкова на аўтобусным прыпынку ў Глыбокім пачула размову. Адзін з субяседнікаў расказваў пра знакамітага земляка, які стаў на чужыне акадэмікам астранаўтыкі, членам міжнародных акадэмій, а калісьці тут, у Глыбокім, сядзеў у турме і чакаў расстрэлу, але быў уратаваны адным са сваіх вучняў.

Аповяд пра Барыса Уладзіміравіча Кіта нагадваў апокрыф, але ў ім выразна праглядваў пераказ кнігі, якую я сама ў некалькіх экземплярах шмат месяцаў назад перасылала ў райаддзел культуры і бібліятэкі сюды ж, у Глыбокае, і якая і на мяне самую зрабіла вялікае ўражанне адразу пасля прачытання.

Я маю на ўвазе невялічкую кнігу Лідзіі Сымонаўны Савік «Вяртанне. Жыццяпіс Барыса Уладзіміравіча Кіта», якая выйшла ў 1993 годзе.

Само па сабе жыццё Барыса Уладзіміравіча вартае вялікай кнігі ці рамана: змаганне з польскімі ўладамі за душы дзяцей-беларусаў, адкрыццё беларускіх школ у савецкія часы, кіраўніцтва Наваградскай беларускай гімназіяй, Адміністрацыйна-гандлёвай школай у Маладзечне ў гады нямецкай акупацыі, затым эміграцыя, навуковая праца, што прынесла яму прызнанне ва ўсім свеце... Але перададзенае жывой, маляўнічай, усхваляванай мовай таленавітай даследчыцы літаратуры Лідзіі Савік, яно сталася ў маіх вачах адкрыццём цэлага шэрагу людзей, беззапаветна адданых душою Беларусі, што пранеслі любоў да яе праз усё сваё жыццё. Апрача таго, менавіта з гэтай кнігі пачалося для мяне сяброўства — не пабаюся сказаць гэтага слова — з самім Барысам Уладзіміравічам, якое дало мне магчымасць убачыць светлага, шчырага, высокаадукаванага чалавека, з якім заўсёды лёгка і цікава. Прыехаўшы ў Франкфурт-на-Майне па накіраванню Інстытута імя Гётэ на двухмесячную стажыроўку, я, вядома ж, пазваніла чалавеку, блізкаму мне па Карэлічах, адкуль і я родам, а таксама па Наваградчыне, дзе я, як і Барыс Уладзіміравіч, пайшла некалі ў першы клас. Дарэчы, тая былая гімназія, якую ён разам з вучнямі будаваў у 30-я гады, стаіць побач з маёй першай школай. Убачыўшы яе здымак ў часопісе «Беларусь», я нават падумала, што гэта і ёсць мая школа, але потым, калі мы ўтраіх (Барыс Кіт, Лідзія Савік і я) увосень 1994 года прыйшлі туды, зразумела, што, на жаль, памылялася.

Успамінаючы тую паездку ў Карэлічы, Наваградак і Гродна, калі на сустрэчы са сваім былым настаўнікам прыязджалі вучні з Вільні і Маладзечна, калі студэнты Гродзенскага універсітэта шчыра прымалі свайго ганаровага прафесара з Франкфурта-на-Майне, а наваградча-

не ўручылі яму дыплом ганаровага грамадзяніна горада, я адчувала глыбокае хваляванне, якое вылілася пазней у паэтычныя радкі аб нашай агульнай радзіме. Неверагодна, але яму сапраўды ўдаецца, нягледзячы на свой больш чым салідны ўзрост (нядаўна мы адзначылі ягонае 85-годдзе), ствараць вакол сябе настрой малады, прыўзняты, нейкі па-асабліваму шчаслівы! І вершы, прысвечаныя Барысу Уладзіміравічу, якія змешчаны ў гэтай кнізе, нараджаліся нібы самі сабой.

Магічная здольнасць Кіта зблiжаць людзей зрабіла і тое, што мне пасля нашай агульнай паездкі па-асабліваму блізкай стала і Лідзія Савік. Нястомная даследчыца творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў, яна вяртае нам і спадчыну рэпрэсіраваных аўтараў, даследуе эмігранцкую літаратуру, займаецца праблемамі развіцця літаратуры XX стагоддзя. Яе складана «злавіць», дазваніцца: лекцыі ў Беларускім універсітэце культуры, выступленні перад настаўнікамі, праца ў Інстытуце літаратуры Акадэміі навук Беларусі, у Згуртаванні беларусаў свету «Бацькаўшчына», ды і ў самім беларускім Адраджэнні, якое ідзе так цяжка, а апошнім часам і трагічна... Цяпер, калі зноў абцяжарыўся працэс вяртання імёнаў беларускіх дзеячаў эміграцыі на Радзіму, асабліва добра бачна, што ўдалося за кароткі час зрабіць гэтай мужнай жанчыне.

Сведчаннем сказанаму пра яе, сказанаму коратка, як толькі можна зрабіць у жанры прадмовы, з'яўляецца і другое, дапоўненае выданне кнігі. Яно наспела. З'явіліся новыя матэрыялы, да таго ж першае выданне рабілася хутка і паспешліва, паколькі любое выданне беларускай кнігі пачынаецца цяпер з сакраментальнага пытання: «Дзе ўзяць грошы?» Калі ж гаварыць пра першае выданне кнігі, то яно унікальнае тым, што дасюль з'яўляецца адзіным даследаваннем жыцця і дзейнасці асобнага дзеяча эміграцыі, хаця кнігі пра творчасць паэтаў, дый кнігі твораў дзеячаў культуры выдаваліся. Энтузіязм Лідзіі Сымонаўны пераадолеў многія перашкоды.

Характэрна і тое, што праз сваю кнігу яна сталася сваёй і на Навагрудчыне, а таксама ў Карэлічах, дзе ўмеюць клапаціцца пра сваіх землякоў, не абдзяляюць іх увагай. Увогуле, гэта прыкмета цывілізаванасці грамадства — дбаць пра людзей, якія прыносяць славу свайму краю і сваёй зямлі.

У Ляймэне, дзе створаны адзіны ў Германіі беларускі музей і чый бургамістр Герберт Эрбар сябруе з Барысам Уладзіміравічам Кітам, які разам з Ю. Попкам, уладальнікам музея, цяпер нябожчыкам, дапамагаў у яго стварэнні, мы бачылі ў мэрыі цэлы аддзел, прысвечаны Барысу Бекеру, сусветна вядомаму тэнісісту, які паходзіць з Ляймэна.

Не аспрэчваючы заслуг спартсмена, заўважу, што ўклад навукоўца ці пісьменніка ў культуру, мабыць, трохі большы — але нідзе і ніколі так не шанцуе менавіта беларускім творцам. Мабыць, такі наш гістарычны лёс.

І ўсё ж... У музеі на Наваградчыне ёсць куточак Барыса Кіта, пра яго расказваюць у Маладзечне і Глыбокім, яго ведаюць у Мінску і Карэлічах. Веру, што гэта новая кніга пра яго абудзіць іншыя сэрцы, выкліча ў іх цікавасць да тых, пра каго яшчэ не напісана, і з'явяцца новыя кнігі пра тых, хто яшчэ жыве і хто памёр, але чые незгасальныя цяпло і сэрца біліся для нашай пакутнай Беларусі. Можа яшчэ нешта ўдасца зрабіць і нам.

Вольга Іпатава.

Я маю край, Радзіму дум сваіх,
То майго сэрца любая Айчына...
*Адам Міцкевіч*

## Прадмова аўтара

Беларуская зямля дала свету многія таленты, да якіх належыць і Барыс Уладзіміравіч Кіт. Ён з тых людзей, што ствараюць гонар любой нацыі ў любой краіне. На Беларусі да нядаўняга часу яго імя было амаль невядомым. Сёння мы павінны ўвесці навуковы, асветніцкі, жыццёвы набытак славутага ва ўсім свеце чалавека, які прываблівае не толькі як навуковец, але і як Асоба, патрыёт Бацькаўшчыны, у нашу нацыянальную гісторыю.

Упершыню я ўбачыла Барыса Уладзіміравіча ў доме Масея Сяднёва пад Нью-Йоркам у Глен-Кове, куды ён заехаў на Каляды пад Новы 1992 год праведаць даўняга сябра, знакамітага беларускага паэта на эміграцыі, калі кіраваўся з Франкфурта-на-Майне ў Вашынгтон да сыноў Валодзі і Віктара, унучкі і праўнука, вельмі падобнага на свайго прадзеда. Мяне ўразіў малады, рухавы, абаяльны воблік Барыса Уладзіміравіча, яго імклівая гаворка на чыстай беларускай мове, уменне з матэматычнай дакладнасцю сказаць асноўнае пра сябе і незвычайна зацікавіць субяседніка менавіта гэтай сціплай недасказанасцю, за якой, адчувалася, стаяла вялікае жыццё. Як было радасна пачуць, знаходзячыся так далёка ад свайго дому, роднае слова, даведацца, што гэта твой зямляк, які не быў на Бацькаўшчыне паўвека, але так закаханы ў Навагрудчыну, сапраўды найпрыгажэйшы куток Беларусі, што даў свету такія таленты, як Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ігнат Дамейка, Ян Чачот, Янка Нёманскі, Янка Брыль... Барыс Кіт — адзін з іх, і ён марыць, каб Навагрудак стаў універсітэцкім горадам, накшталт Оксфарда ці Кембрыджа...
Барыс Уладзіміравіч спяшаўся ў Вашынгтон, і ў мяне было замала часу, каб падрабязна распытаць, даведацца пра ягоны лёс. Але гэта была не апошняя наша сустрэча. Улетку 1992 года ўпершыню пасля амаль 50-гадовага перапынку ён наведаў Бацькаўшчыну, дзе аказалася шмат яго вучняў, знаёмых, родных людзей, якія рады былі вітаць Барыса Кіта ў Маладзечне, Міры, Карэлічах, Навагрудку, Мінску... Ускалыхнулася мінулае, пайшлі ўспаміны, задаваліся пытанні, і нястомны Барыс Уладзіміравіч не паспяваў адказваць, успамінаць, зноў знаёміцца з тымі, каго ведаў яшчэ ў дзяцінстве, юнацтве, падчас працы ў беларускім школьніцтве... «Проста не верыцца, што я мог прыехаць да вас, — гаварыў ён на сустрэчы. — Для мяне гэта

найвышэйшы і найважнейшы момант усяго майго жыцця вярнуцца на Бацькаўшчыну — Беларусь, дзе я правёў найлепшую яго частку — маладыя гады. Так сталася, што я, як і многія іншыя беларусы, у пэўным часе змушаны быў выехаць на чужыну, каб ратаваць сваё біялагічнае існаванне. Але на чужыне мы ніколі не забывалі сваёй Радзімы, праносілі яе слаўнае імя ў свет і рабілі для яе карысці ўсё, што толькі было магчымым. На жаль, нас ужо вельмі мала засталося, і я сябе лічу «апошнім з магіканаў», маё пакаленне ўжо адыходзіць. Многія не дачакаліся гэтага шчаслівага моманту, калі пачаўся вялікі рух Адраджэння, і многія эмігранты — расійцы, украінцы, балтыйцы — атрымалі сёння магчымасць прыехаць на Бацькаўшчыну, якая стала незалежнай. І мы сёння адзначаем не толькі свята сустрэчы нашай славутай школы, але і Адраджэнне нашай дарагой і любімай Бацькаўшчыны. Безумоўна, цяжкасці заўсёды бываюць напачатку, але я веру: пройдзе нейкі час, наша Беларусь разаўецца ў паўнацэнную, культурную, эканамічна моцную, незалежную дзяржаву, якая зойме пачэснае месца сярод народаў свету».

Гэта вера захапіла ўсіх, хто слухаў чалавека, пражыўшага доўгае, складанае і цікавае жыццё, багатае на выпрабаванні, здабыткі, падзеі, сустрэчы. Ён вярнуўся на Бацькаўшчыну, каб падтрымаць сваіх землякоў у цяжкі час выбару, апантаны, як і ўсе свядомыя беларусы, ідэямі адраджэння нацыі.

Так здарылася, што і на гэты раз не хапіла Барысу Уладзіміравічу часу з-за шматлікіх сустрэч, каб адказаць на мае пытанні, падрабязна расказаць пра сваё жыццё.

і восьу кастрычніку 1992 года я мела магчымасць наведаць Барыса Уладзіміравіча ў Германіі, у Франкфурце-на-Майне, па яго ветліваму запрашэнню. Ніштоўжо не перашкаджала слухаць, запісваць найцікавейшы аповяд пра незвычайны лёс чалавека з агромністага касмічнага карабля «Зямля», які шмат зрабіў, каб гэты карабель вырваўся ў сусвет.

Дзякуючы яму я пабывала ў славутых тургенеўскіх мясцінах Вісбадэна, у Бадгомбургу, дзе калісьці не адзін раз бываў Дастаеўскі, пабачыла радавое гняздо апошняй рускай імператрыцы Аляксандры Фёдараўны ў Дармштаце, старажытныя рыцарскія замкі, палацы, музеі, гадзінамі хадзіла па вуліцах Франкфурта, па Дому-музею Гётэ, да болю ў сэрцы дзівячыся, якое ўладкаванае, прыгожае і багатае жыццё, у адрозненне ад нашага, у пераможаных намі пераможцаў... Але што руская і германская гісторыя, калі побач знаходзіўся беларус, які здолеў даказаць, што ён нічым не горшы за амерыканцаў, еўрапейцаў, чалавек глыбокіх і markdown рознабаковых ведаў, з выдатнай

памяццю на даты, сусветную гісторыю, людзей, літаратуру... І толькі аднойчы, калі Барыс Уладзіміравіч прачытаў мне цытату з «Веснавых вод» Тургенева (дзеянне адбываецца ў Франкфурце і Вісбадэне, Санін — герой тургенеўскага твора, задумваецца аб старасці, а яму ўсяго 52 гады), мне падалося, што ён успомніў аб сваіх 82 гадах. Аднак усе, хто сутыкаецца з Барысам Уладзіміравічам, разумеюць: старасць да яго яшчэ не прыйшла, аптыміст па натуры, дабразычлівы да людзей, дзейны, мэтанакіраваны, ён напоўнены шчасцем вяртання на Бацькаўшчыну і жаданнем зрабіць для яе ўсё, што ў яго моцы. Закаханы ў сваю Джэму — Тамару, прыгожую, па-еўрапейску адукаваную жанчыну, з якой больш дваццаці гадоў звязаны духоўнай еднасцю і з якой пабываў у многіх краінах свету, ён ідзе па жыцці, па тых мясцінах, дзе любілі, пакутвалі тургенеўскія героі, руская арыстакратыя... Барыс Уладзіміравіч упэўнены, што ён і ёсць арыстакратыя — арыстакратыя духу, інтэлекту, а гэта нашмат мацней той, што губляла свае сілы, сродкі на модных еўрапейскіх курортах. І ён багаты і шчаслівы ад усведамлення, што не марна пражыў жыццё, годна несучы ў сэрцы Беларусь, не забываючы матчыну мову, не здраджваючы святому ў душы. Ён змог пабудаваць свой лёс так, што рана дасягнуў піка вучонасці, але і да гэтага часу застаецца верным свайму прызванню настаўніка, педагога і з асаблівым гонарам гаворыць пра слынных у свеце людзей: «Гэта мой вучань...» А можа шчаслівы таму, што ганарыцца сынамі, якім аддаў усё самае лепшае, што меў у жыцці, і цяпер не адчувае адзіноцтва, ці, магчыма, таму, што яго імя і добрыя справы вяртаюцца на Радзіму, ад якой быў адарваны столькі гадоў? А можа, ад складу свайго беларускага характару — бескарыслівага, шчырага, цярплівага, адкрытага, заўсёды гатовага рабіць людзям дабро... Гэтыя думкі ўзнікалі ў мяне падчас нашых вандровак па Германіі, дзе я часам ледзь паспявала за маладым, бадзёрым крокам Барыса Уладзіміравіча і за яго цікавымі расказамі пра нямецкую гісторыю, не перастаючы здзіўляцца ягонай памяці, грунтоўным шырокім ведам і асабліва тым спакойным адносінам да казачнай прыгажосці Нямеччыны, за якімі стаіць жыццёвы вопыт чалавека, што аб'ехаў і пабачыў увесь свет — стары і новы: Еўропу, Амерыку, Афрыку, Індыю, Японію, Інданезію, Егіпет, Ганконг, Стамбул, які жыў у Вашынгтоне і Лос-Анжэлесе; ведаў знакамітых вучоных — нямецкіх, амерыканскіх, рускіх, японскіх, якія стваралі касмічныя караблі і ракеты, матэматыкаў і фізікаў з сусветнымі імёнамі, таму што сам прысвяціў гэтым навукам жыццё, хаця не меншы талент меў у гісторыі, жывапісе, захапляўся класічнай музыкай і літаратурай, ніколі, дарэчы, не ўступаў ні ў якія партыі,

верыў, што душы памёршых добрых людзей перасяляюцца ў жывых, нават падобныя на іх знешне. У гэтым ён пераканаўся, сустрэўшы аднойчы на вуліцы жанчыну, якая была як дзве кроплі вады падобная на яго першае каханне — дзяўчыну з Беларусі, загінуўшую ў пекле вайны...

Хто ж ён, гэты рамантык?

Барыс Кіт — матэматык, фізік, хімік, доктар філасофскіх навук у галіне матэматыкі і гісторыі навукі, акадэмік Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі, старэйшы сябра Амерыканскага астранаўтычнага таварыства, ганаровы сябра дырэктарату Нямецкага астранаўтычнага таварыства, сябра Камітэта Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі (Парыж), акадэмік і віцэ-прэзідэнт Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі. Ён заслужаны прафесар Вашынгтонскага Мэрылендскага універсітэта, залаты медаліст Нямецкага таварыства імя Германа Обэрта. Высока ацэнены ва ўсім навуковым свеце, ён вяртаецца на сваю радзіму — Беларусь, дзе пра яго да апошняга часу нават не ўспаміналася. Але ён, не тоячы крыўды ў сэрцы, перапоўнены жаданнем садзейнічаць адкрыццю на Беларусі нацыянальнага універсітэта, бо адсюль пачынаўся яго шлях у вялікае жыццё, шлях таленавітага педагога, вучонага, які аддае свае веды ў літаральным сэнсе слова, бо, дасканала валодаючы англійскай, нямецкай, французскай, польскай, рускай, украінскай, беларускай мовамі, ён у любым асяроддзі, з кожным чалавекам пачувае сябе лёгка і нязмушана, можа знайсці агульныя зацікаўленні і ўзаемаразуменне. Ён захаваў сваю беларускасць, народную сялянскую разважлівасць, цярпімасць да розных палітычных поглядаў, што існуюць у адраджэнскім руху. Яго жыццё цесна знітавана з жыццём беларускага народа, шляхамі-пуцявінамі беларускага інтэлігента, навукоўца, які дзякуючы сваім прыроджаным здольнасцям змог выйсці на сусветную арэну, захаваўшы вернасць нацыянальнаму духу, вернасць Бацькаўшчыне, якая зноў паклікала яго, як запавет, як памяць.

* * *

Гэта кніга — своеасаблівая дакументальная аповесць пра жыццё і дзейнасць беларускага вучонага на замежжы. Тут адлюстроўваюцца не толькі падзеі яго ўласнага жыцця, але асвятляюцца і падзеі эпохі, як яны адбіліся на лёсе гэтай шматграннай асобы. Асяроддзе, эпоха, беларускае адраджэнне 20-30-х гадоў, вайна, эміграцыя — той грамадска-гістарычны фон, які неабходны для вывучэння дзейнасці такога таленавітага чалавека, якім з'яўляецца Барыс Кіт — амаль равеснік стагоддзя. Гістарычны фон можа быць аднолькавы для многіх.

Асяроддзе — нешта больш канкрэтнае, але і тут у нашу эпоху можна выявіць агульныя рысы, характэрныя для пакалення, да якога належыць Барыс Кіт. Унутраны свет кожнага чалавека глыбока індывідуальны, хаця, вядома ж, абумоўлены абставінамі, у якіх ён жыў, выхоўваўся, праяўляў сябе ў навуковай, асветніцкай дзейнасці. Як адзначаў сам Барыс Уладзіміравіч, «маё жыццё праходзіла ў пэўную гістарычную беларускую эпоху. Трэба было змагацца за існаванне, вучыцца ў цяжкіх умовах, шукаць працу, каб зарабіць і ўтрымаць сябе і сям'ю, змяняць месца жыхарства з краіны ў краіну, мяняць кантыненты, шукаць для сябе і сваёй сям'і больш бяспечнага ад палітычных і ваенных трывогаў месца пражывання...»

У кнізе раскрываюцца ўсе этапы жыцця Барыса Кіта: ад дзіцячага — пачатку XX стагоддзя, да сталага — канца нашага стагоддзя. Яна з'яўляецца дапоўненым варыянтам першага выдання (1993г.), што пісалася для публікацыі ў газеце «Голас Радзімы», а затым выйшла ў серыі, якую раней мела магчымасць выдаваць газета. («Вяртанне» было выдадзена за кошт ЗБС «Бацькаўшчына».)

Аўтар выказвае шчырую падзяку ўсім, хто садзейнічаў з'яўленню гэтай кнігі на свет: пісьменніцы Вользе Іпатавай, карэспандэнту газеты "Звязда" Ваплеру Каліноўскаму, галоўнаму рэдактару выдавецтва “Навука і тэхніка” Людміле Пятровай, дырэктару Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Францыска Скарыны прафесару Адаму Мальдзісу, дырэктару Наваградскага гісторыка-краязнаўчага музея Тамары Вяршыцкай, былым вучням Барыса Кіта — прафесару Пятру Кузюковічу, акадэміку Алесю Раковічу, мастаку Кастусю Харашэвічу, а таксама старшыні Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" Ганне Сурмач, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужанаму дзеячу мастацтваў Беларусі, ганароваму доктару Міжнароднай акадэміі інфарматыкі і тэхналагічных працэсаў скульптару Івану Міско.

## Нашчадак сялянскага роду

Дзяды і прадзеды Барыса Кіта, якія спрадвечна займаліся сялянскай працай, паходзяць з вёскі Агароднікі Карэліцкай воласці Наваградскага павета (цяпер адна з вуліц раённага горада Карэлічы Гродзенскай вобласці Беларусі). Карэлічы ляжаць на шляху Мінск — Мір — Наваградак — Гродна, прыгожа абсаджаным беластвольнымі бярозамі і дубамі. Першыя згадкі пра Карэлічы адносяцца да XIV стагоддзя, калі гэтае невялікае мястэчка ўваходзіла ў Наваградскае ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У 1505 г. Карэлічы былі спалены крымскімі татарамі, у 1655-м і 1706-м — шведамі. У 1705 г. праз Карэлічы праязджаў Пётр І падчас свайго падарожжа ў Заходнюю Еўропу. Ён прыпыняўся ў Карэлічах, начаваў у доме спадара Абяржанскага ў самым цэнтры мястэчка. З 1795 г. Карэлічы апынуліся ў складзе Расіі, былі падараваны Вітгенштэйнам імператрыцай Кацярынай Другой. Гараджане прымалі актыўны ўдзел у паўстанні 1863-64 г. У першую сусветную вайну праз Карэлічы праходзіла лінія фронту. З 1921 па 1939 год Карэлічы, як і суседнія Мір, Наваградак і наогул Заходняя Беларусь, знаходзіліся пад уладай Польшчы. Раней горад славіўся фабрыкай слуцкіх паясоў. Будынак гэтай фабрыкі яшчэ захаваўся ў тыя гады, калі сям'я Кіта пасля заканчэння першай сусветнай вайны жыла ў доме паблізу гэтай фабрыкі. Карэлічы, як і вёска Агароднікі, былі некалі шырока вядомыя сваімі агародамі з агуркамі, якія вырошчваліся на экспарт.

Дзед Барыса Уладзіміравіча — Аляксандр Кіта (дарэчы, кіта — азначае вязанка, ахапка сена. Усе крэўныя вучонага носяць прозвішча Кіта, у прозвішчы Барыса Уладзіміравіча апошняе «а» праз шматлікія пераезды, пераафармленні дакументаў неяк выпала, згубілася, і ён вядомы як Кіт) меў невялікую гаспадарку ў Агародніках (каля 4 гектараў зямлі), якая была падзелена на дзве роўныя часткі паміж двума сынамі — Міхасём і Уладзімірам. З-за недахвату сродкаў для ўтрымання сям'і, якая складалася з 7 чалавек — бацька, маці, два сыны, тры дачкі — Юлія, Вольга і Ганна, — дзед вымушаны быў шукаць дадатковага заробку ў суседнім, за 7 кіламетраў, маёнтку графа Храптовіча ў Шчорсах над ракой Нёман. Радавод Храптовічаў пачынаецца з даскарынінскага часу, гэты род слаўны сваёй асветніцкай дзейнасцю, перадавымі метадамі агратэхнікі і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, ранняй адменай паншчыны і асабліва сваёй агромністай па тым часе бібліятэкай, дзе былі кнігі па многіх галінах ведаў і на многіх мовах, рукапісы, музейныя калекцыі. Бібліятэкарам тут працаваў Ян Чачот, яе кнігамі часта карыстаўся

Адам Міцкевіч, калі жыў у Наваградку. Натхнёны незвычайнай прыгажосцю Шчорсаў, цудоўным паркам, што прывольна раскінуўся на беразе Нёмана, вялікі паэт напісаў нямала твораў, прысвечаных гэтаму краю. Бібліятэка і музей заўсёды былі адчынены для творчай працы навукоўцаў і літаратараў, сярод якіх былі У. Сыракомля, А. Ельскі, Я. Лелевель, Я. і А. Снядзецкія, І. Даніловіч і іншыя. Лёс маёнтка і унікальнай бібліятэкі, як і многіх іншых нацыянальных скарбаў, драматычны. Палац Храптовічаў згарэў у полымі рэвалюцый і войнаў, знешне захаваўся толькі будынак бібліятэкі, так і не адноўлены да нашых дзён. Кнігі, рукапісы, карціны трапілі ў музеі, бібліятэкі Санкт-Пецярбурга, Масквы, Кіева. Цяпер у Гродне энтузіястамі беларускага адраджэння створаны Фонд Храптовічаў, які дабіваецца перадачы гэтых каштоўнасцей на радзіму, у беларускія бібліятэкі і музеі.

Захаваліся, дзякаваць Богу, сведкі тых падзей: старыя дубы ў парку, бярозы і таполі на бальшаку, адрэстаўравана царква, у якой часта на малебнах бываў Аляксандр Кіта. Ён пачаў працаваць у гэтай высокацывілізаванай гаспадарцы спачатку сезонным рабочым, а потым дзякуючы сваёй добрасумленнасці, чалавечым здольнасцям, добразычліваму характару ў хуткім часе становіцца адміністратарам. З падросшых дзяцей Аляксандра Кіта двое — Юлія і Уладзімір (бацька будучага акадэміка) — выехалі ў пошуках долі і шчасця ў сталіцу Расійскай імперыі — Санкт-Пецярбург, другі сын — Міхась — застаўся жыць на гаспадарцы ў Агародніках, а дзве дачкі — Вольга і Ганна — выйшлі замуж у суседнія вёскі.

Пасля пераезду Уладзіміра Кіта (ён скончыў сярэднюю школу) у Пецярбург на пачатку XX стагоддзя яму давялося шмат працаваць і адначасова вучыцца, набываць нейкую прафесію, прыстасоўвацца да гарадскіх умоў жыцця. Ён паступіў на курсы сувязістаў і пасля заканчэння гэтых студыяў уладкаваўся ў Міністэрства пошт і тэлеграфаў. Яго паслалі на працу ў мястэчка Шувалава, якое знаходзілася на мяжы з Фінляндыяй. На гэты час Уладзімір Кіта ажаніўся з Ксеніяй Дзмітраўнай Зуравай, якая паходзіла з сялян вёскі Тупікова Кашынскага павета Цвярской губерні і таксама прыехала на заробкі ў Пецярбург. Тут, у доме на Суворaўскім праспекце, у іх нарадзіўся сын-першынец Барыс — 24 сакавіка (6 красавіка) 1910 года. Хрышчэнне яго адбылося ў царкве Смольнага манастыра.

Санкт-Пецярбург быў не толькі расійскай сталіцай, цэнтрам грамадскага жыцця вялікай імперыі, але і своеасаблівым беларускім цэнтрам, куды на вучобу і працу прыязджалі многія юнакі і дзяўчаты з Беларусі. Тут на агульнаадукацыйных курсах Чарняева вучыўся

Янка Купала, у Пецярбургскім імператарскім універсітэце вучыліся Янка Нёманскі (дарэчы, ураджэнец Шчорсаў), Радаслаў Астроўскі, працаваў Цішка Гартны, жылі браты Іван і Антон Луцкевічы, для землякоў з Беларусі былі шырока расчынены дзверы гасціннага дома прафесара Браніслава Эпімах-Шыпілы. У Пецярбургу была арганізавана першая беларуская палітычная партыя — Беларуская рэвалюцыйная грамада (БРГ), на чале якой стаяў Іван Луцкевіч (ён студыяваў юрыспрудэнцыю і археалогію ў Пецярбургу). Барыс Кіт тады быў яшчэ дзіцем, дапытлівым падлеткам, які толькі пачынаў уваходзіць у дарослае жыццё, вучыўся разумець рэчаіснасць, людзей, падзеі. Яго дзіцячая памяць захавала многія моманты жыцця ў Пецярбургу і яго ваколіцах. Бацька ў вольныя часы браў сына на вандроўкі, падчас якіх паказваў найбольш выдатныя, велічныя будынкі, палацы, саборы, плошчы і вуліцы славутага горада на Няве, пабудаванага Пятром Першым і высілкамі многіх простых людзей, у тым ліку і беларусаў. Найлепш хлопчыку запомнілася Петрапаўлаўская крэпасць, сабор, дзе ён убачыў грабніцы памёршых імператараў, імператрыц, з якіх найбольшае ўражанне зрабіў пахавальны склеп Пятра Першага з белага мармуру.

Калі жылі ў Шувалаве, бацька, заядлы рыбак, далучаў сына да гэтага карыснага занятку. І назаўсёды адбілася ва ўражлівай дзіцячай памяці незвычайная прыгажосць шматлікіх азёр і рэчак маляўнічых прыгарадаў сталіцы. Неаднойчы ўся сям'я ездзіла ў суседняе Паргалава, найчасцей у залатыя восеньскія дні, найпрыгажэйшыя ў цудоўных ваколіцах Пецярбурга, а то і проста ў лес па грыбы і ягады.

Фінляндыя належала тады да Расіі як вялікае княства. І ўжо ў сталыя гады, калі Барыс Уладзіміравіч наведваў Фінляндыю, яму часта прыгадвалася маленства, ён і цяпер бачыў расійскія уплывы асабліва ў Хельсінкі, дзе шмат расійскіх помнікаў, будынкаў, сабораў, цэркваў. А тады дзякуючы пастаянным камандзіроўкам бацькі сям'я мела магчымасць праводзіць канікулы ў Фінляндыі, жыць там па некалькі месяцаў. Гэты перыяд згадваецца Барысу Уладзіміравічу як спакойныя, цікавыя імгненні хутка праляцеўшага бесклапотнага, шчаслівага дзяцінства, атуленага бацькоўскім клопатам, гармоніяй акаляючай прыроды, што закладвала добрыя пачаткі ў душы дзіцяці. Ён добра памятае, як яны з маці неаднойчы бывалі ў пецярбургскіх тэатрах. Асаблівае ўражанне зрабіла на малога Барыса пастаноўка ў народным тэатры «Тараса Бульбы» Гогаля. Ён успрымаў ігру акцёраў як праўду жыцця і горка плакаў, назіраючы сцэны, калі «палілі» на вогнішчы прывязанага да дрэва Тараса Бульбу. Можа і гэта паспрыяла ягонаму непрыманню жорсткасці палякаў, іх імкнення палані-

заваць беларусаў, украінцаў, што пазней, у 30-я гады, Барыс Кіт адчуў на ўласным лёсе, калі стаў дарослым, пачаў змагацца за беларускую справу, працуючы ў беларускім школьніцтве.

Ідылія гэтага жыцця (у дзіцячым успрыманні) была спынена, калі пачалася лютаўская рэвалюцыя 1917 года і хутка пасля яе адбыўся бальшавіцкі кастрычніцкі пераварот. У гэтым часе бацька зноў вярнуўся на сваю старую службу ў Пецярбургу, і сям'я (дарэчы, меншы сын Кітоў — Юры, які нарадзіўся ў Шувалаве, на жаль, памёр і быў пахаваны на мясцовых могілках) пасялілася ў кватэры на Шамшавай вуліцы, якая перасякалася з Вялікім праспектам. Уражлівая памяць Барыса Кіта захавала асобныя, найбольш яскравыя сцэны рэвалюцыйных падзей 1917 года ў Пецярбургу: яны з маці былі аднойчы на Марсавым полі і назіралі пахаванне ахвяр лютаўскай рэвалюцыі. У агромністым натоўпе луналі чырвоныя сцягі і гучаў «Інтэрнацыянал». Але на ўсё жыццё з тым успамінам захавалася адчуванне холаду, ад якога пакутавала ўся істота хлопчыка, і ён не мог дачакацца, калі яны вернуцца дамоў, у хатняе цяпло, каб пазбыцца гэтага відовішча. Як прыгадваецца Барысу Уладзіміравічу цяпер, кастрычніцкі пераварот быў здзейснены без асаблівага розгаласу, многія яго нават не заўважылі і апамяталіся тол ькі тады, калі пачаўся страшэнны голад і людзі паміралі літаральна на вуліцах. Бацька пазней расказваў, што яму немагчыма было трапіць на працу з-за баёў паміж рэвалюцыянерамі, жандарамі і казакамі, якія часцей за ўсё адбываліся на мастах праз Няву, і ён вымушаны быў наймаць лодку, каб пераправіцца праз раку і своечасова трапіць на работу, бо штодня мусіў быць там, як спецыяліст па замежнай тэлеграфнай сувязі. Маці пачала часцей наведвацца ў вёску да сваіх бацькоў, каб здабыць нешта з прадуктаў, нават пры пагрозе быць расстралянай, таму што бальшавіцкімі камітэтамі было забаронена перавозіць харчы. Але яе гэта не спыняла. Аднойчы яна ўзяла з сабой і сына, каб пакінуць яго ў вёсцы, дзе пакуль што не галадалі. У вёску Тупікова трэба было ехаць спачатку па старамікалаеўскай чыгунцы Пецярбург — Балагое — Разань, выходзіць на станцыі Кашын. Гэты рускі горад запомніўся сваімі драўлянымі дамамі з рознымі аздобамі на вазніцах, фігурамі расійскіх сялян з вялікімі шырокімі барадамі. Яны хадзілі па чыстых, утульных вуліцах у доўгіх белых кашулях, падпярэзаных рознакаляровымі паскамі. Ад Кашына ў вёску ехалі на падводзе, і яна адкрывалася з пагорка — незвычайна прыгожае, вялікае паселішча, у цэнтры якога ўзвышалася шмат купальная царква, блакітам разлівалася возера. Яны бывалі тут з маці і бацькам раней, на Велікодныя святы, і яму запамяталася, як дзеці каталі чырвоныя яйкі, а на вуліцы было шмат

па-святочнаму апранутых людзей. Хаты ў вёсцы был, дабротныя прасторныя. У хаце вялікая руская печка, пры ёй палаці. Маці тады пасля Вялікадня пакінула малога Барыса ў вёсцы, і ён вельмі сумаваў напісаў ёй нават пісьмо, сам панёс яго на бліжэйшую станцыю Савцыно, але забыўся пецярбургскі адрас. Вядома ж, пісьмо не дайшло, але хлопчык вельмі спадзяваўся, што маці, атрымаўшы ліст, хутка прыедзе і скончыцца яго пакутлівы сум.

А цяпер ён не захацеў застацца ў вёсцы, і вярнуліся яны ў халодны і галодны Пецярбург каб у такі трывожны, цяжкі час быць усім разам. Але праз многія гады Барыс Кіт часта згадваў тыя мясціны, асабліва калі перачытваў «Анну Каренину» Льва Талстога (на нямецкай мове, дзеля дасканалага валодання ёю), бо ў Кашынскім павеце былі маёнткі герояў талстоўскага рамана Вронскага, Аблонскага, Левіна. І заглыбляючыся ў цудоўныя апісанні сярэднярускай прыроды, ён быццам зноў праходзіў па знаёмых з далёкага дзяцінства сцяжынках...

У тыя ж галодныя дні 1918 года вельмі прыдатным быў бацькаў рыбацкі вопыт яны часта з сынам лавілі вудай рыбу, што было немалой падтрымкай для сям'і. І ўсё ж гэта не выратоўвала, здабываць харчаванне станавілася цяжэй і цяжэй. І бацька вырашыў адправіць сына з жонкай у Беларусь, на сваю радзіму ў Агароднікі, нягледзячы на небяспеку такога падарожжа. Яно адбылося дакладна так, як гэта апісана ў рамане Барыса Пастэрнака «Доктар Жываго» і паказана у аднайменным амерыканскім фільме паводле рамана рускага пісьменніка. Там ёсць сцэна: цягнік набірае ход і ў апошні момант на прыступку перапоўненага людзьмі таварнага вагона ўскочыў чалавек. Ён просіцца ў вагон, але азлобленыя пасажыры спіхваюць яго пад колы, на рэйкі. Іменна такую жудасную сцэну назіраў малы Барыс, едучы з маці на Беларусь. Гэта было ў канцы 1918 года. З імі разам ехаў дзядзька Міхась з сынам Паўлам і дачкой Надзяй. З вялікімі цяжкасцямі дабраліся да Мінска, дзе можна было нешта купіць з яды, на якую накінуліся згаладалыя падарожнікі. Да вёскі даехалі фурманкай і напачатку пасяліліся ў цёткі Вольгі, сям'я якой жыла ў Сапатніцы, што за 10 кіламетраў ад Агароднікаў. Маці вымушана была вярнуцца ў Пецярбург, пакінуўшы васьмігадовага сына на клопаты цёткі. Гэта быў вельмі цяжкі перыяд для Беларусі. Голад панаваў усюды. Дзеці хадзілі на поле, збіралі гнілую бульбу, крапіву, лебяду, гатавалі нейкае варыва. Тады яшчэ жыў дзед і часта з маёнтку графа Храптовіча, дзе працаваў, прыносіў хлеб, падтрымліваў унукаў. Ад недаядання, дрэнных умоў, у параўнанні з пецярбургскай кватэрай, тугі па бацьках хлопчык часта хварэў. Але ў хуткім часе маці з бацькам вярнуліся з Пецярбурга, і ўсе разам

пераехалі жыць у Карэлічы. Спачатку туліліся па кватэрах, пакуль не збудаваў бацька хату на сваім надзеле зямлі, што застаўся ад гаспадаркі дзеда ў Агародніках. І хоць хата была яшчэ недабудаванай, без падлогі, але гэта быў свой прытулак, без якога чалавеку жыць у вёсцы нельга. Нядоўга пагаспадарыла ў новай хаце Ксенія Дзмітраўна, яе хворае сэрца не вытрымала цяжкіх выпрабаванняў, якія выпалі на долю сям'і і якія былі абумоўлены рэвалюцыйнымі ўзрушэннямі, грамадзянскай вайной. Яна памерла ў 1920 годзе зусім маладой, трыццацігадовай, пакінуўшы адзінага сына, які вельмі любіў маці, быў прывязаны да яе душой. Гэта было вялікае гора для дзесяцігадовага хлапчука. Воблік роднай маці, маладой, прыгожай, назаўсёды застаўся ў яго сэрцы. Бацьку, вядома ж, немагчыма было аднаму спраўляцца з гаспадаркай, і ён праз некаторы час ажаніўся другі раз з мясцовай жанчынай Аленай Швед, якая паходзіла з вёскі Валеўка, што ля возера Свіцязь. Гэта была працавітая, спагадлівая душой беларуская сялянка, яна стала не мачахай, а другой маці асірацеламу падлетку. Неўзабаве ў Барыса з'явіліся брат і сястра (цяпер брат Барыса Уладзіміравіча — Лявон Уладзіміравіч Кіта жыве ў Мінску, сястра — Ірына Уладзіміраўна Вярбіцкая — у Карэлічах).

На Беларусі ў 1919-1920 гадах ішла польска-савецкая вайна, наша зямля зноў апынулася на перакрыжаванні вынішчальных ваенных дзеянняў. Нямецкая акупацыя змянілася польскай інтэрвенцыяй. Польшча пачала ваенныя дзеянні ў другой палове лютага 1919 г. На захопленай тэрыторыі Беларусі палякі ліквідавалі савецкі лад, польская буржуазія і памешчыкі марылі аб адраджэнні польскай дзяржавы ў межах 1772 г. Не выпадкова яны імкнуліся любымі сродкамі замацаваць за сабой захопленыя землі, стварыўшы з іх Віленскую і Мінскую акругі, а ў іх межах — паветы і гміны. Для кіравання гэтай тэрыторыяй пры штабе Літоўска-Беларускага фронту быў створаны так званы Генеральны камісарыят усходніх зямель. Палітычныя праціўнікі, яўныя і патэнцыяльныя, падвяргаліся рэпрэсіям. У культурным жыцці праводзілася палітыка паланізацыі. Дзяржаўнай мовай была аб'яўлена польская. Аднак у ліпені 1920 г. Чырвоная Армія перайшла ў наступленне, і да жніўня Беларусь была поўнасцю вызвалена. Войскі пад камандаваннем М. Тухачэўскага працягвалі імклівае наступленне, палякі адступалі, пакідалі гарматы, патроны, зброю, і па ўспамінах Барыса Кіта, яны, хлапчукі, якія пасвілі кароў, знаходзячы скрыні патронаў, аддзялялі порах, рабілі з гэтага пораху ракеты і пускалі ў неба. Ці не адсюль пачаліся першыя заняткі ў астранаўтыцы будучага акадэміка? Тады 10-гадовы хлапчук не думаў

пра такія высокія матэрыі, хоць, магчыма, і не адчуваў цяжкасцей жыцця ў такой ступені, як дарослыя.

Войскі М. Тухачэўскага на подступах да Варшавы сустрэлі ўпартае супраціўленне польскіх часцей. Сталін, як палітычны камісар, не жадаючы ўзвышэння Тухачэўскага, не даў магчымасці палкам С. Будзёнага своечасова прыйсці Тухачэўскаму на дапамогу. Былі і іншыя прычыны правалу варшаўскай аперацыі. Савецкі ўрад вымушаны быў пайсці на перагаворы з польскім кіраўніцтвам аб спыненні ваенных дзеянняў і падрыхтоўцы да мірных перагавораў. 12 кастрычніка 1920 г. у Рызе былі заключаны папярэднія ўмовы міру паміж РСФСР і Украінай з аднаго боку, і Польшчай — з другога. Дагавор прызнаваў незалежнасць Украіны і Беларусі, аднак адбіраў ад іх вялікія тэрыторыі, сцвярджаючы лінію Дзяржаўнай граніцы паміж Польшчай і савецкімі рэспублікамі. Беларускія нацыянальныя групоўкі аднесліся да дагавора рэзка адмоўна. Рада БНР выступіла з мемарандумам пратэсту супраць раздзелу Беларусі на дзве часткі і ставіла пытанне аб удзеле сваіх прадстаўнікоў на перагаворах, бо рашэннем Рэўкома БССР дэлегацыі РСФСР даручалася прадстаўляць інтарэсы Беларусі на мірных перагаворах.

Вынікі барацьбы з пункту гледжання знешнепалітычнага фактару замацаваў мірны дагавор РСФСР і УССР з Польшчай, падпісаны 18 сакавіка 1921 г. у Рызе. Аднак ён штучна раздзяліў беларускі народ Дзяржаўнай граніцай. Тэрыторыя Беларусі, якая адышла да Польшчы, склала 108 тыс. кв. км з насельніцтвам звыш 4 млн. чалавек. За БССР захавалася толькі шэсць паветаў Мінскай губерні — Мінскі, Барысаўскі, Бабруйскі, Ігуменскі, Мазырскі і Слуцкі, у іх пражывала больш як паўтара мільёна чалавек. Гомельская і Віцебская губерні былі ўключаны ў склад РСФСР. Так па-жывому была падзелена зямля шматпакутнай Беларусі паміж больш моцнымі дзяржавамі-суседзямі. Згодна з дагаворам урад Польшчы павінен быў прадаставіць беларускаму і ўкраінскаму насельніцтву «ўсе правы, якія забяспечвалі б свабоднае развіццё культуры, мовы і выкананне рэлігійных абрадаў». Аднак гэтыя абавязацельствы не захоўваліся. Заходняя Беларусь стала аграрным прыдаткам прамысловых раёнаў Польшчы, рынкам збыту і крыніцай таннай сыравіны і рабочай сілы. Што гэта азначала для простых людзей можна прасачыць на прыкладзе сям'і Кіта. Агароднікі, як і Карэліцкі, Наваградскі паветы, апынуліся таксама пад Польшчай, урад якой многія беларускія сялянскія і памешчыцкія землі аддаў польскім каланізатарам-асаднікам. Бедныя сяляне-беларусы вымушаны былі ісці працаваць да іх парабкамі, бо малазямельныя гаспадаркі забяспечвалі толькі напаўгалоднае

існаванне. Сям'я Кіта, маючы невялікі надзел зямлі, цяжка і шмат працавала, каб неяк зводзіць канцы з канцамі. Барыс дапамагаў бацьку ўсім, чым мог у свае гады. Гэта было звычайнае жыццё вясковага падлетка, які заўсёды быў заняты нялёгкімі сялянскімі справамі: пасвіў карову, каня, даглядаў за малодшымі дзецьмі, калі бацькі былі ў полі ці куды ад'язджалі з дому. Зімою працы было менш, і бацька вучыў сына першай грамаце. Дзякуючы прыроджаным здольнасцям ён хутка навучыўся чытаць, пісаць, асабліва ўпадабаў арыфметыку і ў 1924 годзе паступіў удразу ў 4 клас мясцовай польскай школы, бо беларускай тады не было. Вучыўся выдатна, выказваючы асаблівую прыхільнасць да малявання. Яго малюнкі выстаўляліся на мастацкай выстаўцы ў Познані. На гэта звярнуў увагу сам дырэктар школы Дулемба і, прагледзеўшы разам са школьным інспектарам малюнкі Барыса Кіта, абяцаў дабіцца для яго стыпендыі ў Акадэміі мастацтваў у Варшаве. На жаль, з гэтага нічога не атрымалася. Справа ў тым, што адным з настаўнікаў школы быў беларус Сцяпан Рамановіч. Ён выкладаў матэматыку, а каб больш зразумелай і даходлівай была для вучняў гэта складаная навука, часта выкарыстоўваў прыклады з акаляючага сялянскага жыцця. Ён не любіў палякаў, асабліва асаднікаў, лічыў іх дрэннымі гаспадарнікамі, і ўсе яны ішлі ў яго пад адмоўным знакам. Крытычна настроены і неасцярожны настаўнік пачаў аднойчы ўрок аб дадатных і адмоўных лічбах такім чынам: выклікаў да дошкі Барыса Кіта, як лепшага ў матэматыцы вучня, "Кіта, уяві, што ты ёсць польскі асаднік на Беларусі. Увосень ты нажаў пэўную колькасць жыта. Як робяць пераважна асаднікі, ты паленаваўся, не змалаціў яго, а проста вывез у мястэчка і прадаў за пэўную колькасць злотых, ну няхай за 500. Дзеля таго, што гэта быў твой чысты прыбытак, дык паставім перад гэтай лічбай знак плюс. Атрымаўшы гэтыя грошы, ты пайшоў у карчму і парадкам выпіў гарэлкі, ну скажам, на 50 злотых, таму паставім перад 50 знак мінус". Гэткім спосабам настаўнік уводзіў алгебраічныя паняцці дадатных і адмоўных лічбаў.

Усё было б ціха, каб прысутныя на ўроках дзеці польскіх асаднікаў не расказалі бацькам, а тыя не пайшлі да дырэктара і не пачалі скардзіцца, што настаўнік Рамановіч зневажае на сваіх уроках усё польскае асадніцтва. У выніку пачалося следства — прыехала вышэйшае школьнае начальства, пачало выклікаць вучняў на допыт, і найперш Барыса Кіта. Аднак беларускія вучні вырашылі не выдаваць свайго настаўніка. Барыс Кіт на допыце запярэчыў супраць абвінавачанняў Рамановіча, і настаўніка не змаглі звольніць з працы, але перавялі ў іншую школу. Для Барыса Кіта гэта абарона Рамановіча

скончылася тым, што яму не далі абяцаную стыпендыю для вучобы ў Акадэміі мастацтваў. Кар'ера магчымага мастака была спынена на самым пачатку. Аднак гэтая падзея мела і свой працяг. Настаўнік Popular Рамановіч у падзяку сваім вучням-беларусам: Кіту, Васілеўскаму, Вярбіцкаму і Гоцку вырашыў «сплаціць даўгі» — падрыхтаваць іх у час летніх вакацыяў да паступлення ў Навагradскую беларускую гімназію. Гэтыя летнія сумесныя заняткі яшчэ больш збл ізілі настаўніка і вучняў, аб'ядналі іх у імкненні падтрымліваць адзін аднаго, што не раз потым здаралася, калі Барыс Кіт ужо працаваў інспектарам школ, а Рамановіч — звычайным настаўнікам. Так выпрацоўвалася ў юнакоў, якія толькі ўступалі ў жыццё, нацыянальная свядомасць, пачаткі беларускасці, высокага патрыятызму, чалавечай годнасці. Добрасумленна і грунтоўна падрыхтаваныя Барыс Кіт і яго сябры паступілі ў шосты клас беларускай гімназіі ў Навагрудку. Гэта быў верасень 1926 года. Навагрудак наогул адыграў вялікую ролю ў лёсе Барыса Кіта, як і ў лёсах многіх іншых вядомых Навагрудку. Існуе пэўная сувязь паміж славай старажытнага горада і яго славутымі сынамі. Вядома, што ўжо ў X стагоддзі (як сведчыць М. Райба ў сваёй кнізе "Навагрудак. Гістарычны нарыс". 1992) на месцы сучаснага Навагрудка ўзнікла славянскае паселішча. Упамінаецца горад і ў Іпацьеўскім летапісе. Некаторыя даследчыкі лічаць, што Навагрудак заснаваў сын Уладзіміра Манамаха Яраполк у 1116 г., а беларускі гісторык М. Ермаловіч, выкарыстоўваючы сведчанні Сафійскага і Наўгародскага летапісу, даказвае, што горад узнік каля 1044 г., падчас паходу Яраслава Мудрага на Літву. З XIII стагоддзя Навагрудак становіцца сталіцай Вялікага княства Літоўскага, яго ўзвышэнне звязана з імёнамі Міндоўга, яго сына Войшалка, і асабліва калі вялікакняжацкі прастол займае князь Вітаўт (з 1392 па 1430 г.). М. Гусоўскі ў «Песні пра зубра» адзначаў, што

*Княжэнне Вітаўта лічаць усе летапісцы*
*Росквітам княства Літоўскага, нашага краю,*
*І называюць той век залатым.*

У час праўлення Вітаўта наогул тэрыторыя Вялікага княства Літоўскага мела вялікія памеры — ад Балтыйскага да Чорнага мораў, ад Буга да вытокаў Волгі. Не раз нападалі на яго татараманголы, рабілі спусташальныя набегі нямецкія крыжакі. У бітве пад Грунвальдам Вітаўт узначальваў беларуска-літоўскія палкі, у складзе якіх была і Навагрудская харугва. Крыжакі былі разбіты і больш не асмельваліся нападаць на Беларусь. У 1511 г. Навагрудак атрымаў магчымасць самакіравання, а ў XVI стагоддзі ён лічыўся адным з самых багатых гарадоў у Вялікім княстве Літоўскім, і яму было

дадзена Магдэбургскае права. Яно было адменена ў 1795 г., калі Наваградчына ўвайшла ў склад Расійскай імперыі ў выніку ваенных паходаў Расіі і Паўночнай вайны (1706) і падзелу Рэчы Паспалітай, тады, па сведчанню гарадскіх хронік, быў разбураны Наваградскі замак, згарэла большая частка горада. Разбурэнне горада і наваколля давяршыла напалеонаўская армія (1812). Вялікія беды і страты Наваградку, як і ўсёй Беларусі, прынесла першая, не кажучы ўжо пра другую, сусветная вайна. За польскім часам у склад Наваградскага ваяводства ўваходзілі Слонім, Шчучын, Валожын, Стоўбцы, Нясвіж, Баранавічы. Ствараючы такое Наваградскае ваяводства, польскія ўлады быццам хацелі аднавіць былую веліч горада. Але на самай справе, знаходзячыся ў складзе польскай дзяржавы, беларусы былі пазбаўлены многіх палітычных і эканамічных правоў, магчымасці ўсебакова развіваць свае культурна-нацыянальныя, асветніцкія патрэбы. Таму многія беларусы-патрыёты актыўна ўключыліся ў барацьбу за выжыванне найперш беларускіх гімназій, і канкрэтна Віленскай і Наваградскай, з якімі цесна звязана дзейнасць Барыса Кіта ў нацыянальным школьніцтве ў 30-40-я гады. Аднак гэтай яго асветніцка-падзвіжніцкай працы папярэднічала вучоба ў Наваградскай гімназіі, атрыманне вышэйшай адукацыі.

Выключна цікавай і павучальнай была гісторыя Наваградскай беларускай гімназіі. Яна праіснавала 15 гадоў (была адкрыта адразу пасля савецка-польскай вайны і лічылася спачатку беларуска-расійскай, на яе будынку тады вісела шыльда: «Змешаная расейска-беларуская гімназія бацькоўскага камітэта ў Наваградку»), але пакінула вялікі след у гісторыі краю. Гімназія дала нямала беларускіх патрыётаў, шчырых і адданых прыхільнікаў роднай зямлі, Бацькаўшчыны, што было вельмі няпроста: чужыя ўлады не толькі не садзейнічалі, але як толькі маглі вынішчалі нават непрыкметныя парасткі нацыянальнай свядомасці беларусаў. Гімназія стала роднай і любімай для вучняў, і не казённай і варожай Бацькаўшыне і мове. Месціліся яе класы ў старым будынку на рыначнай плошчы Наваградка. Заняткі адбываліся ў другую змену, у першую тут займалася яўрэйская школа. Беларускамоўныя класы пачалі працаваць ужаў 1921 годзе, і вучыліся тут пераважна сялянскія дзеці. У польскай гімназіі трэба было плаціць 300 злотых у год, а 50 злотых каштавала карова, пуд жыта — 2 злотых. Таму бацькі, нават заможныя, не маглі пасылаць туды сваіх дзяцей. Адкрыццё беларускіх гімназій было жыццёва неабходнай справай. Гімназія існавала на складкі бацькоў, без ніякіх дзяржаўных датацый, і таму не ўсе настаўнікі мелі магчымасць поўнасцю атрымліваць зарплату. Першым дырэктарам гімназіі быў Янка Цеханоўскі,

затым Пётра Скрабец — клапатлівыя руплі́ўцы на ніве асветы, патрыёты Беларусі. Барыс Уладзіміравіч Кіт і сёння з глыбокай удзячнасцю ўспамінае Пятра Скрабца: «Дзіўны лёс звязваў мяне з гэтым незвычайным чалавекам. Мае ролі з ім увесь час мяняліся, і ў кожнай сітуацыі мы заўсёды мелі першакласныя ўзаемаадносіны». Дзякуючы П. Скрабцу вучань Барыс Кіт атрымаў пры сваім паступленні ў Наваградскую гімназію інтэрнат, заўсёды, падчас вучобы, адчуваў яго бацькоўскі клопат і дапамогу. У 1934 годзе, калі палякамі была зачынена Наваградская гімназія і П. Скрабца перавялі ў Ваўкавыск настаўнікам польскай гімназіі, то ўжо Барыс Кіт дапамагаў яму падрыхтавацца да здачы кваліфікацыйнага экзамена на званне польскага настаўніка. І пазней, калі Барыс Кіт зноў адкрыў Наваградскую гімназію (пасля закрыцця Віленскай), ён запрасіў П. Скрабца вярнуцца з Ваўкавыска ў Наваградак. Далей лёс Пятра Ануфрыевіча Скрабца (1881-1962) склаўся трагічна. Дырэктар, затым настаўнік Наваградскай гімназіі, шчыры беларус, асветнік, які самаахвярна служыў беларускай справе, быў рэпрэсіраваны савецкай уладай у 1945 г., высланы ў Комі АССР, пасля жыў на пасяленні ў Казахстане (Петрапаўлаўская вобласць, саўгас Амангельды). У 1957 г. вызваліўся, вярнуўся на Беларусь, жыў у Зэльве (1957-1959), дзе, дарэчы, таксама пасля вяртання з ГУЛАГа жыла апальная Ларыса Геніюш. Працаваў некаторы час настаўнікам, затым пераехаў у Наваградак, дзе і памёр. Пахаваны на Наваградскіх могілках. Дзеці (сын і дачка) і ўнукі Пятра Скрабца жывуць у Мінску.

Амаль такі ж лёс спасціг і настаўніка Наваградскай гімназіі Міхася Чатырку. Яго ўрокамі гісторыі захапляліся ўсе вучні. Барыс Кіт меў да яго вялікую павагу за тое, што настаўнік навучыў яго любіць гісторыю роднага краю, гісторыю іншых народаў. У вучня і настаўніка склаліся даверліва-сяброўскія адносіны. Міхась Чатырка з сям'ёй жыў у Любчы, прыгожым мястэчку над Нёманам, меў добры, прасторны дом. Было ў яго чацвёра дзяцей, старэйшая дачка Вера вучылася разам з Б. Кітам у адным класе. Барыс Кіт, ужо тады выдатны матэматык, падрыхтоўваў свайго настаўніка па гэтаму прадмету, каб той мог здаць кваліфікацыйны экзамен, жыў у Любчы цэлае лета, спаў у гумне на сене. Па суседству з Чатыркамі стаяў дом Крупічаў, багатых гаспадароў, у дачку якіх Б. Кіт быў закаханы. Гэта адносна спакойнае жыццё скончылася для сям'і Чатыркі трагічна. Яго рэпрэсіравалі разам з жонкай, вывезлі ў Сібір, дзе яны і загінулі. Іх дзеці, Юрка і Ірына, вучыліся пасля ў Віленскай гімназіі, калі Барыс Кіт быў там дырэктарам, апекаваўся іх лёсам.

Пазней у Наваградскай гімназіі настаўнікам малявання працаваў і Язэп Драздовіч, які прышчэпліваў дзецям любоў да прыроды, роднага краю, помнікаў старасветчыны. Відаць, адсюль бярэ пачатак крыніца ведаў Барыса Кіта, яго нязгасная любоў да сваёй радзімы, ён заўсёды высокім словам згадвае людзей, што сеялі ў ягонай юнацкай душы разумнае, добрае, вечнае.

Аднак Наваградская гімназія, як і іншыя беларускія гімназіі, пабудаваныя па ўзору класічных, мела 8 класаў і была прыватнай, таму выпускнікі яе не маглі паступіць у вышэйшыя навучальныя ўстановы Польшчы. Многія выязджалі ў Чэхаславакію, Прагу, дзе іх прымалі ва універсітэты без усялякіх перашкодаў, на падставе пасведчання аб заканчэнні гімназіі і экзаменаў, а таксама давалі стыпендыі. Гэта вельмі цікавая і знамянальная старонка ва ўзаемадачыненнях і дружбе братніх славянскіх народаў. Чэхія дала прытулак беларускаму эміграцыйнаму ураду (БНР), яна ж спрыяла навучанню беларускіх студэнтаў у чэшскіх універсітэтах. Пра гэты перыяд напісаны цікавы раман Віктара Вальтэра «Роджаныя пад Сатурнам», які дае яскравае ўяўленне пра беларускае студэнцтва ў Празе, у славутым на ўсю Еўропу Карлавым універсітэце. У Празе атрымалі вышэйшую адукацыю такія выпускнікі Наваградскай гімназіі, як Аляксандр і Пётр Орсы, Мікалай Гарошка, вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху, з якімі быў добра знаёмы Барыс Кіт. Вучыліся выпускнікі Наваградскай гімназіі таксама ў Вільні, Варшаве (пазней, калі Наваградская гімназія атрымала дзяржаўныя правы), Познані, Львове і нават у Інсбруку. «Беларуская школа, узяўшы за руку, вяла на дарогі адкрыцця, шляхі радасных і бясцэнных знаходак, — пісаў беларускі пісьменнік на эміграцыі Кастусь Акула ў сваёй аповесці «За волю», надаючы вялікае значэнне нацыянальнай адукацыі. — Ад свае гразкае вуліцы — на бальшак, а там і на вялікія дарогі. Прывівалася любоў да пакрыўджанага шматпакутнага колішняга гаспадара роднай зямлі, створанай ім культуры, да Бога, зруйнаваных нацыянальных і рэлігійных святыняў, песняў, мастацтва. Побач тая ж дагэтуль невядомая гісторыя Беларусі раскрывала і выстаўляла бясспрэчнымі фактычнымі доказамі жахлівае махлярства, суцэльную хлусню і варварства суседзяў, што заўсёды пад лозунгамі хрысціянства і панславізму, падпёртага колішнім місіянізмам, пасля камунізмам і ці мала яшчэ якімі крывадушнымі ізмамі, крывавілі, выбівалі, стагоддзямі паланілі некалі вялікі і міралюбны народ, падсякалі ягонае жывое карэнне. Моладзь прагна спажывала духовы корм, станавілася на поўны рост, напаўняла родныя прасторы патрыятычнымі

песнямі, рухалася да асноўнага вывучэння ўсяго свайго роднага й дарагога, да элементарнага тварэння гісторыі...»

Тварыць гісторыю ўласнага жыцця і ўваходзіць у гісторыю Беларусі Барыс Кіт пачаў з гадоў навучання ў Наваградскай гімназіі. Першы раз на заняткі ў верасні 1926 года бацька адвёз яго з Карэліч у Наваградак на кані, пасля дарогу ў 20 кіламетраў ён не раз адольваў пехатою — зімой і летам, каб дапамагаць у гаспадарцы бацьку, якога вельмі любіў і паважаў, адносіны ў іх былі найлепшыя. Адмерваючы гэтыя кіламетры, юнак не пераставаў любавацца цудоўнымі краявідамі родных мясцін, курганамі, пагоркамі, лясамі, азёрамі, паўнаводным Нёманам. Апетыя Адамам Міцкевічам возера Свіцязь і Янкам Нёманскім возера Кромань і сёння захапляюць сваёй незвычайнай і таямнічай прыгажосцю кожнага, хто пабывае на іх берагах, угледзіцца ў загадкавую бездань, паслухае паданні, якія нясуць іх нястомныя хвалі. А тады рамантычныя гісторыі, якія адбываліся ў гэтых мясцінах, былі добра знаёмыя Барысу Кіту, ён быццам станавіўся саўдзельнікам далёкіх падзей, далучаўся да герояў «Свіцязянкі», padання «Над Кроманню», дзе Янка Нёманскі раскрывае легенду пра ўтварэнне возера і князя Войшалка. І можа пра гэтыя даўнія падзеі мроілася юнаку, калі ён адпачываў на паўдарозе, седзячы на прыступках старой каплічкі, якая згадваецца ў паэме Адама Міцкевіча «Дзяды». Можа і адсюль пачалося для будучага сусветна вядомага акадэміка адчуванне Радзімы, Беларусі, любоў да якой ён пранёс праз усё жыццё? Ён пабачыў мноства краін, любаваўся іх экзатычнай прыродай, але заўсёды найвышэй ставіў мілую сэрцу, ні з чым непараўнальную прыгажосць Бацькаўшчыны.

Гады навучання ў Наваградскай гімназіі для Барыса Кіта пазначаны не толькі яго нястомным жаданнем спазнаць гісторыю бацькоўскага краю, выдатнай вучобай, але і актыўнай грамадскай дзейнасцю, пазашкольнай працай. Гэты перыяд (1926-1928) наогул надзвычай цікавы ў гісторыі Заходняй Беларусі. Шырока дзейнічала Беларуская сялянска-работніцкая Грамада, якая аформілася як масавая палітычная арганізацыя ў 1926 г., на чале з вядомым беларускім вучоным, грамадскім дзеячам Браніславам Тарашкевічам. Яе праграма ўключала такія патрабаванні, як самавызначэнне Заходняй Беларусі, стварэнне рабоча-сялянскага ўрада, перадача зямлі сялянам без выкупу, знішчэнне сістэмы асадніцтва. Грамада расла бурна, да і 927 г. у сваіх шэрагах налічвала больш як 100 тысяч чалавек, аб'яднаных амаль у 2 тысячы гурткоў. У яе дзейнасці прымалі ўдзел і старэйшыя гімназісты Наваградскай гімназіі. Барыс Кіт арганізоўваў па вёсках гурткі, у тым ліку і ў сваіх Агародніках, дзе старшынёй

гуртка БСРГ быў абраны яго бацька. Няспынны рост шэрагаў Грамады паказаў, што беларускі народ імкнуўся да волі, што ён жыве, змагаецца за сваю незалежнасць. Гэта нацыянальнае яднанне беларусаў і сёння можа служыць прыкладам, узорам арганізацыі, якая вядзе да агульнанацыянальнай мэты, збірае людзей, нягледзячы ні на якія цяжкасці. Аднак гэта быў час да разгрому Сталіным беларускай інтэлігенцыі, «нацдэмаў» у Савецкай Беларусі, калі заходняя частка насельніцтва, якая пакутавала ад польскага ўціску, з ілюзійнымі надзеямі пазірала на Савецкі Саюз, на які пачалі арыентавацца кіраўнікі БСРГ. Баючыся такой сілы, урад Пілсудскага разграміў Грамаду, кінуўшы ў турмы многія сотні яе актывістаў.

Палітычная актыўнасць вучняў так занепакоіла дырэктара гімназіі, што ён вымушаны быў прасіць некаторых дзеячаў беларускага руху, якія на той час карысталіся вялікім аўтарытэтам сярод беларускага насельніцтва, каб яны прыехалі ў Наваградак і нейкім чынам паўплывалі на вучняў, змусілі іх больш займацца вучобай, а не палітыкай. Але гэта не дапамагло. Хутка за палітычную дзейнасць многіх найбольш актыўных вучняў, у тым ліку і Барыса Кіта, настаўніка Міхася Чатырку, арыштавалі. Дапытвалі некалькі дзён, але ніхто ні ў чым не прызнаваўся, ніхто не выдаваў сваіх сяброў. Таму большая частка гімназістаў была выпушчана з паліцэйскага пастарунку, затрымалі толькі тых, чыя сувязь з кампартыяй Заходняй Беларусі была даказана. Пазней яны былі асуджаны, прасядзелі ў турмах да 1939 г. Калі адбылося ўз'яднанне Беларусі і пачаліся сталінскія рэпрэсіі, многія вядомыя і актыўныя дзеячы Грамады, нягледзячы на тое, што сядзелі ў польскіх турмах, былі арыштаваны савецкай уладай, загінулі ў турмах і канцлагерах, як гэта здарылася з Б. Тарашкевічам, С. Рак-Міхайлоўскім, І. Дварчаніным, Валошыным — прадстаўнікамі ад беларускага насельніцтва ў польскім Сейме. Усе гэтыя падзеі, людзі, якіх ён добра ведаў, неаднойчы слухаў іх прамовы, добра помняцца Барысу Кіту і па сённяшні дзень.

Пасля разгрому Беларускай сялянска-работніцкай Грамады ў Наваградскай гімназіі запанаваў больш нацыянальны, беларуска-патрыятычны настрой сярод вучняў, суцішылася палітычная дзейнасць. Такому накірунку садзейнічаў і новы дырэктар Янка Цеханоўскі (1888-1938). Ён меў вялікі ўплыў на Барыса Кіта менавіта гэтай сваёй беларускасцю. Аднак дзейная натура Барыса Кіта не магла змірыцца з ціхай плынню будзённых гімназічных дзён. Ён арганізаваў літаратурны гурток, стаў яго старшынёй, наладжваў літаратурныя вечары, сам спрабаваў пісаць вершы, чытаў іх на пасяджэннях гуртка. Сцвярджаючы сябе здабываннем ведаў, актыўным удзелам у

жыцці гімназіі, ён паспяваў наведвацца да бацькі, дзе аднавяскоўцы часта бачылі яго з кнігай, асабліва летам, калі пасвіў статак. Бацька не мог яму дапамагаць матэрыяльна, гаспадарку меў бедную і вымушаны быў часта падрабляць то ў маёнтку графа Храптовіча на сенажацях, то ў цагельні. Таму Барысу Кіту, як і іншым вучнямвыдатнікам з бедных сем'яў, дапамагалі напачатку дырэкцыя гімназіі і бацькоўскі камітэт, даючы магчымасць бясплатна вучыцца і жыць у інтэрнаце, а пасля сталі дапамагаць павятовыя ўлады ў асобе ліберальнага і прабеларускі настроенага старасты Грынеўскага і мясцовай грамадскай дзяячкі, яго жонкі Тэклі Грынеўскай.

У 1928 годзе ваяводам у Наваградку быў Зыгмунт Бэчковіч, чалавек з больш пазітыўнымі адносінамі да беларускага насельніцтва. Даведаўшыся аб цяжкім становішчы беларускай гімназіі, многіх вучняў і настаўнікаў (дарэчы, калі ён наведваў урокі ў беларускай гімназіі, то настаўнікі найперш выклікалі да дошкі Барыса Кіта, каб паказаць, як добра адказваюць вучні літаральна па ўсіх прадметах), ён пачаў рабіць захады, каб ёй быў нададзены статус дзяржаўнай. У выніку яго намаганняў Наваградская, а затым і Віленская беларускія гімназіі дзяржаўныя правы атрымалі. Але яны сталі філіяламі польскіх гімназій, дзеля чаго павінны былі пацвердзіць свой новы статус. Ім быў наладжаны супольны экзамен перад дзяржаўнай камісіяй пад старшынствам прафесара, прарэктара Віленскага універсітэта Масоніуса, прыязнага беларусам. Камісія складалася з асобаў, прыйшоўшых звонку, каб захаваць поўную аб'ектыўнасць. Гэта быў экзамен не толькі для вучняў, але і для настаўнікаў. Ён працягваўся два тыдні, былі пісьмовыя і вусныя экзамены. Барыс Кіт пісаў рэферат на французскай мове па творчасці Шатобрыяна, ён дасканала ўжо тады валодаў беларускай, польскай і французскай мовамі, якія вывучаліся ў гімназіі. Атрымаўшы атэстат сталасці з добрымі і выдатнымі адзнакамі, Барыс Кіт адначасна пацвердзіў сваё права на стыпендыю і паступленне ва універсітэт, а беларускія гімназіі яшчэ раз даказалі грунтоўнасць праграм і метадаў навучання, бліскуча вытрымаўшы ўсе выпрабаванні.

## Дзейнасць Барыса Кіта ў беларускім школьніцтве

У верасні 1928 года Барыс Кіт быў залічаны на фізіка-матэматычны факультэт Віленскага універсітэта імя Стэфана Баторыя. Пераезд у Вільню быў пачаткам аднаго з найцікавейшых перыядаў яго біяграфіі, асвечанай выдатнымі падзеямі і традыцыямі гэтага беларуска-літоўскага горада. Вільня (з 1939 г. Вільнюс) — старажытная сталіца Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (XIV-XVIII стагоддзі). З 1940 г. — сталіца Літвы. Сваю назву горад атрымаў ад ракі Вільня. Як сведчаць археалагічныя даследаванні, тэрыторыя Вільні была заселена яшчэ ў X тысячагоддзі да н. э. Славяне — крывічы з'явіліся тут у VI-VII стагоддзі. У XI стагоддзі горад стаў цэнтрам Віленскага княства феадальнага ўдзела Полацкай зямлі. Тут некалі княжылі Рагвалодавічы, а ў часы вялікага князя Гедыміна (1316-1341) Вільня стала сталіцай Вялікага княства Літоўскага. У 1387 г. гораду было нададзена Магдэбургскае права, што пашырыла яго гандлёвыя і культурныя сувязі з суседнімі дзяржавамі. У XVI ст., на самым пачатку, у Вільні абсталяваў друкарню Ф. Скарына, выдаў тут «Малую падарожную кніжыцу» (1522) і «Апостал» (1525), а паслядоўнік Скарыны П. Мсціславец заснаваў друкарню з кірылічным шрыфтам, якую пазней набылі браты Мамонічы. У горадзе выдаваліся падручнікі, рэлігійная літаратура, законы, «Статут Вялікага княства Літоўскага» (1588), многія іншыя, помнікі беларускага пісьменства. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) горад увайшоў у склад Расійскай імперыі і стаў цэнтрам Літоўскай, пазней Віленскай губерніі Віленскага генерал-губернатарства.

З Вільняй звязана дзейнасць К. Каліноўскага, Я. Тышкевіча, славутых беларусаў пазнейшага часу: І. Буйніцкага, У. Ігнатоўскага, В. Ластоўскага, С. Некрашэвіча, А. Чарвякова, Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, К. Буйло, Ядві гі на Ш. і інш. Тут выдаваліся газеты «Наша доля» і «Наша ніва». У 1919 г. была заснавана Віленская беларуская гімназія. Пасля Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. Вільня набывае значэнне палітычнага і кулмурна-інтэлектуальнага цэнтра Заходняй Беларусі. Пачала дзейнічаць управа Таварыства беларускай школы, адкрыўся беларускі музей, створаны братамі Луцкевічамі, выходзілі шматлікія беларускія газеты і часопісы. У 20з30-я гады ў Вільні жылі і працавалі вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага адраджэння, навукі і культуры: А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, А. Станкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, У. Самойла, І. Дварчанін, Р. Шырма, Г. Цітовіч, Ф. Аляхновіч, М. Танк, П. Сергіевіч, Я. Драздовіч, М. Гарэцкі.

Вось у гэтым горадзе і пачалося далучэнне маладога Барыса Кіта да багатай спадчыны беларускай гісторыі. Прыехаўшы ў Вільню, ён пасяліўся на адной кватэры (каля Вострай Брамы) з Ежы Путрамантам, які стаў потым знакамітым польскім пісьменнікам. Разам з Барысам Кітам у Віленскі універсітэт паступілі аднакласнікі па Навагрsucceeded гімназіі, што займаліся некалі ў настаўніка Рамановіча: Аркадзь Вярбіцкі (перайшоў пазней у БССР, там быў арыштаваны ў гады сталінскіх рэпрэсій і загінуў), Язэп Гоцка (расстраляны немцамі ў час вайны за падпольную дзейнасць). Віленскі універсітэт, студэнтам якога стаў Барыс Кіт (скончыў у 1933 г. са ступенню магістра матэматыкі), быў адным са старэйшых у Еўропе. Ён быў заснаваны ў 1570 г. як калегіум, але ўжо ў 1578 г. польскі кароль Стэфан Баторый выдаў калегіуму прывілей, на падставе якога ён быў пераўтвораны ў акадэмію, што давала права прысвойваць вучоныя ступені, мець выбарную адміністрацыю, правы ўласнай юрысдыкцыі. Першым рэктарам быў вядомы ідэолаг контррэфармацыі ў Рэчы Паспалітай П. Скарга, сярод выпускнікоў акадэміі былі такія гістарычныя асобы, як Мялецій Сматрыцкі, Сімяон Полацкі. З 1781 г. акадэмія была рэарганізавана ў Галоўную школу Вялікага княства Літоўскага, куратарам якой стаў беларускі магнат Іахім Храптовіч, а з 1803 г. яна пераўтвараецца нарэшце ва універсітэт з 4 факультэтамі: маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычным, медыцынскім, літаратурным і вольных мастацтваў. Віленскі універсітэт даваў адукацыю на ўзроўні лепшых еўрапейскіх універсітэтаў. З яго сцен выйшлі многія таленавітыя людзі, такія, як А. Міцкевіч, Ю. Славацкі, І. Дамейка. У 1832 г. рускі імператар Мікалай І за вольналюбівую дзейнасць зачыніў Віленскі універсітэт, які зноў пачаў працаваць толькі ў 1919 г., а ў 1920 г. ужо адзначалася 350-годдзе з дня яго заснавання, аднавіліся ўсе старыя добрыя традыцыі: права экстэрытарыяльнасці (паліцыя не магла ступіць на тэрыторыю універсітэта), перыядычна абіраўся рэктар, які павінен быў адкрываць акадэмічны навучальны год вялікай прамовай на ўрачыстым сходзе студэнтаў і прафесараў (так званы дзень інаўгурацыі), калі ўсе збіраліся ва універсітэцкай зале, дзе вісеў агромністы партрэт караля Стэфана Баторыя, а прафесары, дэканы павінны былі апранацца ў тогі.

Пры універсітэце заўсёды існавалі шматлікія студэнцкія арганізацыі, а таксама Беларускі студэнцкі саюз, Таварыства беларусаведаў, беларуская студэнцкая карпарацыя «Скарыніч», выходзілі часопісы «Новы шлях», «Студэнцкая думка», якія стаялі на незалежніцкіх пазіцыях. Асноўным грамадскім цэнтрам быў Беларускі студэнцкі

саюз, сябрамі якога станавіліся беларусы — студэнты ўсіх палітычных напрамкаў. Саюз дзейнічаў на працягу 1920-1939 гадоў.

Барыс Кіт з Першага курса пачаў браць актыўны ўдзел ва універсітэцкім жыцці. Ён уступіў у Беларускі студэнцкі саюз, наведваў сходы такіх беларускіх арганізацый, як Таварыства беларускай школы (ТЫП), якое аб'ядноўвала больш за 14 тысяч сяброў. Кіраўнікамі і актыўнымі дзеячамі гэтай масавай дэмакратычна-культурнай арганізацыі былі Б. Тарашкевіч, І. Дварчанін, П. Пестрак, Р. Шырма, С. Рак-Міхайлоўскі і інш. ТБШ мела даволі шырокую сетку гурткоў і шматтыражныя друкаваныя выданні («Бюлетэнь ТБШ», газета «Шлях», часопіс «Беларускі летапіс»). Аднак польскія ўлады пільна сачылі за дзейнасцю беларускіх арганізацый. У 1927 г. яны забаранілі Беларускую сялянска-работніцкую Грамаду, а ў хуткім часе было забаронена і Таварыства беларускай школы. Яго кіраўнік Рыгор Шырма (1892-1978) трапіў у Лукішкі. Так здарылася, што разам з ім у гэты ж час быў арыштаваны і Барыс Кіт, і яны разам адбывалі пакаранне за адраджэнскую дзейнасць.

Удзел Барыса Кіта ў беларускім грамадскім руху з самых маладых гадоў — гэта перыяд выспявання ў яго душы патрыятычных настрояў, усведамленне сябе беларусам, якому неабыякавы лёс народа, лёс Бацькаўшчыны. Яго захапіў беларускі адраджэнскі рух, асабліва справы многіх дзеячаў, якія, забываючыся пра ўласныя праблемы, арганізоўвалі гурткі, хоры, ішлі да народа, узнімалі ягоную свядомасць, абуджалі прагу нацыянальнага адраджэння. Яны працавалі не дзеля славы і ўласнага дабрабыту, а дзеля ідэі. І Барыс Кіт, усім сэрцам прымаючы гэтыя ідэі, пайшоў па лініі асветніцтва. Ён разумеў, што дзеля таго, каб Беларусь стала незалежнай дзяржавай, трэба шмат працаваць, несці веды людзям, пашыраць асветніцкую справу, і пачынаць неабходна з арганізацыі беларускага школьніцтва, вучыць маладое пакаленне, раскрываючы нашу багатую гісторыю, ідэі беларускасці, свабодалюбства, адчуванне нацыянальнай годнасці і гонару. Гэтыя свае перакананні ён пачынае ўвасабляць у практычныя, канкрэтныя справы. Яшчэ будучы студэнтам 3-га курса Віленскага універсітэта, ён становіцца настаўнікам Віленскай беларускай гімназіі, выкладчыкам матэматыкі. Адсюль бярэ пачатак найбольш плённы і дзейсны перыяд працы Барыса Кіта ў беларускім школьніцтве. Гады яго настаўніцтва ў гэтай гімназіі (1931-1939) пазначаны барацьбой з польскімі ўладамі за існаванне беларускіх школ. Гісторыя беларускага школьніцтва наогул — драматычная старонка ў нашым асветніцтве. З першых яго крокаў пасля вайны 1914-1918 гадоў, карыстаючыся часовай свабодай, беларускія грамадскія

дзеячы і патрыёты змаглі арганізаваць у Заходняй Беларусі каля 500 беларускамоўных школ і 8 гімназій, былі адкрыты настаўніцкія семінарыі, якія з'яўляліся асноўнай базай падрыхтоўкі педагогаў для гэтых школ, працавалі клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні, створаныя беларускімі культурна-асветнымі арганізацыямі. Аднак польскі шавіністычны ўрад, які напачатку нібыта і даў пэўныя дэмакратычныя свабоды нацыянальным меншасцям, у тым ліку і трохмільённым этнічным беларусам, вельмі хутка прыступіў да жорсткай паланізацыі. Вядомы беларускі вучоны Арсен Ліс пісаў пра гэты перыяд: «Калі 20-я гады ішлі пад знакам станаўлення, прынамсі, ва ўсходняй частцы Беларусі дзяржаўнасці, бурнага культурнага развіцця паабапал Рыжскай мяжы, кансалідацыі нацыі, то з канца 20-х, асабліва пачатку 30-х гадоў адбыўся трагічны рэгрэс у гісторыі народа. Ён абазначыўся дзесьці з 1927 г. у падпольскай Заходняй Беларусі, калі ўрад Пілсудскага-Мейштовіча абрушыў на масавы вызваленчы рух, што развіваўся ў легальных формах Беларускай сялянска-работніцкай Грамады, рэпрэсіі і забароны. І з асобай сілай праявіўся фактычна дзяржаўны тэрор супраць сялянства і беларускай інтэлігенцыі. Аўтарытарны рэжым Пілсудскага і таталітарызм сталінскай імперыі аказаліся тымі жорнамі, што сталі сістэматычна і планава перамалочваць старажытную з паходжання, але толькі што адроджаную пасля двухвекавога заняпаду беларускую этнасупольнасць.

Як жа выглядала практычная палітыка польскага ўрада ў дачыненні да заходніх беларусаў у 30-я гады? Згодна са сваёй каланіяльнай стратэгіяй польскі ўрад умацоўваў асаднікаў, польскіх каланістаў, імкнуўся пашырыць свае ўплывы на вёску. Палякі закрывалі беларускія гімназіі, якія складалі прыкметныя беларускія асветна-грамадскія асяродкі, пачатковыя школы, ліквідоўваліся гурткі ТБШ, канфіскоўвалі паэтычныя зборнікі заходнебеларускіх паэтаў, чынілася суровая расправа над беларускім букварам С. Пауловіча «Першыя зярняткі». У 1934 г. на заходнебеларускіх землях, у Картуз-Бярозе, быў створаны першы ў Польшчы канцлагер. Палітычны рэжым даваеннай Польшчы набываў таталітарысцкія рысы...»

Была пастаўлена мэта наогул ліквідаваць беларускія школы і гімназіі, ператварыць заходніх беларусаў у палякаў. Віленскі ваявода Бацянскі нездарма выказаўся аднойчы, што ён зробіць усё, каб на працягу 10 гадоў ніводнага беларуса тут не засталося. І гэта пагроза пачала ператварацца ў рэальнасць: да 1928 года з 8 беларускіх гімназіяў засталося 4: Радашковіцкая, Клецкая, Наваградская і Віленская, а з 1934 г. працавала толькі адзіная беларуская гімназія ў Вільні (заснавана па ініцыятыве І. Луцкевіча ў 1919 г.). Яна, як і

Навагрудская, несла святло нацыянальнай свядомасці, існавала дзякуючы свайму высокаму аўтарытэту, усеагульнай падтрымцы беларускага насельніцтва, самаадданаму энтузіязму і патрыятызму настаўнікаў-беларусаў. Дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі, якая месцілася ў Базыльянскіх мурах на Вострабрамскай вуліцы, быў Радаслаў Астроўскі. (У розныя гады дырэктарамі гімназіі працавалі М. Анцукевіч, Ф. Грышкевіч, А. Станкевіч, Б. Тарашкевіч і інш.) Пры гімназіі дзейнічалі інтэрнат, бібліятэка. Вучыліся ў гімназіі пераважна сялянскія дзеці з падвіленскага беларускамоўнага насельніцтва, якое было каталіцкім. Яго ў сваіх руках трымала польскае шавіністычнае духавенства, варожа настроенае да беларускасці.

Калі ў 1934 годзе, у час агульнага польскага наступу на беларускі рух, была зачынена Навагрудская беларуская гімназія, вучням было прапанавана ўступіць у Польскую дзяржаўную гімназію імя Адама Міцкевіча. Гэта была прымусовая паланізацыя беларускай моладзі. Радаслаў Астроўскі, як дырэктар, адкрыта крытыкаваў польскія ўлады за іх адносіны да беларусаў. Ён паслаў Барыса Кіта, чалавека найбольш вядомага на Навагрудчыне, каб той не дапусціў пераходу беларускіх вучняў у польскую гімназію і перавёз усіх жадаючых у Віленскую. У час, калі пачаўся перапіс вучняў, Барыс Кіт прыехаў у Навагрудак і стаяў цэлы дзень у варотах польскай гімназіі, сустракаў вучняў-беларусаў, агітуючы ехаць вучыцца ў Вільню. Большасць з іх згадзіліся з прапановай беларускага настаўніка. Мясцовы дырэктар польскай гімназіі, даведаўшыся аб «крамольнай» дзейнасці Барыса Кіта, паслаў на яго данос вышэйшым школьным уладам Віленскай акруговай куратарыі, да якой належаў і Навагрудскі павет. Куратарам тады быў пан Шэленгоўскі — на шчасце, адзін з ліберальных дэмакратаў (хутка яго знялі з гэтай пасады). У даносе гаварылася нават пра тое, што Барыс Кіт сваімі дзеяннямі падрываў асновы польскай дзяржаўнасці. Аднак, разабраўшыся ў справе, Шэленгоўскі парваў данос і сказаў, што Кіт паступіў як сапраўдны беларускі патрыёт.

Разам з Шэленгоўскім (ён паплаціўся за свой лібералізм у адносінах да нацыянальных меншасцяў, асабліва да беларусаў. На яго месца польскія ўлады прыслалі ярага шавініста Гадэцкага) адышлі з польскай адміністрацыі і іншыя палякі-дэмакраты. Ім на змену прыходзілі людзі накшталт віленскага ваяводы Бацянскага. Калі ён наведваў Віленскую беларускую гімназію, то заўсёды рабіў заўвагу, чаму замест партрэтаў Адама Міцкевіча і Юлія Славацкага вісяць партрэты Янкі Купалы, Якуба Коласа, быў незадаволены, што тут усе гавораць па-беларуску, спрабаваў нават сярод вучняў займець даносчыкаў,

якія б дакладвалі яму, чаму навучаюць на сваіх уроках беларускія настаўнікі. Пад канец 30-х гадоў шавіністычная польская атмасфера, у якой знаходзіліся беларускія асяродкі, стала невыноснай. Беларускі актыў вырашыў паслаць у Варшаву дэлегацыю ў складзе Р. Астроўскага, Р. Глінскага і Б. Кіта, каб паведаміць польскім вышэйшым уладам, у якім становішчы знаходзіцца беларуская гімназія ў Вільні, тым больш што ёй кожны год пагражалі закрыццём. Аднак гэтая дэлегацыя нічога не дабілася, наадварот, стала яшчэ горш. Ніжэйшае начальства, на ўзроўні кураторыі, было незадаволена скаргамі беларусаў і пачало рабіць больш рашучыя захады, каб наогул ліквідаваць апошнюю беларускую гімназію. Звольнілі спачатку дырэктара Р. Астроўскага і перавялі яго настаўнікам матэматыкі ў адну з польскіх гімназіяў у Лодзь, а беларускую гімназію, якая на той час ужо была філіялам польскай, пачалі цалкам пераводзіць на польскую мову. Дзеля гэтага зрабілі выгляд, аднак, што патрабуецца фармальная згода бацькоў вучняў беларускай гімназіі. Ваявода Бацянскі паслаў сваіх падначаленых, якія то пагрозамі, то ўсялякімі абяцанкамі сабралі патрэбную колькасць подпісаў. Кураторыя адправіла так званыя патрабаванні бацькоў у Міністэрства асветы ў Варшаву. Загад міністэрства аб пераводзе беларускай гімназіі на польскую мову прыйшоў неадкладна. Ён фактычна ліквідаваў беларускую гімназію ў Вільні. Але гэты загад быў атрыманы ў верасні 1939 года, калі пачалася другая сусветная вайна і Польшча перастала існаваць як дзяржава пад ударамі нямецкіх войскаў.

Напад 1 верасня 1939 г. на Польшчу, гітлераўскай Германіі, па сутнасці, развязаў вайну народаў. Польскі народ, мужна абараняючыся ад фашысцкага нашэсця, вёў справядлівую вайну. Аднак, маючы велізарную ваенную перавагу ў жывой сіле і тэхніцы, фашысцкія войскі хутка рухаліся ў напрамку да граніцы СССР. Германія акупіравала амаль усю тэрыторыю Польшчы, яе войскі падступілі да межаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, насельніцтва якіх таксама аказалася перад небяспекай фашысцкага прыгнёту.

Падзеі імкліва нарасталі: 17 верасня Чырвоная Армія заняла Заходнюю Беларусь, у тым ліку і Вільню. Польская школьная адміністрацыя спыніла сваю дзейнасць. Яе месца заняла беларуская пад кіраўніцтвам Францішка Грышкевіча, які па жаданню вучняў і іх бацькоў прызначыў Барыса Кіта дырэктарам Беларускай гімназіі ў Вільні (1939).

Нягледзячы на цяжкія перыпетыі лёсу, беларуская гімназія ў свае апошнія гады заставалася цвярдыняй беларускага духу. І вучні, і настаўнікі жылі ідэяй нацыянальнага адраджэння, тут лунала сама

гісторыя, шырока, урачыста адзначаліся беларускія нацыянальныя святы, найважнейшыя даты, праводзіліся вечары сустрэч, акадэміі ў гонар Слуцкага паўстання, угодкаў 25 Сакавіка, аздобленыя беларускімі нацыянальнымі сімваламі. Працавалі шматлікія мастацкія, фалькольрныя гурткі. Моладзь гаварыла на роднай мове, хаця ў гімназіі, якая мела гуманітарны ўхіл, вывучаліся лацінская, славянскія, еўрапейскія мовы. Тут працавалі вядомыя ў беларускім адраджэнні людзі: браты Луцкевічы, І. Дварчанін, Х. Ільяшэвіч, Максім Гарэцкі, Аркадзь Смоліч, Антон Грыневіч, Сяргей Паўловіч, Рыгор Шырма. Новы дырэктар няўхільна прытрымліваўся лепшых гімназічных традыцый. Але з'явілася шмат новай работы ў сувязі з незвычайнымі абставінамі. Прыбывала немалая колькасць вучняў з розных частак Заходняй Беларусі — даводзілася адчыняць больш інтэрнатаў, каб забяспечыць навучэнцаў усім неабходным, і найперш — жыллём. Трэба было шукаць новых выкладчыкаў і выхавацельнікаў. Аднак у хуткім часе Вільня і ўся Віленская акруга, дзе спрадвеку большасць насельніцтва — беларусы, адышла пад Літву (снежань 1939), і такім чынам Віленская беларуская гімназія аказалася ў чужой краіне. Асноўную частку выхаванцаў Віленскай гімназіі, як вядома, складалі дзеці беларусаў з Наваградка. Таму на агульным сходзе было вырашана, каб дырэктар зрабіў усе магчымыя захады для пераводу гэтых вучняў у Наваградак і аднавіў працу Наваградскай беларускай гімназіі.

І Барыс Кіт пачаў дзейнічаць. Спачатку ён паехаў да начальніка Наваградскай акругі Арцемія Пятровіча Саўчанкі, паведаміў усе абставіны, расказаў гісторыю Наваградскай беларускай гімназіі, будынак якой пасля яе закрыцця ў 1934 годзе быў забраны польскімі ўладамі. А між іншым, яго будавалі самі вучні з дапамогай бацькоў. А. П. Саўчанка, які вельмі добра ставіўся да Барыса Кіта, зразумеў і падтрымаў яго патрыятычныя намаганні. Гімназія ў Наваградку была зноў адкрыта і яе дырэктарам стаў Барыс Кіт. Колькі трэба было мець цярпення, сілы духу, перакананасці ў святасці і неабходнасці справы, якой ён самаахвяр служыў, каб цяпер зрабіць адваротнае: перавезці віленскіх гімназістаў у Наваградскую гімназію, як некалі перавозіў наваградскіх у Віленскую. І зрабіў ён гэта на працягу тыдня: перавёз, уладкаваў у інтэрнат, наладзіў нармальны вучэбны працэс. У Віленскай гімназіі засталіся вучні, бацькі якіх жылі ў Вільні і блізкіх ваколіцах, а дырэктарам стаў ксёндз Адам Вікенцьевіч Станкевіч (1891-1949), які быў вядомым культурна-асветным дзеячам, усебакова адораным гуманітарыем. Усю моц свайго багатага інтэлекту і палымянага сэрца А. Станкевіч прысвяціў беларускай нацыянальнай

ідэі і ідэі хрысціянскай. Ён імкнуўся абараніць правы беларускага народа на сваю нацыянальную незалежнасць, абгрунтоўваючы іх, з аднаго боку, нацыянальнай прыродай беларуса, з другога — хрысціянскімі, агульначалавечымі ідэаламі. Ён стварыў, згодную з еўрапейскімі мадэлямі, канцэпцыю нацыянальнай культуры як найбольш дзейснага сродку развіцця нацыі, нацыянальнай ідэі. А. Станкевіч паказаў прымітывізм і згубнасць для беларускай нацыі сталінскай дактрыны «культура нацыянальная па форме і сацыялістычная па зместу», якая хавала ў сабе па-азіяцку хітры замах на нацыянальную самабытнасць культуры, уніфікавала і русіфікавала яе. Свае думкі ён выказваў у кнігах («Родная мова ў святынях», «Хрысціянства і беларускі народ», «Доктар Францішак Скарына — першы друкар беларускі», «З жыцця і дзейнасці Казіміра Сваяка», «Вітаўт Вялікі і беларускі народ», «Прафесар Браніслаў Эпімах-Шыпіла», «Міхаіл Забэйда-Суміцкі і беларуская народная песня», «Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення» і інш.). Кнігі А. Станкевіча нараджаліся з казанняў. Ён адзін з першых пачаў гаварыць пропаведзі ў касцёлах на беларускай мове, паслухаць якія прыязджалі многія вернікі. Але работай духоўніка не абмяжоўвалася яго дзейнасць. Ксёндз А. Станкевіч — пасол ад беларускага народа ў Варшаўскім сейме, стваральнік беларускай друкарні імя Ф. Скараны, дырэктар беларускай гімназіі, старшыня Беларускага цэнтра Літвы, адзін з кіраўнікоў ТБШ, Беларускага выдавецкага таварыства. Не было такой нацыянальна-дэмакратычнай справы ў 20-40-я гады, якая б не атрымлівала самую актыўную падтрымку А. Станкевіча — дэмакрата, барацьбіта за нацыянальную незалежнасць беларускага народа. За гэтую сваю дзейнасць ён быў рэпрэсіраваны ў гады станаўлення, асуджаны на 25 гадоў і загінуў у адным з канцлагераў Сібіры.

Вось сярод такіх людзей, беларускіх патрыётаў, праходзіла жыццё Барыса Кіта ў 30-я гады, ён быў адным з тых, хто дзейсна працаваў дзеля нацыянальнага адраджэння і асветніцтва. Хутчэй за ўсё і яго чакаў бы лёс многіх беларусаў, загінуўшых у сталінскіх канцлагерах. Аднак тады ён не задумваўся аб гэтым, працягваў сваю пачэсную справу педагога.

Як толькі разышлася чутка пра адкрыццё беларускай гімназіі ў Наваградку, з акаляючых вёсак і мястэчак адразу пайшлі запісвацца ў яе вучні-беларусы. Маладому дырэктару ўдалося сабраць таленавіты настаўніцкі калектыў, дзе працавалі такія педагогі, як Лявон Барысаглебскі (пазней быў прафесарам ВНУ ў Мінску), Пётра Скрабец, Яўхім Скурат, Аляксандр і Наталля Орсы. Дарэчы, Барыс Кіт добра ведаў сям'ю Орсаў, быў звязаны з ёю сяброўскімі адносінамі. Іх

было 4 браты: старшы — Павел Орса жыў у Нягневічах (Орсы паходзілі з Нягневіч), трымаў карчму, і калі Барысу Кіту даводзілася пехатою ісці ў Любчу да настаўніка гісторыі М. Чатыркі, ён адпачываў у Нягневічах, у гасцінным доме Паўла. Мікалай Орса вучыўся разам з Барысам Кітам у Навагрудскай гімназіі, арыштаваны ў гады сталінскіх рэпрэсій, не вярнуўся з ГУЛАГа. Аляксандр Орса паехаў у Чэхію, там атрымаў вышэйшую адукацыю, выкладаў пазней беларускую мову і літаратуру ў Навагрудскай гімназіі. У час нямецкай акупацыі працаваў акруговым школьным інспектарам у Навагрудку, потым эмігрыраваў у Амерыку (ён бацька Алы Орса-Рамана, якая стала прафесарам хіміі Нью-Йоркскага універсітэта). Пятра Орсу Барыс Кіт пазней выпісаў у ЗША, і яны разам засноўвалі беларускую калонію ў Саўт-Рыверы. Пра такіх людзей, узаемадачыненнях з імі Барыса Кіта можна пісаць вельмі шмат, бо той перыяд, калі яны жылі на Навагрудчыне, быў адным з лепшых і плённых у гісторыі беларускай гімназіі. Сярод вучняў і выкладчыкаў панаваў вялікі энтузіязм. У сваёй дырэктарскай, адміністрацыйнай працы Барыс Кіт наследаваў традыцыям, закладзеным былымі дырэктарамі, якіх высока цанілі беларускія настаўнікі і моладзь, падтрымліваючы іх барацьбу, адстойванне інтарэсаў беларускага школьніцтва і наогул беларускай справы. Яго нястомныя намаганні на карысць асветніцтва, актыўная дзейнасць Барыса Кіта як сябра Таварыства беларускай школы, Беларускай сялянска-работніцкай Грамады, паплечніка многіх беларускіх дзеячаў, выкладчыцкая работа, клопат пра дабрабыт вучняў — усе гэтыя шматлікія абавязкі не далі яму магчымасці прымаць удзел ні ў якіх партыях. Ды і, шчыра кажучы, яго асабліва туды і не ўцягвалі. Ён наогул ніколі не належаў ні да якіх палітычных партый, аддаючы ўвесь свой час, сваю нястомную энергію і талент педагагічнай і навуковай дзейнасці. Барыс Кіт заставаўся незалежным у час вайны, не ўваходзіў ні ў якую нямецкую калабарацыю, працаваў толькі дзеля беларускага школьніцтва, што ніякім чынам не можа лічыцца супрацоўніцтвам з немцамі. Што б ні здарылася, якія б войны ні абрынуліся і колькі б ні працягваліся, дзяцей заўсёды трэба вучыць, бо яны — будучыня народа. Гэту ісціну добра ўсведамляў беларускі настаўнік-патрыёт. І Навагрудская гімназія, нягледзячы на цяжкае матэрыяльнае становішча, узгадавала пад яго кіраўніцтвам многіх адукаваных, таленавітых людзей з багатым духоўным светам, высокамаральных інтэлігентаў-беларусаў з глыбокім пачуццём нацыянальнай і чалавечай годнасці, незалежна, дзе яны потым жылі, кім працавалі. Яна загартавала іх для барацьбы з суровымі выпрабаваннямі лёсу.

Забягаючы наперад, трэба адзначыць, што ў 1948 годзе, калі Барыс Кіт эмігрыраваў у Амерыку і заснаваўся ў Саўт-Рыверы (штат Нью-Джэрсі), ён шмат дапамагаў беларусам-эмігрантам у пераездзе, не зважаючы на іх палітычныя перакананні, — «зарубежны» яны (БЦР) ці «крывічы» (БНР). Дзякуючы яму і была створана беларуская калонія ў гэтым амерыканскім мястэчку. Яго хуткі пераезд у Каліфорнію, дзе ён распачаў сваю навуковую дзейнасць і астранаўтычную кар'еру, часткова быў вынікам асабістага расчаравання з прычыны канфліктаў, якія пачаліся паміж гэтымі дзвюма групоўкамі, калі большасць беларусаў-эмігрантаў прыехала ў ЗША.

Але вернемся да часу яго працы ў Наваградскай гімназіі. Арганізатарскія здольнасці Барыса Кіта, яго ўменне працаваць з людзьмі былі заўважаны і высока ацэнены школьнымі ўладамі раёна, хаця яму не раз рабіліся заўвагі (была такая загадчыца райана Кацярына Гутарцова) наконт не зусім «марксісцка-ленінскага» стаўлення да нацыянальна-патрыятычнага выхавання моладзі, ідэй русіфікацыі, зліцця моваў. Тым не менш, ён быў прызначаны акруговым інспектарам Баранавіцкай акругі, і, такім чынам, пад яго кантроль увайшлі ўсе школы Баранавіцкага, Наваградскага, Слонімскага, Валожынскага, Ваўкавыскага паветаў.

Шырока разгарнулася дзейнасць Барыса Кіта па развіццю беларускага школьніцтва. На працягу года ён адкрыў сотні пачатковых і дзесяткі сярэдніх школ. А гэта была не такая простая і лёгкая справа ў той складаны, трывожны час, калі адчувалася пагроза блізкай вайны. Неабходна было ў кожнай вёсцы, мястэчку знайсці адпаведныя памяшканні, настаўнікаў, стварыць ім прыстойныя ўмовы, дабіцца хоць нейкіх матэрыяльных пераваг, каб яны маглі ехаць у вясковыя школы і плённа працаваць. Нялёгка было здабыць мэблю, падручнікі, кнігі, сшыткі. Ён уваходзіў з хадайніцтвамі ў самыя розныя арганізацыі, патрабаваў, прасіў, імкнучыся знайсці агульную мову з кожным чыноўнікам, ад якога залежала станоўчае вырашэнне таго або іншага пытання. Бясконцыя раз'езды, наведванні школы, інспектарскія праверкі, заўсёды добразычлівае жаданне дапамагчы, падказаць, навучыць нявопытнага настаўніка — на ўсё хапала энергіі, настойлівасці і цярпення Барыса Кіта. І ён бачыў аддачу. Школы працавалі, вучылі дзяцей, а гэта галоўнае, дзеля чаго ён жыў, чым натхняўся. Кароткі час, адведзены Барысу Кіту для ягонай дзейнасці ў беларускім школьніцтве паміж уз'яднаннем Заходняй Беларусі з БССР і пачаткам вайны, быў незвычайна плённым, захапляў адчуваннем, што працуе ён на карысць сваёй Бацькаўшчыны, садзейнічае не толькі асветніцтву, але і пашырэнню нацыянальнай

свядомасці ў беларускім асяроддзі. А гэта ж быў самы пік сталінскіх рэпрэсій, калі вынішчаліся самабытныя традыцыі беларускага народа, працоўнае сялянства, інтэлігенцыя — цвет нацыі. Аднак развіццё беларускага школьніцтва і ўсе задачы з ім звязаныя, што паставіў сабе за мэту ажыццявіць Барыс Кіт, былі асноўным стымулюючым пачаткам усіх ягоных намаганняў.

Адначасова з гэтай дзейнасцю ён працаваў яшчэ і выкладчыкам матэматыкі ў Баранавіцкім настаўніцкім інстытуце. Як настаўнік Барыс Кіт карыстаўся вельмі вялікай павагай вучняў, ніколі не чытаў ім натацый, але дысцыпліна на яго ўроках была належная, ён захапляў слухачоў незвычайна цікавым, лёгкадаступным выкладаннем складаных матэматычных формул і тэарэм. У Баранавіцкім педінстытуце Барыс Уладзіміравіч пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Нінай Корсак, бацькі якой жылі ў мястэчку Лебедзева каля Маладзечна. У Лебедзеве нарадзіўся ў 1941 годзе іх першы сын Уладзімір. Але гэтая знамянальная падзея ў асабістым жыцці Барыса Кіта супала з пачаткам другой сусветнай вайны.

Нямецкая акупацыя прынесла шмат гора беларускаму народу. Пачаў усталёўвацца «новы парадак», дзе расстрэлы мірных жыхароў сталі звычайнай з'явай. Немцы вынішчалі асабліва тых, хто займаў хоць нейкую пасаду пры савецкай уладзе ці лічыўся камуністам. Барыс Кіт хаця і не стаў камуністам, але пасаду займаў немалую, быў вядомым чалавекам у акрузе. Даведаўшыся, што расстраляны інспектар вячэрніх школ Генрых Дэмбінскі, у мінулым вядомы польскі дэмакратычны дзеяч, ён зразумеў, што неабходна ратавацца самому і выратоўваць жыццё сям'і. Пехатою накіраваліся яны да Лебедзева, дзе напачатку знайшлі прытулак у бацькоў жонкі. Перачакаўшы нейкі час небяспеку, Барыс Кіт пачынае працаваць у мясцовай школе, выкладае матэматыку і нямецкую мову. Але ён не пакідаў задумы адносна адкрыцця новых навучальных устаноў. Вайна заспела яго на хвалі актыўнай дзейнасці ў нацыянальным асветніцтве, бо тады яшчэ не змагло савецкае кампартыйнае чыноўніцтва падпарадкаваць народную асвету цалкам саветызаваным русіфікатарскім тэндэнцыям.

Як сапраўдны педагог, ён выдатна ўсведамляў, што адукацыя неабходна, што б ні здарылася. Хіба можна вайной або іншымі прычынамі апраўдаць непісьменнасць? Маючы звесткі, што немцы дазволілі адкрываць пачатковыя і вузкапрафесійныя школы, Барыс Кіт вырашыў рызыкнуць. Сустрэўшыся аднойчы са сваім калегам, школьным інспектарам Маладзечанскага раёна Яворскім, яны, параіўшыся, пастанавілі паспрабаваць адчыніць настаўніцкую семінарыю ў Маладзечне. Дзеля гэтага трэба было атрымаць дазвол нямецкіх

акупацыйных улад. У выніку вялікіх старанняў яны такі дазвол атрымалі ў 1942 годзе, пабываўшы ў Мінску. У мясцовай маладзечанскай друкарні былі надрукаваны і распаўсюджаны абвесткі пра адкрыццё настаўніцкай семінарыі. Падалі заявы каля 300 маладых людзей, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены, і пачалася навука. З памяшканнем асаблівых клопатаў не было (заняткі праводзіліся ў былым будынку педвучылішча), як і з настаўніцкім персаналам. Аднак нядоўгай была радасць заснавальніка і дырэктара семінарыі Барыса Кіта. Нямецкі камісар Вілейскай акругі, даведаўшыся пра яе існаванне, прыехаў у Маладзечна, зачыніў не толькі настаўніцкую семінарыю, але і друкарню, адкуль выйшлі абвесткі. Быў дадзены загад арыштаваць дырэктара. Справа ў тым, што маладзечанская семінарыя была адкрыта без дазволу мясцовых уладаў, якія лічылі, што адной семінарыі, якая працавала ў Вілейцы, зусім дастаткова для акругі, тым больш для «унтэрмэншаў», людзей другога гатунку, ніжэйшай расы, якімі яны лічылі беларусаў.

Дырэктару ўдалося пазбегнуць арышту. Ён выехаў у Мінск і, не пабаяўшыся, пайшоў да кіраўніка школьнага аддзела Генеральнага камісарыята Беларусі па дапамогу. Лепшае, што той мог зрабіць для Барыса Кіта, — прызначыць яго дырэктарам семінарыі ў Паставах Глыбоцкай акругі.

Вось як расказвае пра Пастаўскія падзеі ў жыцці Барыса Кіта вядомы беларускі вучоны-біяхімік, старшыня Гродзенскай краязнаўчай асацыяцыі Андрэй Майсяёнак: «Гэтыя месяцы выкладчыцкай працы ў Паставах зліліся ў жудасны кангламерат нечалавечых выпрабаванняў і барацьбы за права быць чалавекам, супрацьстаяння неабходнасці захаваць сваё жыццё і не згубіць чалавечы і нацыянальны твар, неабходнасці даць адпор ворагам беларускасці і інтрыганам і застацца сапраўдным гуманістам, да чаго быў прызначаны Б. Кіт у сутнасці сваёй і беларускай і педагагічнай справах. Спачатку падзеі ў Паставах разгортваліся спрыяльна. Ветліва сустрэў новага дырэктара прадстаўнік мясцовай гарадской управы Адам Дасюкевіч, былы вучань беларускай гімназіі ў Вільні. Чалавек, які шмат зрабіў для абароны правоў беларусаў яшчэ ў польскія часы, прапагандаваў хрысціянскія адносіны сярод беларусаў і палякаў, клапаціўся пра адзінокіх і гаротных людзей. Працаваў у Паставах толькі некалькі тыдняў, пераехаўшы з Варапаева. Дасюкевіч вельмі клапаціўся пра школьную справу, бо вучыцца жадалі многія дзеці, а вясковыя школы заставаліся пустымі па прычыне адсутнасці настаўнікаў. Пастаўскай семінарыі прызначылі вялікі і прыгожы будынак былой польскай гімназіі. У верасні 1942 г. пачалі прыём семінарыстаў, але жадаючых

было значна больш, чым змаглі прыняць. Побач з Б. Кітам працаваў былы сябра па Віленскай беларускай гімназіі Пётра Шчасны, іншыя выкладчыкі, шмат дапамагаў Адам Дасюкевіч.

З цяжкім сэрцам, нягледзячы на ўсе турботы за польскімі ўладамі, сустрэў Барыс Кіт адмоўныя адносіны акупантаў да спробы аднавіць польскую школу ў Паставах, а пазней нават забарону прымаць польскіх вучняў у семінарыю. Прычым тут дзеці католікаў-палякаў? Барыс Кіт на сваю рызыку і адказнасць вырашыў прыняць здольных, нягледзячы на іх польскае паходжанне. За гэта ён будзе яшчэ праследаваны. Але паступова і тут, як на ўсёй акупіраванай Беларусі, фашысцкі рэжым пачынае дэманстраваць сваю сутнасць. Арышты, забойствы становяцца на вуліцах Пастаў звычайнай, штодзённай з'явай. Адносіны акупантаў нечалавечыя, і перш за ўсё пакутуе яўрэйская абшчына. Прыйшоў час і ліквідацыі гета, займалася такой бруднай справай Глыбоцкае акруговае СД. Забітыя ляжалі на пастаўскіх вуліцах сотнямі. Б. Кіт перажываў гэты жудасны момант разам са сваімі вучнямі ў семінарыі. Неўзабаве з'віўся афіцэр СД — карнік з пісталетам у руцэ і запатрабаваў, каб дырэктар і вучні неадкладна прынялі ўдзел у ачышчэнні вуліц ад трупаў. Барыс Кіт не згадзіўся і не дазволіў, каб вучні былі ўцягнуты ў гэта. Ад расстрэлу яго выратавала толькі выпадковасць і хвіліны часу, калі пачуўшы пра намеры карніка, прыляцеў Дасюкевіч і ўзяў на сябе ўсю адказнасць за пахавальную справу.

Прыйшлося далей Б. Кіту перажыць і крывавыя падзеі ў Паставах, у якіх гінулі іншы раз, знішчаючы адзін другога палякі і беларусы, хрысціяне і атэісты, прыхільнікі Арміі Краёвай і чырвоных партызанаў, а ўсе разам — суседзі, землякі, жыхары Пастаўшчыны... Гінулі сотнямі і тысячамі...

Светлай весткай у гэтыя хмурныя дні быў дазвол на адкрыццё новай навучальнай установы ў Маладзечне. Гэта павінна быць гандлёвая школа, куды Барыс Кіт быў прызначаны дырэктарам. Аднак ён працягваў выкладаць у Паставах, а ў Маладзечне быў толькі наездамі.

Паступова над галавой Б. Кіта збіраюцца хмары. Успомнілі ўсё: і занадта патрыятычную беларускую дзейнасць (як гэта пры арыйскіх уладальніках?), і пасаду савецкага чыноўніка ў 1939-41 гадах, і гуманізм да яўрэяў і палякаў, і непавагу да нямецкіх улад, і залішнюю самастойнасць. Справу ў лепшыя традыцыях тых часоў завёў шэф Глыбоцкай акруговай паліцыі Левандоўскі. Арыштавалі Барыса Кіта падчас чарговай вандроўкі з Пастаў у Маладзечна, на чыгуначным вакзале ў Крулеўшчызне. Прывезлі ў Глыбокае і адразу кінулі ў падвал, дзе ўжо было шмат арыштаваных. Пачаліся допыты, здзекі.

Следчыя дабіваліся свайго: шпіянаж на карысць англа-амерыканцаў, сувязь з партызанамі, парушэнне нямецкіх законаў на акупіраваных тэрыторыях. Гэтыя страшныя дні, а было іх 30, захаваліся жудасным успамінам у памяці Барыса Уладзіміравіча. «...Кожны дзень наганяюць чалавек 30, з іх 25 расстрэльваюць у першую ноч. І ўсе 30 дзён тое самае. Цягнулі ў падвал розных: найбольш беларусаў, якія падазраваліся ў партызанстве, былі і ксяндзы, і спекулянты, а сярод апошніх пераважна палякі. Так было. Адзін беларускі настаўнік сядзеў са мной. Разгаварыліся... «У вёску ноччу прыходзіць партызан, бярэ, што трэба. Днём з'яўляюцца немцы, якія ўсё ведаюць. Арыштоўваць за сувязь з партызанамі (бо не данеслі). Чакаю... Буду расстраляны... Вазьміце мае боты...»

Уначы яго забіраюць... Я бачу яго рэчы... Тыя боты...»

Усё ж вядомага беларускага настаўніка ў гэты крытычны момант не пакінулі сябры і вучні. Функцыянер БЦР у Глыбокім Мядзейка ўзначаліў цэлую кампанію за вызваленне арыштаванага педагога. Усё магчымае рабіў са свайго боку і Адам Дасюкевіч. Звольніць не выпадала, але з кіпцюроў Левандоўскага Б. Кіта выцягнулі. «Для вырашэння справы» перавялі вязня ў акруговую Вілейскую турму, дзе была галоўная тэрытарыяльная кватэра СД. Змучаны настаўнік нарэшце быў выпушчаны на волю дзякуючы высілкам свайго былога вучня Кастуся Касяка, які працаваў на той момант дарадчыкам па беларускіх справах пры гебістскамісарыяце. Справу не толькі прыпынілі, але дазволілі аднавіць працу на пасадзе дырэктара гандлёвай школы ў Маладзечне. Не адразу змог прыступіць да працы пасля перажытага...

Нягледзячы на ўсе перашкоды, якія рабілі акупацыйныя ўлады справе народнай адукацыі, беларускія патрыёты працягвалі барацьбу за стварэнне навучальных установ, хапаліся за любую магчымасць палепшыць падрыхтоўку настаўнікаў, іншых спецыялістаў (медыкаў, гандляроў, аграрнікаў), даць хоць мінімальную магчымасць адукацыі дзецям. У другой палове 1943 года, пасля стратэгічнай бітвы пад Курскам, вызвалення значнай часткі акупіраванай тэрыторыі, нямецка-фашысцкія ўлады сталі больш уважліва прыслухоўвацца да патрабаванняў мясцовага насельніцтва. Лілася ракою кроў беларускіх сялян падчас карных акцый, але ж акупанты заігрывалі з БЦР, нацыянальнымі арганізацыямі, бачачы ў гэтым магчымасць супрацьпастаўлення нарастаючаму партызанскаму руху на Беларусі. Аднак не будзем судзіць тых беларускіх патрыётаў, якія ў гэты складаны, жорсткі і супярэчлівы час выконвалі свой маральны абавязак, штодзённа робячы сваю лекарскую ці педагагічную справу. Відаць, так думаў і рабіў школьны інспектар Маладзечанскага раёна Яворскі,

які ўжо два гады неадступна змагаўся з уладамі за адкрыццё Маладзечанскай семінарыі, а потым гандлёвай школы. Нарэшце немцы махнулі рукой. Узрадаваны Яворскі прыбег да Барыса Кіта з дазволам. Усё было забыта, абмеркавалі склад педагагічнага калектыву, напрамкі дзейнасці і вырашылі выконваць праграму сярэдне-вышэйшай гандлёвай школы, а фактычна адміністрацыйна-гандлёвага інстытута...» (А. Майсяёнак. «Пастаўскі сюжэт у жыцці акадэміка астранаўтыкі». Часопіс «Калоссе» I, 1993 г., Паставы). Да ўсяго сказанага трэба дадаць, што выратавальнікаў Барыса Кіта пазней спасціг трагічны лёс. А. Дасюкевіч быў расстраляны немцамі за патрыятызм, за тое, што ратаваў беларусаў, дзе і як толькі мог, а К. Касяка расстралялі па даносу палякаў, якія імкнуліся вынішчаць беларускую інтэлігенцыю, што адстойвала беларускасць, нямецкімі рукамі. Гэта яшчэ адна зусім не вывучаная старонка ўзаемадачыненняў палякаў антыбеларускай накіраванасці і свядомых беларусаў у гады нямецкай акупацыі.

Такія выпадкі, трагічныя лёсы незлічоных ахвяр у час акупацыі прымушаюць да аб'ектыўнага даследавання дзейнасці тых удзельнікаў вайны, якія пад выглядам супрацоўніцтва з немцамі баранілі мірнае насельніцтва, шчыра і цвёрда стаялі за беларускую нацыю, ідэю беларускасці. Рызыкуючы жыццём, за гэту ідэю ў складаных, цяжкіх абставінах вайны змагаўся і Барыс Кіт, неаднойчы гледзячы смерці ў твар, аднак мужна, цярпліва і настойліва працягваў сваю пачэсную работу.

Вярнуўшыся ў Маладзечна, Барыс Кіт пачаў рабіць усе магчымыя і немагчымыя захады, каб ператварыць гандлёвую школу ў адміністрацыйна-гандлёвы інстытут з гуманітарным ухілам, які дзякуючы яму, як дырэктару, і ягоным паплечнікам на асветніцкай ніве, ператварыўся ў сапраўдную беларускую нацыянальную школу.

Першы год былі арганізаваны два курсы. Абітурыенты, якія вучыліся ў польскай гімназіі, або ў савецкай школе, залічваліся на другі курс, на першы курс было прыняла звыш 60 чалавек — былі створаны такім чынам дзве паралельныя групы.

Увосень 1943 г. у інстытут прынялі 120 студэнтаў. Яны навучаліся ў трох паралельных групах. У пераважнай большасці гэта былі дзеці сялян з Маладзечанскага, Вілейскага, Ашмянскага і Радашковіцкага паветаў. Мясцовых маладзечанскіх вучняў было каля 30 чалавек. Прычым, хлопцаў значна больш, чым дзяўчат. Уступны конкурс быў вялікі, бо падалі заявы ў інстытут каля 200 чалавек. Размяшчаўся ён на Менскай вуліцы ў былым прыватным доме, дзе абсталявалі класы, настаўніцкі пакой і канцылярыю. Навучанне, разлічанае на 4 гады,

вялося ў дзве змены, шэсць дзён на тыдзень. Вывучаліся ўсе прадметы сярэдняй школы, а таксама гандаль, таваразнаўства, бухгалтэрыя і на апошніх двух курсах — права.

Выкладчыкамі ў гэту навучальную ўстанову запрашаліся многія прафесіяналы, якія выдатна ведалі свае прадметы. Намеснікам дырэктара стаў віленскі юрыст Дзмітрыеў, што спецыялізаваўся ў гандлёвым праве. Ён выкладаў гандаль і права, дасканала валодаў англійскай і нямецкай мовамі і добра гаварыў па-беларуску. Чалавекам, які далучаў вучняў да беларускасці, быў выкладчык беларускай літаратуры Янка Давідовіч. Эстэт, інтэлігент, прыгожы, выхаваны — усе вучні былі ў яго закаханыя. Размаўляў на крыштальна чыстай літаратурнай мове, быў асабіста знаёмы з М. Танкам, ведаў на памяць шмат беларускіх вершаў. Ён прымушаў вучняў чытаць беларускую, рускую і сусветную класіку, дамагаўся, каб яны гаварылі на беларускай мове, і кожны тыдзень пытаўся, што было імі прачытана за апошні час. Беларускую мову выкладала Вольга Пагуда — маладая, сінявокая, светлавалосая дзяўчына, якая ў 1944 годзе перажыла асабістую трагедыю — яе нарачоны — малады беларускі афіцэр, сярод белага дня быў застрэлены ў Лідзе палякамі. Яна моцна перажывала сваё гора, студэнты пра гэта ведалі і вельмі спачувалі сваёй настаўніцы.

Выкладчыкам гандлёвай справы быў Шчасны з Навагрудчыны. Ён скончыў вышэйшую гандлёвую школу ў Варшаве, валодаў англійскай і нямецкай, рускай і беларускай мовамі. Настаўнік Калачоў быў звязаны з партызанамі, Барыс Кіт пра гэта ведаў, і аднойчы, калі немцы прыехалі яго арыштоўваць, ён даў ім недакладны адрас, а сам папярэдзіў Калачова, і той дзякуючы гэтаму паспеў выратавацца ад немінучай расправы, хаця Барыс Кіт страшэнна рызыкаваў сваім жыццём.

Настаўнікі працавалі самаахвярна, жылі напаўгалодна, і таму па рашэнню бацькоўскага камітэта была ўстаноўлена аплата для іх: з кожнага вучня адзін пуд мукі і адзін кілаграм сала ў год, каб неяк падтрымаць настаўнікаў харчамі. Пры інстытуце быў гурток мастацкай самадзейнасці, літаратурны гурток, да якога належалі не толькі студэнты, але і аматары пяра з ваколіцаў. Гэтымі гурткамі кіраваў школьны інспектар Магер. З восені 1943 года музычныя заняткі (піяніна, скрыпка) пачаў весці рускі кампазітар і скрыпачвіртуоз Камароўскі. Яго з лагера ваеннапалонных вызваліў Барыс Кіт, уладкаваў на працу, вярнуў, можна сказаць, да жыцця. Камароўскі часта наладжваў канцэрты класічнай музыкі разам са сваімі вучнямі.

Цікавыя меркаванні наконт гандлёвай школы выказваў яе былы вучань Міхась Лужынскі, які цяпер жыве ў Аўстраліі, быў дырэктарам Беларускага радыё ў гэтай далёкай краіне: «Сама задума ганадлёвай школы была надзвычай разумная. Выпускнік школы мог заняць якуюхаця пасаду ў гандлёвай арганізацыі, адкрыць агенцыю імпарту і экспарту, дастаць працу бухгалтара ў любым прадпрыемстве, адміністратара ў раённай ці гарадской управе або сакратара суда. Як вядома, у нас усе гэтыя становішчы амаль без выключэння былі занятыя чужынцамі. Дырэктарам школы быў Барыс Кіт. Ён карыстаўся вялікай пашанай, усе неяк ведалі яго біяграфію — былы выкладчык Віленскай беларускай гімназіі і шчыры патрыёт. Ён выстараўся для ўсіх нас пасведчанні па-нямецку і па-беларуску са здымкам, якія нам вельмі дапамагалі ездзіць дадому цягніком. Немцы, як вядома, зацятыя фармалісты і да паперак, напісаных па-нямецку, ставіліся з павагай... Пра далейшую долю настаўнікаў Маладзечанскай гандлёвай школы ведаю мала. У вольным свеце знаходзіцца толькі прафесар Барыс Кіт, цяпер навуковец міжнароднай славы. Большасць вучняў засталіся дома. Ёсць два дзесяткі ў Польшчы, 3 — у Англіі, 2 — у ЗША, 2 — у Канадзе, 1 — у Аўстраліі... Усе яны добрым словам успамінаюць дырэктара Барыса Кіта, заслужанага беларускага педагога, які рызыкаваў жыццём, каб моладзь магла атрымаць у жудасныя акупацыйныя часы асвету... Прыспешана б'ецца сэрца, калі прыпамінаю той трывожны час, час змагання і нацыянальнага ўздыму беларускага народу і нашага юнацкага ў ім удзелу». (Газета «Беларус», люты 1983 г.).

Такім чынам, вучэбны працэс у гандлёвай школе быў добра наладжаны, ішоў поўным ходам. Часта даводзілася дырэктару ратаваць сваіх студэнтаў ад нямецкіх акопаў, залічваць у школу звыш усякай нормы юнакоў і дзяўчат, якім пагражаў прымусовы ўгон у Германію. Многім ён так выратаваў жыццё.

Тое, што Барыс Кіт замест ніжэйшай гандлёвай школы навучае студэнтаў па інстытуцкай праграме, дайшло да нямецкіх улад. Ён зноў апынуўся на мяжы арышту. Было загадана неадкладна зачыніць інстытут. Пра гэты загад дырэктар не паведаміў студэнтам і выкладчыкам і не спяшаўся яго выконваць. Студэнты прайшлі поўны інстытуцкі курс навучання. Атрымліваючы дыпломы і віншаванні дырэктара, выкладчыкаў, яны і не здагадваліся, што афіцыйна іх інстытут даўно зачынены. Мужнасць і на гэты раз не здрадзіла іх дырэктару.

Адміністрацыйна-гандлёвая школа ў Маладзечне дала за час сваёй дзейнасці добрыя, грунтоўныя веды студэнтам, дала нацыянальнае ўзгадаванне. Барыс Кіт, чалавек справы, адкрыў гэтую школу, каб не

пакінуць беларускіх дзяцей у такі цяжкі час, каб не пазбавіць іх інтэлектуальнага развіцця, каб захаваць у іх душах веру і высокую мараль. Па сведчанню былой вучаніцы Барыса Кіта А. Кананові́ч, якая жыве ў Ваўкавыску, «у школе поўнасцю адсутнічала ўсялякая палітызацыя. Ніякіх усхваленняў Гітлера і яго арміі, нам нічога нават не гаварылі аб нямецкім народзе і яго культуры, ні адзін немец не пераступаў парога школы, і мы не ведалі, што наш дырэктар валодае нямецкай мовай. Не было ў нас ніякай крытыкі Сталіна і бальшавізму, а ў душы кожны з нас разумеў, што немцы павінны быць выгнаны з нашай зямлі...

А вось беларуская літаратура... Ні ў польскіх, ні ў савецкіх школах мы нічога падобнага не чулі. Мы даведаліся пра Кірылу Тураўскага, Францішка Скарыну, Сімяона Полацкага, Льва Сапегу, пра Вялікае княства Літоўскае, пра Буднага, Цяпінскага, Кастуся Каліноўскага, пра беларускую літаратуру канца XIX і пачатку XX стагоддзя. Мы спявалі «Пагоню», «Люблю каш край», «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» і іншыя песні. І літаратура, і песні садзейнічалі развіццю нацыянальнай свядомасці і духоўнаму адраджэнню, а веданне матэматыкі, фізікі, гандлёвай справы развівала наш інтэлект». (Газета «Літаратура і мастацтва», 24 студзеня 1992 г.)

Як сведчаць гэтыя ўспаміны, навучанне ў гандлёвай школе ішло па праграмах, якія не зведалі ні польска-нямецкай, ні савецкай ідэалагічнай цэнзуры. Студэнты далучаліся да вытокаў гісторыі культуры Беларусі, яе звычаяў і традыцый. Настаўнікі былі руплі́ўцамі на ніве нацыянальнай асветы, сапраўднымі інтэлігентамі і патрыётамі.

Сёння мы можам чытаць многія сведчанні вучняў Барыса Кіта, іх цёплыя словы ўдзячнасці свайму дырэктару, якія яны выказалі праз 50 гадоў на сустрэчы ў Маладзечне ў ліпені 1992 года. «Барыс Кіт запомніўся вучням як неардынарны, высокаадукаваны чалавек, які актыўна падтрымліваў розныя ініцыятывы вучняў... Не раз настаўнік засцерагаў нас ад разыкоўных, неабачлівых учынкаў. Не ўсведамлялі мы тады, як нялёгка было нашаму дырэктару: над ім навісла смяротная пагроза не толькі з боку акупантаў, але і ад «сваіх». У пасляваенны час савецкія ўлады жорстка распраўляліся з выкладчыкамі школ тыпу нашай. Магчыма, прадбачачы гэта, Барыс Кіт вырашыў пакінуць Беларусь... Дзякуючы такім людзям, як Барыс Кіт, Іван Давідовіч, В. Магер, Г. Вяршыцкі, у гэтай школе, якая стала сапраўды беларускай нацыянальнай школай, сфарміраваўся і мой грамадзянскі светапогляд, які, нягледзячы на жыццёвыя цяжкасці, дапамог стаць свядомым беларускім мастаком. Я ўдзячны свайму жыццёваму лёсу, што некалькі гадоў быў вучнем і выхаванцам Барыса Уладзіміравіча

Кіта, бо наша школа, створаная пераважна яго намаганнямі, як потым аказалася, стала адзінай магчымасцю далучыцца да беларушчыны, нацыянальнай свядомасці. Менавіта ў ёй мы пазнавалі старадаўнюю гісторыю свайго народа, яго літаратурную спадчыну, прыгажосць роднай мовы, бо амаль усе прадметы вяліся на беларускай мове высокаадукаванымі беларускімі настаўнікамі. Ідэя Бацькаўшчыны, вернасць запаветам яе лепшых сыноў аб змаганні за дабрабыт свайго народа паступова пранікала ў нашу свядомасць, у наша жыццё. Тым не менш, многія вучні, настаўнікі пасля вайны былі асуджаны, высланы ў ГУЛАГ толькі за тое, што ў час акупацыі вучыліся і працавалі ў беларускіх школах. Варта спадзявацца, што з часам будзе створана праўдзівая і аб'ектыўная гісторыя трагічнага лёсу беларускай адукацыі ў паднявольныя часы. Павінна быць дадзена і належная ацэнка дзейнасці тых людзей, якія самаахвярна служылі справе выхавання беларускай моладзі. І безумоўна, што ў гэтай слаўнай плеядзе паплечнікаў на ніве нацыянальнага адраджэння імя Барыса Кіта зойме пачэснае месца!» (Кастусь Харашэвіч, мастак. "Наш дзень", 21 ліпеня 1992 г.). Дарэчы, Кастусь Харашэвіч (г.н. 1927 г.) — таленавіты беларускі мастак, раскрывае ў сваіх карцінах заходнебеларускую рэчаіснасць, прыгажосць роднай прыроды. «Выступленне Браніслава Тарашкевіча перад сялянамі Заходняй Беларусі», «Каля возера», «Кастусь Каліноўскі», «Пушча», «Магіла паўстанца», «Каля млына», «Гасцінец», «Вялікдзень», «Ваколіцы Маладзечна», «Вечар у Солах», «Помнік мінулага», «Завулак у Вільні», «Вечарэе», «Зіма ў Плёсах», «Вязынка. Хата Я. Купалы», «Мой родны кут», «Апошні снег», «Вуліца ў Ашмянах», «Лета ў Яхімаўшчыне», «Вясенні прамень» — гэтыя і многія іншыя карціны Кастуся Харашэвіча перадаюць нязгасную любоў і замілаванасць мастака да роднага краю, сведчаць пра тое, што жыла і будзе жыць Беларусь, калі яе народ дае свету такіх высокаталенавітых людзей.

Сам Барыс Уладзіміравіч лічыць, што гісторыя Маладзечанскай гандлёвай школы — гэта гісторыя краю ў час акупацыі. «Яе заснаванне, кароткі перыяд дзейнасці, людзі, якія тварылі яе гісторыю ў такія цяжкія гады, — незабыўная старонка жыцця Бацькаўшчыны, — гаварыў ён на сустрэчы, выказваючы словы ўдзячнасці сваім вучням за добрую памяць аб ім. — Яна паказала, як поўныя жыцця і светлых памкненняў вы ў свае маладыя гады ўсведамлялі сябе часткай беларускага народу, перажыўшага пакутлівыя старонкі сваёй гісторыі пад нямецкай акупацыяй. Вы даказалі сваёй вучобай, што можаце супрацьстаяць нямецкай ідэалогіі з яе падзелам на вышэйшую і ніжэйшую расу, што вы — дастойныя людзьмі звацца...»

## Эміграцыя і навуковая дзейнасць у ЗША (1944-1972)

У 1944 годзе Барыс Уладзіміравіч Кіт з сям'ёй выехаў на Захад. Цяжка было пакідаць Радзіму, дзе столькі было распачата добрых спраў, столькі аддадзена сіл для беларускага школьніцтва, дзе заставаліся родныя, блізкія людзі, вучні — частка ягонай душы. Ад'язджаў ён з Лебедзева на падводзе з малым сынам і жонкай і не думаў, што ў дзень развітання з Бацькаўшчынай на чыгуначную станцыю з'явіцца вялікая грамада яго выхаванцаў, каб выказаць падзяку, павагу чалавеку, які запаліў для іх святло ведаў, даў накірунак у нялёгкую жыццёвую дарогу і, хто ведае, можа развітацца назаўсёды. Хто тады мог падумаць, што сустрэча адбудзецца толькі амаль праз 50 гадоў, калі многіх з іх сапраўды ўжо не будзе ў жывых. Адны за навучанне ў гандлёвай школе былі асуджаны, другія, каб выжыць, утойвалі той факт, што яны вучыліся пры нямецкай акупацыі, многія выехалі за мяжу, а некаторым удалося пераадолець усе перашкоды і дзякуючы грунтоўным ведам, набытым у школе, стаць сапраўднымі прафесіяналамі, як доктар медыцыны прафесар П. М. Кузюковіч, выкладчыкі Ганна Зянько, Соф'я Макоўская, Яраслаў Касцюк, хірург У. Саўрук, мастак К. Харашэвіч.

Барысу Уладзіміравічу пашчасціла на эміграцыі: ён і там меў магчымасць займацца настаўніцкай дзейнасцю. Прыроджаны педагог, ён навучаў, выхоўваў моладзь, пачынаючы ад школ да універсітэтаў. На эміграцыі ён не згас, а ўспалымнеў творча, не згубіўся ў шматлікім, differentмоўным і супярэчлівым свеце чужыны. Дзякуючы настойлівасці, ведам, добразычліваму характару ён быў і застаўся беларусам, пачаў здабываць сабе і Радзіме гонар і славу. Яго дзейсная, працавітая, цярплівая натура працягвала тварыць гісторыю ўласнага жыцця, якая яркай, змястоўнай старонкай упісвалася ў гісторыю чалавецтва.

Напачатку Барыс Кіт з жонкай і сынам трапіў у Баварыю, горад Офенбах-Ліндау, а пазней у Мюнхен, які страшэнна быў разбураны падчас вайны, цэлымі, амаль некранутымі ваеннымі разбурэннямі, засталіся толькі яго прыгожыя ваколіцы. У адноўленым Мюнхене Барыс Уладзіміравіч бываў пазней, у 70-я гады, калі на радыёстанцыі «Свабода» працаваў яго даўнейшы сябра М. Сяднёў. Барыса Кіта і цяпер прыцягвае гэты старажытны нямецкі горад, выдатныя гістарычныя і культурныя помнікі, музеі, тэатры, карцінныя галерэі, уменне баварцаў наладжваць цікавыя, вясёлыя святы. А тады ў ваколіцах Мюнхена знаходзіўся лагер для перамешчаных асобаў, дзе жылі ў асноўным украінцы. Тут была заснавана ўкраінская нацыянальная

гімназія, дзе Барыс Кіт на працягу трох гадоў навучаў дзяцей матэматыцы. Адначасова вучыўся сам на факультэце медыцыны Мюнхенскага універсітэта (1945-1948) (разам з ім паступіў і скончыў гэты факультэт Вітаўт Рамук, цяпер доктар медыцыны, актыўны дзеяч (разам з жонкай Верай) беларускай эміграцыі ў Чыкага). І вельмі дарэчы цяпер было веданне нямецкай мовы, якую ён вывучаў яшчэ ў студэнцкія гады. Адным з найбольш здольных яго вучняў ва ўкраінскай гімназіі быў Юры Ольхіўскі, які пазней стаў вядомым амерыканскім вучоным, прафесарам Джарджтаўнскага універсітэта ў Вашынгтоне.

Аднак трэба было думаць пра пастаяннае месца пражывання. Лагер для перамешчаных асобаў — гэта часовы прыпынак, магчымасць агледзецца, усвядоміць сваё становішча і вырашыць, куды накіравацца, дзе знайсці надзейны прытулак, працу, якая б адпавядала духоўнаму складу, што Барысу Кіту было найважней за матэрыяльныя выгоды, хаця для паўнацэннага і свабоднага чалавечага жыцця гэта таксама важна і неабходна.

І ён прыняў рашэнне пераехаць у Амерыку. Было няпроста аднаму з першых вырвацца з эмігранцкіх лагераў у Германіі. Дапамаглі дакументы аб нямецкіх праследаваннях падчас ягонай дзейнасці ў беларускім школьніцтве.

Але, не маючы ні родных, ні знаёмых: у ЗША, трэба было знайсці спонсара-арганізацыю, якая б дапамагла ў пераездзе і першапачатковым уладкаванні ў далёкай краіне. І такая арганізацыя знайшлася — «Сусветная помач царквы». Барысу Кіту і ягонай сям'і ўдалося пры яе падтрымцы ажыццявіць свае намеры.

Можна толькі здагадвацца, якія пакутліва-супярэчлівыя пачуцці авалодалі яго душой, калі ён з жонкай і сямігадовым сынам ступіў на хісткую палубу парахода і праз некаторы час упершыню ўбачыў славутую статую Свабоды ў Нью-йоркскім марскім порце, і яму нясцерпна захацелася, каб параход павярнуў назад, зноў павёз яго бліжэй да Радзімы. Можа ў гэты момант яму прыгадалася, як ён ва ўзросце свайго сына разам з маці пакідаў галодны і халодны паслярэвалюцыйны Петраград у перапоўненым абяздоленымі людзьмі вагоне. І цяпер, на параходзе, яму думалася пра бясконцыя цяжкасці — рэвалюцыі, войны, рэпрэсіі, разбурэнні, пераўтварэнні, якія вымушана перажываць Бацькаўшчына, што ніяк не спрыяе нармальнаму жыццю простых людзей. Расставанне з Радзімай заўсёды цяжкае, тым больш, калі не ведаеш, ці вернешся да яе парога...

Але падзея адбылася. Першыя крокі на амерыканскай зямлі Барыс Кіт зрабіў напрыканцы 1948 года. У Нью-Йорку, які ўразіў сваёй незвычайнасцю, велічнасцю, кантрастамі, непадобнасцю на еўрапей-

скія гарады, беларускі эмігрант даведаўся, што ў суседнім гарадку Саўт-Рывер, невялікі гарадок штата Нью-Джэрсі, з двух-трохпавярховымі асабнякамі, знаходзіць кватэру ў нейкай спадарыні Корсак, якая мела тое ж прозвішча, што і ягоная жонка. Сярод старэйшых эмігрантаў ствараецца кола знаёмых, якія імкнуліся дапамагаць новапрыбыўшым землякам усім, чым толькі маглі. У хуткім часе Барыс Кіт уладкоўваецца ў фармацэўтычную фірму, дзе першыя тры месяцы працаваў у аддзеле прадукцыі, а потым быў пераведзены ў лабараторыю хімікам, кантраляваў якасць лекаў, што выпускаліся ў гэтай фірме. Лабараторыя знаходзілася ў некалькіх кіламетрах ад Саўт-Рывера, у суседнім гарадку Нью-Брансвіку, зялёным, ціхім, вельмі ўтульным, дзе цяпер жыве шмат беларусаў. Ён быў шчаслівы ад усведамлення, што змог выехаць з Еўропы ад пасляваенных разбурэнняў і матэрыяльнай неўладкаванасці. Аднак думкі пра многіх суродзічаў, якія засталіся ў Нямеччыне, не пакідалі Барыса Кіта. І ён пачынае шукаць шляхі, усялякія магчымасці, каб садзейнічаць іх пераезду ў Амерыку. Нечаканая дапамога прыйшла зверху. У 1949 годзе тагачасны амерыканскі прэзідэнт Гары Трумэн выдаў загад аб перасяленні двухсот тысяч эмігрантаў з лагераў перамешчаных асобаў з Германіі. Працэдура фармальнасцяў перасялення значна спрасцілася. Дастаткова было, каб чалавек, які пражываў у ЗША, падпісаў пасведчанне, што бярэ на сябе ўсе пачатковыя клопаты, звязаныя з перасяленнем,— знайсці кватэру, сустрэць эмігрантаў.

Барыс Кіт ухапіўся за такую рэдкую магчымасць. На працягу кароткага часу ён выпісаў сотні пасведчанняў для беларусаў, пражываўшых тады ў Нямеччыне. Паколькі самому нельга было ўсе запрашэнні падпісваць, то гэта рабілі па ягонай просьбе іншыя жыхары Саўт-Рывера. Асабліва шмат Барысу Кіту ў такой міласэрнай справе дапамагалі два маладыя беларусы — Шаўроўскі і Філіповіч (абодва ўжо памерлі). Амаль штодзень Барысу Уладзіміравічу даводзілася ехаць у порт Нью-Йорка, каб сустракаць сваіх землякоў. Ягоная кватэра ў Саўт-Рыверы зрабілася перавалачным пунктам, пакуль не было знойдзена памяшканне (транзітка), дзе прыбыўшыя беларусы жылі пэўны час: шукалі сабе патрэбную кватэру альбо дом, працу пры дзейснай дапамозе Барыса Кіта.

Дарэчы, насылаў ён запрашэнне Хведару Ільяшэвічу — беларускаму паэту, літаратару, рэдактару беларускай газеты ў Беластоку, свайму добраму і даўняму знаёмаму. Яны разам некалі працавалі ў Віленскай беларускай гімназіі, Хведар Ільяшэвіч выкладаў беларускую мову і літаратуру. І калі ў сям'і Ільяшэвічаў нарадзілася дачка Марыля, то Барыс Кіт стаў яе хросным бацькам. Але, на вялікі жаль, у

той дзень, як прыйшло запрашэнне, Хведар Ільяшэвіч загінуў у аўтамабільнай катастрофе. Яго сям'я засталася ў Польшчы. Дачка Марыля жыве ў Шчэціне, стала доктарам неўралогіі, яе муж — Кшыштаф Марліч — прафесар медыцыны, саветнік прэзідэнта Польшчы ў гэтай галіне, мае ўласную клініку. І па сённяшні дзень Барыс Кіт падтрымлівае цесныя сувязі з сям'ёй Марылі Марліч, часта бывае ў Шчэціне, як і Марлічы наведваюць яго ў Франкфурце-на-Майне.

Выпісаў Барыс Кіт у Амерыку настаўніка Вадэйку, былога дырэктара гімназіі ў Баранавічах, хірурга Шчорса, якога потым выбралі віцэ-прэзідэнтам амерыканскага медыцынскага таварыства, кампазітара Міколу Куліковіча, але той прыслаў ліст падзякі і, прыехаўшы ў Амерыку, застаўся ў Нью-Йорку, святара Лапіцкага, які заснаваў беларускую праваслаўную царкву ў Саўт-Рыверы, настаўнікаў Вольгу Пазняк-Сяднёву, сваю былую вучаніцу па Віленскай беларускай гімназіі, Дарафейчыка (дзед фізіка В. Зарэцкага з Беларусі, які цяпер жыве ў Германіі), Святаслава Каўша, таксама свайго вучня з Віленскай гімназіі, які ў 1949 г. быў кіраўніком беларускага лагеру перамешчаных асобаў у Ватэнштэце (Германія). Тут было добра арганізавана беларускае жыццё, выдавалася газета, якую рэдагавалі Хведар Ільяшэвіч і Аляксандр Гатковіч (цяпер жыве ў Англіі), працавала беларуская гімназія імя Янкі Купалы. Па прыездзе ў Амерыку С. Коўш актыўна займаўся беларускімі справамі: стаў адным з заснавальнікаў беларускай царквы Ефрасінні Полацкай у Саўт-Рыверы і беларускім святаром, уваходзіў у рэдкалегію часопіса «Беларуская думка», пэўны час быў старшынёй Беларуска-Амерыканскага Дапамогавага Камітэта. Немагчыма пералічыць усіх тых беларусаў, каму Барыс Кіт дапамог пераехаць з лагераў перамешчаных асобаў у Амерыку. Аднак не так проста і лёгка было эмігрантам, якія не валодалі мовай краіны пражывання, атрымаць працу. Барыс Кіт і тут дапамагаў, чым мог. Ён, ведаючы французскую і нямецкую мовы, даволі хутка авалодаў англійскай мовай і дзякуючы таму, што ў Віленскім універсітэце студыяваў фізіку і хімію, а ў Мюнхене некаторы час навучаўся медыцыне, атрымаў уплывовую пасаду ў фармацэўтычнай фірме. Гэта давала яму магчымасць уладкоўваць многіх землякоў на працу ў розныя яе аддзелы. (Некаторы час тут, напрыклад, працаваў вядомы беларускі пісьменнік Юрка Віцьбіч.)

Ужо ўладкаваныя беларускія эмігранты ў сваю чаргу выпісвалі з Нямеччыны родных і знаёмых. Колькасць беларусаў хутка павялічылася. Многія пасяляліся ў суседнім з Саўт-Рыверам Нью-Брансвіку або Пасэйку, ці ехалі ў Нью-Йорк. Так, «дзякуючы намаганням Барыса Кіта ў Саўт-Рывеы паўстала найвялікшая сёння беларуская калонія ў

ЗША» (Уладзімір Брылеўскі. «70-годдзе прафесара Барыса Кіта», газета «Беларус» 276, 1980 г.). Вітаўт Кіпель у сваёй кнізе «Беларусы ў ЗША», якая выйшла ў Мінску (1993), таксама адзначае ролю Барыса Кіта — заснавальніка першай беларускай калоніі ў ЗША ў пасляваенныя гады: «Іншыя беларусы, якія прыбылі ў Злучаныя Штаты неўзабаве пасля вайны, як прыкладам, д-р Барыс Кіт, не толькі арганізавалі дзейнае кола людзей, якія маглі падрыхтаваць неабходныя паперы імігрантам, але й запатрабавалі першыя паваенныя арганізацыі ў беларускіх асяродках. Дзейнасць гэтых пачынальнікаў распачала ланцуговую рэакцыю. Тыя, хто прыбылі крыху пазней, знаходзілі новых спонсараў і арганізацыі, якія аблягчалі пераезд у Амерыку новым беларускім імігрантам. Працэс гэты набіраў размах у канцы 1948 — пачатку 1949 году».

Каб прыдаць больш арганізаваную форму беларускаму руху ў ЗША, быў створаны Беларуска-Амерыканскі Дапамогавы Камітэт, і Барыс Кіт стаў адным з першых яго старшыняў. Вось якую інфармацыю дае пра дзейнасць гэтага камітэта ў сваёй кнізе Вітаўт Кіпель: «...Арганізацыя была зарэгістраваная ў Олбані, штат Нью-Йорк, пад назовам «Злучаны Беларуска-Амерыканскі Дапамогавы Камітэт» 8 лістапада 1948 года.

Мэтаю арганізацыі было дапамагаць беларусам у працэсе эміграцыі і. ўсталявання ў Злучаных Штатах. Камітэт шукаў спонсараў для імігрантаў і вёў актыўную кампанію ў справе гуртавання новапрыбыўшых суродзічаў. Пастулова арганізацыя пачала сацыяльную, культурную і палітычную дзейнасць — ладзіла літаратурныя вечарыны, лекцыі ангельскае мовы, дапамагала шукаць працу, а таксама заснавала перыядычны друк: часопісы «Беларус у Амерыцы», «Беларускае слова ў Амерыцы» і газету «Беларуская трыбуна». Гэта былі першыя паваенныя беларускамоўныя перыёдыкі ў Злучаных Штатах Амерыкі. Камітэт заснаваў аддзелы ў Пасэйку і Саўт-Рыверы, штат Нью-Джэрсі, Норт-Холівудзе, штат Каліфорнія, у Нью-Йорку.

Старшынямі камітэту былі д-р Іван Ермачэнка (1948-1949), д-р Барыс Кіт (1949-1950), д-р Мікола Шчорс (1950-1951), а. Мікалай Лапіцкі (1951-1976), а. Святаслаў Коўш (1976-1986), а. Мечыслаў Брынкевіч (ад 1988 году).

Злучаны Беларуска-Амерыканскі Дапамогавы Камітэт працягвае сваю дзейнасць і сёння. Ён набыў друкарскае абсталяванне і ад 1960 году дапамагае ў друку гадавога перыядычнага выдання «Беларуская думка». Камітэт вядзе шырокую сацыяльную, культурную і адукацыйную дзейнасць, а таксама ў неабходных выпадках выказвае беларускія палітычныя погляды і патрэбы».

Барысу Кіту ў ягонай дзейнасці арганізатара і заснавальніка беларускай калоніі шмат у чым дапамагалі ўкраінцы. Яны часта выступалі як беларусы, асабліва на першым часе, калі беларусы яшчэ не паспелі прыехаць у Амерыку. Барыс Кіт умеў ладзіць з рознымі людзьмі, для яго была важнай духоўная, унутраная сутнасць чалавека, а не нацыянальнасць ці палітычныя погляды. І таму, калі ў Саўт-Рывер пачалі прыязджаць беларусы розных палітычных напрамкаў, ён усё ж меў надзею, што можа тут, у чужой краіне, яны аб'яднаюцца, будуць разам. На жаль, чым больш іх прыязджала, тым большыя пачыналіся спрэчкі, разыходжанні. Яднання не атрымлівалася, і Барыс Кіт у поўным расчараванні і з іншых прычынаў вырашыў пакінуць Саўт-Рывер і пераехаць у Лос-Анжэлес, Каліфорнія (1950).

У Лос-Анжэлесе ён спыніўся ў знаёмых палякаў, якія некалі жылі ў лагеры перамешчаных асобаў у нямецкім горадзе Ватэнштэце, дзе ў асноўным знаходзіліся беларусы. Дарэчы, жонка гэтага паляка была беларускай, сястру якой Барыс Кіт некалі таксама выпісваў у Амерыку. Яна і папрасіла яго наведаць яе родзічаў Міцісаў у Лос-Анжэлесе, гасціннасцю якіх Барыс Кіт і карыстаўся на першым часе па прыездзе ў гэты незнаёмы амерыканскі горад. Тут ён пачаў шукаць працу ў галіне фармацэўтычнай хіміі, вопыт якой ён здабыў у Саўт-Рыверы. Але, на жаль, тут фармацэўтычная індустрыя не была так развіта, і Барысу Кіту ўдалося ўладзіцца на фабрыку, якая выпускала тэлеапараты. Гэта была цяжкая і вельмі небяспечная праца. У хуткім часе ён перайшоў у хімічную лабараторыю доктара Вілярда, якая знаходзілася ў Галівудзе, на адказную пасаду кантрольнага хіміка. Пасля двух месяцаў прыватнае бюро па працаўладкаванню знайшло яму работу кантрольнага хіміка па вытворчасці лекаў, галоўным чынам вітамінаў, дзе ягоным непасрэдным начальнікам стаў Дан Эткінс — выдатны арганізатар хімічнай індустрыі ў Каліфорніі. У іх з Барысам Кітам склаліся добрыя адносіны, яны пасябравалі сем'ямі, і пазней Дан Эткінс з жонкай не раз прыязджаў да Барыса Кіта ў госці і ў Вашынгтон, і ў Франкфурт-на-Майне.

У хімічнай фірме Дана Эткінса Барыс Кіт працаваў 3 гады (1951-1953), а з 1953 г. Дан Эткінс, заснаваўшы новую фірму, забраў з сабой Барыса Кіта і да 1956 года працягвалася яго адносна спакойнае, матэрыяльна забяспечанае жыццё ў Лос-Анжэлесе. Адначасна Барыс Уладзіміравіч пачаў засноўваць беларускі рух у Каліфорніі.

А пачалося ўсё з асабістага свята, сямейнай урачыстасці. У той самы дзень, як Ніна нарадзіла другога сына (Віктара), Барыс Уладзіміравіч, ідучы ад яе са шпіталя, заглянуў у склеп, дзе гаспадаром быў украінец Мікола Новак. Разгаварыліся, пазнаёміліся, адзначылі нара-

джэнне новага чалавека і вырашылі разам рабіць беларуска-украінскую справу. Барыс Уладзіміравіч пачаў хадзіць на ўкраінскія сходы, выступаць з прамовамі ад імя беларусаў. Прыехаў у Каліфорнію Чэслаў Найдзюк, юрыст па адукацыі, былы вучань Барыса Кіта па Віленскай беларускай гімназіі, які таксама эмігрыраваў у Амерыку. Ён брат Язэпа Найдзюка — аўтара падручніка па беларускай гісторыі і вядомага дзеяча беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі (Найдзюкі родам з Ваўкавышчыны, вёска Рэпля), рэдактара часопіса «Шлях моладзі» (1929-1939). (Дарэчы, кніга Язэпа Найдзюка «Беларусь учора і сёння» перавыдадзена выдавецтвам «Навука і тэхніка» ў Мінску, 1993 г.)

Чэслаў Найдзюк добра валодаў літоўскай мовай і выступаў перад літоўцамі, зямляцтвы якіх былі ўжо даволі моцнымі і распаўсюджанымі ў Каліфорніі, на іх роднай мове. І беларусы, і літоўцы, і ўкраінцы чуліся тут братамі, іх аб'ядноўвала любоў да пакінутай блізкай і такой далёкай цяпер радзімы.

Барыс Кіт і Чэслаў Найдзюк узялі на сябе ролю беларускага прадстаўніцтва на агульных сходах і сустрэчах з літоўцамі і ўкраінцамі, вялі актыўную работу па згуртаванню беларусаў, якія прыбывалі ў Каліфорнію найчасцей па запрашэнню Барыса Кіта. Пасля Чэслава Найдзюка з Саўт-Рыверу ў Лос-Анжэлес прыехала сям'я беларускіх артыстаў Мяленцьевых. Бацька — Алімп Мяленцьеў — піяніст і кампазітар, маці — Марыя Мяленцьева — спявачка, іх дачка Нона — танцоўшчыца. Да вайны яны былі артыстамі Беларускага Дзяржаўнага Акадэмічнага тэатра оперы і балета. Падчас вайны былі вывезены ў Германію, трапілі ў амерыканскую зону акупацыі. У 1950 г. Барыс Кіт выпісаў іх у Саўт-Рывер, а пасля ў Каліфорнію, дзе разам з Міколам Новакам стараўся ўладкаваць іх у Галівуд, але гэтага не атрымалася. Меленц'евы шмат дапамагалі ў станаўленні беларускай справы, часта выступалі з праграмай беларускіх канцэртаў перад украінцамі і літоўцамі. Спонсарам іх канцэртаў часта быў Інстытут міжнародных спраў у Лос-Анжэлесе. Барыс Уладзіміравіч памятае праграму аднаго з канцэртаў Мяленцьевых, перад якім яму давялося выступаць з дакладам «Беларускі народ у эміграцыі за незалежнасць». У далёкай Каліфорніі гучалі шчымлівыя мелодыі любай Бацькаўшчыны: «Я табун сцерагу», «Вол бушуе — вясну чуе». «Хлопец пашанькупахае», «Васількі», «На хадзі ты каля хаты», «Лявоніха», «Люблю наш край...» На вачах прысутных блішчалі слёзы, сэрцы чуйна адгукаліся на знаёмыя з дзяцінства кранальныя народныя песні роднага краю... Такія канцэрты мелі моцнае эмацыянальнае ўздзеянне на людзей, садзейнічалі цеснаму згуртаванню землякоў. Беларуская справа ў Каліфорніі працяг-

вала жыць і пасля ад'езду Барыса Кіта ў Вашынгтон, тут заставаліся Мяленцьевы, Чэслаў Найдзюк, многія іншыя беларусы. Гэта была першая ў Каліфорніі беларуская хваля эміграцыі, якую аб'яднаў і стварыў Барыс Кіт дзеля прысутнасці беларусаў і ў гэтай частцы Амерыкі.

Цікавыя ўспаміны пра беларускія пачаткі ў Лос-Анжэлесе напісаў Чэслаў Найдзюк: «Да Лос-Анжэлеса прыехаў я 13 кастрычніка 1950 г. на запросіны свайго вучыцеля і кляснага настаўніка Віленскай беларускай гімназіі праф. Барыса Кіта. Будучы тады яшчэ нежанатым і без сям'і, стаў я жыць у доме сям'і Барыса Кіта ў Норт Галівудзе. Гэта аблягчала нам супольныя высілкі для кантактаў і сувязяў як з бліжэйшымі суродзічамі, так і з іншанацыянальнымі арганізацыямі. З свайго ранейшага пражывання ў штаце Нью-Джэрсі мы мелі паўнамоцтвы ад беларускіх арганізацыяў прадстаўляць іх у Лос-Анжэлесе і прапагандаваць беларускасць. 9 снежня 1950 г. у доме сп-ва Кітоў быў заснаваны Аддзел Злучанага Беларуска-Амерыканскага Дапамогавага Камітэту ў складзе кіраўніцтва: старшыня — Ч. Найдзюк, заступнік — А. Міцю, сакратар — Н. Кіт, скарбнік Л. Стаднікаў. Ад гэтага часу вялася перапіска з Галоўнай Управай К-ту ў Саўт-Рыверы. Утрымоўваліся кантакты і з Беларускім Кангрэсовым Камітэтам Амерыкі, БНР і БЦР. У гэтым часе ў Лос-Анжэлесе былі ўжо добра арганізаваныя і актыўныя нашыя нацыянальныя суседзі. Яны мелі свае нацыянальныя касцёлы і цэрквы. Трэба было навязаць з імі сувязь і пазнаёміцца бліжэй. Адбыліся з імі шматлікія спатканні на вечарах і ўрачыстасцях, з прывітаннямі ад імя беларусаў, як, напр., у украінцаў і летувісаў.

У летувісаў на ўрачыстасці я сказаў прывітаньне нават па-летувіску. Персанальныя спатканні далі нагоду пазнаёміцца з ведамымі дзеячамі, як праф. Біржышкам, ген. Раштыкісам, Міколам Новакам. У украінцаў выступалі і праф. Кіт, і маг. Ч. Найдзюк. На асаблівы ўспамін заслугоўвае піянерскі выступ у тэлевізіі сп-ні Ніны Кіт з паказам беларускага халадніка. Дапамаглі сваім суродзічам у розных патрэбах. Гасьцілі ведамага сьпевака Паўла Пракапені ў доме сп-ва Кітоў 11 сакавіка 1951 г. і былі на ягоным канцэрце ў Лос-Анжэлесе 26 сакавіка 1951 г. Стала падавалі да беларускага друку хроніку з жыцця беларусаў у Каліфорніі, як да газэтаў «Бацькаўшчына», «Беларус», «Беларуская трыбуна», «Царкоўны Сьветас», «Божым шляхам» і інш. Падтрымоўвалі іх падпіскай і распаўсюджваньнем. Нават распаўсюджвалі беларускія велікодныя і інш. карткі. Пісалі прывітаньні беларускім арганізацыям на ўрачыстае адзначэньне ўгодкаў Акту 25 Сакавіка і Слуцкага паўстаньня. Пісалі і інфармавалі амерыканскія ўстановы аб беларускіх патрэбах, напр., 9 чэрвеня 1952 г. выслалі

сенатарам і паслам разам 43 лісты адносна праекту закону аб эміграцыі ахвяраў вайны. З часам адносіны мяняліся, прыбывалі новыя суродзічы, а некаторыя пакідалі Лос-Анжэлес, як і сям'я Кітоў. Напісаць успаміны за ўвесь час нялёгка, вымагае шмат часу, якога стала не хапае на ўсё новыя патрэбы. Некаму прыйдзецца, раней ці пазьней, падсумаваць, і цяпер ужо без страху перадаць да публічнага ведама ў Беларусі, тым больш, што многія адышлі з гэтага свету.

Чэслаў Найдзюк».

Пра першапачатковыя паваенныя беларускія арганізацыі ў ЗША піша і Іван Касяк у раздзеле «Другая сусветная вайна і паваенны час» (кніга «Беларусь учора і сяньня», с. 354): «У ЗША ў 1948 годзе была заснаваная новымі беларускімі эмігрантамі дапамогавая арганізацыя. Яна была выклікана патрэбай несьці дапамогу беларусам змураваць з Нямеччыны ў краіны сталага пасялення. Новапрыбылыя эмігранты М. Філіповіч, І. Ермачэнка, Б. Кіт, В. Чабатарэвіч і іншыя заснавалі Злучаны Беларуска-Амэрыканскі Дапамогавы Камітэт, для дзейнасьці якога атрымалі чартэр. Цэнтраля камітэту была ў Нью-Йорку, а аддзелы хутка паўсталі ў Саўт-Рыверы, Пасэйку (штат Нью-Джэрсі), а пазней і ў Галівудзе (штат Каліфорнія). Мэтамі арганізацыі былі: матэр'яльная дапамога беларусам у Амэрыцы і ў іншых краінах, дапамога беларусам-бежанцам (ДП) эміграваць з Нямеччыны ў Амэрыку, утрымліваньне ў сваім асяроддзі беларускай культурнай спадчыны, захады перад амэрыканскім урадам у беларускай нацыянальнай справе, утрымліваць сувязі з іншымі нацыянальнымі прадстаўніцтвамі ў Амэрыцы...»

Барыс Кіт, як сапраўдны патрыёт, аддаў шмат сіл і часу арганізацыі беларускіх зямляцтваў у ЗША. Аднак не гэта дзейнасць з другой паловы 50-х гадоў становіцца галоўнай для яго. Нядоўгі перыяд жыцця ў Саўт-Рыверы, пераезд у Лос-Анжэлес былі своеасаблівым трамплінам перад яго ўзыходжаннем на вяршыні навуковай кар'еры. У вольным свеце кожнаму чалавеку, вядома ж, напачатку неабходна з'арыентавацца, агледзецца, зразумець, на што ён здольны і чаго можа дасягнуць. Аказалася, што талент, веды, адукацыя Барыса Кіта, атрыманыя на Беларусі, — моцны, надзейны грунт, які можа даць добры плён. Тут жа, у Лос-Анжэлесе, пачынаецца касмічная эра ў навуковай дзейнасці Барыса Кіта, калі ён уладкоўваецца на працу ў славутую фірму «North American Aviation» (цяпер «Rockwell International»), якая стварала амаль усе найбольш выдатныя амерыканскія касмічныя і аэранаўтычныя праекты, пачынаючы ад першых стратэгічных, інтэркантынентальных ракетных сістэм, як «Navaho», праз найбольш бліскучы праект XX стагоддзя «Apollo» (па-

дарожжа чалавека на Месяц) да сённяшняга чаўночнага касмічнага карабля «Shuttle». Трэба адзначыць, што гэта фірма мела аддзел аэранаўтыкі, дзе былі распрацаваны такія самалёты, як Р-54, што дапамаглі перамагчы гітлераўскую Германію, скончыць другую сусветную вайну, і дзе ствараліся праекты сучасных ракетных самалётаў. Лос-Анжэлес наогул тады быў цэнтрам ракетнай прамысловасці, многія фірмы працавалі ў накірунку касмічных праектаў, было шмат навуковых устаноў. Фірма, дзе працаваў Барыс Кіт, мела шматлікія аддзелы: касмічных даследаванняў, атамных распрацовак, аэранаўтыкі, развіцця камп'ютэрнай галіны, ракетных матораў і інш.

Барыс Кіт адразу трапіў у сапраўдную навуковую атмасферу, і працаваў на працягу 25 гадоў у касмічных даследаваннях ЗША. У якасці матэматыка і сістэмнага аналітыка ўдзельнічаў у некалькіх важнейшых праграмах развіцця міжкантынентальных ракетных сістэм. Але пачынаў ён са знаёмства з працай высокаінтэлектуальных людзей, для якіх былі створаны ідэальныя ўмовы, вывучаў навуковую літаратуру, уваходзіў у кола іх даследаванняў. Яго незвычайна захапляла, узвышала адчуванне, што ён належаў да вышэйшай амерыканскай навуковай эліты.

Кіраўніцтва фірмы, улічыўшы практычны вопыт Барыса Кіта як хіміка ў дадатак да прафесійнай адукацыі фізіка і матэматыка, даручыла яму даследаваць магчымасць ужывання плыўкага вадароду для сістэмы «Navaho». Гэта былі тыя піянерскія часы, калі ўжыванне плыўкага вадароду належала да рэчаў, пра якія можна было толькі марыць. Найбольшай цяжкасцю ў гэтых даследаваннях было тое, што плыўкі вадарод хутка выпарваўся: ён меў вельмі нізкую тэмпературу, а па-другое, ён заўсёды з'яўляўся ў дзвюх формах — арта-вадарод і пара-вадарод. Арта-форма сама пераходзіла ў пара-форму, выдзяляючы вялікую колькасць цеплыні. Уваходзячы ў гэтыя праблемы, Барыс Кіт адчуваў сябе тут пачынальнікам. Ён цалкам аддаўся працы, праседжваў у бібліятэках, перачытваў навуковую літаратуру, правёў вялікую колькасць аналізаў і доследаў. На гэтай аснове ён напісаў рэферат, выступіў з навуковым дакладам, які выклікаў агульную зацікаўленасць. Папярэднія вынікі былі добрымі, абнадзейваючымі, і таму вырашана было працягваць даследаванні якасцей плыўкага вадароду як будучага ракетнага паліва. Гэта была першая навуковая праца Барыса Кіта, якая мела значны ўплыў на пазнейшыя даследаванні аб плыўкім вадародзе, што заахвоціла яго, як першапраходца, далей займацца праблемамі ракетнага паліва, якое цяпер стандартна ўжываецца ў вялікіх ракетных сістэмах «Apollo», «Shuttle». Акрылены навуковымі дасягненнямі ў такой важнай галіне, Барыс Кіт

вырашыў напісаць першы ў гісторыі навукі падручнік аб усіх магчымых палівах для ракетных сістэм. Фірма поўнасцю яго падтрымлівала ў гэтых пачынаннях. Кніга выйшла ў 1960 годзе з прадмовай славутага вучонага, стваральніка сучаснай аэрадынамікі Тэадора фон Кармана, з якім Барыс Кіт быў асабіста добра знаёмы. Кніга
была выдадзена ў прэстыжным выдавецтве «Macinillan Company» ў Нью-Йорку пад назвай: «Rocket Ropellant Handbook». Яна хутка разышлася па ўсім свеце разам з імем аўтара — Барыса Кіта. Мела шмат станоўчых рэцэнзій, у якіх адзначалася важнасць падручніка як першай з'явы ў гэтай галіне, тым больш, што благаславіў яго ў навуковы ўжытак сам Тэадор фон Карман. Генерацыі ракетных інжынераў карысталіся гэтай кнігай, яе і сёння выкарыстоўваюць як неабходны дапаможнік тыя, хто займаецца праблемамі касмічных даследаванняў. У 1962 годзе ў Савецкім Саюзе выдадзены падручнік Я. М. Паушкіна «Химия реактивных топлив» у выдавецтве Акадэміі навук СССР, у якім ёсць спасылкі на працы Барыса Кіта, на яго грунтоўны падручнік. Пазней, у 1987 годзе, у часопісе «Astronautik» быў апублікаваны артыкул Барыса Кіта «Мае асабістыя ўспаміны пра Тэадора фон Кармана», дзе расказваецца не толькі пра жыццёвы шлях і навуковую дзейнасць выдатнага вучонага, сустрэчы і супрацоўніцтва Барыса Кіта з фон Карманам, але і пра той час, калі вяліся даследаванні ракетнага паліва, пісалася кніга па гэтых праблемах. Асновай артыкула з'явіўся даклад, з якім Барыс Кіт выступіў у Брайтане (Англія, 1987 г.) на астранаўтычным кангрэсе. Вось невялікія ўрыўкі з гэтых успамінаў: «Я пазнаёміўся з доктарам Тэадорам фон Карманам у 1958 годзе на астранаўтычным кангрэсе ў Амстэрдаме і быў уражаны даступнасцю, прастатой гэтага вялікага чалавека... Ён па-сяброўску, уважліва ставіўся да кожнага, хто з ім знаёміўся, цікавіўся праблемамі, якімі той або іншы вучоны займаўся, уваходзіў у асабістае жыццё, не шкадаваў часу для людзей... Перш чым напісаць прадмову да маёй кнігі, ён захацеў прачытаць яе і папрасіў прынесці на наступны дзень у гатэль. У прызначаны тэрмін я прыехаў да яго і ўбачыў у пакоях доктара Кармана шмат журналістаў і вучоных. Гэта быў час, калі Савецкі Саюз запусціў свой першы штучны спадарожнік Зямлі і ўсе задавалі славутаму вучонаму бясконцыя пытанні. Убачыўшы мяне, доктар Карман спыніў гутарку з журналістамі і пачаў роспыты пра маю кнігу, дзейнасць у даследаванні космасу. Ён быў задаволены, што выданне маёй навуковай работы падтрымлівае «North American Aviation», фірма, дзе я быў на службе, і тым, што я добра ведаў яго вучня Эдварда ван Дрыеста — выдатнага вучонага-даследчыка.

Пасля Першага астранаўтычнага кангрэса ў Амстэрдаме я вярнуўся ў Вашынгтон, дзе кіраваў важным даследчым праектам для міністэрства паветраных сіл ЗША, Я шмат часу праводзіў у бібліятэцы кангрэса ў Вашынгтоне. І доктар Карман, ведаючы гэта, папрасіў мяне рабіць выпіскі з тых публікацый, якія яго цікавілі. У хуткім часе доктар Карман сам прыехаў у Вашынгтон з лекцыямі, патэлефанаваў мне і папрасіў прынесці выпіскі па ракетнаму паліву, якія яму спатрэбіліся для выступлення ў кангрэсе. Ён запрасіў мяне да сябе, каб параіцца па гэтых пытаннях, але я выказаў здзіўленне, чаму менавіта мяне, а не іншага спецыяліста ў гэтай галіне, на што атрымаў адказ: «Усё ў парадку, доктар Кіт, я прачытаў вашу кнігу па ракетнаму паліву вельмі ўважліва, напісаў прадмову да яе і лічу вашу кнігу самым лепшым даведнікам па гэтых праблемах. Яна задавальняе мяне цалкам. Між іншым, доктар Кіт, я сёння яшчэ не снедаў. Ці павінен я і для вас паставіць прыбор? Што б вы хацелі з'есці?»

Я адказаў згодай і хутка быў у гатэлі. Доктар Карман ішоў мне насустрач са сваёй спальні ў халаце і быў босы. Цяжка было паверыць, што гэты маленькі чалавек стаў заснавальнікам сучаснай аэрадынамікі і звышгукавой эпохі. Мы елі сняданак і абмяркоўвалі пытанні, патрэбныя доктару Карману для даклада ў кангрэсе ЗША.

На наступны дзень у час вячэры я спытаў у Кармана, ці шмат пытанняў было пасля яго даклада ў членаў кангрэса. Ён паглядзеў на мяне і, усміхаючыся, адказаў: «Барыс, сенатары ў мяне пыталіся толькі пра розніцу паміж плыўкім і цвёрдым ракетным палівам». Пазней я часта сустракаўся з доктарам Карманам у Вашынгтоне і нават аднойчы ўладкоўваў яго сваякоў, якія прыехалі з Венгрыі. Сяброўскія, сардэчныя адносіны ўсталяваліся паміж намі. У час маіх паездак у Еўропу я наведваў фон Кармана ў Парыжы (ён працаваў старшынёй камітэта па астранаўтыцы пры НАТО, прасіў ацаніць новыя астранаўтычныя ідэі маіх сяброў і супрацоўнікаў па «North American Aviation» («Rockwell International»), выказаць меркаванні.

У канцы свайго жыцця доктар Карман вельмі цікавіўся гісторыяй астранаўтыкі. У размовах, дакладах, выступленнях ён пастаянна згадваў эпізоды з гісторыі ці літаратуры. Асабліва яму падабаліся кнігі Жуля Верна і прадбачанні пісьменніка-фантаста тэхнічных адкрыццяў (падводнай лодкі, тэлебачання, палёту на Месяц). У 1962 годзе я слухаў даклад доктара Кармана ў Вашынгтоне на Кангрэсе міжнароднага геаграфічнага года. Ён выказваў захапленне апісаннем палёту на Месяц Жуля Верна, які ўказаў нават месца запуску ракеты — пункт 27°7' паўночнай шыраты і 77°3' заходняй даўжыні (па Грынвічу), дзе сёння блізка знаходзіцца цэнтр мыса Кенэдзі, адкуль за-

пускаюцца амерыканскія касмічныя караблі. На жаль, доктар Карман не змог парадавацца паспяховаму палёту амерыканцаў на Месяц. Ён памёр на 6 гадоў раней гэтай знамянальнай падзеі.

Акрамя Жуля Верна фон Карман цікавіўся Гарэтам П. Сэрвісам, амерыканскім пісьменнікам XIX стагоддзя, які таксама пісаў фантастычныя творы. Кармэн здзіўляў сваіх слухачоў выключнай памяццю і веданнем мастацкай літаратуры. Тут я дапамагаў яму ў пошуках старых часопісаў і газет, дзе калісьці публікаваліся творы Гарэта П. Сэрвіса. Я знайшоў газету «Бостон пост», амаль спарахнелую ад часу, у якой была надрукавана аповесць «Падарожжа на Марс», у бібліятэцы кангрэса, зрабіў копію і прынёс доктару Карману. Ён быў проста шчаслівы, атрымаўшы гэту знаходку, выкарыстаў яе для пацвярджэння сваіх некаторых навуковых здагадак і гіпотэз, а мне быў вельмі ўдзячны за мой, як ён лічыў, уклад у яго даследаванні. Гэта быў апошні раз, калі я бачыў доктара фон Кармана — цудоўнага чалавека, выдатнага вучонага і сябра». (Dr. phil. Boris Kit. «Meine personlichen Erinnerungen an Theodore von Karman». Astronautik. Heft 1, 1987. s.17).

Дарэчы, калі Тэадор фон Карман памёр на 81 годзе жыцця, прэзідэнт Кенэдзі выказаў спачуванне блізкім і шкадаванне, што адышоў адзін з найвялікшых гуманістаў і вучоных свету. Пахаваны фон Карман у германскім горадзе Аахене, дзе ён заснаваў інстытут аэрадынамікі.

У 1957 годзе адбылася гістарычная падзея сусветнага значэння — Савецкі Саюз ажыццявіў запуск першага спадарожніка Зямлі. Гэта ўскалыхнула ўвесь свет. Многія вучоныя, адзначаючы поспех савецкіх длслед чыкаў у галіне касманаўтыкі, пісалі: «Вырашыць паспяхова такую складаную задачу, як запуск першага спадарожніка, магла краіна, якая мае немалую колькасць спецыялістаў і вялікі навукова-тэхнічны патэнцыял...» І далей: «Чалавецтва ўдзячнае Каралеву за здзейсненае. Атрымаць прызнанне чалавецтва — значыць быць выдатным дзеячам навукі і культуры» (Герман Обэрт — адзін з піянераў ракетнай тэхнікі, удзельнік стварэння першага амерыканскага спадарожніка, з 1958 года жыў у ФРГ). «Калі рускія запусцілі такі спадарожнік — 83,6 кілаграма, значыць яны могуць падняць і больш цяжкі». (Джозеф Каплан — узначальваў нацыянальны камітэт ЗША па правядзенню міжнародных геафізічных даследаванняў). «Чалавек больш не прыкаваны да сваёй планеты» (Фрэдэрык Жоліо-Кюры — французскі фізік). «Савецкія вучоныя шмат зрабілі для развіцця сусветнай касманаўтыкі, далі моцны імпульс яе далейшаму імкліваму руху наперад» (Барыс Кіт). Барыс Уладзіміравіч атрымаў у падарунак

кнігу Германа Обэрта «Шлях да падарожжа ў космас» ад заснавальніка і старшыні Нямецкага астранаўтычнага таварыства імя Германа Обэрта Густава Штааца, з якім ён знаёмы больш як 30 гадоў і мае вялікую перапіску на нямецкай мове. Гэту кнігу Густаў Штаац падарыў Барысу Кіту на 80-годдзе з надпісам: «Я цешуся, што мы разам рабілі вялікую справу для сусветнага астранаўтычнага руху». Выказваліся таксама віншаванні і падзяка ад Нямецкага астранаўтычнага таварыства за ўклад у развіццё астранаўтыкі.

Герман Обэрт — гігант у сусветнай касмічнай тэхніцы, адзін з найвялікшых першапраходцаў астранаўтыкі. Яго імем было названа астранаўтычнае таварыства ў Германіі, Барыс Кіт з'яўляецца даўгалетнім сябрам і членам Дырэктарату, узнагароджаны Залатым медалём Германа Обэрта. Ён асабіста ведаў Германа Обэрта, сустракаў яго на сходах гэтага таварыства. Аднойчы Барыс Уладзіміравіч з Тамарай падышлі да Германа Обэрта на адным з ягоных юбілеяў, павіншавалі і спыталі пра самаадчуванне. Герман Обэрт з сумам сказаў: «Усе яны мяне хваляць і віншуюць, але ніхто б з іх не хацеў быць на маім месцы». А было яму тады 90 гадоў (нар. у 1894 г.). На свеце былі яшчэ два вучоныя такога маштабу: рускі — Канстанцін Цыялкоўскі і амерыканец — Роберт Годард, аўтар многіх вынаходніцтваў у розных галінах ракетнай тэхнікі.

Незвычайна шырокі рэзананс ад запуску першага спадарожніка Зямлі ўспрымаўся ў свеце як вялікае дасягненне чалавечага розуму, выключнага таленту. Амерыканцы, уражаныя тым, што не яны першыя запусцілі спадарожнік, актывізавалі сваю дзейнасць у гэтым напрамку. Прэзідэнт Амерыкі паставіў задачу: апярэдзіць савецкіх вучоных у касмічных даследаваннях. Было паклікана да супрацоўніцтва шмат вучоных, ракетных экспертаў з усіх канцоў Амерыкі. І Барыс Кіт найлепш падышоў, бо працаваў у гэтай сістэме, да таго ж добра ведаў рускую мову. У 1958 годзе ён быў выкліканы з Лос-Анжэлеса ў Вашынгтон і пачаў працаваць у міністэрстве паветраных сіл ЗША, у аддзеле касманаўтыкі. У дадатак на маладога, перспектыўнага вучонага былі ўскладзены і абавязкі дзяржаўнага дарадчыка, эксперта па развіццю міжнароднай касманаўтыкі, галоўным чынам савецкай. Ён пачаў весці гэтыя сувязі ва ўласцівай яму памяркоўнай манеры добразычлівага стаўлення да людзей, тым больш, што валодаў незвычайнымі якасцямі характару — камунікабельнасцю, цярплівасцю, дыпламатычнасцю. Увесь час, будучы над палітыкай, ён не адчуваў ніякай варожасці да сваёй былой краіны, не быў нацыяналістам, спрыяў міралюбству, у душы захоўваў нязгасную любоў да Радзімы. Савецкі спадарожнік, можна сказаць, дапамог Барысу Кіту

выйсці на сусветную арбіту. У Вашынгтоне ён студыйцаў поспехі ў касманаўтыцы іншых краін, пісаў рэфераты, пачаў ездзіць на міжнародныя кангрэсы, выступаць з дакладамі. У гэты перыяд адбываецца мноства сустрэч і знаёмстваў Барыса Кіта са славутымі людзьмі. З Вернерам фон Браўнам — нямецкім вучоным (пачынаў навуковую дзейнасць у Германіі, пасля вайны ў Амерыцы працягваў распрацоўваць ракетную тэхніку), які з Тэадорам фон Карманам, Барыс Кіт упершыню сустрэўся на Міжнародным кангрэсе ў Амстэрдаме (1958), але больш блізка яны сышліся на Вашынгтонскім сусветным касмічным форуме. Калі Барыса Кіта прадстаўлялі Вернеру фон Браўну, той сказаў: «Доктар Кіт, вам не трэба другі раз прадстаўляцца, я ўжо знаёмы з вамі па вашых працах». І Карман, і Браўн, нягледзячы на сваю геніяльнасць, былі без комплексаў вялікасці, нішто чалавечае не было ім чужое. Вакол іх групаваліся таленавітыя людзі, якіх прыцягвалі не толькі гучныя імёны вядомых ва ўсім навуковым свеце вучоных, але і даступнасць, звычайнасць. Барыс Кіт, добра ведаючы напрамкі іх дзейнасці, адчуваў, што Тэадор фон Карман (1881-1963) больш вучоны (былы прафесар Гётынгенскага універсітэта, пачынаў сваю навуковую кар'еру ў Германіі, з прыходам Гітлера да ўлады эмігрываваў у ЗША. Напісаў шматлікія работы па самалёта- і ракетабудаванню, аэра-, гідра- і тэрмадынаміцы і інш.), тады як Вернер фон Браўн (1912-1977) больш адміністратар, арганізатар навукі. (Пачынаў як канструктар ракет, адзін з кіраўнікоў германскага ваенна-даследчага ракетнага цэнтра ў Пэнемюндзе, дзе была створана ракета А-4. У 1945 годзе эмігрываваў у ЗША. Тут пад яго кіраўніцтвам распрацаваны ракеты «Рэдстоўп», «Юпітэр», ракеты-носьбіты «Сатурн» (для касмічнага карабля «Apollo»). Пазней Барыс Кіт супрацоўнічаў з Браўнам і як вучоны, і як перакладчык у сустрэчах з рускімі і многімі іншымі вучонымі.

Барыс Уладзіміравіч добра ведае і здаўна знаходзіцца ў сяброўскіх адносінах з прафесарам Фрздэрыкам Ордвеем — аўтарам многіх кніг у галіне гісторыі астранаўтыкі, былым супрацоўнікам і сааўтарам прац Вернера фон Браўна. Фрэдэрык Ордвей — заснавальнік Міжнароднай федэрацыі астранаўтыкі ў 50-х гадах, а цяпер працуе ў міністэрстве энергіі ў Вашынгтоне начальнікам аддзела спецыяльных праектаў, з'яўляецца старшынёй секцыі гісторыі Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі, дзе Барыс Кіт часта выступаў з навуковымі рэфератамі. Фрэдэрык Ордвей — вядомы вучоны ў Амерыцы і ва ўсім свеце — рэкамендаваў Барыса Кіта акадэмікам у Міжнародную акадэмію астранаўтыкі. Гэта акадэмія была заснавана напачатку 60-х гадоў Тэадорам фон Карманам. Яе мэта — аб'яднаць найвыдат-

нейшых вучоных свету, якія займаюцца праблемамі астранаўтыкі і разам выпрацоўваць будучыя астранаўтычныя праекты (падарожжа на Месяц, Марс і г. д.), спалучаць намаганні вучоных усяго свету ў гэтым напрамку.

Штогод акадэмія праводзіць астранаўтычныя кангрэсы, яе гадавыя сходы супадаюць з пасяджэннямі Міжнароднай астранаўтычнай федэрацыі, якія плануюцца ў розных сталіцах свету і буйных гарадах. У федэрацыю ўваходзяць усе, хто займаецца астранаўтыкай, а ў акадэмію выбіраюць тых, хто дасягнуў выдатных вынікаў, унёс значны ўклад у навуку. Найбольшая колькасць членаў Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі — вучоныя Амерыкі, якую ў акадэміі прадстаўляе і Барыс Кіт.

У 1960 годзе ў Рочэстэры (ЗША) адбыўся Міжнародны кангрэс фізікаў-ядзершчыкаў. У перыяд яго падрыхтоўкі Барысу Кіту патэлефанавалі з дзярждэпартаменту і прапанавалі стаць каардынатарам, кіраўніком групы пяцідзесяці вучоных, якія прыбылі на гэты кангрэс. Тут і адбылося яго першае знаёмства з Д. Блахінцавым, Н. Багалюбавым, А. Благанрававым, Г. Будкерам, В. Векслерам і іншымі вядомымі савецкімі акадэмікамі, знакамітымі талентамі, даследчыкамі ў галіне ядзернай фізікі і касмічных даследаванняў. З Германіі на кангрэс прыехаў Вернер Гейзенберг — стваральнік квантавай механікі, нобелеўскі лаўрэат, прыбыў амерыканскі фізік Роберт Опенгеймер — «бацька» першай атамнай бомбы, якая была створана пад яго кіраўніцтвам у ЗША.

Групу савецкіх вучоных Барыс Кіт суправаджаў па Амерыцы, знаёміў з яе экзотыкай, выдатнымі мясцінамі. Пабывалі яны і ў Каліфарнійскім універсітэце Берклі (прыгарад Сан-Францыска), які, дарэчы, мае каля 50 сваіх філіялаў ва ўсіх гарадах Каліфорніі. Універсітэт Берклі — цэнтр ядзерных даследаванняў усяго свету. На факультэце фізікі тады працавалі 17 нобелеўскіх лаўрэатаў. Многія з іх былі першаадкрывальнікамі новых хімічных элементаў, дапоўнілі табліцу Мендзялеева. Прафесары універсітэта запрашалі савецкіх вучоных на кактэйлі, навуковыя сустрэчы. Барыс Кіт быў у цэнтры гэтых сустрэч, перазнаёміўся з усімі нобелеўскімі лаўрэатамі. У дні паездак з рускай групай ён найбольш сышоўся з Д. І. Блахінцавым (1907-1979, фізік, дырэктар Інстытута ядзерных даследаванняў у Дубне, кіраўнік работ па стварэнню першай у свеце атамнай электрастанцыі. Напісаў шмат работ па квантавай механіцы, атамнай і ядзернай фізіцы, тэорыі ядзерных рэактараў, фізіцы элементарных часціц, метадалогіі фізікі).
Дзякуючы гэтым сустрэчам у Амерыцы Барыс Кіт становіцца вядомым чалавекам і ў асяроддзі савецкіх вучоных, тым больш, што

на аснове грунтоўнага вывучэння і асабістага ўдзелу ў развіцці і даследаванні міжнароднай касманаўтыкі, зацікаўленасці поспехамі савецкіх вучоных у гэтай галіне ён напісаў сваю другую кнігу «Гісторыя і сучасны стан савецкай астранаўтыкі», якая выйшла ў ! 964 годзе, у сааўтарстве з Фрэдэрыкам Ордвеем (атрымаў вышэйшую адукацыю ў Гарвардскім універсітэце і Сарбоне, падараваў Барысу Кіту шмат сваіх кніг з цёплымі, сяброўскімі прысвячэннямі). Кніга па гісторыі савецкай астранаўтыкі (600 старонак) стала неабходнай для тых, хто займаўся касмічнымі даследаваннямі, яна знаходзіцца ў многіх бібліятэках свету, у тым ліку ў бібліятэцы кангрэса, музеі астранаўтыкі ў Вашынгтоне. Пасля гэтага Барыс Кіт браў удзел у першых гістарычных перамовах паміж ЗША і СССР па супрацоўніцтву ў галіне касманаўтыкі, дзе зноў сустракаўся са знаёмымі вучонымі, якіх некалі курыраваў у Амерыцы, і пазней, калі дэлегацыі савецкіх вучоных самага рознага ўзроўню прыязджалі ў Амерыку ў рамках гэтага супрацоўніцтва, ён быў нязменным удзельнікам, дарадчыкам, кіраўніком-перакладчыкам навуковых перамоў і сустрэч.

У 1963 годзе Барыс Кіт пераходзіць на працу ў аддзел касманаўтыкі Міжнароднай карпарацыі тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі (International Telephone and Telegraph Corporation). Мэтай гэтай фірмы было даследаванне і пабудова сатэлітаў сувязі. Барыс Кіт стаў дарадчыкам прэзідэнта фірмы, шмат займаўся даследаваннем метадаў сувязі з Месяцам. Гэта быў перыяд падрыхтоўкі падарожжа амерыканцаў на Месяц. Тут для Барыса Уладзіміравіча з'явілася магчымасць больш засяродзіцца на абагульненні сваіх навуковых дасягненняў, напісанні артыкулаў у астранаўтычныя часопісы, дакладаў, з якімі выступаў на міжнародных кангрэсах касманаўтыкі.

У навуковым свеце Амерыкі існуе даўняя традыцыя — для ажыццяўлення вялікіх праектаў збіраць лепшыя сілы, ствараць часовыя калектывы даследчыкаў самага высокага прафесійнага ўзроўню. Аднак калі работа падыходзіць да завяршэння, многія вучоныя, выканаўшы сваю задачу, вымушаны шукаць іншае месца працы. Так здарылася з калектывамі, якія працавалі над запускам касмічных спадарожнікаў Зямлі. Але працягвалася работа па вынаходніцтву пілатуемых касмічных караблёў, падрыхтоўцы палёту на Месяц, і асноўны склад даследчыкаў працаваў у гэтым напрамку. Барысу Кіту не давялося шукаць іншага занятку, яму была даручана матэматычная распрацоўка сродкаў сувязі ў гэтых праектах. Прымяненне матэматыкі для павышэння эфектыўнасці аперацый у кожнай галіне чалавечай дзейнасці — гэта новая навука нарадзілася ў Англіі падчас другой сусветнай вайны, пасля бліскучага поспеху, матэматычна вылічаных

аперацый, супраць нямецкіх падводных лодак у Атлантычным акіяне (радарныя станцыі).

Матэматычная практыка сталася вельмі прыдатнай, калі пазней Барыс Кіт выйшаў з астранаўтыкі і працаваў у розных установах: нацыянальным бюро стандартызацыі, міністэрстве камерцыі, затым у штаб-кватэры арміі, у міністэрстве камунікацый. Тут ён займаўся ў асноўным даследаваннем метадаў павышэння эфектыўнасці адміністрацыйнай дзейнасці пры дапамозе матэматыкі. Ён вырашаў незвычайна складаныя практычныя задачы, якія прадугледжвала рацыянальнае амерыканскае грамадства, імкнучыся быць наперадзе ўсяго свету. Падчас яго працы ў бюро стандартызацыі пры прэзідэнце ЗША была створана група вучоных, куды ўвайшлі спецыялісты розных галін, у тым ліку і Барыс Кіт, для даследавання тэхналагічнага развіцця і параўнання яго паміж Еўропай (Англіяй), Амерыкай і Японіяй. Ён браў затым актыўны ўдзел у падрыхтоўцы даклада прэзідэнту Ліндану Джонсану па гэтых праблемах. Калі ў 1967 годзе ў Жэневе праводзіўся Сусветны кангрэс па стандартызацыі, Барыс Кіт быў афіцыйным амерыканскім дэлегатам на гэтым кангрэсе, абіраўся сакратаром камісіі па стандартызацыі электроннай прадукцыі (ёсць падзяка за гэту працу).

У Амерыцы, як вядома, ужываецца англійская сістэма мер, у той час як амаль увесь свет перайшоў на метрычную сістэму (напрыклад, — амерыканскія электрычныя лямпачкі нельга выкарыстоўваць у Еўропе). Барыс Кіт, як матэматык, вылічваў, колькі сродкаў з-за гэтага губляюць амерыканцы. З групай экспертаў-эканамістаў ён падлічыў, што, напрыклад, фірме «Джэнерал электрык» каштавала б 600 мільёнаў долараў, каб перабудаваць сваю вытворчасць. Таму многія прыватныя фірмы, якія не могуць адразу перайсці на еўрапейскі стандарт, ствараюць спецыяльныя аддзелы, якія асобна выпускаюць для Еўропы сваю прадукцыю.

Такія матэматычныя разлікі, даследаванні групы Барыса Кіта пайшлі ў кангрэс, які пастанавіў пастулова пераходзіць на еўрапейскую метрычную сістэму мер, хаця прыватным фірмам не надта загадаеш.

Працуючы ў матэматычным аддзеле міністэрства камунікацый і транспарту, Барыс Кіт вырашаў праблему, як палепшыць эфектыўнасць працы транспарту пры дапамозе камп'ютэраў, колькі будзе каштаваць перанос чыгункі за горад і многія іншыя жыццёва наспеўшыя пытанні. Дзеля гэтага ён павінен быў наладжваць сувязі з даследчыцкімі цэнтрамі універсітэтаў, каб яны займаліся аналізам дзейнасці розных галін вытворчасці, інспектаваў іх працу. Усё гэта сведчыць, што Барыс Кіт заўсёды быў на стрыжні часу, навукова-

тэхнічнага прагрэсу і, як вучоны, заўсёды знаходзіў прымяненне сваім ведам у жыцці, не замыкаўся ў вузка тэарэтычнай сферы. Уменне дапасоўваць іх да рэальнай практыкі дало магчымасць яму далучыцца да групы амерыканскіх вучоных, прафесараў і зрабіць кругасветнае падарожжа напрыканцы 60-х гадоў, выступіць з лекцыямі ў многіх краінах свету (Японіі, Індыі, Мексіцы, Іспаніі, Канадзе, Англіі, Швецыі, Нарвегіі, Фінляндыі, Германіі і інш.). Чытаў ён лекцыі і ў Польшчы, у Кракаўскім універсітэце. І тут яму не раз прыгадвалася, што побач Радзіма — Беларусь, якая ў гады яго маладосці знаходзілася пад уладай Польшчы. У 30-я гады польскі ўрад аб'явіў яго нядобранадзейным, і яму было забаронена выязджаць за мяжу нават з турыстычнай групай. Узнікалі думкі: толькі, калі вырваўся ў Амерыку, аб'ездзіў увесь свет, адчуваючы сябе вольным і патрэбным людзям.

Імкліва міналі гады ў цікавай, захапляючай дзейнасці. Аднак Барыс Уладзіміравіч знаходзіў час займацца выхаваннем сыноў, сачыць за іх навучаннем, дапамагаў набываць спецыяльнасць ва універсітэтах, матэрыяльна станавіцца на ногі. Старшы сын Уладзімір у сваіх прафесійных прыхільнасцях пайшоў па слядах бацькі. Ён скончыў тры факультэты: палітычных навук і замежнай дыпламатыі Джарджтаўнскага універсітэта (дзе выкладалі Кісінджэр і Бжэзінскі. Уладзімір Кіт быў, дарэчы, выдатным спартсменам, чэмпіёнам Амерыкі па тэнісу), факультэт фізікі Мэрылендскага універсітэта (у 60-я гады моладзь захаплялася космасам, і Валодзя працаваў у касмічным цэнтры ў Вашынгтоне, у аддзеле даследавання спадарожнікаў) і факультэт электроннай інжынерыі універсітэта Джорджа Вашынгтона, атрымаў ступень магістра. Цяпер ён высокакваліфікаваны спецыяліст у камп'ютэрнай тэхніцы, працуе кіраўніком аднаго з аддзелаў міністэрства астранаўтыкі ў Вашынгтоне.

Малодшы, Віктар, скончыў Мэрылендскі універсітэт, займаўся мікрабіялогіяй, пасля паступіў на медыцынскі факультэт, стаў выдатным хірургам, жыве ў Балтыморы. Паколькі адукацыя ў ЗША платная, то ўсе гады навучання адзіным спонсарам сыноў быў бацька. Атрымаўшы выдатныя, прэстыжныя прафесіі, малодшыя Кіты на сённяшні дзень высокааплачваемыя спецыялісты, маюць уласныя дамы, матэрыяльна стабільна забяспечаны, удзячныя бацьку за падтрымку і бескарыслівую дапамогу.

Дарэчы, Валодзя, які нарадзіўся на Беларусі, добра валодае рускай і беларускай мовамі. Яму давялося пабываць на радзіме ў 1968 годзе. Ён суправаджаў выстаўку «Архітэктура ЗША», якую арганізоўвала і курыравала ягоная жонка Тамара Азарава (яе бацька армянін, маці

ўкраінка — імігрыравалі ў Амерыку з Арменіі). Выстаўка праводзілася ў многіх буйных гарадах былога СССР (Масква, Пецярбург, Ерэван, Мінск і інш.). У Маскве Валодзя прымаў удзел у тэнісных спаборніцтвах як чэмпіён Амерыкі, у Пецярбургу захапляўся прыгажосцю, гістарычнымі помнікамі гэтага цудоўнага горада, наведаў мясціны, дзе нарадзіўся і жыў у дзяцінстве яго бацька, а ў Мінску (выстаўка была разгарнуў ў вестыбюлі опернага тэатра і мела незвычайны поспех, стаялі вялікія чэргі людзей, жадаючых пазнаёміцца з невядомай Амерыкай) Уладзімір Кіт сустрэўся з дзедам Уладзімірам Кітам, а таксама з дзедам і бабуляй Корсакамі (па мацярынскай лініі). Гэта была хвалюючая, незабыўная сустрэча розных пакаленняў, родных людзей, раз'ядналых акіянам, рознымі палітычнымі сістэмамі, савецкай ідэалогіяй, што не дазваляла не толькі сустракацца, але і перапісвацца, дзесяцігоддзямі нічога не ведаць пра блізкіх.

Цяпер Валодзя і Віктар, самі ўжо стаўшы бацькамі, любяць збірацца разам хаця б раз у год, і Барыс Уладзіміравіч кожны раз на Каляды імчыць са сваёй еўрапейскай далечы на спатканне з дарагімі людзьмі, унукамі, праўнукамі, радуецца сустрэчы, магчымасці пабываць у Вашынгтоне — гэтым прыгожым, багатым горадзе — сталіцы Злучаных Штатаў Амерыкі, дзе прайшла значная і найбольш плённая частка яго жыцця.

## Пераезд у Германію

### *Педагагічная, прафесарская праца ва універсітэтах Еўропы (з 1972 года)*

Амерыка стала другой радзімай для беларуса Барыса Кіта, яна дала яму ўсё, што патрэбна чалавеку для нармальнага жыцця ў вольным свеце. Ён адбыўся тут як вучоны, здзейсніў свае мары і спадзяванні, тут выраслі і жывуць яго сыны. Аднак у сэрцы ўвесь час захоўваўся вобраз Бацькаўшчыны, хоць і затуманены доўгімі гадамі расстання. Можа таму, выйшаўшы на пенсію, Барыс Кіт выбраў для сталага пражывання Германію, еўрапейскую краіну высокай культуры і высокага ўзроўню жыцця. Усё ж бліжэй да Радзімы, куды ён, нягледзячы ні на што, думаў вярнуцца. Барыс Кіт ніколі не забываў пра Беларусь, заўсёды цікавіўся яе жыццём, добра ведаў шматпакутную гісторыю Бацькаўшчыны, бо сам быў удзельнікам і відавочцам многіх гістарычных падзей.

У 1972 годзе Барыс Кіт пераязджае ў Франкфурт-на-Майне — незвычайна прыгожы, старажытны горад, былы цэнтр свяшчэннай Рымскай імперыі, а цяпер найсучаснейшы горад Еўропы, дзе па-нямецку рацыянальна спалучаюцца далёкая гісторыя і дзень сённяшні, і які праз супермадэрны міжнародны аэрапорт звязаны з усімі сталіцамі свету (што, відаць, немалаважна пры мабільнасці, непаседлівасці Барыса Уладзіміравіча). Па вуліцах Франкфурта ідзеш, як па старонках гісторыі, дзе старыя гатычныя будынкі суседнічаюць з высотнымі гатэлямі, офісамі, банкамі. Велічную прыгажосць гораду надаюць шырокі Майн, масты, утульныя пешаходныя вуліцы з яркімі, багатымі вітрынамі шматлікіх магазінаў, помнікі славутым людзям, музеі, скверы і паркі, чыстыя дагледжаныя набярэжныя і жылыя кварталы з мноствам кветак, зяляніны, і ні адзін дом не паўтарае другі, усе радуе і цешыць вока.

Барыс Кіт выдатна ведае гісторыю Германіі, а пра Франкфурт многім беларусам, якія бываючы ў Еўропе, не мінаюць яго гасціннасці, можа расказваць як найлепшы гід — бясконца і цікава. Звесткі пра паселішча, дзе цяпер прывольна раскінуўся Франкфурт, вядомыя да нашай эры. У 794 г. Карл Вялікі зрабіў тут дзяржаўнае пасяджэнне еўрапейскага значэння. У XII стагоддзі Франкфурт наведвае Фрыдрых I Барбароса. У 1356 г. імператар Карл IV выдае Залатую Булу, якая зрабіла Франкфурт горадам, дзе каранаваліся нямецкія каралі і імператары. І цяпер на старажытнай цэнтральнай плошчы ў агромністай зале гарадской ратушы вісяць каляровыя партрэты гэтых каралёў і

імператараў, якія ішлі на цырымонію каранавання ў велічны сабор насупраць ратушы. Перад саборам сёння можна ўбачыць (пасля археалагічных раскопак) адкрытыя рымскія маставыя, якія памятаюць легіянераў Цэзара, Даміцыяна... У 1749 г. у Франкфурце нарадзіўся Іаган Вольфганг Гётэ — славуты нямецкі паэт, у музей якога і да помніка ідуць людзі самых розных нацыянальнасцей і колеру скуры, каб аддаць даніну павагі, пакланіцца вялікаму немцу... У 1848 г. у Франкфурце збіраецца Першы агульнанямецкі парламент, на будынку якога цяпер вісіць мноства мемарыяльных дошак, а велізарная зала парламента ўражвае сваімі памерамі і аскетычнасцю, сціпласцю, але і велічнасцю ўбрання — тут адчуваецца подых гісторыі, чуюцца галасы палымяных аратараў. На працягу XIX стагоддзя ў Франкфурце, суседнім Вісбадэне шмат перабывала знакамітых людзей, асабліва рускіх арыстакратаў. Тут пісаў свае творы Тургенеў, бываў Дастаеўскі... Не верылася, што ў час вайны Франкфурт быў вынішчаны дашчэнту, настолькі ён цяпер прыгожы і багаты, а сляды другой сусветнай вайны можна ўбачыць толькі на фотаздымках у музеі горада. Барыс Уладзіміравіч Кіт пасяліўся ў Франкфурце-на-Майне не дзеля таго, каб цешыцца прыгажосцю і дабротамі Германіі, жыць размераным спакоем заслужыўшага свой адпачынак чалавека. Ён выбраў Франкфурт як геаграфічны цэнтр Еўропы і яшчэ таму, што тут знаходзяцца асноўныя еўрапейскія філіялы Вашынгтонскага Мэрылендскага універсітэта, у якім ён выкладаў матэматыку з таго часу, як пасяліўся ў Вашынгтоне, нягледзячы на занятасць даследчыцкай дзейнасцю. Першае знаёмства з універсітэтам адбылося, калі Барысу Кіту было даручана напісаць кнігу пра развіццё касманаўтыкі ў Савецкім Саюзе. Але існавала правіла, каб тэмай кіраваў які-небудзь універсітэт і быў яе спонсарам. І такі спонсар знайшоўся, як часта гэта бывае, зусім выпадкова. Аднойчы Барыс Кіт ляцеў у Японію на Міжнародны кангрэс. Месца яго ў самалёце аказалася побач з месцам прафесара Мэрылендскага універсітэта Сэнгера. Яны пазнаёміліся, разгаварыліся, і прафесар Сінгер прапанаваў свой універсітэт у якасці кіраўніка-гранта кнігі Барыса Кіта. Непасрэдным куратарам гэтай працы ў Мэрылендскім універсітэце стаў прафесар Джон Толл, дэкан факультэта фізікі і астраноміі, славуты вучоны, саветнік прэзідэнта ЗША, якога пазней выбралі рэктарам універсітэта. Пасля выдання кнігі Барысу Кіту прапанавалі стаць выкладчыкам матэматыкі універсітэта. Але паколькі ён быў на дзяржаўнай пасадзе, то мог чытаць лекцыі толькі на вячэрнім факультэце, дзе вучыліся дарослыя людзі, якія хацелі мець вышэйшую адукацыю.

Мала ў Амерыцы універсітэтаў з такой багатай спадчынай, як Мэрылендскі. Сёння гэта адзін з найвялікшых універсітэтаў ЗША. Ён быў заснаваны ў 1807 годзе ў Балтыморы (штат Мэрыленд, непадалёку ад Вашынгтона, атрымаў назву ад імя Божай Маці — святой дзевы Марыі), пачынаўся з факультэта медыцыны і юрыспрудэнцыі. (Дарэчы, сын Барыса Кіта — Віктар, скончыў факультэт дантысткі Мэрылендскага універсітэта). Затым былі адкрыты факультэты літаральна па ўсіх галінах ведаў — ад гуманітарных да фізіка-матэматычных. Праз паўстагодцзе універсітэт вырас да аднаго з асноўных у Амерыцы. Цяпер Мэрылендскі універсітэт — гэта сістэма з II самастойных універсітэтаў. Галоўная і найбольшая яго частка знаходзіцца ў Калэдж-Парку, прыгарадзе Вашынгтона, дзе ёсць усе факультэты, у тым ліку і вячэрні, для тых, хто працуе (University College). У гэтую частку Мэрылендскага універсітэта ўключаюцца ўсе філіялы за межамі Амерыкі, якія знаходзяцца на тых кантынентах, дзе базіруюцца амерыканскія ваенныя сілы, кампактна жывуць амерыканцы. Каля 600 такіх філіялаў ёсць у Еўропе, шмат іх у Японіі, Аўстраліі, іншых краінах. Існуе нават прымаўка, што ў Мэрылендскім універсітэце ніколі не заходзіць сонца.

Барыс Кіт, маючы выдатныя характарыстыкі і падзякі рэктарата, мог выкладаць матэматыку ў любым з гэтых цэнтраў са сваім вялікім вопытам першакласнага педагога. Але, прыехаўшы ў Франкфурт-на-Майне, ён стаў прафесарам матэматыкі Еўрапейскага аддзела Мэрылендскага універсітэта, чытаў лекцыі ў філіялах Нюрнберга, Вісбадэна, Дармштадта, Гайдэльберга, Ганау (радзіма братоў Грым). Сярод яго вучняў шмат амерыканцаў, якія сталі вядомымі вучонымі, як, напрыклад, прафесар матэматыкі Джон Сассар (універсітэт штата Агаё). Ён захапіўся сваім настаўнікам матэматыкі, яго цікавай, даходлівай манерай выкладання, уменнем данесці да студэнтаў прыгажосць, логіку, глыбінны сэнс гэтай складанай навукі, без якой не абыходзіцца ні адна галіна ведаў, і напісаў кнігу «Гісторыя матэматыкі» з прадмовай Барыса Кіта.

Мэрылендскі універсітэт свята прытрымліваецца сваіх устаялых традыцый. Адной з самых цікавых і хвалюючых з'яўляецца цырымонія ўручэння дыпломаў. Звычайна акт заканчэння навучальнага года адбываецца ў Гейдэльбергу, галоўным еўрапейскім цэнтры Мэрылендскага універсітэта. Студэнты тут атрымліваюць дыпломы бакалаўраў, і ў гэты ж дзень кожны год аднаму з прафесараў уручалі Ганаровы дыплом доктара (яго атрымалі Адэнаўэр, Брант, маюць Коль і Геншар). У 1987 годзе Барысу Кіту быў уручаны дыплом заслужанага прафесара на адным з такіх актаў, а ў 1990 годзе Барыс Кіт атрымаў

дыплом ганаровага прафесара. Больш за 30 гадоў працаваў ён у Мэрылендскім універсітэце — з 1962 па 1993, з іх — 10 гадоў у ЗША, астатнія ў Еўропе.

Адначасова з пачаткам педагагічнай дзейнасці ў Еўропе Барыс Кіт пачаў працаваць над доктарскай дысертацыяй.

З даўніх часоў Барыса Кіта цікавіла гісторыя навукі, жыццё вялікіх людзей, таленавітых вучоных, навукоўцаў. Таму і абраў ён тэму пра жыццё і дзейнасць аднаго з найвялікшых матэматыкаў XX стагоддзя Антона Зыгмунда. Афіцыйным кіраўніком дысертанта згадзіўся стаць прафесар Рэгенсбургскага універсітэта, таксама вядомы ў навуковым свеце матэматык Імрэ Тот (1921 года нараджэння, выхадзец з Румыніі, але жыве ў Германіі). Барыс Кіт паехаў да яго, прапанаваў дзесяць варыянтаў тэм доктарскай дысертацыі. Па агульнай згодзе спыніліся на тэме «Антон Зыгмунд», што супала з жаданнем Барыса Кіта. Так стаў ён дактарантам Рэгенсбургскага універсітэта. Прафесар Імрэ Тот зняў клопат дакументальнага афармлення са свайго дысертанта. Рэгенсбургскі універсітэт прызнаў усе дыпломы Барыса Кіта, у тым ліку магістэрскую працу, за якую ён атрымаў дыплом магістра філасофіі Віленскага універсітэта ў галіне матэматыкі яшчэ ў 30-я гады. Рэгенсбургскі універсітэт, як і сам горад, адзін з найстарэйшых у Германіі. Барыс Кіт, з яго незвычайнай любоўю да гісторыі, дасканала вывучыў храналогію гістарычных падзей горада, пры нагодзе заўсёды раскажа, што ў гэтай мясцовасці людзі жылі за 500 гадоў да н. э. (кельтскія плямёны). Рымляне прыйшлі туды ў канцы I стагоддзя пасля нараджэння Хрыста і пад кіраўніцтвам імператара Марка Аўрэлія залажылі свой лагер Кастра рэгіна (лагер на рацэ Рэген). Рымляне жылі да 400 г. н. э., пасля прыйшлі баварцы з Багеміі і зрабілі Рэгенсбург першай сталіцай Баварыі. У свае часы тут часта бываў Карл Вялікі — заснавальнік свяшчэннай Рымскай імперыі. Цяпер гэта адзін з найбольш вядомых нямецкіх гарадоў з многімі гістарычнымі помнікамі, старажытнымі саборамі, універсітэтамі, горад, які шмат даў Барысу Кіту і ён ганарыцца, што абараняў дактарат у Рэгенсбургу.

Так, пра кожны горад, краіну, месца, дзе ён пабываў або жыў, Барыс Кіт можа гадзінамі расказваць пра гістарычныя падзеі, славутых людзей, помнікі культуры, архітэктуры, і ўсё гэта ўвязваецца ім з асабістым жыццём, падкрэсліваецца, як гэта ўзбагаціла яго Духоўны свет, быццам зрабіла саўдзельнікам вялікіх падзей і лёсаў, надало гонару за чалавецтва, яго стваральную дзейнасць.

Доктарскую дысертацыю Барыс Кіт паспяхова абараніў у 1982 годзе на вучоным савеце Рэгенсбургскага універсітэта. Яна выйшла

асобнай кнігай (1983) пад назвай: «Antoni Zygmund, his life and his contribution to the mathematics of 20th Century».

Барыс Кіт правёў вялікую працу па збору і апрацоўцы матэрыялаў пра жыццё і навуковыя дасягненні Антона Зыгмунда (1900-1992), у якога абаранілася каля 100 дысертантаў, у тым ліку 3 8 дактароў навук. Прыязныя і цікавыя асабістыя ўзаемадачыненні звязвалі Барыса Кіта з Антонам Зыгмундам. Упершыню яны, студэнт і прафесар, спаткаліся на лекцыях, калі Зыгмунд працаваў у Віленскім універсітэце, а Барыс Кіт наведваў яго семінары. Антон Зыгмунд шукаў тады дачу для сваёй сям'і, і Барыс Кіт дапамог яму ў гэтым — пасяліў іх у Калоніі Віленскай — прыгарадзе Вільні, у доме, дзе жыў сам. Антон Зыгмунд з жонкай (яна таксама выкладала матэматыку ва універсітэце) і сынам жыў там летнія месяцы. Сын Жорж часта хварэў, і Барысу Кату даводзілася ездзіць за лякарствам, прывозіць урача. Пазней Жорж скончыў у ЗША факультэт менеджменту, жыў у Англіі, меў уласны самалёт і ў адзін са святкаванняў свайго дня нараджэння паляцеў з сябрамі на прагулку. Але здарылася няшчасце: самалёт пацярпеў катастрофу, і ўсе загінулі. Гэта трагічная вестка даканала старога Зыгмунда. У сына сіратамі засталося 4 дзяцей. І да сённяшняга дня Барыс Уладзіміравіч з болем згадвае пра гэтыя драматычныя падзеі ў сям'і свайго былога настаўніка.

Да 1939 года Антон Зыгмунд працаваў у Віленскім універсітэце, а Барыс Кіт да 1933 г. быў ягоным студэнтам. Яны сталі добрымі сябрамі. Пазней Антон Зыгмунд жыў у Чыкага, і калі Барыс Кіт пасля вайны прыехаў у Амерыку, паміж імі завязалася перапіска, настаўнік даваў свайму вучню рэкамендацыі для ўладкавання на працу ў Амерыцы. Былі асабістыя сустрэчы ў Парыжы (1961 г.). Як чалавек Антон Зыгмунд быў цудоўны, добры, патрабавальны, меў шмат сяброў, прыхільнікаў свайго таленту, вучняў, якія сталі вялікімі вучонымі свету. Сувязі Антона Зыгмунда і Барыса Кіта трымаліся да апошніх дзён. У 1978 годзе Барыс Кіт наведаў свайго настаўніка ў Чыкага, была доўгая, задушэўная размова. Барыс Кіт спытаў, ці напісаў хтонебудзь са шматлікіх вучняў прафесара кнігу пра яго жыццё і навуковую дзейнасць. Антон Зыгмунд адказаў, што такой кнігі няма. І Барыс Кіт, быццам пытаючы дазволу, прапанаваў: "Можа, я пра Вас напішу?" — «Напішыце», — быў адказ. Так узнікла задума доктарскай дысертацыі Барыса Кіта. Антон Зыгмунд падарыў яму тады сваю кнігу «Трыганаметрычныя рады» з уласнаручным надпісам: «Сп. Барысу Кіту. Сардэчныя пажаданні поспеху ў працы. Антон Зыгмунд».

Памёр Антон Зыгмунд у 1992 годзе, пражыўшы 92 гады. У часопісе Чыкагскага універсітэта быў змешчаны некралог: «Заслужаны

прафесар Чыкагскага універсітэта Антон Зыгмунд памёр 30 мая 1992 года ў сваім доме ў Гайдпарку (раён Чыкага). Заснавальнік Чыкагскай школы матэматычнага аналізу, Антон Зыгмунд атрымаў нацыянальную медаль навукі — найвышэйшую навуковую ўзнагароду ад прэзідэнта Амерыкі ў 1986 годзе. Вядомы ў сваёй галіне як спецыяліст гарманічнага аналізу, вельмі важнага ў распрацоўцы касмічных праектаў, крысталаграфіі і Лазараў, ён напісаў 6 кніг і 180 навуковых артыкулаў».

Пахаваны Антон Зыгмунд у Чыкага.

Доктарская дысертацыя Барыса Кіта пра важкі ўклад Антона Зыгмунда ў сусветную навуку — гэта не толькі даніна павагі, асабістая памяць вучня пра настаўніка, але і грунтоўная навуковая работа ў галіне гісторыі навукі, матэматыкі. Сёння гэта работа Барыса Кіта вядомая і на Беларусі. Вось які водгук далі на яе вучоныя А. Г. Майсяёнак, А. П. Садоўскі, А. А. Пякарскі (Інстытут біяхіміі Акадэміі навук Беларусі, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы): «Імя Барыса Уладзіміравіча Кіта — педагога і матэматыка, гісторыка навукі, дзеяча беларускай эміграцыі — стала вядомым сучасным даследчыкам у апошнія гады дзякуючы намаганням Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» і ініцыятыве акадэміка Ю. М. Астроўскага, які прапанаваў выбраць Б. У. Кіта замежным членам АП Беларусі. Аднак гэты навуковец ужо на пачатку 80-х гадоў быў добра вядомы ў навуковых колах Захаду, пра што сведчыць прысутнасць яго біяграфіі ў прэстыжных даведніках і энцыклапедыях. У лістападзе 1991 г. інфармацыйны бюлетэнь матэматычнага факультэта Мэрылендскага універсітэта ў хроніцы сваёй паведаміў: «Барыс Кіт (матэм.), ветэран лектарскай працы ў галіне матэматыкі, быў нядаўна адзначаны за сваю піянерскую даследчыцкую працу ў вывучэнні сусвету на працягу 1950-60-х гадоў, за публікацыі і доўгатэрміновую дзейнасць у міжнародным астранаўтычным руху, стаўшы выбраным сябрам Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі (МАА) у Парыжы. У кастрычніку на Міжнародным астранаўтычным кангрэсе ў Манрэалі ён прэзентаваў працу «Дзейнасць былых навукоўцаў з Пэнямюнда, якія засталіся ў Германіі», і на спалучанай сесіі МАА і Канадскага Каралеўскага таварыства ён быў узнагароджаны прэстыжным дыпломам акадэміка».

Больш падрабязныя звесткі пра Б. Кіта годам раней друкуе часопіс «Astronautik», якія змяшчаюць кароткі агляд навуковай дзейнасці да 80-годдзя прафесара Кіта. Паведамляецца, што з 1965 г. юбіляр з'яўляецца сябрам гісторыка-астранаўтычнага таварыства імя Германа Обэрта і з 1976 г. уваходзіць у яго кіраўніцтва, а за актыўную

дзейнасць таварыствам узнагароджаны Залатым памятным знакам. Інфармацыя пра папярэднюю дзейнасць Б. Кіта наступная: «Прафесар Кіт больш як 25 гадоў працаваў у ЗША ў галіне вывучэння сусвету, у якасці матэматыка і аналітыка сістэм, прымаў удзел у большасці важкіх амерыканскіх ракетных і спадарожнікавых праграм, як напрыклад, у распрацоўцы міжкантынентальнай ракетнай сістэмы фірмай North American Aviation і спадарожніка сувязі ITT (International Telegraph and Telephone Corporation).

Ён аўтар шматлікіх рэфератаў і навуковых прац. Падкрэслім агляд гісторыі касмічных доследаў у СССР (1964), а таксама яго кнігу пра ракетнае паліва (1960). Ён быў тэхнічным кансультантам і перакладчыкам на першых гістарычных перагаворах аб савецка-амерыканскім супрацоўніцтве ў даследаванні касмічнай прасторы. У сучасны момант прафесар Барыс Кіт з'яўляецца ганаровым прафесарам матэматыкі Мэрылендскага універсітэта ў Гейдэльбергу. Вядома, што з 1972 г. Барыс Кіт пераязджае ў Еўропу, пачынаючы працу ў філіі амерыканскага універсітэта на пасадзе выкладчыка і, пазней, прафесара матэматыкі. Універсітэцкая пасада і вялікая зацікаўленасць гісторыяй, у прыватнасці гісторыяй навукі, паступова прыводзяць Б. Кіта да неабходнасці атрымання навуковай ступені. У 1982 г. на 72 годзе жыцця ён абараняе дысертацыю на ступень доктара філасофіі ў галіне матэматыкі пры універсітэце Рэгенсбург (Заходняя Нямеччына).

Дысертацыйная праца Барыса Кіта мае назву «Антоні Зыгмунд. Яго жыццё і яго ўклад у развіццё матэматыкі 20 стагоддзя». Зварот да постаці А. Зыгмунда ў дысертанта не выпадковы, бо менавіта Зыгмунд узначальваў матэматычную школу універсітэта Стэфана Баторыя ў Вільні, калі там вучыўся і складваў сваю магістэрскую працу Барыс Кіт.

У дысертацыі змешчаны агляд развіцця польскай матэматычнай школы паміж сусветнымі войнамі (1919-1939), гісторыя гарманічнага аналізу, жыццяпіс Антона Зыгмунда і агляд яго ўкладу ў развіццё матэматычных навук.

Антон Зыгмунд (1900-1992) нарадзіўся ў Варшаве, дзе скончыў пачатковую і сярэднюю школы. Падчас першай сусветнай вайны ён разам з бацькамі знаходзіўся на Палтаўшчыне (Украіна). Пасля вяртання ў Варшаву ў 1919 г. быў прыняты на матэматычны факультэт універсітэта. Навуковым кіраўніком А. Зыгмунда быў вядомы польскі матэматык С. Сакс (1897-1943), які пазней стаў яго калегам па Навуковай працы. У 1929-30 гг. знаходзіўся ў Оксфардскім універсітэце ў якасці стыпендыята фонда Ракфелера, дзе супрацоўнічаў з вядо-

мымі матэматыкамі Хардзі і Літлвудам. У 1930 г. Зыгмунд пачынае працу ў Вільні як выкладчык універсітэта Стэфана Баторыя, а з пачаткам другой сусветнай вайны пераязджае ў ЗША, дзе застаецца працаваць да канца жыцця.

Галоўныя навуковыя інтарэсы А. Зыгмунда, як і яго настаўніка С. Сакса, належаць да тэорыі функцый сапраўднага і комплекснага пераменных і функцыянальнага аналізу. Вынікі яго даследаванняў зрабілі ўплыў як і надалей уплываюць на развіццё розных раздзелаў сучаснага матэматычнага аналізу. Менавіта ў канструктыўнай тэорыі функцый вядомы клас функцый Зыгмунда і няроўнасць Зыгмунда для вытворнай трыганаметрычнага палінома, у метрычнай тэорыі функцый — тэарэма Зыгмунда аб спалучаных функцыях, у тэорыі сінгулярных інтэгралаў — метад Кальдэрона-Зыгмунда, у функцыянальным аналізе — тэарэма Зыгмунда аб інтэрпаляцыі аператараў.

Кніга А. Зыгмунда «Трыганаметрычныя рады» стала своеасаблівай энцыклапедыяй вынікаў і метадаў розных раздзелаў тэорыі функцый. Першае выданне гэтай кнігі было ў 1935 г. у Варшаве, а другое, значна перапрацаванае і дапоўненае, у 1959 г. у Кембрыджы. За мінулы час гэта кніга неаднаразова перавыдавалася ў розных краінах, у тым ліку і ў СССР. Да сённяшняга часу гэта кніга застаецца актуальнай і звычайна цытуецца ў артыкулах, прысвечаных тэорыі функцый.

Пад кіраўніцтвам А. Зыгмунда абаронена 38 дысертацый. Яго вучнямі з'яўляюцца такія вядомыя матэматыкі, як Й. Марцінкевіч, М. Б. Вэйс, Р. Ж. Коэн, Б. Макенхаўпт, А. Кальдэрон, Ф. М. Стэйн і іншыя. Гэтыя матэматыкі сусветна вядомыя па наступных выніках доследаў: тэарэмы Й. Марцінкевіча і Рысса-Торына сталі асноватворнымі вынікамі тэорыі інтэрпаляцыі аператараў. На жаль, лёс Й. Марцінкевіча, таленавітага віленскага матэматыка, якога звалі польскім Эварыстам Галуа, быў вельмі трагічны. Ва ўзросце 30 гадоў ён быў знішчаны ў Катыні разам з польскімі афіцэрамі і інтэлігентамі ў 1940 г. Вучні Зыгмунда Е. М. Стэйн і М. Б. Вэйс шмат зрабілі для развіцця гарманічнага аналіза функцый многіх пераменных. А. П. Кальдэрон разам з Зыгмундам распрацавалі рэчыўную тэорыю сінгулярных інтэгралаў аднаго і некалькіх пераменных. У тэорыі сталярных інтэгралаў добра вядомая ўмова Б. Макенхаўпта. Р. Ж. Коэн вырашыў вядомую праблему кантыніум гіпотэзы.

Як сведчаць гэтыя звесткі, прыведзеныя ў дысертацыі Б. У. Кіта, аўтару ўдалося гістарычна і шматгранна раскрыць жыццёвы і творчы шлях А. Зыгмунда, яго навуковай школы, навуковыя дасягненні яго шматлікіх вучняў і супрацоўнікаў. Не выпадкова дысертацыйная

праца Б. Кіта, якую, дарэчы, можна ўбачыць у бібліятэках амаль што ўсіх універсітэтаў Заходняй Еўропы, была прызнана найлепшай працай матэматычнага факультэта Рэгенсбургскага універсітэта за 1982 год. Дысертацыя Б. У. Кіта мае безумоўную каштоўнасць для ўсіх, хто зацікаўлены гісторыяй матэматыкі, а таксама студэнтаў, аспірантаў, навуковых супрацоўнікаў, чые навуковыя доследы блізкія інтарэсам А. Зыгмунда.

Сваёй кнігай доктар Б. Кіт садзейнічаў развіццю гісторыі навукі. Пасля выхаду яе ў свет Барыс Кіт атрымаў навуковае званне доктара філасофіі, што азначала павелічэнне прэстыжу, прафесійны рост. Гэта было афіцыйнае афармленне яго вялікай, шматгадовай дзейнасці навукоўца і педагога, адкрывала доступ да звання прафесара, акадэміка. Увесь перыяд жыцця ў Германіі, нягледзячы на занятасць выкладчыцкай справай, напісаннем дысертацыі, Барыс Кіт працягваў займацца і навуковай дзейнасцю, публікаваў у часопісах Амерыкі і Германіі навуковыя артыкулы (іх выйшла звыш 30), быў пастаянным дэлегатам усіх міжнародных астранаўтычных кангрэсаў, выступаў з дакладамі і паведамленнямі. Як удзельнік гэтых кангрэсаў, ён пабываў у Амстэрдаме, Токіо, Парыжы, Афінах, Брэмене, Нью-Йорку, Канстанцы, Бруселі, Вене, Зальцбургу, Мюнхене, Кобленцы, Лазане, Інсбруку, Брайтане, Малазе, Дрэздэне, Манрэалі, Іерусаліме, Осла і іншых гарадах і краінах. Тут завязваліся новыя знаёмствы, цікавыя сустрэчы, гутаркі з вядомымі ва ўсім свеце людзьмі: вучонымі, даследчыкамі, касманаўтамі. У кастрычніку 1978 года на Астранаўтычным кангрэсе ў Мюнхене Барыс Кіт пазнаёміўся з беларускімі касманаўтамі У. Кавалёнкам і П. Клімуком. Сустрэліся славутыя беларусы, і Барыс Уладзіміравіч з вялікай зацікаўленасцю распытваў сваіх землякоў пра Беларусь, яе жыццё, падзеі, радуючыся магчымасці гаварыць на роднай мове. Трэцяга кастрычніка 1991 года ў гатэлі Хілтан у Атаве — сталіцы Канады, на ўрачыстым пасяджэнні Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі разам з Каралеўскай акадэміяй Канады Барысу Уладзіміравічу быў уручаны дыплом акадэміка Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі, галоўная кватэра якой знаходзіцца ў Парыжы. Дыплом уручаў доктар Георг Мілер — прэзідэнт Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі (былы кіраўнік праекта «Apollo», падарожжа амерыканцаў на Месяц). Сумеснае пасяджэнне дзвюх акадэмій было наладжана ў сувязі з Міжнародным кангрэсам у Манрэалі. Гэта быў кульмінацыйны момант усёй астранаўтычнай і навуковай кар'еры Барыса Кіта. Рэктарат Мэрылендскага універсітэта разаслаў у сувязі з гэтым усім навукоўцам, прафесарам паведам-

ленне аб выбранні Барыса Кіта акадэмікам Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі.

Барыс Уладзіміравіч Кіт, як акадэмік з сусветным імем, удастоены гонару быць занесеным у самыя прэстыжныя навуковыя даведнікі свету. Яго біяграфія, звесткі пра навуковую дзейнасць змешчаны ў энцыклапедыі «Амерыканскія вучоныя» («Dictionary of international Biography»), у біяграфічным даведніку «Брытанская каралеўская блакітная кніга» («Royal Blue Book»), у вядомым слоўніку «Хто ёсць хто ў касманаўтыцы» («Who's who in Space»), у даведніках «Leaders of American Science», «American men of Science» (ЗША), «Two Thousand men of Achievement» (Англія). Біяграфія Барыса Кіта разам з біяграфіямі іншых славутых вучоных укладзена ў капсулу часу, якая знаходзіцца ў бібліятэцы Роберта Годарда ў Вашынгтоне (капсула будзе адкрыта праз 500 гадоў).

Так здзейсніўся Барыс Уладзіміравіч Кіт гістарычна, так стаў вядомым у гісторыі свету.

## Вяртанне на Бацькаўшчыну

На сваёй Бацькаўшчыне Барыс Уладзіміравіч Кіт становіцца вядомым толькі цяпер, калі Беларусь атрымала незалежнасць. «Для мяне гэта галоўная падзея XX стагоддзя, — гаворыць Барыс Уладзіміравіч. — Нарэшце пасля тысячы гадоў змагання, цярпення, няволі, усялякіх акупацыяў наш народ атрымаў сваю незалежнасць, поўную суверэннасць, прызнаную ўсімі іншымі народамі. Такога яшчэ не было ў нашай гісторыі». Гэту вялікую падзею ён адзначыў прыездам на Радзіму, што выклікала хвалю публікацый, успамінаў, сустрэч з тымі, хто быў знаёмы з ім у маладыя гады. І, вядома ж, была наладжана сустрэча настаўніка з былымі вучнямі, ініцыятарам якой быў Алесь Гатковіч — вучань Барыса Уладзіміравіча па гандлёвай школе (цяпер журналіст, піша пад псеўданімам А. Гілярчык, жыве ў горадзе Лідс, Англія). Ён расшукаў Барыса Кіта праз газету «Беларус», якую Барысу Кіту прыслаў яе рэдактар Янка Запруднік, Алесь Гатковіч такім чынам звязаўся з Барысам Уладзіміравічам і паміж імі пачалося актыўнае ліставанне з 1988 г. А. Гатковіч — шчыры прыхільнік Барыса Кіта, яны блізкія ідэйна і духоўна. Гэта ён паведаміў сваім былым аднакласнікам па гандлёвай школе, што з'явілася магчымасць сустрэцца з Барысам Уладзіміравічам на Бацькаўшчыне.

І сустрэча адбылася (19 чэрвеня 1992 г. у Маладзечне) — хвалюючая, незабыўна-радасная і адначасна з адчуваннямі смутку, тугі аб хутка праляцеўшых маладых гадах, блізкіх людзях, якіх ужо не было сярод іх.

Непасрэднымі арганізатарамі сустрэчы былі: Ірына Зубрыцкая — супрацоўніца Маладзечанскага гісторыка-краязнаўчага музея і былыя вучні Гандлёвай школы — Валянціна Ценцявіцкая і мастак Кастусь Харашэвіч. Ім удалося расшукаць і сабраць разам каля 40 чалавек. На сустрэчу прыйшлі многія жыхары Маладзечна і яго ваколіц, прысутнічалі Генадзь Каханоўскі (1936-1994) — вядомы вучоны і краязнавец, гісторык Мікола Ермаловіч, былі прадстаўнікі гарвыканкама, грамадскіх арганізацый, БНФ, многія журналісты. Афіцыйную частку вёў мэр горада Генадзь Карпенка. Усім хацелася паглядзець і паслухаць славутага земляка.

Выступаючы на сустрэчы на чыстай беларускай мове, якую ён пранёс праз усё жыццё, Барыс Кіт расказаў пра свой паўвекавы побыт за межамі Бацькаўшчыны, навуковую і педагагічную працу ў ЗША і Германіі, пра беларускую эміграцыю, горача падтрымаў ідэі нацыянальнага адраджэння.

Многіх прысутных цікавіла пытанне, як ён стаў сусветна вядомым вучоным? На гэта ён сціпла адказаў, што яго навуковая кар'ера — звычайная з'ява ў вольным свеце, што яму проста пашанцавала ў жыцці. Аднак няцяжка было зразумець, што для таго, каб трапіць у вышэйшую амерыканскую навуковую эліту, неабходны прыроджаны талент, нястомная праца, вялікія веды, бясконцае самаўдасканаленне.

Неафіцыйную частку сустрэчы адкрыў прафесар Петр Маркавіч Кузюковіч, пачаўшы яе словамі: «Барыс Кіт пачуў наш трывожны голас і прыехаў. Гэта першае вяртанне нашага настаўніка»... У выступленнях былых вучняў, юнакоў і дзяўчат, а цяпер пажылых людзей адчувалася пэўная стрыманасць у выказваннях, за якімі таілася вялікае хваляванне і ў той жа час вынік перажытага імі ў пасляваенныя гады, калі трэба было «трымаць язык за зубамі» дзеля ўласнай бяспекі. Але ва ўсіх выступленнях вар'іравалася думка, што, дзякуючым такім педагогам, як Барыс Кіт, яны сталі не толькі адукаванымі людзьмі, але і свядомымі беларусамі з выразна акрэсленым светапоглядам. І сапраўды, хто з іх да паступлення ў гандлёвую школу ведаў, як выглядаў беларускі нацыянальны сцяг, хто бачыў «Пагоню»? Беларуская моладзь, якая жыла ва Усходняй Беларусі, ведала толькі серп і молат і партрэты «бацькі ўсіх часоў і народаў». У Заходняй Беларусі са сцен польскіх школ глядзеў вусаты «дзядэк» Пілсудскі з польскай эмблемай белага арла — сваяка двухгадовага царскага сімвала.

Зерне беларускага адраджэння было кінуты менавіта ў гандлёвай школе, дзе на сцяне старога будынка вісеў бел-чырвона-белы сцяг і дзе яны ўпершыню ўбачылі «Пагоню». Тут вучняў пачалі далучаць да гісторыі роднага краю, мовы, літаратуры, мастацтва. Тут яны даведаліся пра яго мінулае, многія трагічныя старонкі сваёй радзімы.

І паліліся радасныя і сумныя ўспаміны на сустрэчы праз 50 гадоў: «Я і некаторыя жыхары нашага горада добра памятаем Барыса Уладзіміравіча, калі яму было крыху больш за 30 гадоў. Гэта быў вельмі інтэлігентны чалавек. Тактоўны ў адносінах як да навучэнцаў, так і выкладчыкаў школы. Руплівы ў арганізацыйных справах і пабацькоўску чулы да кожнага з нас, юнакоў і дзяўчат, якія наведвалі гэтую школу як з самога Маладзечна, так і з навакольных вёсак. Адчувалася, што галоўнай рысай усёй яго дзейнасці была шчырая адданасць асветніцкай справе ў плыні нацыянальнага адраджэння сярод беларускай моладзі...»

«...Майму пакаленню пашчасціла мець вас за настаўніка, які аддаваў сваё здароўе і сілу, каб адукаваць нас, малодшых, паставіць

на шлях да лепшае будучыні, зрабіць нацыянальна свядомымі. Наша падзяка вам бязмежная...»

«...Мяне кранула і ўзрушыла, што за такі доўгі час вы не забылі Радзіму і беларускую мову і цяпер так актыўна дапамагаеце нам перажыць цяжкі час...»

«...Гэта быў нялёгкі шлях — пачаць у чужой краіне з нуля і дасягнуць такіх вышынь...»

«...Аб вашай дабрыні, чалавечнасці ў мяне засталіся самыя светлыя ўспаміны. Памятаю, як вы ў чорным гарнітуры, малады, прыгожы, дэманстравалі на адным з інстытуцкіх вечароў, як трэба танцаваць мазурку...»

«...Цяжка ўявіць: праз паўвека мы сустрэліся з вамі, дырэктарам, якога паважалі і любілі... Вы — чалавек, які не можа жыць спакойна, для сябе. Вы, відаць, народжаны рабіць дабро. Такіх людзей на свеце мала...»

У выступленні В. Ценцявіцкай, падчас акупацыі вывезенай у Нямеччыну, раскрыўся драматычны лёс жанчыны, якой пашчасціла сустрэцца з Барысам Уладзіміравічам у лагерах перасяленцаў. І тут настаўнік прыйшоў на дапамогу сваёй вучаніцы ў яе роспачнай сітуацыі, аказаўшы садзеянне ў вяртанні на Радзіму.

Многія былыя гандлёўцы расказвалі пра тое, што вучоба ў школе стала для іх галоўным абвінавачаннем пасля вайны — НКВД узводзіла гэту звычайную справу ў ранг супрацоўніцтва з немцамі, за што яны траплялі ў ГУЛАГ і там завяршалі сваю «адукацыю». Кругі апраметнай, апісаныя Дантэ ў «Боскай камедыі», здаліся б раем у параўнанні са сталінска-берыеўскімі канцлагерамі. І тое, што яны пабачылі, перажылі там, страшней «Архіпелага ГУЛАГа» А. Салжаніцын.

Былы вучань Барыса Уладзіміравіча, цяпер прафесар медыцыны Пётр Маркавіч Кузюковіч у сваёй прамове на сустрэчы падкрэсліў, што ніякага супрацоўніцтва з акупантамі не было і не магло быць, моладзь проста вучылася ў беларускай школе, у беларускіх настаўнікаў, як рабілі іх аднагодкі ва ўсім свеце, засвойваючы азы нацыянальнай адукацыі і культуры. Аднак і немцы, і савецкія ўлады непрымальна ставіліся да нацыянальнага ўздыму, нацыянальнага адраджэння. Менавіта за гэтыя ідэі не раз гестапаўцы арыштоўвалі Барыса Кіта, а пасля вайны ён, як і многія яго вучні, бясспрэчна трапіў бы ў ГУЛАГ, калі б не пайшоў у выгнанне.

Ніколі не думаў прафесар, што яму давядзецца пабачыць свайго настаўніка, пра якога не чуў усе гэтыя 50 гадоў. З гонарам за беларусаў гаварыў ён пра вялікія здольнасці Барыса Кіта як вучонага, які змог стаць паплечнікам і працаваць разам з сусветна вядомымі

людзьмі, захаваўшы свой патрыятызм, любоў да Бацькаўшчыны, што выхоўвалася ў яго з маладых гадоў. «Барыс Уладзіміравіч мог бы, — гаварыў прафесар Кузюковіч, — скончыўшы універсітэт, пайсці працаваць у любую польскую прэстыжную школу, але вырашыў вучыць бедных беларускіх дзяцей. І ў перыяд вайны, калі ён арганізаваў гандлёвую школу, мы адчувалі тут толькі свой родны беларускі дух, толькі беларускае ўзгадаванне. Гэты настрой ствараў Барыс Кіт разам з беларускімі настаўнікамі. Дарэчы, многіх з іх ён выратоўваў з лагераў ваеннапалонных, даваў прытулак і работу. Ад дырэктара залежала, што ў інстытуце былі такія дэмакратызм, з'яднанасць. Ён імкнуўся даць нам усебаковую адукацыю, асабліва гуманітарную. Працавалі факультатывы па музыцы, жывапісу, выкладаліся эстэтыка, этыка. Але я і па сённяшні дзень захапляюся унікальным талентам свайго настаўніка выкладаць матэматыку, выключна даходліва тлумачыць гэты складаны прадмет вучням. Многае я пераняў ад яго методыкі, калі ўжо сам навучаў студэнтаў. Мяне здзіўляе і захапляе шчырая беларускасць Барыса Кіта. Іншы на яго месцы задаволіўся б дасягнутым, спакойна спажываў плён сваёй нялёгкай працы і сусветнай вядомасці, а ён, нягледзячы на тое, што амаль быў забыты на Беларусі, вярнуўся, каб зрабіць штосьці карыснае для Бацькаўшчыны. На мой погляд, патрыятычная дзейнасць Барыса Кіта адпавядае поглядам Максіма Багдановіча, якія выказаны ў цудоўным вершы «Пагоня»: «Толькі ў сэрцы трывожным пачую за краіну радзімую жах...» І сапраўды, Барыс Кіт заўсёды там, дзе ўзнікае пагроза беларускасці. У 30-я гады ён вядзе барацьбу з польскімі ўладамі за існаванне беларускіх школ. У час нямецкай акупацыі з неймавернымі цяжкасцямі адкрывае гандлёвую школу ў Маладзечне, працуе на ніве беларускага асветніцтва. І цяпер, у перыяд станаўлення незалежнасці Беларусі, такой хісткай і няпэўнай, ён захоплены ідэяй стварэння нацыянальнага універсітэта з шырока разгалінаванымі філіяламі па гарадах рэспублікі. Цяжка і крыўдна ўсведамляць, што такія людзі вымушаны былі пакідаць Радзіму, свой народ і працаваць за мяжой, аддаючы веды і талент чужой краіне. Але і там ён зрабіў шмат для роднай Беларусі, даказаў, што і беларусы нечага вартыя, не горшыя за іншых. Ён праславіў беларускую нацыю, якая павінна ведаць яго, як ведае і памятае сваіх слаўных сыноў...»

Удзельнікі гэтай памятнай сустрэчы наведалі разам з шаноўным госцем Маладзечанскі гісторыка-краязнаўчы музей, дзе была адкрыта унікальная экспазіцыя беларускага нацыянальнага адраджэння. З цікавасцю разглядалі цяперашнія пасівелыя людзі сябе, маладых, прыгожых, на групавых фотаздымках былых вучняў гандлёвай

школы. Яны тады яшчэ не ведалі, якія цяжкасці лягуць на плечы многіх з іх, і пазіралі на свет весела, з усмешкамі, з адкрытымі, даверлівымі тварамі.

Былы выхаванец школы, а цяпер вядомы беларускі мастак Кастусь Харашэвіч падрыхтаваў да сустрэчы выстаўку сваіх палотнаў, на якіх прысутным адкрыліся маляўнічыя беларускія пейзажы, карціны мілай сэрцу беларускай прыроды, тужлівай і светлай, якая натхняла не адно пакаленне мастакоў.

Закончылася сустрэча застоллем, дзе гучалі «Пагоня», «Мы выйдзем шчыльнымі радамі», «Люблю наш край» — песні іх маладосці, вывучаныя падчас навучання ў гандлёвай школе. Гісторык Мікола Ермаловіч прачытаў купалаўскія радкі, незвычайна сугучныя настрою ўдзельнікаў сустрэчы:

*Пачаць збіраць зярно к зярняці,*
*Былое ў думках уваскрашаць,*
*Каб быт на новы лад пачаці*
*І сейбу новую пачаць...*

Гэтыя прарочыя словы. Наш — бел-чырвона-белы сцяг. Гэта покліч «Пагоні» да ўсенароднага нацыянальнага адраджэння, да яднання беларусаў, зерне якога пачаў і працягвае сеяць разам са сваімі

Б.Кіт у Інстытуце фізікі АН Беларусі. Мінск. 1992 г.

сеяць разам са сваімі вучнямі і паслядоўнікамі на Бацькаўшчыне Барыс Кіт.

Але не толькі са сваімі былымі вучнямі сустракаўся Барыс Уладзіміравіч улетку 1992 года, калі першы раз прыехаў на Беларусь. Ён пабываў у Акадэміі навук, пазнаёміўся з акадэмікамі Ф. Фёдаравым, Р. Гарэцкім, членам-карэспандэнтам В. Грыбкоўскім, які падараваў яму сваю кнігу «Лазеры» (дарэчы, Барыс Уладзіміравіч асабіста ведаў Нрохарава, Басава — таленавітых рускіх вучоных, даследчыкаў лазераў). Яго прыняў міністр замежных спраў Пётр Кузьміч Краўчанка, з якім склаліся добрыя ўзаемаадносіны (праз садзеянне міністра Барыс Уладзіміравіч змог першы раз прыехаць на Бацькаўшчыну, затым перадаць сваю навуковую спадчыну, розныя дакументы і матэрыялы ў Наваградскі гісторыка-краязнаўч ы музей, а ў сакавіку 1994 г. П. Краўчанка і былы пасол Беларусі ў Германіі П. Садоўскі запрасілі Барыса Уладзіміравіча разам з Тамарай прыехаць з Франкфурта ў Бон на адкрыццё беларускага пасольства.

Барыс Кіт быў таксама цёпла сустрэты ў калектыве Беларускай Энцыклапедыі, які ўзначальваў тады Міхась Аляксандравіч Ткачоў. Вядомы вучоны, грамадскі дзеяч, да якога Барыс Уладзіміравіч ставіўся з вялікай павагай, паспеў да сваёй заўчаснай смерці пакінуць у

кнізе «Вялікае мастацтва артылерыі» (серыя «Нашы славутыя землякі») уласнае вызначэнне месца Барыса Кіта ў гісторыі навукі: «На небасхіле беларускай нацыянальнай навукі нямала зорак першай велічыні. Адна з іх ззяе сваім нязгасным святлом вось ужо больш як 300 гадоў. Гэта Казімір Семяновіч, ураджэнец беларускай зямлі, выдатны вучоны ў галіне артылерыі і піратэхнікі. Яго геній выкарыстоўваем мы сёння, пасылаючы да Месяца, Сатурна, Марса ды іншых планет касмічныя апараты з дапамогай шматступеньчатых ракет. Прататып, будову і стабілізатары гэтых складаных ракет ён распрацаваў яшчэ ў сярэдзіне XVII стагоддзя. Сімвалічна, што цяпер ужо цэлы шэраг нашых суайчыннікаў займаюцца праблемамі ракетнай тэхнікі. Тут пальму першынства мусім аддаць ураджэнцу Навагрaдчыны, сыну простага селяніна з вёскі Агароднікі Барысу Кіту. І сёння, гаворачы пра стваральнікаў ракетнай тэхнікі, мы павінны ўсведамляць, што сярод выдатных ракетчыкаў і інжынераў побач з беларусам К. Семяновічам, англьцам У. Кангрэвам, французам Р. Эно-Пельтры, амерыканцам Р. Годардам, немцамі Г. Обэртам і фон Браўнам, рускімі К. Цыялкоўскім і С. Каралевым назаўсёды прапісалася імя Барыса Кіта».

Скрануўся лёд адчужанасці, бяспамяцтва і на Беларусі ў адносінаах да тых, хто не па сваёй волі і без усялякай віны вымушаны былі пакідаць Радзіму. Дарэчы, першынство ў адкрыцці імя Барыса Кіта на Беларусі належыць заснавальніку Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, дырэктару Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны, прафесару Адаму Мальдзісу, які ў свой час звярнуўся да прэзідэнта Акадэміі навук Л. Сушчэні з прапановай аб абранні Барыса Уладзіміравіча Кіта — акадэміка Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі — замежным членам Акадэміі навук Беларусі, характарызуючы яго як актыўнага і таленавітага навукоўца ў галіне гісторыі астранаўтыкі і матэматыкі, энцыклапедыста, які валодае унікальнымі звесткамі па гісторыі адукацыі ў Беларусі, гісторыі беларускага нацыянальнага руху. Вядомы беларускі пісьменнік Барыс Сачанка ў кнізе «Сняцца сны аб Беларусі» (1990 г.), у якой сабрана асноўная інфармацыя пра беларускую эміграцыю пасляваеннага часу, ставіў прозвішча Барыса Кіта на першае месца сярод вучоных беларусаў замежжа.

Сам Барыс Кіт, памятаючы сваю асветніцкую працу ў беларускім школьніцтве, напоўнены жаданнем зрабіць штосьці карыснае, практычна-дзейснае для Бацькаўшчыны. Гэту добрую традыцыю ён ніколі не перапыняў, дапамагаў беларусам-землякам на эміграцыі і ў выданні кніг, і ў станаўленні і наладжванні рэгулярных радыёперадач для беларусаў, якія жывуць у Аўстраліі, у арганізацыі беларускага

музея ў нямецкім горадзе Ляймене. Дарэчы, у Берліне створана навуковая арганізацыя "Міжнароднае таварыства для абмену навукі імя Барыса Кіта". Гэта арганізацыя не з'яўляецца чыста беларускай, хаця на чале яе стаіць беларус — Валерый Віктаравіч Зарэцкі (нарадзіўся ў Віцебску, адукацыю атрымаў у Мінску, вучоны-фізік. Быў запрошаны для работы ў Германію).

Восенню 1992 года Барыс Кіт праз Міністэрства замежных спраў Беларусі перадаў сваю навуковую і асабістую спадчыну ў Навагрардскі гісторыка-краязнаўчы музей, дзе адкрыты мемарыяльны пакой Барыса Кіта і дзе, дарэчы, знаходзіцца яго партрэт, намаляваны беларускай мастачкай Раісай Сіплевіч, якая надзвычай тонка і па-мастацку грунтоўна змагла раскрыць рысы свайго славутага земляка, падкрэсліць сціпласць, чалавечнасць шчырага беларуса і знакамітага вучонага. Мы бачым яго ў прафесарскай мантыі, асветленага духоўнай прыгажосцю, у глыбокай засяроджанасці. Ён быццам углядаецца ў нас добрымі праніклівымі вачыма, імкнучыся зразумець, хто мы — беларусы — сёння і куды кіруемся.

У ліпені 1993 г. адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя «3-я Навагрудскія чытанні», у якой прынялі ўдзел вучоныя з Мінска, Гродна, Вільнюса, Масквы, Беластока. На канферэнцыі з паведамленнем пра архіў Барыса Кіта выступіла дырэктар Навагрудскага гісторыка-краязнаўчага музея Тамара Вяршыцкая: «У лютым 1993г. сусветна вядомы вучоны ў галіне астранаўтыкі, доктар філасофіі ў галіне матэматыкі, прафесар філіяла Мэрылендскага універсітэта ў Гайдэльбургу Барыс Уладзіміравіч Кіт перадаў у фонды нашага музея першую частку свайго асабістага архіва. На працягу года матэрыялы працягвалі паступаць, і зараз архіў Б. У. Кіта ў фондах музея налічвае звыш 300 адзінак захавання.

Маладосць і пачатак дзейнасці нашага славутага земляка прыпадаюць на 20-я гады — перыяд беларускага Адраджэння, калі Барыс Уладзіміравіч спачатку вучыўся, а потым сам выкладаў матэматыку і быў дырэктарам Навагрудскай беларускай гімназіі, той самай «элітарнай» беларускай школы, якая, нягледзячы на цяжкі матэрыяльны стан, узгадавала некалькі соцень надзвычай адукаваных, таленавітых людзей, пазначыўшы іх пячаткай высокай маралі і інтэлігентнасці, выхавала іх адзін раз і на ўсё жыццё беларусамі з пачуццём уласнай годнасці за сваю нацыю. Гэты перыяд яго жыцця прадстаўлены выключна каштоўнымі для музея матэрыяламі: пасведчаннем Навагрудскага акружнога школьнага інспектарыята за подпісам школьнага інспектара доктара А. Орсы аб здачы Катам экзамена па лацінскай мове па праграме гімназіі гуманітарнага тыпа, шматлікімі пас-

ведчаннямі Віленскага акружнога школьнага кураторыума аб прызначэнні Кіта ў склад дзяржаўнай адукацыйнай камісіі ў якасці экзаменатара па матэматыцы для абітурыентаў беларускага філіяла гімназіі імя А. Міцкевіча ў Навагрудку, заліковай кніжкай студэнта матэматычна-прыродазнаўчага факультэта універсітэта імя Стэфана Баторыя ў Вільні, пасведчаннем Барыса Кіта — настаўніка матэматыкі гімназіі імя Славацкага ў Вільні, пасведчаннем аб прызначэнні Кіта ў склад экзаменацыйнай камісіі па прыёму экзамена па беларускай мове ў гэтай жа гімназіі, заліковай кніжкай студэнта факультэта медыцыны Мюнхенскага універсітэта, пропускам студэнта факультэта электратэхнікі тэхнічнага інстытута ў Карлсруэ, якія сведчаць аб неаслабнай празе да ведаў і настойлівасці ў дасягненні пастаўленай мэты.

Шматлікія фотаздымкі знаёмяць з бацькамі Барыса Уладзіміравіча, калегамі па працы ў Маладзечне ў гады вайны, калі ён, ратуючы моладзь ад вывазу ў Германію, арганізаваў нелегальны адміністрацыйна-гандлёвы інстытут, знаёмяць з сябрамі па беларускай эміграцыі, яго сям'ёй у Амерыцы. Цэлыя альбомы фотаздымкаў расказваюць аб удзеле Б. У. Кіта ў розных міжнародных кангрэсах аэранаўтыкі, шматгадовай педагагічнай дзейнасці ў Мэрылендскім універсітэце. Ён не згубіўся ў разнастайным свеце эміграцыі. Ён заўсёды быў і застаўся беларусам, на працягу ўсяго жыцця здабываючы сваёй дзейнасцю гонар і славу Беларусі, і надзвычай таленавітым, што прызнана вядучымі навуковымі таварыствамі свету, і кранальна сціплым чалавекам. Аб высокіх дасягненнях прадстаўніка беларускай нацыі сведчаць ганаровыя дыпломы акадэміка Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі, Амерыканскага і Нямецкага астранаўтычнага таварыстваў, Брытанскага Міжпланетнага таварыства, Міжнароднага аб'яднання імя Германа Обэрта-Вернера фон Браўна і інш.

Навуковая спадчына Барыса Уладзіміравіча прадстаўлена «Падручнікам па выкарыстанню ракетнага паліва», напісаным у сааўтарстве з І. Дугласам, дакладамі на навуковых сімпозіумах і канферэнцыях, доктарскай дысертацыяй, прысвечанай вывучэнню навуковай спадчыны вядомага польскага матэматыка Антонія Зыгмунда. Вялікую частку архіва складае перапіска Кіта з прадстаўнікамі беларускай эміграцыі, а таксама перапіска з рознымі фондамі і навуковымі ўстановамі Еўропы і Амерыкі наконт адкрыцця ў Навагрудку гуманітарнага універсітэта, ідэя стварэння якога належыць Барысу Уладзіміравічу».

Захапіўшыся гэтай ідэяй, ён распрацаваў ужо нават прыкладную праграму па ўзору славутых еўрапейскіх і амерыканскіх універсітэтаў.

На яго думку, Беларускі нацыянальны універсітэт павінен мець, галоўным чынам, гуманітарны напрамак з факультэтамі:

1. Беларусістыкі: мова, літаратура, гісторыя, археалогія Беларусі.
2. Славістыкі і заходнееўрапейскай гуманісты«.
3. Агульнай гісторыі, палітычных навук, дыпламатыі.
4. Эканомікі і камерцыі.

Адкрыццё такога універсітэта вымагаецца сучасным нацыянальным адраджэннем. Цэнтр яго павінен быць у сталіцы, але з шырока разгалінаванымі філіяламі ва ўсіх абласцях Беларусі, і найперш у гарадах Наваградак і Маладзечна, адкуль пачынаўся шлях Барыса Кіта ў вялікае жыццё. Ён цяпер увесь у пошуках спонсараў для ажыццяўлення гэтай патрыятычнай ідэі, разаслаў больш за тысячу лістоў у самыя розныя фірмы, арганізацыі, пабываў у Вашынгтоне, дзе разам са сваім адвакатам Леслі Тэнанам (акадэмік Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі па законах космасу, аўтар шматлікіх публікацый па праблемах космасу, захапіўся ідэяй Барыса Кіта па заснаванню Беларускага нацыянальнага універсітэта, бескарысліва прапанаваў сваю дапамогу як адвакат, апрацаваў форму ліста, праявіў вялікую актыўнасць, нават жаданне паехаць на Беларусь для чытання лекцый у гэтым універсітэце), паслаў заявы ў Фордаўскую, Ракфелераўскую, Гётэфундацыі, Карнегікарпарацыён, Ананбергфундэйшн, Меркфундэйшн, Фонд Сораса, многія іншыя вядомыя фундацыі. Аднак у сувязі з апошнімі падзеямі на Беларусі ніхто асабліва не спяшаецца ўкладваць сродкі ў развіццё яе культуры, эканомікі).

Захоплены патрыятычнай ідэяй Барыса Кіта і на Беларусі, творчая, навуковая інтэлігенцыя, выкладчыкі ВНУ горача падтрымліваюць пачынанні вучонага. Быў створаны камітэт рэалізацыі ідэй Барыса Кіта, падрыхтаваны праект пераўтварэння Мінскага інстытута культуры ў Беларускі нацыянальны універсітэт, які зацверджаны на калегіі Міністэрства культуры Беларусі. І гэта ідэя здзейснілася.

Шостага красавіка 1993 года ў Беларускім універсітэце культуры адбылася ўрачыстасць, прысвечаная знаёмству студэнтаў і выкладчыкаў з жыццём і дзейнасцю Барыса Уладзіміравіча Кіта з нагоды дня нараджэння вучонага, на якой выступілі Адам Мальдзіс, Юры Хадыка, Вольга Іпатава, Руслан Качаткоў, Лідзія Савік. Адбыўся святочны канцэрт. Быў прыняты прывітальны адрас са словамі ўдзячнасці: «...там, за мяжою, Вы ўсёй душою з намі, дапамагаеце роднай Беларусі і словам, і справай...». Запіс гэтай урачыстасці, юбілейны адрас з віншаваннямі былі адпраўлены Барысу Кіту ў Франкфурт-на-Майне, а паведамленне пра гэту падзею было перададзена па тэлебачанні. На малой радзіме Барыса Кіта ў Карэлічах 5-6 чэрвеня

1993 г. праходзілі першыя Карэліцкія краязнаўчыя чытанні, арганізаваныя Карэліцкім райвыканкамам і Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам імя Ф. Скарыны, дзе былі прачытаны даклады з гісторыі Карэліцкага краю, прагучалі паведамленні, расказы пражыццё і дзейнасць славутых людзей, якіх узгадавала гэта шчодрая зямля. Барыс Кіт — яе жывая гісторыя, сучаснік і легенда для тых шматлікіх землякоў, якія прысутнічалі ў зале і якія жылі побач з яго бацькамі, блізкімі людзьмі, маглі бачыць родную сястру Барыса Уладзіміравіча — Ірыну Уладзіміраўну — прыгожую, сціплую жанчыну, незвычайна знешне падобную на старэйшага брата. Яна прыйшла паслухаць, што скажуць пра яго людзі, згадзілася паказаць месца, дзе калісьці стаяла хата Кітоў у Агародніках, якія цяпер сталі адной з карэліцкіх вуліц. Ціхая вясковая ўскраіна, зеляніна садоў, агародаў, поплаў за імі, блакіт возера, недалёкі лес. На месцы старой хаты стаіць прыгожы, дагледжаны дамок, жывуць тут чужыя людзі. Барыс Уладзіміравіч, калі быў тут улетку 1992 года, нічога не пазнаў на сваім родным паселішчы. І толькі высокая, стромкая груша і кашлатая яблыня прыветна прашумелі яму сваім лісцем у падзяку за тое, што пасадзіў іх некалі на бацькоўскай зямлі, куды ён вярнуўся з далёкіх дарог і ўжо назаўсёды...

І Барыс Кіт сапраўды вярнуўся на Бацькаўшчыну, у духоўнае жыццё Беларусі, у яе гісторыю і памяць удзячных суайчыннікаў. Больш частымі сталі яго прыезды не толькі на Беларусь, але і ў Маскву (па справах акадэміі Еўразіі), у Вільню — горад сваёй маладосці.

Дзесяць дзён, з 20 па 30 верасня 1994 года доўжыўся яго другі прыезд на Радзіму. Запрошаны на адкрыццё Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, што адбывалася ў Мінску, Барыс Уладзіміравіч быў абраны яе віцэ-прэзідэнтам і правадзейным акадэмікам. Удзел у пасяджэннях акадэміі не перашкаджаў, аднак, яго сустрэчам з многімі людзьмі, наведванню многіх устаноў і родных мясцін.

У час прылёту з Франкфурта-на-Майне ў Мінскім аэрапорце-2 яго цёпла віталі прадстаўнікі Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», навуковага Скарынінскага цэнтра, група кінастудыі «Беларусьфільм», якая на працягу ўсяго знаходжання суправаджала вучонага ў паездках, здымаючы дакументальны фільм "Барыс Уладзіміравіч Кіт." У першы ж дзень свайго прыезду ён наведаў сядзібу «Бацькаўшчыны», Скарынінскі цэнтр, дзе адбылося яго знаёмства з вядомымі вучонымі-беларусістамі, на якой аб задачах і праблемах акадэміі Еўразіі гаварыў Я. Я. Шыраеў (акадэмік, таксама беларус, жыве ў Маскве).

Сяброўскай і працяглай наступным днём была сустрэча Барыса Уладзіміравіча з супрацоўнікамі рэдакцыі «Голас Радзімы» (рэдактар Вацлаў Мацкевіч). Ён адчуваў сябе тут як дома, вольна і нязмушана, шмат расказваў пра падзеі на Захадзе, адказваў і сам задаваў пытанні. Ён быццам знаходзіўся сярод блізкіх і даўно знаёмых сяброў, і гэта не толькі таму, што газета шмат друкавала матэрыялаў пра Б. Кіта, але і таму, што яна стала вельмі цікавай і змястоўнай, пастаянна змяшчае артыкулы пра дзеячаў беларускай эміграцыі, дае аб'ектыўную інфармацыю пра падзеі на Беларусі, вяртае Бацькаўшчыне незаслужана забытыя або раней забароненыя імёны таленавітых беларусаў, іх творчую і навуковую спадчыну.

Як педагог, настаўнік, прафесар матэматыкі Вашынгтонскага Мэрылендскага універсітэта і яго філіялаў у Еўропе, Барыс Уладзіміравіч не мог не пабываць у мінскіх навучальных установах. Ён наведаў Беларускі тэхналагічны універсітэт, Беларускі універсітэт культуры, адну з мінскіх сярэдніх школ з матэматычным ухілам.

У Тэхналагічным універсітэце Барыс Уладзіміравіч агледзеў галерэю славутых беларускіх вучоных, дзе знаходзіўся і яго партрэт. Галерэя створана энтузіязмам выкладчыкаў (укладальнік яе Яраслаў Міляшкевіч — старшыня Таварыства беларускай мовы універсістэта, партрэты маляваў мастак Хведар Кашкурэвіч) і прысвечана слынным сынам і дочкам зямлі беларускай, якія здабылі і гонар і славу як сваёй нацыі, так і народам іншых краін, увайшлі ў гісторыю сусветнай навукі.

*Гэта такія імёны, як:*

**Казімір Семяновіч** (1600-1651) — першы ракетчык Еўропы, вучоны-прыродазнавец, аўтар працы «Вялікаемастацтва артылерыі», вынаходнік шматступеньчатай ракеты, генерал-лейтэнант артылерыі.

Ураджэнец Віцебшчыны (зямля Дубровенская).

**Марцін Пачабут-Адляніцкі** (1728-1810) — астраном і асветнік, заснавальнік астранамічнай школы ў Вільні. Стваральнік і дырэктар Віленскай абсерваторыі, рэктар Віленскага універсітэта.

Паходжання з Гарадзеншчыны (в. Смалянцы).

**Ігнат Дамейка** (1802-1889) — знакаміты даследчык-геолаг Чылі, рэктар універсітэта ў Сант'яга, вялікі асветнік. Удзельнік паўстання на Беларусі 1830—1831 гг. Народны герой Чылі.

Родам з Наваградчыны (м. Нядзведка, каля Міра).

**Тэадор Нарбут** (1784-1864) — гісторык, археолаг, вайсковы інжынер, аўтар «Гісторыі літоўскага народа» (9 тамоў). Даследчык гісторыі Вялікага княства Літоўскага.

Ураджэнец Гарадзеншчыны (м. Шаўры, Воранаўскі раён).

**Канстанцін Тышкевіч** (1806-1868) — археолаг, этнограф, гісторык, пачынальнік беларускай навуковай археалогіі, заснаваў Віленскі музей старажытнасцей.

Нарадзіўся і працаваў на Міншчыне (г. Лагойск).

**Яўстах Тышкевіч** (1814-1873) — археолаг, гісторык, краязнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі. Заснавальнік і старшыня Віленскай археалагічнай камісіі.

Паходжання з беларускага магнацкага роду XVI стагоддзя. Нарадзіўся ў Лагойску, радавым гняздзе графоў Тышкевічаў.

**Уладзіслаў Дыбоўскі** (1838-1910) — вучоны-прыродазнавец. У Мінскім павеце праводзіў навуковыя даследаванні па заалогіі, палеанталогіі і батаніцы, якія прынеслі яму еўрапейскую вядомасць.

Ураджэнец Меншчыны (м. Адамарын).

**Якуб Наркевіч-Ёдка** (1847-1905) — вучоны-фізік, урач, вынаходнік-першапраходца, аўтар адкрыцця спосабаў электраграфіі і дастасавання яе да мэт дыягностыкі.

Ураджэнец Уздзеншчыны (м. Наднёман).

**Аляксандр Кавалеўскі** (1840-1901) — біёлаг-эвалюцыяніст, заснавальнік эмбрыялогіі, эксперыментальнай і эвалюцыйнай гісталогіі, акадэмік.

Ураджэнец Віцебшчыны (м. Шусцянцы).

**Соф'я Кавалеўская, н. Корвін-Крукоўская** (1850-1891) — славуты матэматык, першая жанчына — член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук, прафесар Стакгольмскага універсітэта, грамадскі дзеяч.

Паходжання з Віцебшчыны (в. Палібіна).

**Уладзімір Кавалеўскі** (1842-1883) — заолаг, заснавальнік эвалюцыйнай палеанталогіі. Аўтар класічных прац, упершыню выкарыстаў вучэнне да праблемы філагенезу хрыбетных.

Ураджэнец Віцебшчыны (м. Шусцянцы).

**Аляксандр Маліноўскі** (Багданаў, 1873-1928) — філосаф, эканаміст, урач, палітычны дзеяч, пісьменнік-фантаст. Заснавальнік першага ў свеце Інстытута клінічнай і эксперыментальнай гематалогіі і пералівання крыві, яго дырэктар. Аўтар першага ў Расіі навуковага курса эканомікі. Стваральнік падмурка новай навукі — кібернетыкі.

Ураджэнец Гарадзеншчыны (в. Саколка).

**Яўхім Карскі** (1861-1931) — заснавальнік беларускай філалогіі, мовазнаўства, фальклярыст, адзін з найбуйнейшых даследчыкаў славянскіх моў, акадэмік.

Ураджэнец Гарадзенскага павета (в. Наша).

**Мітрафан Доўнар-Запольскі** (1867-1934) — гісторык, фалькларыст, этнограф, заснавальнік беларускай гістарычнай навукі, прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта, акадэмік.

Ураджэнец Гомельшчыны (г. Рэчыца).

**Міхаіл Курака** (1872-1920) — металург, заснавальнік расійскай школы доменшчыкаў, выдатны вынаходнік.

Ураджэнец Магілёўшчыны (в.Казелле пад Краснаполлем).

**Павел Кабека** (1897-1954) — фізік, буйны спецыялісту галіне фізікі цвёрдага цела, заснавальнік навуковай школы. Стварыў тэарэтычную базу вытворчасці пластмасаў.

Узгадаваны на зямлі Мсціслаўшчыны (м. Кудрычы).

**Аляксандр Чыжэўскі** (1897-1964) — вялікі пераўтваральнік прыродазнаўства, заснавальнік геліябіялогіі і аэраіонафікацыі. Адкрыў метахрамезію бактэрый (эфект Чыжэўскага-Вельховера).

Ураджэнец Беласточчыны (г. Цехановец).

**Леў Арцымовіч** (1900-1973) — сусветна вядомы фізік-атамшчык, упершыню атрымаў кіраваную тэрмаядзерную рэакцыю, акадэмік, член Амерыканскай акадэміі навук і мастацтваў. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Са старажытнага беларускага роду.

**Ільля Прыгожын** (1917) — фізік, хімік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па хіміі (1977), прэзідэнт Бельгійскай акадэміі навук, стваральнік тэорыі неабарачальных працэсаў.

Паходжання з Магілёўшчыны.

**Барыс Кіт** (1910) — вучоны-матэматык, распрацоўшчык і канструктар першых касмічных сістэм, вынаходнік паліва для касмічных караблёў, дарадчык урада ЗША па астранаўтыцы, прафесар Мэрылендскага універсітэта, доктар філасофіі. Акадэмік Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі.

Ураджэнец Наваградчыны (в. Агароднікі, Карэлічы).

Барыс Уладзіміравіч з вялікай увагай і цікавасцю агледзеў галерэю, быў сфатаграфаваны і зняты на кінакамеру каля ўласнага партрэта.

Затым рэктар універсітэта, прафесар Іван Міхайлавіч Жарскі пазнаёміў Барыса Уладзіміравіча з прафесарска-выкладчыцкім складам універсітэта, арганізацыяй навучальнага працэсу. Адбыўся дынамічны, зацікаўлены дыялог матэматыкаў, якіх хвалявалі не толькі чыста прафесійныя навуковыя праблемы, але і жыццёвыя, вострaнадзённыя пытанні выжывання беларускай нацыі («Што дапамагло Вам у эміграцыі выстаяць, узняцца?», «Выжылі, пабывалі ў многіх краінах, былі

педагогам — як і ў чым можна параўнаць моладзь?», «Як выратаваць навуку, у прыватнасці матэматыку?», «Чаму не знайшлося на Беларусі ў 30-я гады выдатных лідэраў, якія б маглі павесці за сабой нацыю?» — гэтыя і многія іншыя пытанні ўзнікалі падчас размовы ў рэктарскім кабінеце). Прафесар Аляксей Саламонаў прачытаў свой патрыятычны верш, які надзвычай адпавядаў моманту і духу сустрэчы: «Я навекі з табой, Беларусь!»:

Свет в ялік, дзе нямала цікавых
І прыгожых, цудоўных мясцін,
Шмат людзей працавітых, яскравых,
Многа розных багатых краін...
Я ж не ведаю іншага краю
Чым ты, маці мая, Беларусь.
Ты не яркая звонку, сабою
І не маеш марскіх берагоў,
Толькі я не разлучны з табою
Пры любым спалучэнні ўмоў...

Але найглыбей уразілі Барыса Уладзіміравіча нашы маладыя таленты ў Беларускім універсітэце культуры, дзе ён прысутнічаў на занятках, рэпетыцыях у класе Дробыша (народная творчасць, ансамбль «Валачобнікі»), у класе Бяляевай (народная харэаграфія, ішла рэпетыцыя сучасных і старажытных абрадавых танцаў), слухаў выступленне аркестра народнай музыкі, ансамбля «Спадчына» (кіраўнік Альбіна Скарабагатчанка), якія яму прадстаўляла рэктар універсітэта Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч.

І ўжо зусім па-маладому адчуваў сябе Барыс Уладзіміравіч на сустрэчы з вучнямі Мінскага матэматычнага ліцэя. Ён быццам вярнуўся ў сваё юнацтва, успомніў пра гады, калі выкладаў матэматыку ў Віленскай, Навагрудскай гімназіях. «Я проста шчаслівы, што вас тут бачу. Я быў настаўнікам і дырэктарам беларускіх гімназій, але я, пражыўшы жыццё на эміграцыі, ніколі не забываў Радзімы, сваёй мовы. Я вельмі люблю матэматыку, без яе немагчыма ўявіць наша жыццё, яна — аснова ўсіх навук, нават гуманітарных. Я доўгі час працаваў у касмічных даследаваннях, дзе ўсё пабудавана на матэматыцы. Яна дала пачатак камп'ютэрам, цяпер касмічная, камп'ютэрная эпоха. Падарожжа на Месяц вырахавана матэматыкамі, гэта вялікае дасягненне чалавецтва. Працуючы ў аддзеле астранаўтыкі, я даследаваў усё, што тычылася плыўкага вадароду, сёння ён аснова касмічных палётаў. Але з усіх прафесій я вылучаю настаўніцкую, я ніколі яе не пакідаў, увесь час працаваў настаўнікам — і на Беларусі, і ў далёкай Амерыцы. Гэта так пачэсна — несці святло ведаў

моладзі. Вы пойдзеце далей, будзеце развіваць навуку. Усё мяне ўсцешвае на Радзіме, асабліва вы, маладыя, вы — мой працяг...»

Можа першы раз у жыцці бачылі вучні жывога беларуса-эмігранта, акадэміка Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі, які, пражыўшы 50 гадоў за межамі Бацькаўшчыны, так цудоўна гаварыў па-беларуску. Яны распытвалі пра асабістае я го жыццё, пра сыноў, жыццё ў Амерыцы, пыталіся, якімі мовамі валодае, прасілі расказаць пра славутага беларуса-матэматыка XVI стагоддзя Семяновіча, які пачынаў тое, да чаго прыйшоў Цыялкоўскі ў XIX стагоддзі, цікавіліся, ці паляцяць людзі ў XX стагоддзі на Марс... Агульная мова была знойдзена, з вучнямі гаварыў сапраўдны настаўнік...

Дарэчы, агульную мову ён можа знаходзіць з людзьмі самых розных узростаў і прафесій. Падчас пасяджэнняў Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі Барыс Уладзіміравіч пазнаёміўся з мітрапалітам Філарэтам, мэрам Мінска А. Герасіменкам, старшынёй Нацыянальнага банка Беларусі С. Багданкевічам, размаўляў з акадэмікам Р. Гарэцкім, мэрам Маладзечна Г. Карпенкам, з якімі меў сустрэчы яшчэ ў свой першы прыезд, з многімі вядомымі рускімі вучонымі. На спатканні з ім прыходзілі і прыязджалі яго былыя вучні: з Вільні прыехаў Расціслаў Мілюк, з Мінска акадэмік Алесь Раковіч. Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч падарыў Барысу Уладзіміравічу свой новы зборнік вершаў «На высокім алтары» з кранальным надпісам: "Слыннаму сыну Беларускай зямлі акадэміку Барысу Уладзіміравічу Кіту — у незабыўны дзень нашага асабістага знаёмства. Наздароў, Божа, Вялікага Чалавека нашага! Маці-Беларусі вельмі патрэбна яго моц і здароўе. Ніл Гілевіч. 22.9.94. Менск."

Барыс Уладзіміравіч атрымаў ад беларусаў Вільні, старшыні беларускай суполкі ў Літве Пятра Малафея афіцыйнае запрашэнне ў 1995 годзе наведаць Вільню, адзначыць там 85-гадовы юбілей, пахадзіць па мясцінах сваёй маладосці. І ён абяцаў, калі будзе добрае здароўе, прыехаць у Вільню, тым больш, што там створаны беларускі нацыянальны цэнтр імя Барыса Кіта.

А цяпер дзякуючы клопатам Вольгі Іпатавай была арганізавана яго вандроўка па мясцінах дзяцінства і ранняга юнацтва — у Мір, Карэлічы, Навагрудак і Гародню, дзе ён ні разу не быў, але дзе даўно чакалі яго як ганаровага прафесара Гродзенскага універсітэта імя Янкі Купалы.

Гістарычны Мірскі замак сустрэў сваімі адноўленымі сценамі, якія задуменна ўглядаліся ў блакіт возера, атуленага зелянінай дрэў старога парка — усё тут гаварыла пра далеч стагоддзяў і сённяшні, такі складаны, цяжкі і супярэчлівы час, што перажывае наша краіна.

Па дарозе на сваю малую радзіму, углядаючыся ў родныя краявіды, Барыс Уладзіміравіч успамінаў розныя падзеі са свайго дзяцінства: вось тут, каля ракі Сэрвеч, у першую сусветную вайну праходзіла лінія абароны Гіндэнбурга, на многія кіламетры быў нацягнуты калючы дрот, і яны, вясковыя хлапчукі, часта падкрадаліся сюды, іх цікавіла ўсё, што было забаронена, а па дарозе з Карэліч у Наваградак недзе павінна стаяць старая каплічка, апісаная яшчэ А. Міцкевічам у «Дзядах», а якія магутныя дубы, каля якіх нельга было не спыніцца, не палюбавацца іх раскідзістымі вершалінамі. Яму помніліся гэтыя дубы маладымі дубкамі, такім жа, як некалі быў ён сам, а цяпер, яны, мудрыя, шмат пажыўшыя і пабачыўшыя на сваім вяку, сустрэліся быццам старыя сябры і Барыс Уладзіміравіч вітаўся з імі, пяшчотна дакранаючыся да іх агрубелай кары рукамі... І прыветна свяціліся купалы прыгожай і ўзнёслай царквы, калі праязджалі паўз Турэц і ўсюды рабілі фотаздымкі на памяць...

На ўтульнай Карэліцкай плошчы Барыса Уладзіміравіча сустракалі родныя і знаёмыя людзі, быў наладжаны прыём у старшыні Карэліцкага гарвыканкама Яна Альфяровіча і яго намесніка Аляксандра Самца. Гэта сапраўдныя актыўныя дзеячы-беларусы, апантаныя любоўю да роднага краю. Яны запрасілі госця прыехаць на наступны год — на свята 600-годдзя першага ўспаміну пра Мір і Карэлічы, якое будзе шырока адзначацца. Адбылася сустрэча грамадскасці Карэліч са сваім славутым земляком, пайшлі ўспаміны, пытанні, выступленні, аўтографы на кнізе «Вяртанне». Цікавым і ўсхваляваным было прывітальнае слова былога вучня Барыса Уладзіміравіча Новіка Пятра Герасімавіча, які спецыяльна прыехаў з Вільні на сустрэчу з настаўнікам: «Я таксама ўраджэнец Агароднікаў, 13-гадовым хлапчуком Барыс Уладзіміравіч Кіт прывёз мяне ў Віленскую беларускую гімназію, здабыў для мяне бясплатнае ўтрыманне, як і многім іншым вучням, за што мы вельмі ўдзячныя яму, як і за тое, што наш настаўнік заўсёды прывіваў нам ідэі беларускасці. Па яго прыкладу я таксама ўсё жыццё працаваў настаўнікам, цяпер на пенсіі, інвалід вайны. Я вельмі рады спатканню з Барысам Уладзіміравічам, спадзяюся, што цяпер ён часцей будзе наведваць Бацькаўшчыну». Шмат гаварыў, адказваў на самыя розныя пытанні Барыс Уладзіміравіч, з цікавасцю агледзеў прысвечаную яму выставу пад кранальным эпіграфам: «Родны дом, падары мне мужнасць, Зноў чакае мяне дарога, Непазбежнасць пакут і мудрасць Векавога твайго парога» (Пятро Ламан). Былі агульныя і групавыя фотаздымкі на памяць і развітальнае слова Аляксандра Самца: «Дзякуй Вам, што не забылі нас, родную мову, дзякуй і нізкі паклон, што Вы здзейсніліся як Чалавек, вучоны, праславілі нашу

Карэліцкую зямлю, якая дала Вам сваю моц, каб вытрымаць усе выпрабаванні за Ваша доўгае жыццё. Хачу падарыць Вам беларускі ручнік з датай сённяшняй сустрэчы і памятны знак Міра, а таксама кветкі на памяць...»

А потым была магіла бацькі на Карэліцкім пагосце, куды ехалі па былой вёсцы Агароднікі, вуліца якой цяпер называецца Акцябрская. Могілкі займаюць высокае, прыгожае месца. Тут ціха пагойдваліся ад ветру вынослівыя сосны, а ў засмужанай далечыні ваколіц віднеліся Карэлічы, Агароднікі, дзе калісьці стаяла хата бацькі, які цяпер спачывае за зялёнай агароджай пад сціплым помнікам дагледжанай Ірынай Уладзіміраўнай магілы — Уладзімір Аляксандравіч Кіта — 1882-1970.

Што падумаў Барыс Уладзіміравіч, паклаўшы кветкі на магілы бацькі і мачыхі, якая была яму другой роднай маці, ідучы да машыны і аглядваючыся на гэтае святое месца? Тут свая зямля, родныя, блізкія людзі, землякі, прыхільнікі яго таленту, былыя вучні, роднае неба... А яшчэ побач старажытны Наваградак, дзе прайшлі яго першыя юнацкія гады, дзе і цяпер стаіць будынак беларускай гімназіі, пабудаваны яго рукамі, дзе ў краязнаўчым музеі знаходзіцца яго навуковая спадчына і куды цяпер ён перадаў сваю тогу акадэміка...

Сустрэча ў Наваградку была такой жа цёплай і шчымлівай, як і ў Карэлічах. У вялікай прыгожай зале музычнага вучылішча сабралася шмат народу.

Тут адбылася знамянальная падзея — Барысу Уладзіміравічу Кіту старшынёй Наваградскага гарвыканкама Георгіем Еўстаф'евічам Бакам быў уручаны Дыплом ганаровага грамадзяніна Наваградка (рашэннем 18 сесіі Наваградскага гарсавета ад 16 чэрвеня 1994 г.).

Шмат добрых слоў і пажаданняў было выказана ў адрас госця. Чытала свае (прысвечаныя Б. У. Кіту) вершы Вольга Іпатава, словы падзякі за перададзеную спадчыну выказала Тамара Вяршыцкая — дырэктар гісторыка-краязнаўчага музея, з ўспамінамі выступілі Аляксей Анішчык, аўтар кнігі пра Наваградскую гімназію, і былы вучань гэтай гімназіі мясцовы паэт Самсон Пярловіч. Ад Наваградскай суполкі Згуртавання беларусаў свету Барыса Уладзіміравіча вітала Таццяна Царук, дзяўчаты ў нацыянальных строях уручылі ганароваму грамадзяніну горада вянок з кветак і зялёных дубовых лістоў — сімвал гонару,вечнасці і славы. У адказ Барыс Уладзіміравіч усхвалявана сказаў: «Пасля таго, што я перабачыў і чуў за сваё жыццё — гэта для мяне найшчаслівейшы момант. Я меў шмат гонараў, але гэта найвышэйшы. Шчаслівы, што мы дажылі да таго часу, калі можна прыехаць

на Радзіму, сустрэцца. Наша незалежная рэспубліка становіцца вядомай ва ўсім свеце. Дзякуй за гонар, за шчасце быць сярод вас...»

Доўга потым хадзіў па Наваградку Барыс Уладзіміравіч. Спыніліся каля гары Міндоўта, пра гэты помнік XIII стагоддзя цікава і падрабязна расказвала Тамара Вяршыцкая, пабывалі на старажытным Наваградскім замчышчы, адкуль адкрываюцца цудоўныя краявіды на горад і яго наваколле, і, вядома ж, не маглі абмінуць былую Наваградскую гімназію, якая знаходзіцца ў падножжы замкавай гары. Мірна свяціліся ў прыцемку вокны, за якімі сядзелі вучні, нешта пісалі, слухалі настаўніцу, а былы дырэктар глядзеў на іх і ціхай радасцю свяціліся яго вочы — справа яго працягваецца, жыве... Выйшлі настаўнікі, запрашалі зайсці ў школу, паведамілі, што яна носіць назву — школа імя Адама Міцкевіча, але яны думаюць аднавіць яе гісторыю, сабраць звесткі пра яе першага дырэктара і будаўніка.

А цяпер ён быццам апынуўся ў сваёй маладосці, слухаючы ўсхваляваны расказ Яўгеніі Шостак: «Я была калісьці вучаніцай Барыса Уладзіміравіча Кіта, мела шчасце вучыцца ў Віленскай беларускай гімназіі, дзе ён быў выкладчыкам матэматыкі і пакінуў у нашых сэрцах добры ўспамін. Пасля таго, як Вільня адышла да Літвы, для беларускай гімназіі не знайшлося там месца. Але ў Наваградку засталіся муры Наваградскай беларускай гімназіі, якую прыватна будавалі нашы бацькі за свой кошт і якую палякі закрылі яшчэ да 1939 года. Тады амаль усе вучні ў Віленскай гімназіі і часткова выкладчыкі дзякуючы клопатам і стараннем Барыса Уладзіміравіча пераехалі ў Наваградак, як на сваю спадчыну. Школа ўжо пры савецкай уладзе стала называцца 1-я беларуская школа. Яе арганізатарам і першым дырэктарам стаў Барыс Уладзіміравіч Кіт.

Вельмі многа клопатаў узваліў ён на свае плечы дырэктара. Узгадніць праграму навучання, акрэсліць узровень ведаў, арганізаваць інтэрнат для вучняў, харчаванне, абагрэў. Не было падручнікаў, з'явіліся новыя дысцыпліны, але ўжо з пачаткам новага навучальнага года (1940) школа пачала працаваць нармальна. Была выдатная дысцыпліна, мы, вучні, вельмі паважалі сваіх педагогаў, любілі іх, шанавалі іх нялёгкую працу, хаця адносіны ў нас былі сяброўскія. Яшчэ ў Віленскай гімназіі нашым класным настаўнікам быў Барыс Уладзіміравіч. Ён вельмі многа для нас арганізоўваў экскурсій. Былі на Зялёных азёрах, у Тракаі. Асабліва запомнілася экскурсія на возера Нарач. Барыс Уладзіміравіч сам быў малады і любіў моладзь. На Нарач далёка, таму дзяўчаты ехалі цягніком, а хлопцы паплылі па Віліі. Па дарозе начавалі ў сялян, варылі бульбу, кашу, многа плавалі, наладжвалі спаборніцтвы, было многа жартаў і смеху...» І тут у расказ

сваёй былой вучаніцы ўрываецца Барыс Уладзіміравіч: «...А памятаеце, як мы плылі на лодках па Марачы, неба было чыстае, сіняе, толькі далёка на гарызонце з'явілася непрыкметная хмарка. Але з яе, пакуль мы плылі, пачалася бура, возера ўспенілася, пайшлі высокія хвалі з белымі барашкамі. Некаторыя вучні перапалохаліся, меншыя пачалі нават плакаць. Я ўвесь час іх падбадзёрваў, прымушаў веславаць супраць хваляў, але сам вельмі хваляваўся за дзяцей. Калі дабраліся да берага, рыбакі вельмі здзівіліся, што знайшліся такія рызыканты. Нават яны, вопытныя і загартаваныя людзі, не выходзяць у такое надвор'е на возера. На беразе была невялікая вёска, дзяцей накармілі бульбай з кіслым малаком. Назад вярталіся па Віліі ўніз па цячэнні, затрымліваліся ў бацькоў вучняў, рабілі беларускую прапаганду, гаварылі толькі па-беларуску, расказвалі пра сваю гімназію, спявалі беларускія песні... Я памятаю, калі сам быў вучнем Наваградскай гімназіі, то мы разам з настаўнікамі і вучнямі часта наладжвалі такія самадзейныя паездкі, плылі па Нёману ад Ярэміч да Любчы, давалі канцэрты на беларускай мове, расказвалі пра беларускую гісторыю, літаратуру, чыталі вершы...» Дыялог зноў працягвае Яўгенія Шостак: «...Я памятаю наш развітальны вечар. Мы з вамі, Барыс Уладзіміравіч, пайшлі на ўскраіну горада. Клас даручыў мне сказаць вам словы ўдзячнасці за вашу самаадданую працу з намі, за цудоўныя ўрокі па фізіцы і матэматыцы, расказы пра астраномію, гісторыю, літаратуру, музыку. Усё вы ведалі, усім цікавіліся, былі прыкладам для нас, распальвалі прагу ведаў. Мы тады ўручылі вам альбом з фотаздымкамі ўсіх вучняў нашага класа. Вярталіся дамоў і не ведалі, што Вялікая Айчынная вайна перакрэсліць усе мары юнацтва, параскідае нас па ўсім свеце, і з многімі ніколі больш не давядзецца спаткацца. Таму мы сёння вельмі рады вас тут бачыць, прымаць на роднай зямлі...»

Зноў фотаздымак на памяць на ганку былой гімназіі, побач з акном пакоя, дзе некалі жыў дырэктар Барыс Уладзіміравіч Кіт. Далей гаворка працягвалася ў памяшканні Наваградскага гісторыка-краязнаўчага музея, дзе пра Кіта і многіх славутых наваградцаў разгорнута вялікая экспазіцыя. Барыс Уладзіміравіч пазнаваў тут на фотаздымках многіх сваіх знаёмых: М. Чатырку, П. Скрабца, Л. Барысаглебскага, якія разам з ім працавалі ў Наваградскай гімназіі, і беларусаў-эмігрантаў, якіх шмат выйшла з Навагрädчыны. Зноў нахлынулі ўспаміны пра гэтых людзей, пра маладыя гады, першае каханне, Наваградак 20-30-х гадоў, незабыўных сяброў, якіх ужо няма...

Прысутным было вельмі цікава паслухаць (людзям, нашмат маладзейшым за госця) пра першае каханне Барыса Кіта:«...Такое немаг-

чыма забыць. Я быў студэнтам першага курса Віленскага універсітэта, а яна — Рыва Траявіцкая — вучылася ў польскай гімназіі ў Наваградку. Ёй было 16, а мне 18 гадоў. Сям'я Траявіцкіх жыла ў Карэлічах, і калі я прыязджаў на канікулы, яна прыходзіла да мяне ў Агародніке, каб я ёй дапамог у матэматыцы. Яна была вельмі прыгожай дзяўчынай, са светлымі, буйнымі валасамі, чарнавокая, высокая... Пазней, калі пачаліся нашы спатканні, Рыва прызналася, што прыходзіла не толькі дзеля матэматыкі... У нас было вялікае каханне, але супраць яго паўсталі яе бацькі. Яны не хацелі, каб дзяўчына з яўрэйскай сям'і выйшла замуж за хлопца беларуса. Нават у хату да яе я не мог прыйсці. Мы сустракаліся патаемна, спатканні нашы працягваліся тады, калі яе сям'я пераехала ў Наваградак пасля таго, як у Карэлічах згарэла іх хата. Але, нягледзячы на гэта, нашы сустрэчы працягваліся 4 гады, а паколькі яны былі пад забаронай, то каханне разгаралася ўсё болей. І пачуцці нашы былі такія абвостраныя, пяшчотныя. Я часта прыязджаў з Вільні ў Наваградак, каб сустрэцца з Рывай, часамі прастойваў каля яе акон нават зімою, каб пабачыць каханую дзяўчыну, бо фанатызм бацькоў, заможных, рэлігійных, не дапускаў, каб іх дачка сустракалася з гоем. Яўрэйскія хлопцы, спаткаўшы нас аднойчы на вуліцы, хацелі пабіць камянямі. Звычаі сям'і перамаглі, Рэбека не змагла пераступіць волі бацькоў, якія выдалі яе без кахання за нашмат старэйшага за яе яўрэя. Прыгажосць яе звяла, як кветка без сонца... Апошні раз мы спаткаліся ў Баранавічах, перад самай вайной, успомнілі мінулае, пашкадавалі, што лёс развёў нас... У час вайны яна загінула, як і многія іншыя яўрэйскія сем'і, калі прыйшлі фашысты і пачалі ажыццяўляць свае нечалавечыя акцыі. Але я і дасюль не веру ў тое, што яна загінула, пасля вайны я шукаў яе сляды ў эміграцыі, у Ізраілі, але нідзе не знайшоў. Вобраз Рэбекі ўвесь час жыве ў маёй душы. Здараецца нават так, што, ідучы па Вашынгтону, Парыжу або Франкфурту, я раптоўна бачу ў праходзячай дзяўчыне мілы абрыс твару, зграбную постаць...»

І другія, блізкія і дарагія, людзі ўспомніліся Барысу Уладзіміравічу з яго маладосці. Аркадзь Лашэвіч... Вучань, памочнік і сябар Барыса Кіта, ведаў і разумеў іх адносіны з Рэбекай. Быў вялікім беларускім патрыётам, дапамагаў у пераводзе Віленскай гімназіі ў Наваградак, быў старшынёй вучнёўскага камітэта Наваградскай гімназіі, выступаў на розных урачыстасцях. Пазней стаў ваяводам Беластоцкім, праводзіў беларускую палітыку. Урад Польшчы быў незадаволены яго беларускімі справамі. Яго перавялі ў Варшаву, дзе ён неўзабаве памёр. Жыве яго сын, цяпер прафесар медыцыны філіі Варшаўскага

універсітэта ў Беластоку. Ён праходзіў практыку ў прафесара Кшыштафа Марліча ў Шчэціне і ад Марліча (муж дачкі Хведара Ільяшэвіча) Барыс Уладзіміравіч даведаўся пра сына Лашэвіча, сазваніўся з ім, і яны доўга гаварылі, успаміналі бацьку — Аркадзя Лашэвіча, яго патрыятычную беларускую душу...

Але ні пра аднаго са сваіх даўніх сяброў Барыс Уладзіміравіч не ўспамінаў такім добрым, хвалюючым словам, як пра таленавітага паэта, шчырага беларуса Хведара Ільяшэвіча: «...Шчаўя сябраваць з яго братам Міколам Ільяшэвічам (іх сялянская сям'я жыла на Пружаншчыне), які скончыў Пражскі універсітэт, гістарычны факультэт. Вучыўся і жыў Мікола ў Празе разам з Уладзімірам Жылкам, Вінцэнтам Жук-Грышкевічам, Янкам Геніюшам, Міколам Гарошкам, Аляксандрам і Пётрам Орсамі. Мікола Ільяшэвіч выдаў у Празе першую на чэшскай мове кнігу пра сваю Бацькаўшчыну "Беларусь і беларусы", дзе з адраджэнскіх пазіцый аб'ектыўна паказаў ролю Беларускага вайсковага з'езда (восень 1917), Усебеларускага з'езда ў Мінску (снежань 1917), Слуцкага паўстання ў лістападзе 1920 года. Кніга М. Ільяшэвіча ў савецкай Беларусі была сустрэта непрыхільна, ніколі не перавыдавалася, аднак чэшская грамадскасць мела магчымасць даведацца пра гісторыю, культуру, прыроду Беларусі, жыццё беларусаў у Польшчы, Літве, Латвіі, прачытаць у перакладзе на чэшскую мову вершы Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, М. Чарота, А. Дудара, А. Моркаўкі, прозу Т.Гушчы, казкі А.Сержпутоўскага. Вярнуўшыся на радзіму, Мікола Ільяшэвіч выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі мову і гісторыю, а я матэматыку, мы вельмі пасябравалі, жылі ў адным доме. На вялікі жаль, Мікола захварэў на сухоты і памёр у 1934 г. За ягонай труной ішла ўся гімназія, гучаў пахавальны марш Шапэна, прамовы над гэтым заўчасна памёршым шчырым беларускім патрыётам гаварылі многія выкладчыкі. Пахаваны Мікола Ільяшэвіч на Віленскіх могілках. На змену Міколе прыйшоў яго малодшы брат Хведар, які таксама скончыў гістарычны факультэт, але Віленскага універсітэта, пачаў выкладаць гісторыю, беларускую мову і літаратуру. Хведар ужо тады быў вядомым паэтам, я захапляўся яго вершамі, якія былі прысвечаны роднаму краю. І сёння мне помняцца радкі:

Зацвітай, родны край, зацвітай,
Гінуць годзе ў завеі і сцюжы, —
Хай далінамі сонечны май
Успалымнее вагнямі ружаў!
У тваіх песнях — нядолі іржа —
Уздыхні ж песняй новай, вясёлай.
Раздавайся юнацкі наш шаг

Па дарогах радзімых сёлаў!
З моцнай верай у лепшыя дні
Беларускую даль ускалосім —
У электрычным скупаем агні
Тваe постаці цёмныя вёсак.
І на шыбах заплеснеўшых хат
Сядзе радасць вясёлкай ірдзістай —
У паходны расходзьцеся тахт
Пераборы рукі цымбаліста.
Зацвітай, родны край, зацвітай
Гінуць годзе ў завеі і сцюжы!
Хай далінамі сонечны май
Успалымнее вагнямі ружаў!

Мы тады былі захоплены беларускімі справамі, а Хведар мог выказаць нашы справы, пачуцці, адданасць Беларусі высокім паэтычным словам, якое знаходзіла водгук у сэрцы:

Зарана вы прыйшлі. Над роднымі загонамі
ня ссыпаўся яшчэ нядолі жоўты ліст,
яшчэ ўсё сумным тонам ў лесе сасновым
хтось плача, як калісь...
Зарана вы прыйшлі...

Можа і сапраўды многія барацьбіты за беларускую ідэю тады прыйшлі зарана, некаторыя заўчасна паміралі, іншыя ўвесь час адчувалі ганенні з боку польскіх уладаў, траплялі ў Лукішкі... Хведар Ільяшэвіч быў звольнены з гімназіі за беларускасць, а я меў дакумент аб стабілізацыі, адміністрацыя гімназіі не мела права звольніць мяне без дазволу Міністэрства асветы, хоць я выкладаў матэматыку на беларускай мове і актыўна займаўся беларускімі справамі. Аднак калі я перавёў вучняў з Віленскай гімназіі ў Наваградскую, то і на мяне палякі пачалі збіраць кампрамат. І здарылася так, што з Варшавы ў Вільню прыехаў новы куратар гімназій — Юліуш Баліцкі, зрабіў інспектарскую праверку Віленскіх гімназій, не ведаючы яшчэ закулісных інтрыг мясцовых польскіх уладаў. Найбольш яму спадабаліся мае ўрокі і ён даў мне выдатную характарыстыку, і таму я, як найлепшы настаўнік гімназіі, стаў недаступны для сваволля мясцовых уладаў. Але мяне праследавалі іншымі спосабамі — забаранялі ехаць за мяжу, як асобе «палітычна ненадзейнай». Памятаю, была арганізавана экскурсія настаўнікаў у Еўропу, я ўжо аформіў дакументы, заплаціў грошы, напісаў беларусам у Берлін, каб сустракалі (у Берліне тады вучыўся Калоша, але афіцыйныя польскія ўлады ў самы апошні момант адмовілі ў візе, выкрэслілі маё імя з ліку экскурсантаў, тым

больш, што ім было вядома, як мяне, пасля разгрому ТБШ, арыштавалі і пасадзілі ў Лукішкі, хоць я тады быў яшчэ студэнтам Віленскага універсітэта, а старшынёй ТБШ быў Рыгор Раманавіч Шырма. Як сёння памятаю — у чацвер мне трэба было чытаць даклад на семінары па матэматыцы, а ў панядзелак мяне арыштавалі, пасадзілі ў Лукішкі, у суседняй камеры сядзеў Рыгор Шырма. Вялося следства, ці належу я да камуністычнай партыі. Я трапіў у адну камеру са студэнтам Хайлукам, якога хутка выпусцілі. Аднаму было страшна сядзець у камеры, я вельмі перажываў, трывожыўся. Падчас прагулкі ў турэмным двары спаткаў Васіля Рагулю, былога беларускага сенатара ў польскім сейме. Разгаварыліся, я сказаў, што Ханяўку выпусцілі, а мне сумна і вусцішна сядзець аднаму. Рагуля, перагаварыўшы з начальнікам аховы, пасадзейнічаў пераводу ў яго камеру, і тут у мяне былі зусім іншыя адчуванні. Васіль Рагуля мне, маладому студэнту (21 год), шмат расказваў са свайго жыцця, супакойваў, настройваў на новыя змаганні за беларускую ідэю. Следства ўстанавіла, што я не належаў ні да якой партыі, і я быў выпушчаны з Лукішак, пайшоў на заняткі. Студэнты нават не ведалі, што я некалькі дзён сядзеў у турме.

Я быў духоўна вельмі блізкі з Хведарам Ільяшэвічам, увесь час сябраваў з ім, падтрымліваў найлепшыя адносіны з яго сям'ёй. Пасля вайны я трапіў у Мюнхен, а Хведар Ільяшэвіч, які заўсёды дапамагаў беларусам падчас эміграцыі, жыў у Ватэнштаце, дзе знаходзіўся лагер перамешчаных асоб. Тут ён арганізаваў беларускую гімназію імя Ф. Багушэвіча і выкладаў, як і ў Віленскай, гісторыю, мову і літаратуру. Разам з Алесем Гатковічам ладзілі літаратурныя вечары, выпускалі газету, наогул арганізоўвалі ўсё беларускае жыццё ў гэтым нямецкім горадзе. Часта сюды з чытаннем сваіх вершаў прыязджаў Масей Сяднёў, у іх з Хведарам былі сяброўскія адносіны, у паэтаў было шмат агульных зацікаўленняў. Я прыехаў у Ватэнштат у 1946 годзе праведаць і сустрэцца з беларусамі, сярод якіх было шмат вучняў, знаёмых. І Хведар Ільяшэвіч, і Алесь Гатковіч вельмі абрадаваліся сустрэчы, бо хадзілі чуткі, што я загінуў ад рук гестапа. Алесь Гатковіч жыў з Хведарам Ільяшэвічам на адной кватэры, ён нават саступіў мне свой ложак, і мы з Хведарам прагаварылі ўсю ноч, успамінаючы Радзіму, Вільню, блізкіх людзей, свае маладыя гады на Беларусі. Ніхто не думаў тады, што гэта было наша апошняе спатканне, што Хведар Ільяшэвіч загіне так рана і трагічна. Я часта чытаў вершы Хведара Ільяшэвіча, Масея Сяднёва на сваіх лекцыях, захапляўся іх паэтычным талентам».

Барыс Уладзіміравіч гаварыў, а яго слухалі, затаіўшы дыханне, бо хто і калі раскажа так цікава пра тыя падзеі, таленавітых людзей, беларусаў, з якімі яго звязвалі агульныя справы па беларускаму адраджэнню на працягу доўгіх дзесяцігоддзяў... Слухалі, задавалі пытанні, дапаўнялі, самі расказвалі — супрацоўнікам музея, гісторыкам свайго краю было што расказаць госцю. Гэта і дырэктар музея Тамара Вяршыцкая — маладая прыгожая жанчына, высокаадукаваны спецыяліст музейнай справы з дасканалым веданнем англійскай, нямецкай, беларускай моў, і Мікола Гайба — навуковы супрацоўнік, аўтар гістарычна-краязнаўчага нарыса пра Наваградак, выдадзенага асобнай кніжкай, і Іван Сяргеевіч Грынь — былы супрацоўнік музея, цяпер інспектар па ахове гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны Наваградскага краю (незвычайна знешне падобны на цара Мікалая ІІ, па трапнаму вызначэннюназіральнага Барыса Уладзіміравіча). У любоўна сабраных і прыгожа афармленых экспазіцыях гісторыка-краязнаўчага музея адчуваліся высокі эстэтычны густ, грунтоўная гістарычная і навуковая дасведчанасць сапраўдных адраджэнцаў Бацькаўшчыны.

А наперадзе была сустрэча з Гародняй — цудоўным старажытным беларускім горадам, якім захапляецца кожны, хто хоць аднойчы паходзіць па яго вуліцах, пастаіць над Нёманам, пабачыць стары і новы замкі, палацы, Калажу, пагутарыць з выдатнымі прадстаўнікамі беларускай нацыі.

Найперш пра горад свайго юнацтва расказвала яшчэ па дарозе Вольга Іпатава, а пасля гідамі былі даўні знаёмы Барыса Кіта Андрэй Майсяёнак — народны дэпутат Гродзенскага абласнога савета, намеснік дырэктара па навуковай працы Інстытута біяхіміі Акадэміі навук Беларусі, старшыня краязнаўчай асацыяцыі (ён шмат пісаў пра Барыса Уладзіміравіча Кіта, выступаў з дакладамі пра яго навуковую дзейнасць), Алесь Краўцэвіч — прарэктар па навуковай працы Гродзенскага універсітэта, вядомы археолаг, гісторык, аўтар многіх навуковых работ, і Вячаслаў Буко — доктар біялагічных навук, загадчык лабараторыі гепаталогіі Інстытута біяхіміі АН Беларусі, які пазнаёміўся з Барысам Уладзіміравічам падчас сваёй паездкі ў Германію, у Франкфурт-на-Майне. Як цікава было слухаць гэтых улюбёных у сваю працу людзей , сапраўдных беларускіх інтэлігентаў, якія выдатна ведалі свой край, яго гісторыю і якія шмат робяць для нацыянальнага адраджэння Беларусі. Захоплена расказваў Алесь Краўцэвіч пра Каралеўскі замак, дзе цяпер музей, бібліятэка, (з яе багацейшым аддзелам рэдкіх кніг, які ўзначальвае працавіты, шчыры адданы сваёй справе чалавек — Ванда Іванаўна Шоцік), пра стары

замак Стэфана Баторыя, палац Вітаўта, храм XII стагоддзя, раскапаны археолагамі, паведаміў адкуль пайшла назва Каложскай царквы, помніка архітэктуры часоў Вітаўта. У 1853 годзе правая частка яе, падмытая водамі Нёмана, упала ў раку — так і стаіць Каложа — адна частка драўляная, другая каменная, з маёлікавымі вясёлкавымі ўзорамі, на якіх прыкметны клеймы майстроў XII стагоддзя. А крыху ніжэй Калажы ўстаноўлен памятны знак «Пагоня на Грунвальд. 1410» (аўтар Алесь Дранец). Усе гэтыя старажытныя помнікі культуры, збудаваныя нашымі продкамі на высокім, стромым беразе Нёмана, патаналі ў густой зеляніне пракавечных паркаў і садоў, ледзь кранутых золатам ранняй восені. З вялікай увагай, цікавасцю слухаў, глядзеў на гэту прыгажосць чалавек, які аб'ездзіў амаль увесь белы свет і якога, здавалася б, ужо нічым не здзівіш. Пазней Барыс Уладзіміравіч скажа, што Гродна не менш цікавы і прыгожы горад, чым еўрапейскія гарады і сталіцы.

Наступны дзень (28 верасня) з самай раніцы Барыс Уладзіміравіч пабываў у Інстытуце біяхіміі. Андрэй Майсяёнак прадставіў яго дырэктару інстытута, расказаў пра дзейнасць і структуру гэтага навуковага цэнтра і асабліва пра яго заснавальніка і першага дырэктара акадэміка Юрыя Міхайлавіча Астроўскага, які заўчасна памёр у 1992 годзе, пакінуўшы пра сябе добрую памяць сярод людзей. Пра гэта сведчыць створаны ў інстытуце музей Ю. М. Астроўскага. Ён перапісваўся з Барысам Уладзіміравічам Кітам, часта званіў яму ў Франкфурт, пісаў хадайніцтва на імя прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі пра абранне Б. У. Кіта ганаровым акадэмікам АН. Ю. М. Астроўскі быў не толькі выдатным вучоным-біяхімікам, доктарам медыцынскіх навук, але і актыўным грамадскім дзеячам, прымаў удзел у аднаўленні зруйнаванай беларускай гісторыка-культурнай спадчыны, лічыў першачарговай і галоўнейшай справай у адраджэнні Беларусі выхаванне нацыянальнай самасвядомасці, быў членам Гродзенскай Рады ТБМ, працаваў над кнігай «Беларусы: генетыка, рэлігія, нацыянальнасць», цікавіўся гісторыяй, літаратурай. Ён сябраваў з Васілём Быкавым, яму дарыла свае кнігі Ларыса Геніюш, пісалі Зоська Верас і Лявон Луцкевіч, ён захапляўся творамі Уладзіміра Караткевіча, іншых класікаў беларускай літаратуры. Мемарыяльны кабінет-музей шмат расказвае наведвальнікам пра Ю. М. Астроўскага — Вучонага, Чалавека, Грамадзяніна, Беларуса. Пабываў Барыс Уладзіміравіч і ўсклаў кветкі каля мемарыяльнай дошкі на доме, дзе жыў Рыгор Раманавіч Шырма, з якім ён быў асабіста знаёмы яшчэ ў 30-я гады, наведаў музей Максіма Багдановіча, экскурсію па ім правяла стваральніца гэтага музея, вядомая паэтэса

Данута Бічэль-Загнетава. Яна з любоўю і разуменнем гаварыла пра лёс і творчасць нашага славутага паэта. Барыс Уладзіміравіч адзначыў, што музей Максіма Багдановіча нагадвае яму музей Бетховена ў Боне, той жа еўрапейскі ўзровень і па афармленню, багаццю экспазіцыі і па эрудыцыі экскурсавода.

Але галоўнай падзеяй стала для Барыса Уладзіміравіча наведванне Гродзенскага універсітэта імя Янкі Купалы, да помніка якому каля галоўнага корпуса ён усклаў кветкі. Быў арганізаваны прыём у рэктарацe, куды запрасілі і Гродзенскае тэлебачанне. Рэктар універсітэта прафесар Леанід Мікалаевіч Півач паведаміў, што Гродзенскі універсітэт заснаваны ў 1978 годзе, на базе педінстытута. Цяпер тут працуюць шматлікія факультэты самага рознага профілю, навучаецца 7 тысяч студэнтаў (на дзённым і завочным аддзяленнях), якім чытаюць лекцыі 600 выкладчыкаў вышэйшай катэгорыі: прафесары, дактары, кандыдаты навук. Барыс Уладзіміравіч, як ганаровы прафесар, выказаў падзяку, што яго прынялі ў сям'ю Гродзенскага універсітэта і папрасіў, калі будзе магчымасць, адкрыць філіял універсітэта ў Навагрaдку. На гэтую просьбу рэктар заўважыў, што ён сам навагрaдчанін. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт у Мінску, а ягоныя малодшыя брат і сястра вучыліся ў школе, якую будаваў Б. У. Кіт. Рэктарат мяркуе адкрыць у Навагрaдку ліцэй гуманітарнага накірунку і каледж эканамічнага профілю, хаця цяпер вельмі цяжка з матэрыяльным забеспячэннем, самому універсітэту не хапае вучэбных памяшканняў. Адведзена добрая пляцоўка на беразе Нёмана, непадалёку ад Каложы, для будаўніцтва новых карпусоў універсітэта, але эканамічнае становішча ў краіне настолькі цяжкае, што невядома, калі знойдуцца сродкі для гэтага. Барыс Уладзіміравіч паабяцаў дапамагчы ў наладжванні кантактаў з еўрапейскімі універсітэтамі, як ужо дапамог Інстытуту біяхіміі і А. Майсяёнку ўстанавіць сувязь з Ельскім універсітэтам. У інтэрв'ю для тэлебачання Барыс Уладзіміравіч адзначыў, што ён шчаслівы зноў пабываць на Радзіме, і не толькі ён, але і многія эмігранты-беларусы, вельмі быў рады і задаволены, калі яму ўручылі дыплом ганаровага грамадзяніна Навагрaдка і ганаровага прафесара Гродзенскага універсітэта, і што ён шчыра верыць у наша нацыянальнае адраджэнне, тым больш пабачыўшы, сустрэўшыся з моладдзю, многімі беларусамі, якія самаахвярна працуюць дзеля беларускай ідэі. Назад дарогі няма, ва ўсім свеце сёння адчуваецца рух да незалежнасці, і ўвесь свет хоча бачыць дзяржаву Беларусь дэмакратычнай і незалежнай. І яшчэ ён сказаў, што яму незвычайна спадабаўся горад, пра які так цікава расказваў Алесь Краўцэвіч. Ён быў захоплены прыгажосцю, стара-

жытнымі помнікамі, музеямі, людзьмі Гародні, дзе ён пабываў упершыню, але гэта падарожжа застанецца ў памяці на ўсё жыццё. На развітанне рэктар універсітэта падарыў Барысу Кіту кнігі: «Гродна» і «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт», а Алесь Краўцэвіч свае цікавыя гістарычныя даследаванні «Гродзенскі замак» і «Тэўтонскі ордэн. Ад Іерусаліма да Грунвальда».

Незабыўнай для Барыса Кіта паездка ў Гародню стала яшчэ і таму, што на сустрэчы са студэнтамі фізіка-матэматычнага факультэта, якую адкрываў і вёў рэктар універсітэта, Барыс Уладзіміравіч зноў апынуўся ў сваёй стыхіі настаўніка, выкладчыка любімай матэматыкі, зноў шмат расказваў пра сябе, сваю працу ў Амерыцы і педагагічную дзейнасць ва універсітэтах Еўропы, павіншаваў моладзь з незалежнасцю Бацькаўшчыны. «Вы пабачыце Беларусь у наступным стагоддзі. Вы будзеце сведкамі росквіту нашай краіны...»

Пра пераемнасць пакаленняў, пераплеценасць чалавечых лёсаў, ідэі нацыянальнага і духоўнага адраджэння гаварыла ў сваім цікавым і змястоўным выступленні Вольга Іпатава, якая прачытала вершы, прысвечаныя Барысу Кіту і Гародні, — гораду яе маладосці, яго непаўторнай красе.

І пасыпаліся шматлікія пытанні, якія сведчылі, што студэнтам было цікава пазнаёміцца са славутым беларусам, паслухаць яго меркаванні адносна самых розных жыццёвых праблем: «Нам, маладым, вельмі цікава даведацца пра Вашы юнацкія гады, пра першыя крокі ў навуцы. Хто былі Вашы першым настаўнікі?» «Шаноўны спадар Барыс Кіт, ці ёсць надзея пазнаёміцца на Бацькаўшчыне з Вашымі ўспамінамі?» «Ці плануецца пераклад на беларускую мову Вашых прац па матэматыцы?» «Як Вы ацэньваеце ўзровень фізіка-матэматычнай навукі на Беларусі?» «Я чуў, што Вы хочаце паспрыяць стварэнню універсітэта ў Наваградку. Наколькі гэта рэальна сёння? І ці зроблены да гэтага першыя крокі?» «Як студэнты ў Амерыцы ставяцца да фізічнага выхавання? І Вашы адносіны да фізічнага выхавання?» «Шаноўны Барыс Уладзіміравіч! У Вас за плячамі вялікі педагагічны вопыт. Скажыце ў некалькіх словах, што б Вы параілі нам, як будучым настаўнікам?» «Вельмі шаноўны спадар Барыс Кіт! Як Вы ацэньваеце сённяшнюю палітычную сітуацыю на Беларусі?» «Шаноўны Барыс Уладзіміравіч! Як Вы ставіцеся да таго, што некаторыя жыхары Беларусі не прымаюць роднай мовы?» «Паважаны Барыс Уладзіміравіч! Скажыце, калі ласка, што Вы думаеце аб рэлігійнай сітуацыі на Беларусі?» «Паважаны спадар Кіт! Многія наракаюць на тэрміналагічныя праблемы ў беларускай мове. Як Вы ацэньваеце гэту праблему ў сваёй навуковай галіне?» «Як Вы ацэньваеце ўзровень

беларускай адукацыі адносна адукацыі ў Амерыцы? Дзе можна пазнаёміцца з Вашымі навуковымі працамі?» «Паважаны Барыс Кіт! Ці ведаеце Вы пра лёс манаграфіі Аляксея Анішчыка пра Наваградскую гімназію?» «Барыс Уладзіміравіч! Ці шчаслівы Вы чалавек?» Гэта пытанне яму задавалі амаль на ўсіх сустрэчах, і ён нязменна адказваў, што ён шчаслівы чалавек і асабліва сваім вяртаннем на Бацькаўшчыну і сваім новым знаёмствам з ёй.

Адказаўшы на гэтыя і шматлікія іншыя пытанні, Барыс Кіт прачытаў студэнтам невялікі рэферат пра даследаванні і перспектывы палёту на Марс.

## Даследаванне Марса

*Перад сваім прыездам на Беларусь я званіў па тэлефоне Андрэю Майсяёнку і паведаміў аб намеры завітаць да вас у Гародню. Андрэй Георгіевіч папрасіў мяне падрыхтаваць невялікі рэферат на любую тэму. Я выбраў тэму з галіны астранаўтыкі, у якой працаваў шмат гадоў у Амерыцы. Я лічу, што Беларусь сягоння, як незалежная дзяржава, можа таксама далучыцца да сусветнага астранаўтычнага руху.*

*Тэма майго рэферату можа паказацца трохі дзіўнай і не рэальнай. Але паверце мне, што ўвесь цывілізаваны свет займаецца праблемамі падарожжа на найбольш магчымую планету Марс.*

*Безумоўна, гэты праект будзе праектам наступнага стагоддзя. Мяне ўжо не будзе, але вы, маладыя, будзеце працягваць гэтую вялікую справу.*

*Калі ў нашым стагоддзі такія дасягненні, як падарожжа на Месяц, можна сказаць, часткова былі выкліканы жаданнем выперадак паміж ЗША і былым СССР, то пасля заканчэння халоднай вайны ўсе вялікія праекты будуць выконвацца ўсім чалавецтвам.*

*Чалавек ніколі не можа спыніцца. Пасля здзяйснення найвялікшага праекту XX стагоддзя, як падарожжа на Месяц праз праект «Апола» амерыканцамі, што адбылося 20 ліпеня 1969 года, калі два астранаўты — Ніл Армстронг і Эдвін Андрыч — высадзіліся на паверхню Месяца і пазней адбыліся далейшыя падарожжы «Апола» аж да 1972 года, калі 12 амерыканцаў пабывалі на Месяцы, чалавецтва пачало думаць аб далейшых дасягненнях у даследаванні планет. Як справа выглядае на будучыню, калі чалавек зможа засвоіць нейкую іншую планету, дык у яго магчымасцях будзе толькі Марс. У апошні час шмат гаворыцца, пішацца і дыскутуецца на астранаўтычных кангрэсах не толькі пра розныя праекты ў астранаўтыцы, але і аб*

*магчымасцях будучага даследавання і эксплуатацыі планеты Марс. Гэта і дало мне думку, што тэма аб магчымасці падарожжа чалавека на Марс была б найбольш адпаведнай для маладых навукоўцаў.*

*Маю надзею, што гэты мой сціплы рэферат пабольшыць вашу зацікаўленасць, усяго беларускага грамадства — і дзяржавы і выкліча ваш і Беларусі актыўны ўдзел у сусветным астранаўтычным руху, як гэта робяць сёння шмат народаў і дзяржаў — членаў Міжнароднай астранаўтычнай федэрацыі, якая склікае штогод у розных сталіцах свету кангрэсы. У гэтым годзе астранаўтычны кангрэс адбудзецца ў Іерусаліме (Ізраіль). Толькі дзве краіны — ЗША і Расія — тэхнічна здольныя паасобку працаваць над праектам падарожжа на Марс. Можа ў будучыні гэтыя абедзве краіны аб'яднаюць свае высілкі, да гэтага ўсё ідзе, і тады справа пойдзе лягчэй. Былі ўжо заявы на кангрэсах адносна каардынацыі палётаў на Месяц і Марс, паміж Расіяй і ЗША. Пра гэта гаварылі падчас другой міжнароднай канферэнцыі па вывучэнню Сонечнай сістэмы ў Пасодыне (Каліфорнія, жнівень 1992 г.) прафесар Валеры Барсукоў і Джордж Буш, калі ён яшчэ быў прэзідэнтам ЗША. Што датычыцца асобных высілкаў самой Расіі, то яна збіраецца ў 1996 годзе выслаць беспілотны касмічны карабель на спадарожнік Марса — Фобас, а ў 1997 г. разам з Францыяй плануецца выпусціць касмічны карабель у раён астэроіднага пояса паміж Зямлёй і Марсам. У 1998 годзе Расія намервается аднавіць «асвойванне» Венеры. Дзве расійскія спробы паслаць касмічны карабель на Фобас у мінулыя гады не здзейсніліся. Што датычыцца ЗША, то ў нас, як Іў Расіі, можа ў меншай ступені, існуе сёння эканамічны крызіс, што перашкаджае кангрэсу пайсці на большыя грашовыя субсідыі.*

*Падлічана, што кошт абследавання і падарожжа на Марс можа быць трохі вышэй, чым існуючы цяпер бюджэтны дэфіцыт ЗША (больш трыльёна долараў), і таму шмат дэпутатаў кангрэса мяркуюць, што можа лепш пачакаць з такімі праектамі.*

*І ўсё ж такі, нягледзячы на ўсе цяжкасці, існуе і будзе існаваць заўсёды той самы бунтарны дух, які прымушаў чалавека адкрываць полюсы, ехаць на малых караблях у невядомыя акіянскія далі, як зрабіў гэта Хрыстафор Калумб, заваёўваць паветраны акіян, падарожнічаць на Месяц. Апантаны гэтым духам чалавек імкнецца даследаваць далі космаса, як выглядае, насупраць логікі і розуму.*

*Перад тым, як перайсці да пытання, як даследаваць і паляцець на Марс, зробім невялікі агляд, што ўжо мы ведаем пра гэту таямнічую планету.*

*Чырванаваты колер планеты Марс змусіў тры тысячы гадоў таму назад вавілонскіх астролагаў спалучыць яе са страшным богам вайны Нергалам, імем якога яна была названа. Грэкі і рымляне ідэнтыфікавалі Нергала са сваімі багамі Арэсам і Марсам. Першы раз бачыў яе ў тэлескоп Вялікі Галілей у 1610 годзе, а ў 1877 годзе амерыканскі астраном Асаф Хол адкрыў Дэймас і Фобас — марсіянскія месяцы.*

*Марс адлеглы ад Сонца на 228 мільёнаў кіламетраў. Яго год роўны 687 дзён, а суткі — 24,6 гадзіны. Дыяметр планеты 6 787 кіламетраў, маса — адна дзесятая Зямлі. Сіла прыцяжэння на паверхні Марса 40 працэнтаў зямной. Сярэдняя тэмпература раўняецца мінус 50 градусаў па Цэльсію. Найвышэйшая тэмпература на экватары даходзіць да мінус 1,5 градуса па Цэльсію, а ўзімку на полюсах дасягае — 130 С°, што амаль у два разы халадней, чым на Зямлі ў самыя лютыя сібірскія маразы.*

*Марс атрымлівае ў два разы менш сонечнай энергіі, чым Зямля. Атмасфера яго сухая і разрэджаная, а скалістая паверхня зафарбавана, як іржаўчынай, з прычыны вялікіх залежаў жалезнай руды.*

*У канцы мінулага стагоддзя, як з 'явіліся фатаграфіі са славутай «сеткай Каналаў», загарэлася фантазія ў людзей на Зямлі і паўстала пытанне — ці ёсць жыццё на Марсе? З'явіліся кнігі фантастыкі: «Вайна светаў» Г. Уэлса, «Аэліта» А. Талстога, «Марсіянскія хронікі» Р. Брэдбэры і інш. Але як гэта заўсёды бывае, распаленая фантазія сціхла, як толькі прыйшла навука і высветліла ўсе тайны Марса.*

*У 1965-м і ў 1973 гадах амерыканцы выслалі на арбіту Марса касмічныя караблі-лабараторыі «Марынар-4» і «Марынар-9». Гэтыя лабараторыі прыслалі на Зямлю першаякасныя фатаграфіі «Каналаў». Аказалася, гэта не каналы, зробленыя разумнымі істотамі, а высахшыя русла грандыёзных вадзяных патокаў. Гіганцкія дзіркі-вадасховішчы аказаліся велізарнымі каньёнамі, у параўнанні з якімі славуты амерыканскі Гранд Каньён — толькі маленькая ўпадзінка. А спадарожнік Марса — гэта агромністыя каменныя глыбы няправільнай формы з 26-кіламетровым дыяметрам у Фобаса і 16-кіламетровым у Дэймаса. А яшчэ пазней, у 1976 годзе, «Вікінг-1» і «Вікінг-2» селі на паверхню Марса, узялі пробы грунта, зрабілі ўсебаковы аналіз і паслалі на Зямлю вестку: Марс зусім мёртвы, ніякага там жыцця няма нават у выглядзе мікраарганізмаў. Прымаючы пад увагу, што вынікі проб «Вікінгу» могуць адносіцца толькі да адной мясцовасці, і што трэба атрымаць поўную карту планеты, то праз 17 гадоў пасля 'Вікінгу", 25 верасня 1992 года, з мыса Канаверал (Фларыда) узляцеў у неба касмічны*

*карабель-лабараторыя «Марс-Обсервер». Яму трэба было пакрыць 12 мільёнаў кіламетраў, правесці ў палёце адзінаццаць месяцаў і выйсці на арбіту Марса ў жніўні 1993 года. Мэтай гэтага праекту было — падрабязны тапаграфічны здымак, падрабязны аналіз умоў надвор'я і пошук адзнак жыцця ў розных раёнах. А што можа быць найбольш важным, як знайсці месцы пасадкі для магчымых будучых караблёў, як аўтаматычных, так і з людзьмі?*

*Уся праграма, якая каштуе 980 мільёнаў долараў, разлічана на тры гады і выклікае ў навуковым свеце зразумелае хваляванне. Высылка такога карабля магчыма толькі раз у 26 месяцаў, калі Зямля і Марс знаходзяцца адносна адзін аднаго ў найбольш выгадным становішчы. «Марс-Обсервер», які важыць 2,5 тоны, будзе круціцца вакол Марса на вышыні 400 кіламетраў і працаваць без перапынку ўсе 687 дзён марсіянскага года. Лабараторыя забяспечана ўсім, што магла даць сучасная тэхніка. Яе тэлекамеры, напрыклад, здольныя перадаваць зусім выразныя абрысы прадметаў, якія маюць толькі пару метраў даўжыні. І галоўная мэта лабараторыі — падрыхтаваць будучую высадку чалавека на Марс.*

*У дапамогу «Марс-Обсервер» нядаўна быў запушчаны праз касмічны тэлескоп робат-фотааб'ектыў, які робіць дакладныя здымкі Марса. І таму ўсе апошнія касмічныя праекты ажыццяўляюцца пры дапамозе чаўночнага амерыканскага касмічнага самалёта. А з тым, што на Марсе няма ніякіх слядоў жыцця, вучоныя наогул зміраліся. Цяпер яны спрачаюцца — ці раней было якое-небудзь жыццё там? І шмат хто думае, што Марс прыпамінае Зямлю, а ў якім стане ён цяпер ёсць — то да гэтага дойдзе і Зямля.*

*У чым жа розніца паміж гэтымі дзвюма планетамі? Бачыце, Зямля мае ваду, што забяспечыла з 'яўленнеў акіянах водарасцяў, а потым раслін, якія паглынаюць з атмасферы двухвокіс вугляроду. Ён выкідаецца ў яе тэктанічнымі сіламі і напаўняе яе кіслародам, робячы ідэальную раўнавагу, якая ўтрымлівае клімат, што спрыяе жыццю.*

*Марс калісьці таксама, відаць, меў ваду на сваёй паверхні. Але ён меншы Зямлі, тэктанічныя працэсы былі менш актыўныя, так што двухвокіс вугляроду больш забіраўся з атмасферы, чым вяртаўся назад. Не было пласта двухвокісу вугляроду ($C0_2$) навокал планеты, які недапусціў бы ахалоджвання і спрыяў бы ўтрыманню жыцця (парніковы эфект). У выніку вада замерзла, і Марс зрабіўся халодным, сухім і безжыццёвым. Над планетай праносяцца страшныя віхуры, якія разносяць пыл, напоўнены жалезнай рудой, якой шмат ёсць у кары Марса, і робяць яго чырванаватым.*

*Можа, мільёны гадоў таму назад усё было інакш на чырвонай планеце. Высахшае водарусла, каласальныя правалы гавораць пра тое, што тут калісьці бушавалі патопы. А калі была вада, значыць, было і жыццё, можа, і разумнае. Калі ж былі разумныя істоты, можа, яны таксама зрабілі ядзерны выбух? Але ці адновіцца тут жыццё?*

*Цяпер паўстае пытанне — ці будзе зноў калі жыццё на Марсе, а не пытанні — ці ёсць жыццё на Марсе, ці было жыццё на Марсе? Цяпер людзі задумваюцца: «Ці зможа наш чалавек адрадзіць жыццё на Марсе, зрабіць накшталт філіяла Зямлі?»*

*Экспедыцыю на Марс можна зрабіць на касмічным караблі, аднак гэтая магчымасць ляжыць усё яшчэ ў сферы здагадак. Цікавыя здагадкі падае амерыканскі астранаўт Майкл Колінз, які мае шмат вопыту ў касмічнай дзейнасці, бо сам лятаў на Месяц. Ён напісаў кнігу «Місія на Марс», у якой дае вельмі цікавыя парады. Вось некаторыя з іх: вельмі добра пабудаваць не адзін, а два касмічныя караблі, якія паляцяць на Марс (напрыклад, адзін амерыканскі, а другі еўрапейскі), з мэтай, што другі будзе ўвесь час ляцець у падтрымку першага. Першы сядае на паверхню Марса ,другі знаходзіцца ў арбіце Фобаса. Сістэма падтрымання жыцця на караблях павінна прадстаўляць закрыты цыкл, дзе ўсё будзе выкарыстоўвацца паўторна.*

*Падарожжа на Марс будзе куды больш складаным і небяспечным у параўнанні з падарожжам на Месяц. Тут прыйдзецца спаткацца з цэлым комплексам праблем: ад смяротна небяспечнай касмічнай радыяцыі да так званага «касмічнага стрэсу», выкліканага ў выніку тугі і напружанага нервовага стану каманды карабля, асабліва віду касмічнай настальгіі, калі касманаўты будуць бачыць Зямлю, як маленькую іскарку, аддаленую ад іх на мільёны кіламетраў.*

*Дзеля большай пэўнасці Колінз радзіць пасылаць касманаўтаў парамі — муж і жонка, — якія будуць жыць у асобных выгадных памяшканнях на караблі. Шмат сюрпрызаў можа чакаць гэтых марсіянскіх касманаўтаў, як, напрыклад, ужо згаданую касмічную радыяцыю, але звязаную з раптам павышанай сонечнай радыяцыяй, метэарытамі і г. д.*

*Вельмі шмат праблем прыносіць доўгатрывалая бязважкасць, у стане якой змяняецца сістэма цыркуляцыі крыві, узнікаюць сімптомы, падобныя да марской хваробы. Можа здарыцца, што ў мозг чалавека прыходзіць сігнал абраптоўным павелічэнні аб'ёму крыві, што выклікае знішчэнне «лішкаў» крывяной плазмы, памяншэнне прадукцыі чырвоных крывяных клетак, атрафіравання мышачнай*

*сістэмы, памяншэнне аб'ёму сэрца, абязводжванне ўсяго арганізму, і ўсё гэта ў беспаваротным працэсе.*

*Адна справа правесці некалькі месяцаў на зямной арбіце, вярнуцца на Зямлю і адразу трапіць у рукі лекараў, і зусім іншае — прыляцець на Марс, выйсці з карабля і адразу пачаць тытанічную працу па асваенню невядомай планеты. Вельмі важным будзе поўная стэрыльнасць карабля. Самыя няшкодныя зямныя бактэрыі, якія трапяць з караблём на Марс, могуць там прайсці мутацыю і зрабіцца небяспечнымі для каманды карабля.*

*І ўсё ж-такі, калі дапусцім, што касмічныя караблі пачалі лятаць на Марс — што чакае першых касманаўтаў-перасяленцаў, якія захочуць нават асвоіць гэту планету, пачаць тарыфікацыю Марса, г. зн. замяніць чырвоную і мёртвую планету ў зялёную і з чалавечым жыццём?*

*Гэтыя першыя людзі на Марсе павінны будуць жыць у сховішчах і норах марсіянскай паверхні, каб схавацца ад радыяцыі і страшэннай халадэчы. Ваду часткова будуць атрымліваць з палярных вышынь. З вады электролізам атрымаецца кісларод, а вадарод злучыцца з двухвокісам вугляроду ў атмасферы і дасць метанкрыніцу цяпла і ракетнага паліва. На Марсе ёсць усё для атрымання бетону, шкла і металу.*

*І вось, нягледзячы на ўсе цяжкасці падарожжа на Марс, апісаныя вышэй, была апытана вялікая колькасць амерыканскіх вучоных — ці магчыма такое падарожжа, ці не? Большасць вучоных адказалі, што гэта зусім магчыма пры сучаснай тэхніцы, якая ўсё болей удасканальваецца.*

*У ЗША, яшчэ пры прэзідэнце Вушы, пад націскам навуковых колаў была абвешчана так званая ініцыятыва касмічнага даследавання, сэрцам якой стаў праект асваення Марса. Правесці дакладны, навуковы аналіз гэтага праекта было даручана 4-м найбольш выдатным навукова-даследчым цэнтрам ЗША. Атрыманыя дадзеныя з цэнтраў падсумавалі ў наступныя парады для далейшай касмічнай дзейнасці:*

*Можна даследаваць космас пры дапамозе аўтаматычных машын-робатаў, паехаць на Марс проста з Зямлі, паляцець спачатку на Месяц, а далей на Марс.*

*Марс — планета, куды чалавек хоча паехаць і асвоіць яе. Тэхніка ўжо даходзіць да такой дасканаласці, што можна гэта будзе зрабіць!*

*У выніку дзейнасці амерыканскай ІКД (Ініцыятывы касмічнага даследавання) быў выдадзены даклад Стэфорда. Гэта НАСА — Міністэрства астранаўтыкі паклікала групу — 40 чалавек найвыдатнейшых вучоных пад кіраўніцтвам былога астранаўта*

*Тома Стэфорда, каб даследаваць будучыя касмічныя планы ЗША. Яны пачалі працу ў жніўні 1990 года і працягвалі Ю месяцаў. Вынікам яе быў даклад на 180 старонках, які выдаў наступныя рэкамендацыі:*

*Поўнае і дакладнае даследаванне планеты Марс: спачатку падарожжа на Месяц каля 2005 года.*

*Першае падарожжа чалавека на Марс з мэтай затрымацца там на тэрмін ад 30 да 100 дзён.*

*Паехаць зноў на Марс каля 2016 года і быць там каля 600 дзён.*

*Або: Спачатку падарожжа на Месяц у 2003 годзе з шырокай актыўнасцю там пры дапамозе машын-робатаў. Пазней палёт на Марс у 2014 годзе.*

*Палёт на Месяц у 2004 годзе і адтуль даследаванне Марса, куды паляцець у 2014 годзе, там затрымацца ад 30 да 100 дзён.*

*Для праекта падарожжа на Марс выкарыстаць усе рэсурсы, якія знаходзяцца ў космасе. Дзеля гэтага збудаваць фабрыкі-робаты на Месяцы каля 2003 года з чалавекам каля 2004 года і з палётам на Марс каля 2016 года.*

*Даклад Стэфорда рэкамендуе таксама наступнае:*

*Выкарыстаць у праекце асваення Марса тыя самыя ракетныя матory першай ступені, якія ўжываліся ў праекце «Апалон», г. зн. Сатурн V.*

*Звычайныя маторы, або з камбінацыямі плыўкі вадарод і плыўкі кісларод, якія будуць яшчэ больш удасканалены да 1998 года і якія змогуць падняць цяжар ад 150 да 250 тон.*

*Таксама замест плыўкага вадароду можна выкарыстаць кандэнцыйны керасін, калі будзе ўдасканалены гэты матор, што можа быць больш эканамічным і бяспечным.*

*У далейшых ступенях марсавага карабля павінны ўжывацца ядзерныя маторы з усімі удасканаленнямі. І на Марсе, і на Месяцы павінна ўжывацца ядзерная энергія з ядзернай сістэмай, якая дасць найменш мегават электрычнасці.*

*Праграму ІКД увесці ў школы, каб узгадаваць і адпаведна падрыхтаваць будучых вучоных і інжынераў.*

*Заклікаць усіх, хто можа, каб давалі ідэі, якія будуць карыснымі ў ІКД.*

*Даклад Стэфорда заканчваецца наступнымі словамі: «Амерыка стаіць на парозе новага стагоддзя і новых дасягненняў. Нашы сучасныя высілкі праходзяць інтэнсіўную праверку. Мы маем шмат цяжкіх і заблытаных праблем, падобных на тыя, што мелі ў эпоху «Апалона». Напрыклад, такое пытанне: дзеля чаго зноў патрэбны вялікія праекты і велізарныя грашовыя выдаткі, звязаныя з імі?*

*ІКД павінна адрадзіць у амерыканцаў сэнс канкурэнцыі і нацыянальны гонар. У сучасным свеце няпэўнасці ІКД павінна і мае здольнасць натхніць нашу нацыю і стымуляваць народ да новых вялікіх дасягненняў.*

*Безумоўна, далейшае развіццё тэхнікі павінна папярэдзіць такія вялікія праекты, як падарожжа на Марс. Можна пачаць усё з малым бюджэтам. Вялікія народы ў мінулым заўсёды даследавалі і эксплуатавалі новыя прасторы. Космас — гэта прастора індустрыялізаванага свету XXI стагоддзя.*

*Мы, амерыканцы, павінны спытаць сябе: якая будзе наша роля ў будучым даследаванні Сонечнай сістэмы — кіраваць або плясніся за іншымі, ці стаяць у баку ад усяго?»*

*Заканчэнне.*

*Пры канцы гэтага сціплага рэферату хачу сказаць наступнае. Мы ўжо стаім на парозе новага стагоддзя, якое, напэўна, прынясе чалавецтву шмат новых дасягненняў у навуцы і тэхніцы. Ужо шмат зроблена ў XX стагоддзі (палёт на Месяц). З'явілася новая навука — астранаўтыка, якая ўсё больш і больш захапляе чалавека. Ужо існуе IAF (Міжнародная астранаўтычная федэрацыя), якая аб'ядноўвае высілкі ўсяго свету. Астранаўтыка выкладаецца на спецыяльных факультэтах у Гарвардскім, Стэнфордскім, Мюнхенскім і іншых універсітэтах. Можа, калі-небудзь і беларуская незалежная дзяржава далучыцца да сусветнага астранаўтычнага руху?!»*

* * *

Так, сапраўды, вера Барыса Кіта ў незалежную і багатую Радзіму, якой яна павінна стаць, каб адчуваць сябе ўпоравень з вялікімі дзяржавамі свету, нязгасная. Паездзіўшы па глыбіннай Беларусі, пазнаёміўшыся, сустрэўшыся, паразмаўляўшы з моладдзю, з многімі выдатнымі беларусамі, апантанымі ідэямі адраджэння Бацькаўшчыны, Барыс Уладзіміравіч змог упэўніцца, што жыве Беларусь, нягледзячы ні на што, як жыў, жыве і будзе жыць народ, які столькі перапакаваў. Гэта загартоўвае, пацвярджае, што толькі ў еднасці, добрасуседстве, вернасці лепшым нацыянальным традыцыям, любові да сваёй мовы, гісторыі, далучанасці да еўрапейскай сусветнай цывілізацыі наша духоўная моц і выратаванне.

Апошні дзень у Мінску да вучонага ў гатэль «Беларусь» прыходзілі карэспандэнты газет, радыё, тэлебачання. Каля трох гадзін размаўляў з ім, распытваў пра жыццё, здымаў кінарэжысёр, народны артыст рэспублікі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Віктар Дашук, фільм якога пра Барыса Кіта быў паказаны 21 лістапада 1994 г. па беларускім

тэлебачанні пад назвай «Барыс Кіт — апошні з магіканаў». Дарэчы, па тэлебачанні быў паказаны тэленарыс: «Я заўсёды быў беларусам» (6 снежня 1994 т., інтэрв'ю Вольгі Іпатавай з Б. У. Кітам падчас работы Міжнароднай акадэміі Еўразіі).

Перад ад'ездам у Франкфурт Барыс Уладзіміравіч нанёс развітальны візіт у ЗБС «Бацькаўшчына», дзе старшыня згуртавання Ганна Сурмач уручыла яму памятныя сувеніры, кнігі.

Усяго дзесяць дзён быў з намі Барыс Уладзіміравіч, але пра яго знаходжанне на Бацькаўшчыне шмат пісалі газеты («Культура», «Звязда», «Навіны Акадэміі навук Беларусі», «Гродзенская праўда», «Голас Радзімы», «Пагоня», «Новае жыццё», карэліцкая газета «Полымя» і інш.). Вось урыўкі з некаторых артыкулаў:

«...Другі — за больш чым пяцідзесяцігадовы перапынак — прыезд сусветна вядомага вучонага Барыса Кіта, нашага земляка на сваю радзіму быў надзвычай плённым... У нашым друку шмат пісалася аб вяртанні сыноў і дачок нашай Бацькаўшчыны, якія па тых ці іншых прычынах пакінулі некалі радзіму і цяпер, калі пачалі здзяйсняцца іх шматгадовыя спадзяванні на незалежнасць Беларусі, хацелі б зноў адчуваць сябе на роднай зямлі не толькі гасцямі, але і патрэбнымі ёй, яе навуцы і бізнесу, яе культуры і адукацыі людзьмі. Доктар астранаўтыкі, заслужаны прафесар Мэрылендскага універсітэта Барыс Кіт, якому ў красавіку 1994 года споўнілася 84 гады, поўны жадання наладзіць кантакты паміж навукоўцамі Амерыкі і Германіі і беларускімі вучонымі, і яго надзіва энергічныя захады дапамаглі ў стварэнні новых праграм нашаму універсітэту культуры, дзе ён таксама пабываў падчас свайго прыезду, прымеркаванаму, аднак, найбольш да стварэння новай Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі.

Міжнародная акадэмія навук Еўразіі, якую ўзначаліў вядомы вучоны з Масквы Яўген Шыраеў, ставіць за мэту не канфрантацыю з Акадэміяй навук Беларусі і іншых дзяржаўных устаноў, а найперш — супрацоўніцтва з вучонымі ўсіх краін у галіне культуры і навукі на карысць Беларусі. Аб гэтым, дарэчы, добра сказаў на першай Генеральнай асамблеі МАНЕ мэр горада Мінска Аляксандр Герасіменка, які шмат у чым дапамог ажыццяўленню самой ідэі акадэміі: «Прыемна, што Міжнародная акадэмія навук Еўразіі арганізавана менавіта ў Мінску і выбрала наш горад сваёй штаб-кватэрай. Разумею ўсю адказнасць гарадскіх улад па стварэнню нармальных умоў працы акадэміі. Мэты, якія яна ставіць, блізкія і зразумелыя нам, бо для Беларусі сёння, як ніколі раней, патрэбны захаванне і далейшае развіццё ўжо раней створаных навуковых, культурных, эканамічных і духоўных сувязей. Нам важныя, як ніколі, і структурная перабудова

эканомікі, накіраваная на развіццё энергазберагальных тэхналогій і згортвання рэсурсаёмістых вытворчасцей, а таксама вырашэнне пытанняў, звязаных з канверсіяй. Рэалізацыя ўсяго гэтага патрабуе развіцця шматпрофільнай, высокаразвітай навукі як падмурка тэхнічнага, эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу грамадства».

Менавіта таму акадэмікамі новай акадэміі сталі не толькі Р. Гарэцкі, В. Рагойша, Г. Цыхун, А. Мальдзіс, І. Ліштван і іншыя беларускія навукоўцы, але і А. Савін, М. Макееў, А. Раўшэнбах, Б. Карнілаў — вядомыя вучоныя з Расіі, А. Баршчэўскі з Польшчы, В. Кіпель з ЗША, навукоўцы з Украіны. Сапраўднымі яе членамі сталі Мітрапаліт Мінскі і Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт, спявак Віктар Скарабагатаў, асацыіраваным членам абраны А. Герасіменка, членкорам — Джордж Дзівілі з Англіі...

Шкада, што на Генеральную асамблею амаль не запрасілі карэспандэнтаў — на ёй можна было ўбачыць, апроч усяго, і невялікія выставы карцін Яўгена Шыраева і Барыса Карнілава, паслухаць мелодыі са старажытнага «Полацкага сшытка» ў выкананні Віктара Скарабагатава і ўвогуле ўпэўніцца, што наш Мінск паступова становіцца цэнтрам не толькі, скажам так, міфічнай СНД, але і цалкам рэальных утварэнняў, што могуць скандэнсаваць лепшыя сілы беларускай і сусветнай навукі. Барыс Кіт, абраны віцэ-прэзідэнтам, адзначыў гэта ў сваёй прамове з супрацоўнікамі газеты «Культура». Адзначыў ён таксама і незвычайны ўздым душэўных сіл, які надала яму паездка на Беларусь...» (Вольга Іпатава. «...Я спадзяюся на новыя сустрэчы...», газета «Культура» 12 кастрычніка 1994 г.).

«...27-28 верасня ў Гародні з неафіцыйным візітам знаходзіўся акадэмік Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі, вядомы грамадскі і педагагічны дзеяч Заходняй Беларусі і беларускай эміграцыі, славуты сын Прынёманскага краю, прафесар, доктар філасофіі Барыс Уладзіміравіч Кіт. Да шматлікіх навуковых і ганаровых званняў Барыса Кіта днямі дадалося членства Міжнароднай акадэміі «Еўразія», сесія якой адбылася 24-26 верасня ў Менску і на якой наш зямляк быў абраны віцэ-прэзідэнтам. Таму нядзіўна, што галоўную ўвагу віцэ-прэзідэнта «Еўразіі» ў Гародні прыцягнулі акадэмічныя і універсітэцкія якасці нашага горада, сустрэчы з навукоўцамі, абмеркаванне перспектыў супрацоўніцтва з акадэміяй, якая ставіць сваёй мэтай збліжэнне і каардынацыю навуковых доследаў у розных рэгіёнах Еўропы. У арганізацыі першага візіта Б. Кіта ў Гародню дапамаглі рэдакцыя газеты «Культура», рэктарат Гарадзенскага універсітэта імя Я. Купалы і Гарадзенская філія фонда падтрымкі дэмакратычных рэформаў.

Барыс Кіт вядомы як адданы прыхільнік беларускай гісторыі культуры... Аб гэтым пісала «Пагоня» ў сваім нумары ад 30 ліпеня 1993 г. Нядзіўна, што першая экскурсія ў Гародні адбылася ў Гарадзенскі гісторыка-археалагічны музей. Аматарам гісторыі і навукі цікава будзе даведацца, што падчас экскурсіі Б. Кіт падараваў аддзелу рэдкай кнігі і старадрукаў музея экземпляр сваёй доктарскай дысертацыі, прысвечанай гісторыі ўзнікнення матэматычнай школы Зыгмунда ў Заходняй Беларусі. Прафесар Кіт прысутнічаў на лекцыі варшаўскага прафесара Лелейка, прысвечанай гісторыі гарадзенскіх замкаў. Ён быў прадстаўлены мэру горада Генрыху Карпенку і віцэ-мэру Аляксандру Мілінкевічу. Вялікае захапленне ў акадэміка выклікала гарадзенская старажытнасць: муры старога замка, сцены 1000-гадовых культавых пабудоў. 84-гадовы акадэмік наведаў і Каложскую гару, дзе пакланіўся гістарычнаму помніку «Пагоні на Грунвальд»... (Андрэй Майсяёнак. «Акадэмік Барыс Кіт упершыню наведаў Гародню», газета «Грамада», 7-13 кастрычніка 1994 г.).

«...Лепшыя прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі нашай рэспублікі ў свой час вымушаны былі пакінуць Радзіму. Але вялікая сіла таленту ў розных умовах і абставінах прабівала сабе дарогу. Так нашы землякі станавіліся славутымі людзьмі ў Амерыцы і Канадзе, Аўстраліі і Германіі. Імёны іх гучалі ў свеце, выдаваліся кнігі і навуковыя працы, выконваліся іх песні.

Толькі аб сваіх слынных сынах і дочках маўчала Бацькаўшчына. Таталітарны рэжым рабіў для гэтага ўсё: быў забаронены прывоз эмігранцкай літаратуры і толькі час ад часу яна выпадкова скрозь мытны кантроль трапляла сюды. Была забарона нават на вымаўленне імя, глушыліся перадачы замежных радыёстанцый.

Цяпер зусім іншы час. Нашы сусветна вядомыя землякі вяртаюцца на Бацькаўшчыну, а іх імёны, набыткі займаюць сваё пачэснае месца ў гісторыі, навуцы, культуры, асвеце.

Аб гэтым мы гутарым у Інстытуце біяхіміі Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь з Барысам Кітам, які наведаў гэту навуковую ўстанову па запрашэнню намесніка дырэктара інстытута Андрэя Майсяёнка. Суправаджала госця Лідзія Савік — сакратар Рады Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», пісьменніца, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі, дацэнт Беларускага універсітэта культуры, якая многае зрабіла для таго, каб Барыс Кіт ужо другі раз за кароткі час наведаў родныя мясціны, каб аб ім пачулі тут.

У невялічкім рабочым кабінеце гаспадара на бачным месцы размешчана ксеракопія артыкула Масея Сяднёва «Барыс Кіт» з эмі-

гранцкай газеты «Беларус», што выходзіць у ЗША. Прыгадваецца сустрэча госця з А. Майсяёнкам у Франкфурце-на-Майне, а затым размова __ пераносіцца да родных мясцін Барыса Кіта. Ён з прыемнасцю ўспамінае тыя далёкія, але цікавыя гады жыцця... А сёння ён нават не ўяўляў, як многа людзей, былых вучняў, памятаюць аб ім, ганарацца сваім былым настаўнікам. Урачыстыя вечары, наладжаныя з нагоды прыезду шаноўнага госця, паказалі гэта яскрава... (Р. Карачун. «Цешуся сустрэчай з Бацькаўшчынай», газета «Гродзенская праўда» 11 кастрычніка 1994 г. Апублікаваны вялікі артыкул пра жыццё і дзейнасць Барыса Уладзіміравіча Кіта.)

«...Вельмі шкада, што дасюль не была асабіста знаёма з нашым вядомым суайчыннікам, славутым вучоным Барысам Кітам. Не чалавек — глыба. Столькі ўсяго можна расказаць...» (Таццяна Антонава. «Па слядах свайго першага кахання», газета «Звязда» 8 кастрычніка 1994 г.)

«...І тым бліжэй бацькоўская зямля...» Гэтыя радкі, вынесеныя ў загаловак, належаць пяру паэтэсы Вольгі Іпатавай і ўзяты яны з верша, прысвечанага нашаму славутаму земляку, прафесару астранаўтыкі Барысу Кіту. Вольга Іпатава прачытала свой верш у час сустрэчы грамадскасці райцэнтра з Барысам Кітам у дзіцячай музычнай школе (Карэлічы), якая адбылася ў мінулы панядзелак...

«...Барыс Уладзіміравіч Кіт пачаў свой расказ з таго, што ён шчаслівы чалавек, шчаслівы дасягнутым і асабліва тым, што прыехаў на Радзіму да сваіх родных і знаёмых, да сваіх землякоў». Я жыў тут, вучыўся, а далей удасканальваў свае веды праз усё жыццё. Ведаю, што самае галоўнае ў грамадстве, калі яно хоча стаць цывілізаваным, — гэта асвета. Але наша пакаленне сваё аджыло, і вам, маладым, прадаўжаць асветніцкую работу. Гэта самы важны напрамак вашай дзейнасці яшчэ і таму, што Беларусь сёння незалежная. Гэта, бадай, самая важкая падзея стагоддзя ў яе гісторыі. Але каб яна сапраўды стала паўнапраўным членам міжнароднага супольніцтва, трэба яшчэ вельмі многа працаваць...»

Потым Барыс Уладзіміравіч адказваў на пытанні ўдзельнікаў сустрэчы...» (С. Лука. «І тым бліжэй бацькоўская зямля», газета «Полымя» І кастрычніка 1994 г., Карэлічы).

На гэтыя сустрэчы землякі, был ыя вучні Барыса Кіта прыносілі яму свае ўспаміны, як вусныя, так і пісьмовыя.

З успамінаў акадэміка Аляксандра Раковіча: «У сваіх успамінах я не магу згадаць вялікую колькасць цікавых фактаў, адлюстраваць доўгатэрміновыя назіранні ці непасрэдныя асабістыя стасункі з Барысам Уладзіміравічам Кітам. Мы людзі, так бы мовіць, рознага часу.

Нас раздзяляе больш чым 16-гадовы ўзроставы бар'ер, што для магчымых узаемных дачыненняў перыяд даволі вялікі. Мне не давялося ні вучыцца разам з Б. Кітам, ні тым больш працаваць. Але былі другія абставіны, якія дазволілі мне не толькі знаць і чуць пра Кіта, але і бачыць яго ў працы, у дзейнасці.

Нашы бацькоўскія хаты раздзяляла не больш чым двухкіламетровая адлегласць. Вёска Агароднікі, дзе правёў сваё дзяцінства Барыс Кіт, прытуліла да мястэчка Карэлічы з поўдня. Мая ж родная вёска Лясок ляжыць на поўнач ад Карэліч, у адлегласці 1,5км. Пры такіх пазіцыйных параметрах не толькі ўсе важныя, але і сярэднія ды дробныя падзеі і здарэнні былі добра вядомыя і шырока абмяркоўваліся як у адной, так і ў другой вёсцы, балазе што Карэлічы былі звычайным месцам сустрэч агародніцкіх сялян з лясоцкімі і наадварот. Акрамя таго, мне давялося некалькі месяцаў вучыцца ў навучальнай установе, якую ўзначальваў Барыс Кіт...

Першыя згадкі пра Барыса Кіта ў маёй свядомасці адносяцца, бадай, ці не да шасцігадовага ўзросту. Гэта быў пачатак 30-х гадоў. Тады сяляне і моладзь нашых вёсак пацягнуліся да навукі, бо верылі, што яна асветліць ім шляхі да нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення. Я задоўга да школы навучыўся ад маці і старэйшага брата пісаць, чытаць, лічыць і выконваць першыя чатыры арыфметычныя дзеянні, цікавіўся навукай і таму прагна ўбіраў у сябе ўсё, што аб ёй гаварылі. Частыя размовы бацькі і яго сяброў пра добрыя поспехі ў адукацыі нашага земляка з суседніх Агароднікаў я ўспрымаў з вялікай павагай да яго і пачуццём недасягальнасці ім здзейсненага. Яны будзілі ў маёй дзіцячай свядомасці баязлівыя летуценні, жаданні пайсці яго шляхам, стаць з часам такім жа, як ён. Тады ж я спасціг такія словы і паняцці, як экзамен, гімназія, бурса, матура, універсітэт, доктар, прафесар, рэктар і інш. Тыя часы сёння мне здаюцца рамантычнымі і вызначальнымі ў нашых лёсах, а асоба Барыса Кіта нейкай легендарна-волатаўскай.

Усе трыццатыя гады пры кожных чарговых канікулах гімназісты навакольных вёсак, што вучыліся ў Віленскай беларускай гімназіі, распавядалі аб здольным, руплівым, самаадданым выкладчыку Барысу Кіту, аб яго дабрыні, спагадлівасці і дапамозе гімназістам у працы і побыце. Але ўбачыць яго мне давялося толькі ў канцы 30-х, дакладней у 1939 годзе. У гэтым годзе я скончыў 6 класаў сярэдняй школы і паспяхова здаў экзамены ў польскую гімназію імя А. Міцкевіча ў Наваградку. Пачатак заняткаў тады супаў з пачаткам другой сусветнай вайны. Хутка ў Наваградак увайшла Чырвоная Армія, а прыкладна праз месяц у сувязі з перадачай Вільні Літве ў

Наваградак пераехала Віленская беларуская гімназія на чале з Барысам Кітам, яе дырэктарам. Пры такой сітуацыі я пакінуў польскую наваградскую гімназію, выбар якой быў абумоўлены магчымасцю жыць у роднай цёткі ў вёсцы Сялец, і перайшоў у прывезеную з Вільні беларускую гімназію. Выкладчыкамі ў гэтай гімназіі былі: Аляксандр і Наталля Орсы, Вольга Радзевіч, Эма Залкінд, Аляксей Анішчык, Платон Пляскач, Лявон Барысаглебскі, Мокат, Еўпіхоўская і іншыя. Многія з іх прыехалі з Вільні.

І вось адзін з першых сходаў вучняў і педагогаў Наваградскай беларускай гімназіі ў фізкультурнай зале. Выступае дырэктар. Малады, інтэлігентны, высокаадукаваны чалавек гаворыць аб мэтах і задачах, аб рэжыме работы і навучання, аб умовах жыцця ў інтэрнатах, аб падручніках, неабходным інвентары і дапаможным абсталяванні. Гаворыць проста, лёгка, мілагучна, па-беларуску. У зале поўная цішыня: слухаюць моўчкі, старэйшыя і малодшыя, слухаюць настаўнікі. Упершыню адчуваю, якая прыгожая беларуская мова, якая мяккая і сакавітая, якая развітая, якія складаныя думкі можна так проста на ёй выказаць. Барыс Кіт зачароўвае аўдыторыю грунтоўнымі ведамі, уменнем іх выкласці, адчуваецца трывалы педагагічны вопыт, набыты ў практыцы выкладання па-беларуску ў Вільні, высокі прафесіяналізм навукоўца і выкладчыка. І гэта ў 29 год! Сучасныя спецыялісты ў такім узросце ўсё яшчэ ходзяць у маладых, патрабуюць дапамогі.

Міжвольна прыходзіць на ўспамін наш калектыўны выступ у падтрымку беларускай мовы ў школе, Тады, у 1936 годзе, мы, вучні польскай школы, адмовіліся заходзіць у клас і садзіцца за парты, патрабаваўшы ад кіраўніцтва школы беларускай мовы навучання. І хоць дзяржава адказала штрафамі для нашых бацькоў, усё ж у 1936-1937 навучальным годзе шмат якія дысцыпліны ў Запольскай школе Карэліцкай воласці выкладаліся па-беларуску. Але якое гэта было выкладанне?! Гэта быў здзек над нашай мовай, бо польскія настаўнікі не хацелі, ды і не ўмелі яе выкладаць. Яны імкнуліся, каб наша слова гучала брыдка, ганебна, каб нам самім яно не падабалася, і мы адмовіліся ад сваіх жаданняў. Для пашырэння сферы ўжывання мовы як тады, так і цяпер патрэбны такія волаты духа, ведаў, апантаныя патрыёты беларушчыны, якім мы ведалі Барыса Кіта. Менавіта ён з размахам сеяў сярод нас зерні высокай нацыянальнай свядомасці, пачуцця беларускай годнасці, бязмежнага жадання ведаў.

На жаль, хутка нашы з Б. Кітам шляхі разышліся, бо я ў лютым 1940 года паехаў з Наваградка дамоў, дзе ўзнікла Запольская школа і дзе я мог вучыцца далей, а Барыс Кіт быў пераведзены на работу ў аблана».

Школьныя мары Алеся Раковіча пайсці па слядах Барыса Кіта здзейсніліся. Ён стаў матэматыкам, нястомна, як і яго настаўнік, усё жыццё павышаў свае веды. Цяпер ён вядомы на Беларусі як таленавіты вучоны, доктар тэхнічных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, акадэмік Акадэміі інфармацыйных працэсаў і тэхналогій, мае ўзнагароды, з'яўляецца аўтарам 206 асноўных апублікаваных навуковых работ, у тым ліку 25 манаграфій і брашур, 13 міжнародных і замежных публікцый, 4 падручнікі, 4 вучэбныя дапаможнікі. Пад яго кіраўніцтвам абаронена 10 кандыдацкіх дысертацый. Цяпер Аляксандр Гаўрылавіч Раковіч працуе загадчыкам лабараторыі Інстытута тэхнічнай 'кібернетыкі .Акадэміі навук Беларусі.

Ці не падарунак гэта для Барыса Кіта бачыць, як пасеянае ім некалі зерне буйна ўскаласіла не ў адным з яго былых вучняў, многія з якіх сталі акадэмікамі, прафесарамі, матэматыкамі, настаўнікамі, ды і, наогул, добрымі людзьмі, патрыётамі Бацькаўшчыны, і ці не таму ён увесь час на сустрэчах паўтарае, што ён шчаслівы чалавек?!

Сустрэчы з Бацькаўшчынай, знаёмымі і блізкімі людзьмі, былымі вучнямі натхнялі і Барыса Уладзіміравіча на ўспаміны. Добрае слова ён гаварыў пра кожнага чалавека, з кім зводзіў яго лёс на Радзіме і ў эміграцыі. Варта ўслухацца ў гэтыя словы шмат пажыўшага і пабачыўшага чалавека, каб зразумець, якая сіла прыцягвала і прыцягвае да яго людзей.

## *Расказы Барыса Кіта*

### Алесь Калодка

У сваім жыцці я сустракаў выдатных людзей, да якіх належыць і Алесь Калодка. Ён нарадзіўся ў Турцы, вучыўся ў Віленскім універсітэце, скончыў юрыдычны факультэт. Гэта быў шчыры патрыёт Беларусі. Я сустрэўся з ім падчас вайны, ён быў беларускім упаўнаважаным у Вілейцы, ездзіў па Вілейшчыне і праводзіў беларусізацыю адміністрацыі, вельмі важную для нас справу. Бо як толькі прыйшлі немцы і пачалася акупацыя, ўсе пасады ў вёсках і гарадах адразу пазаймалі палякі, якія вынішчалі беларусаў нямецкімі рукамі. Мужная дзейнасць Калодкі выратавала шмат беларускіх патрыётаў ад рук польскіх рэнегатаў, якія, добра ведаючы нямецкую мову, супрацоўнічалі з немцамі, імкнучыся вынішчыць этнічных беларусаў. Калодка выратаваў, да прыкладу, Нікандра Мядзейку — былога школьнага інспектара Маладзечанскага раёна. Прыехаўшы на інспекцыю гэтага раёна, Калодка заўважыў, што начальнік раёна Уневіч, рэнегат, які прыкідваўся беларусам, склаў спіс людзей, якія павінны быць расстраляныя, і першым стаяла прозвішча Мядзейкі, а за ім і іншых беларусаў. Калодка паспеў многім паведаміць, а найперш папярэдзіў Мядзейку, той знік і такім чынам застаўся жывым. Пра сваю патрыятычную дзейнасць Алесь Калодка шмат расказваў мне, калі завітаў у Лебедзева, дзе я знаходзіўся з сям'ёй, і таксама папярэджваў мяне аб небяспецы, якая пагражала ўсім нам з боку палякаў і немцаў. Я яму вельмі ўдзячны за гэта.

За сваю беларускую дзейнасць ён трапіў у нямецкі канцлагер Аўшвіц, дзе страціў здароўе, але застаўся жывым. Пазней мы спаткаліся з ім у Мюнхене, дзе ён заснаваў беларускі студэнцкі саюз. У хуткім часе ён выехаў у Аўстралію, але і там не пакідаў займацца беларускімі справамі. Мы з ім перапісваліся да самай ягонай смерці. Алесь Калодка напісаў цікавыя ўспаміны, якія друкаваліся ў газеце «Беларус» (1994).

### Доктар Мікола Шчорс

Мікола Шчорс нарадзіўся ў м. Новы Свержань, а бацькі яго паходзілі са Шчорсаў, дзе некалі працаваў мой дзед. Мікола скончыў факультэт медыцыны Віленскага універсітэта на два гады пазней за мяне. Але мы разам з ім належалі да беларускага студэнцкага саюза ў Вільні, адзін час Мікола быў нават старшынёй гэтага саюза і наогул

актыўным грамадскім дзеячам, шчырым беларусам. Падчас вайны быў старшынёй беларускага нацыянальнага камітэту ў Варшаве. Пасля заканчэння вайны я спансараваў яго прыезд у Амерыку, у Саўт-Рывер, дзе ён заснаваў Беларускі Кангрэсовы камітэт Амерыкі, быў рэдактарам газеты "Беларуская трыбуна". Калі я выехаў з Саўт-Рывера, Мікола Шчорс пераняў маю справу, якую я вёў дзеля пераезду беларусаў у Амерыку, стаў першым беларускім лекарам Саўт-Рывера, лячыў сваіх землякоў, рабіў аперацыі. Мы з ім часта перапісваліся. Потым Мікола пераехаў у Нью-Йорк, працаваў хірургам. Ён быў настолькі здольным, выдатным хірургам, што яго выбралі віцэ-прэзідэнтам Амерыканскага хірургічнага таварыства. Меў сям'ю, жонка яго Ліза таксама ўрач, анастэзіёлаг. У іх двое дзяцей: дачка Тамара, сын Мікалай, ёсць унукі. Я маю да іх шчырую, вялікую пашану, а Мікола для мяне не толькі зямляк, але і блізкі па духу чалавек, які здолеў даказаць, што і мы, беларусы, нечага можам дабівацца ў вольным свеце. Памёр гэты выдатны чалавек, таленавіты, шчыры беларус у 1995 годзе у горадзе Маўнт Дора (штат Фларыда, ЗША).

## Масей Сяднёў

Маё першае знаёмства з Масеем Сяднёвым — таленавітым беларускім паэтам, цікавым чалавекам адбылося ў 1946 годзе ў Германіі. Сустрэліся, як сустракаліся ўсе беларусы-эмігранты. Я ўжо ведаў, што ён быў рэпрэсіраваны, не паспеўшы скончыць Мінскі педінстытут, да вайны адбыў чатыры гады на Калыме, выпадкова выратаваўся, у 1944 годзе трапіў у Беласток, дзе яму на першых кроках выгнання вельмі дапамог Хведар Ільяшэвіч. У Германіі, у лагерах перамешчаных асоб, ён часта выступаў з чытаннем сваіх вершаў, меў вялікі поспех.

У 1949 годзе, ужо з Амерыкі я выпісаў у Саўт-Рывер Вольгу Пазняк, а ў 1950 г. прыехаў з Нямеччыны і Масей Сяднёў, яны пажаніліся, у іх затым нарадзілася трое дзяцей. Калі я выехаў у Каліфорнію, а праз 8 гадоў у Вашынгтон, Сяднёвы жылі яшчэ ў Саўт-Рыверы. Пазней, падчас працы Масея на радыёстанцыі «Свабода» ў Мюнхене і майго пераезду ў Франкфурт-на-Майне, мы часта сустракаліся, ездзілі ў госці адзін да аднаго. Я па запрашэнню Сяднёва чытаў лекцыі па радыё пра дасягненні амерыканскай навукі і тэхнікі. На працягу ўсіх гэтых гадоў узнікла духоўная еднасць, прыязнасць, сяброўства.

Пасля вяртання Сяднёвых у Амерыку мы падтрымлівалі цесную сувязь, а калі я прыязджаю на Каляды да сваіх сыноў, то заўсёды праведваю Вольгу і Масея ў Глен-Кове пад Нью-Йоркам, дзе яны

цяпер жывуць. Я вельмі высока цаню творчасць Сяднёва, лічу, што ён найбольш выдатны беларускі паэт і празаік на эміграцыі. Ён збудаваў мост паміж беларускай і заходнееўрапейскай літаратурай сваімі перакладамі, асабліва з нямецкай класікі. Вельмі добра, што творчасць Масея Сяднёва вярнулася на Беларусь, што там цяпер ведаюць, чытаюць, перавыдаюць яго паэтычныя зборнікі «Патушаныя зоры», «Ачышчэнне агнём», «А часу больш, чым вечнасць», раманы «І той дзень надышоў» і «Раман Корзюк» (я быў спонсарам яго першага выдання ў Мюнхене), а нядаўна ў Мінску выйшла і «Масеева кніга» — зборнік яго публіцыстыкі. Мне падабаюцца многія яго вершы, асабліва прысвечаныя Беларусі:

Цяпер на бацькаўшчыне ўжо маразы
кладуць узор на ранішнім лядку.
Падпаленыя восеняў бярозы
усьцяж гарäць на бальшаку...
У полі бацьку я ў падмозе,
гляджу жывёлу, бульбіны пяку.
І ўсё гляджу чамусьці, як бярозы
гараць на нашым бальшаку...

***

Сьпяць акіяну твайго воды,
як сон, варочаецца імгла.
Нашто ж, скажы, між Захадам і Усходам
вачыма сінімі ты прарасла?..

***

Не сумуй, Беларусь, ты блікітнаю казкаю
і снягамі ў палёх не імжы —
Да цябе яшчэ прыдзем, каб сілаю носкаю
здолець тых, што распялі цябе на крыжы...

***

Родныя, ня плачце пры ўспаміне —
не загіне ваш бяздомны сын:
я прыду з далёкае чужыны,
змучаны выгнаннем на спачын.
Утаю я сэрца свайго раны,
абаб'ю з адзення пыл дарог.
Усхвалёваны душою, стану
на даўно пакінуты парог...

Я наогул вельмі люблю паэзію, сам спрабаваў пісаць вершы яшчэ ў гімназіі, асабліва, калі зведаў першае каханне. Пазней прыйшла ідэя напісаць аповесць. Нават сюжэт узяў з уласнага жыцця — як я ратаваў каханую дзяўчыну на момант пажару, калі ў Карэлічах выгарэла шмат дамоў, бо былі яны пад саламянымі стрэхамі... Але гэта задума не здзейснілася. Тым не менш, літаратура, гісторыя, музыка, жывапіс для мяне, пасля матэматыкі, вядома, — нязменная любоў.

Памятаю, калі мне было гадоў 12 ці мо 13 і наша сям'я тады часова жыла ў доме святара, я знайшоў і прачытаў Біблію, усю запар, асабліва спадабаўся «Стары запавет». З таго часу добра ведаю амаль усе традыцыйныя літаратурныя сюжэты, якія выкарыстоўваюцца пісьменнікамі ўсяго свету. І пазней, якая б кніжка ні трапляла ў рукі, чытаў запоем, асабліва рускую класіку — Пушкін, Лермантаў, Крылоў, Тургенеў, Чэхаў. Знаёмства з беларускай кнігай у мяне адбылося ў Навагрудскай беларускай гімназіі, памятаюцца апавяданні з беларускага жыцця Ф. Багушэвіча, Ядвігіна Ш., З. Бядулі, «Новая зямля» Я. Коласа, вершы М. Багдановіча, Я. Купалы. Многае і цяпер магу цытаваць на памяць. І цяпер вельмі захапляюся паэтычным, прыгожым пісьменствам, жывапісам, платанічна жаночай прыгажосцю. Тады была надзвычай выхаваная моладзь, не было ніякай распусты, і захапленне красой — гэта як захапленне карцінай, добрай кнігай, высокай паэзіяй, як духоўнае ўзбагачэнне, кранаючая музыка. Незвычайна люблю музыку, асабліва Чайкоўскага, лічу яго найвялікшым геніем музыкі, вылучаю з усіх рускіх кампазітараў, добра ведаю яго творчасць, бясконца магу слухаць арыю Ленскага, меланхалічную серэнаду, скрыпічны канцэрт, «Поры года», баркаролу, музыку да балета «Щелкунчик», ведаю падрабязнасці жыцця Чайкоўскага, яго перапіску з Н. Ф. фон Мекк, братамі Рубінштэйнамі. Музыка Чайкоўскага меладычная, яе не трэба вывучаць, яна сама льецца ў душу. З заходнееўрапейскіх кампазітараў найбольш мне падабаюцца Бетховен, Моцарт, Шапэн, асобныя рэчы Э. Брыга. Як і музыкай, захоплены жывапісам XIX стагоддзя, больш чым сучасным мастацтвам...

Усе гэтыя развагі ў мяне, як бачыце, выклікала творчасць Масея Сяднёва, паэта, які ўсе свае вершы, паэмы, прозу пісаў прыгожай беларускай мовай, роўнай мовам, на якіх напісаны творы сусветнага мастацтва. У пашану да творчасці М. Сяднёва мне ўдалося здабыць яму дзве намінацыі на Нобелеўскую прэмію: ад Джарджтаўнскага універсітэта (Вашынгтон, США) і універітэта імя Людвіга Максіміліяна (Мюнхен, Германія).

## Мікола Хмыз

Яшчэ пра аднаго свайго даўняга сябра, шчырага беларуса мне б хацелася расказаць. Знаёмства і спатканне з Міколам Хмызам адбылося ў Зальцбургу (Аўстрыя), дзе быў лагер перасяленцаў. Адразу знайшлі агульную мову, пасябравалі. Пазней пехатою ішлі з Зальцбурга да Бодэнскага возера, затрымаліся ў гарадку Офенбах-Мілівер (французская зона акупацыі). Мікола меў адукацыю эканаміста, быў жанаты, жонка была ўрачом. З імі разам была дырэктар шпіталю з Мінска доктар Станіслава Ярашэвіч з пляменнікам. Разам з гэтымі людзьмі я дзяліў першыя дарогі выгнання. Так здарылася, што мы апынуліся ў Зальцбургу, а рэчы засталіся ў Вене, усё было разбомблена, паязды амаль не хадзілі. Але я рызыкнуў і паехаў за рэчамі, і мне ўдалося санітарным цягнікам выехаць назад у Зальцбург. Па дарозе цягнік бамбілі амерыканцы, мы выскаквалі, хаваліся ў лесе і зноў ехалі, я ледзь не загінуў. Так дабраліся да Зальцбургу. Мікола Хмыз потым сказаў, што ён страшэнна шкадаваў і перажываў за мяне, не трэба было дазваляць ехаць у Вену, абышліся б і без рэчаў. Але Бог быў літасцівы да мяне, я застаўся жывы.

У Офенбах-Міліверы мы ўсе разам жылі ў баўэра, цяжка працавалі, дачакаліся канца вайны. Сябры пазнаюцца ў бядзе — я добра памятаю пакуты першых дзён выгнання, наша добрае сяброўства з Міколам, усё гэта зблізіла нас на ўсё жыццё. Потым была Амерыка, я шмат дапамог яму і ягонай сям'і ўладкавацца ў Каліфорніі. Нашы дамы былі побач у Норд-Галівудзе, Мікола працаваў механікам у авіяцыйнай фірме, меў добры заробак, купіў прыгожы дом, матэрыяльна быў высока забяспечаны. Не ўваходзіў ні ў якія грамадскія і палітычныя справы.

Пазней, калі я жыў у Вашынгтоне і часта праз Каліфорнію ляцеў у Японію, то заўсёды спыняўся, каб праведаць добрага сябра. Але не папярэджваў Міколу, і ён, узрадаваны, жартаваў: «Ты гэта прыляцеў, ці твой дух?» І пасля, як я пераехаў у Франкфурт-на-Майне, мы з Тамарай, як прылятаді з Еўропы, некалькі разоў спыняліся ў яго доме. Мікола вазіў нас па славутых і цікавых мясцінах Галівуда, Лос-Анжэлеса, Малібу-Біч, дзе жывуць знакамітыя галівудскія артысты. Нам было вельмі цікава паглядзець Дыснейленд, цудоўны Ганцінгтон-Парк — батанічны сад, заснаваны міліянерам Ганцінгтонам.

Калі Мікола паміраў ад цяжкай хваробы, ён пазваніў мне, каб я прыехаў развітацца. Сын Міколы Хмыза скончыў Стэнфордскі універсітэт, ажаніўся з амерыканкай, мае вялікую сям'ю, цяпер працуе

інжынерам-механікам адной з фірмаў, жыве ў Сан-Паўла, каля Сан-Францыска.

## Францішак Азевіч

З Францішкам мы пазнаёміліся, калі разам вучыліся ў Віленскім універсітэце на факультэце матэматыкі. Ён паляк, наогул, у мяне было шмат знаёмых палякаў, разумных, цікавых людзей. Сярод іх Стэфан Ендрыхоўскі — пасля вайны стаў міністрам замежных спраў Польшчы, Ежы Путрамент — вядомы пісьменнік, польскі пасол у Турцыі, Друто — намеснік міністра замежных спраў і амбасадар у Парыжы. Гэтыя мае калегі, з якімі мы разам сядзелі ў студэнцкіх аўдыторыях, стваралі пасляваенную Польшчу. Іх сябра і духоўнага настаўніка Генрыка Дэмбіньскага расстралялі немцы. З Дэмбіньскім мы разам працавалі — я акруговым школьным інспектарам, а ён інспектарам вячэрніх школ у Баранавічах. Я тады паспеў выехаць з горада і застаўся жывы, а майго калегу расстралялі.

З Францішкам Азевічам мы былі блізкімі сябрамі, студэнцкае брацтва не забываецца. Пасля вайны ён працаваў дырэктарам гімназіі ў Польшчы. Я яго наведваў, калі бываў у Марлічаў у Шчэціне. Францішак памёр у 1993 годзе. Адзін з яго сыноў — прафесар фізікі Вроцлаўскага універсітэта.

## Вацлаў Марчэўскі

Гэта мой вялікі сябра з маладых гадоў. Я спаткаў яго ў 1932 годзе, калі ехалі цягніком на Польскі кангрэс настаўнікаў матэматыкі. Падчас гутаркі ён звярнуў увагу на вялікую дзейнасць Антона Зыгмунда, які апублікаваў сваю выдатную кнігу «Трыганаметрычныя рады». Вацлаў Марчэўскі быў тады асістэнтам выдатнага матэматыка Вацлава Серпіньскага. (У час нямецкай акупацыі Марчэўскі вымушаны быў змяніць сваё сапраўднае прозвішча Леў Шпільрайн на Вацлава Марчэўскага, бо як яўрэя немцы маглі яго расстраляць.) Наша сяброўства завязалася падчас гэтай канферэнцыі, мы былі тады маладыя, у нас былі агульныя зацікаўленасці. З таго часу мы да вайны часта сустракаліся ў Варшаве. Вацлаў працаваў рэктарам Вроцлаўскага універсітэта. Пасля вайны, калі я прыехаў у Польшчу як прадстаўнік Амерыканскай акадэміі навук, то спаткаў яго на могілках "Павонзкі", дзе сабралася грамадскасць на адкрыццё помніка Серпіньскаму. На помніку быў надпіс: «Даследчыку бясконцасці...»

У хуткім часе пасля гэтай нашай сустрэчы Марчэўскі памёр. Ён быў адным з найвыдатнейшых матэматыкаў Польшчы, меў шмат друкаваных прац, даследаванняў у галіне матэматыкі, пакінуў прыкметны след у навуцы.

### Густаў Макшыцкі

Перад выездам у Амерыку Густаў Макшыцкі быў прафесарам аэрадынамікі ў Політэхнічным інстытуце ў Варшаве, зрабіў вялікі ўклад у развіццё польскай авіяцыі. Пасля вайны эмігрыраваў у Каліфорнію (ЗША), пачаў працаваць у фірме «North American Aviation». Я сустрэўся з ім на польскай вечарыне ў Лос-Анжэлесе, мы пазнаёміліся, разгаварыліся, і прафесар Макшыцкі прапанаваў мне перайсці ў фірму, дзе працаваў сам. Я з удзячнасцю прыняў яго прапанову, адсюль пачалася і мая астранаўтычная кар'ера. Мы вельмі з ім пасябравалі, часта сустракаліся сем'ямі, шмат гадоў працавалі разам. Гэта быў выдатны вучоны, высокадухоўны чалавек, меў перапіску з Эйнштэйнам. Памёр у 1985 годзе.

### Раджэнда Нігам

Індыйскі прафесар Нью-Дэлійскага універсітэта Раджэнда Нігам быў маім калегам, калі я працаваў у аддзеле астранаўтыкі ў Вашынгтоне па развіццю сатэлітаў сувязі. Мы былі вельмі вялікія прыяцелі, разам пісалі навуковыя артыкулы, ездзілі на міжнародныя кангрэсы астранаўтыкі па ўсім свеце. Раджэнда Нігам жыў у Амерыцы і я спансараваў яго права стаць грамадзянінам Амерыкі. Ён прыехаў з Індыі, быў вельмі здольны матэматык, мы сябравалі сем'ямі. Ён шмат расказваў пра Індыю, а я яму гаварыў увесь час, што Індыі такія вучоныя больш патрэбны, чым Амерыцы. І Раджэнда вярнуўся ў Індыю, нават мяне агітаваў туды ехаць. Аднак напрыканцы жыцця зноў вярнуўся з сям'ёй у Амерыку, дзе і памёр. Ён быў маім шчырым сябрам, вельмі добрым і верным у сяброўстве да канца. Я лічу яго выдатным вучоным-гуманістам, вялікім сябрам і чалавекам.

### Гарумі Танака

Гарумі Танака — адзін з выдатнейшых лінгвістаў Японіі, прафесар, доктар універсітэта Нагойя, аўтар многіх падручнікаў. Калі я першы раз ехаў у Японію (1961), мой добры знаёмы, амерыканец японскага паходжання Джунджы Азакі (ён працаваў са мной у адной

фармацэўтычнай фірме ў Каліфорніі) даў мне адрас сваіх родных у Токіо, каб я іх адведаў. Ягоны родзіч доктар Кікута, выдатны хірург і ўласнік шпіталю, вельмі багаты чалавек, вадзіў мяне па рэстаранах, запрашаў да стала па дзесяць гейшаў, якім трэба дорага плаціць. У Токіо ёсць цэлыя кварталы рэстаранаў. Прыходзіш, апранаеш кімано паверх гарнітура, садзішся на падлогу па японскаму звычаю, зняўшы абутак. Падыходзяць гейшы, якія спецыяльна вучацца на тое, каб весяліць госця. Я нават закахаўся ў адну з прыгожых японак, захапіўся яе далікатнасцю, выхаванасцю. Вельмі прыгожы, лялечны твар, хоць фігуры ў іх і не вельмі стройныя. Але японкі вельмі ласкавыя, пяшчотныя, апранутыя ў маляўнічыя кімано, ураженне ад іх незвычайнае.

Доктар Кікута не гаварыў па-англійску і запрасіў на вячэру свайго швагра, які добра валодаў англійскай мовай. Гэта і быў Гарумі Танака. Мы пасябравалі, і Гарумі стаў маім гідам па Японіі. Асабліва мне запомнілася ўзыходжанне на Фудзіяму. Аўтобусам ехалі да сярэдзіны гары, у падножжа якой густы лес, а потым сыпучы пясок. Аўтобусы спыняюцца, да падножжа едзеш цэлы дзень, а калі даедзеш да пяскоў, то далей на яе вяршы ну ніхто не спрабуе падняцца. Вяршыня белая, зусім голая, бачная здалёк. Даехаўшы да Фудзіямы, людзі зрабілі святую справу, сядзяць у рэстаранах, якіх тут вялікае мноства, любуюцца Фудзіямай — месцам пакланення ўсіх японцаў. Гэта вельмі здольная, працавітая нацыя, японцы вельмі добра валодаюць англійскай мовай, я 4 разы быў у Японіі і мне няцяжка было ездзіць па краіне, знаёміцца з яе асаблівасцямі, людзьмі, экзотыкай. Пабываў і ў Хірасіме, у музеі ахвяр атамнай бамбардзіроўкі. Сам горад адбудаваўся, і толькі гэты музей нагадвае пра трагедыю. Я часта ў японскіх універсітэтах чытаў лекцыі, удзельнічаў у міжнародных навуковых кангрэсах. І заўсёды мяне суправаджаў, сустракаў, прымаў як дарагога госця Гарумі Танака.

Ён не меў амерыканскага дактарату і я дапамог яму атрымаць доктарскі дыплом. Гарумі падаў заяву ў фонд Фулбрайт з просьбай аб стыпендыі, я даў яму рэкамендацыі, і ён яе атрымаў. Уладкаваўся ў Браўнуніверсітэт горада Правідэнс (штат Родайленд). Вучыўся 3 гады, атрымаў дактарат, вярнуўся ў Японію і стаў дэканам універсітэта Нагойя. Пасля гэтага мы сталі сябрамі назаўсёды. Калі ён бываў у Еўропе, то заўсёды наведваў мяне ў Франкфурце, мы прымалі яго з Тамарай. Ён выдатна іграў на раялі, Тамара таксама добрая піяністка, спявачка, займалася балетам, добра адчувае і разумее музыку, наогул прыгажосць. Наладжваліся сапраўдныя канцэрты класічнай музыкі.

Цяпер Гарумі Танака на пенсіі, жыве ў Японіі, жонка яго іграе на флейце, а ён на раялі — цэлы хатні ансамбль. Я быў у іх дома. Яны не маюць вялікіх кватэр, няма ніякай мэблі, нізенькі столік, табе прапаноўваюць падушачку, трэба ўмець апусціцца на падлогу, прыгожа сесці, падкурчыўшы ногі, і гэтак жа прыгожа ўстаць. На стол падаюць сукіякі (мясное блюда з рысам і зялёнымі прыправамі) і тэмпура (дары мора, нешта падобнае на ракаў), крэветкі. Іх смажаць на аліўкавым масле. Да гэтага — японская рысавая гарэлка, сакэ. Есці можна або палачкамі, або відэльцамі. Японскія сем'і вельмі гасцінныя, ветлівыя, бясконца кланяюцца ў пояс, запрашаюць прыязджаць як найчасцей. Я і сёння трымаю сувязь з маім японскім сябрам — выдатным вучоным і цудоўным чалавекам.

### Капітан Батлер

Батлер быў капітанам амерыканскага марскога флоту. Калі я з ім пазнаёміўся, ён ужо быў у адстаўцы, працаваў адвакатам. Мы пасябравалі. Капітан быў прыяцелем сына Франкліна Рузвельта — Джэймса Рузвельта, кангрэсмена. (Дарэчы, у Франкліна Дэлано Рузвельта был о чатыры сыны). Праз капітана Батлера я пазнаёміўся і з Джэймсам Рузвельтам — сімпатычным амерыканцам. Аднойчы я сабраўся паехаць у Італію, у Рым. Батлер папрасіў мяне адведаць яго сябра-калегу італьянскага адмірала Франчэска Басліні, былога міністра марскіх сіл Італіі, а ў той час ён быў камендантам марской крэпасці Ля-Спецыя каля Генуі. Капітану Батлеру пасля заканчэння вайны было даручана асабіста арыштаваць міністра Басліні, паколькі, як вядома, Італія ваявала на баку немцаў. Але пасля трох дзён арышту амерыканцы выпусцілі Басліні, і з гэтага часу Батлер і Басліні сталі закадычнымі сябрамі. I вось гэтага адмірала і прасіў мяне адведаць Батлер. Я пагадзіўся, і калі прыехаў у Рым, то знайшоў дом Басліні — прыгожы, багаты палаццо, у прэстыжным квартале італьянскай сталіцы. На сценах віселі дарагія карціны марскіх бітваў.

Калі Басліні даведаўся, што мяне прыслаў капітан Батлер, то прыняў як найлепшага сябра, я гасціў у ягоным доме, пабываў у марской крэпасці Ля-Спецыя, іншых славутых мясцінах Італіі. Гэта марская краіна нечым мне нагадала Інданезію. Дарэчы, у Інданезіі і на Філіпінскіх астравах я спыняўся па дарозе ў Японію. Але аднойчы наведаў Інданезію па запрашэнню інданезійскага мільянера, з якім пазнаёміліся ў Бейруце, у гатэлі «Фініцыя», разам аглядалі Бейрут, пасябравалі. Ён прыязджаў да мяне ў Вашынгтон, меў 6 уласных караблёў, гандляваў з усім светам. Пасля таго як пабываў у мяне ў

Вашынгтоне, запрасіў, каб я прыехаў да яго ў Джакарту. Прымаў пацарскі. У яго агромністы палац — адна частка для еўрапейскіх гасцей, другая для інданезійскіх. Вялікі сад, у якім расстаўлены дарагія рымскія мармуровыя статуі. Я прабыў у яго некалькі дзён, ён мяне ўсюды вазіў, знаёміў з Інданезіяй — гэтай цудоўнай, экзатычнай краінай. Пасля я паехаў у Ганконг, жыў у гатэлі «Мандарын». Ганконг — камерцыйны цэнтр свету, пакінуў незвычайнае ўражанне, цяжка апісаць нават. Нас, амерыканцаў, усюды прымалі вельмі добра і ў Італіі, і ў Японіі, і ў Інданезіі, і ў Так капітан Батлер выклікаў у мяне незвычайную зацікаўленасць марскімі краінамі. Ён быў маім сябрам да канца жыцця, заўсёды дапамагаў, чым мог, меў прыгожы дом у багатым квартале Вашынгтона, і я быў там частым госцем.

... Я наогул лічу Амерыку краінай вялікіх магчымасцей. Тут можна сустрэць самых розных людзей, славутых вучоных. У Амерыцы я пазнаёміўся з Леанідам Іванавічам Садовым, акадэмікам А. А. Благанрававым — абодва былі віцэ-прэзідэнтамі Акадэміі навук СССР. Я іх вазіў спецыяльным дзяржаўным самалётам у ракетныя цэнтры, дзе паказваў ім вынікі амерыканскіх астранаўтычных даследаванняў. Пазней Л. І. Сядова я сустракаў на кожным Міжнародным кангрэсе астранаўтыкі, а першае спатканне было ў Амстэрдаме, дзе ён чытаў лекцыі.

Калі гаварыць шчыра, то Амерыка дата мне столькі, колькі іншая краіна не магла б даць. Я тут адчуваў сябе роўным з усімі, гэта стварала добры настрой, стымулявала работу, роўны, свабодны, дэмакратычны, як усе. Гэта адзіная краіна, дзе ў мініяцюры прадстаўлены цэлы свет, дзе людзі розных нацыянальнасцей адчуваюць сябе вольнымі, роўнымі.

Не ўсе гэта падкрэсліваюць, але я лічу, што Амерыка ў нашым стагоддзі адыграла найвялікшую ролю ў тэхналагічных адносінах (аэранаўтыка, астранаўтыка, падарожжа на Месяц, найвялікшы тэхнічны поспех у гісторыі чалавецтва — атамная энергія і г. д.). У сэнсе палітычным таксама найвялікшае дасягненне — перамога над фашызмам і камунізмам (камунізм быў пераможаны пасля 50-гадовай халоднай вайны дзякуючы Амерыцы). XX стагоддзе — гэта стагоддзе Амерыкі.

Я асабіста ўдзячны гэтай краіне, што яна так многа мне дала на працягу 40-гадовага грамадзянства, але і я для Амерыкі зрабіў немалы ўклад У навуку, асабліва ў галіне астранаўтыкі. У педагагічнай дзейнасці, як прафесар Мэрылендскага універсітэта, я адукаваў тысячы амерыканскіх грамадзян і ў Амерыцы, і ў Еўропе. Амаль кожны год прымаў удзел ва ўрачыстасцях заканчэння навучальнага году,

якія заўсёды адбываліся ў галоўным еўрапейскім цэнтры Мэрылендскага універсітэта ў Гайдэльбергу. На гэтых урачыстасцях рэктар універсітэта ўручаў выпускнікам (а іх катя тысячы чалавек з усіх філіялаў) дыпломы аб заканчэнні універсітэта. Гэты ўрачысты акт — незвычайна цікавае і прыгожае відовішча. Зала вялікая, з вокнамі ад падлогі да столі, з якой звісаюць 6 залацістых люстраў з лямпачкамі ў выглядзе свечак. Сцэна адкрытая, упрыгожаная сцягамі тых краін, дзе працуюць філіялы Мэрылендскага універсітэта, шмат кветак. Гучыць класічная музыка, спакойныя гукі раяля быццам уліваюцца ў душу. Зала паступова напаўняецца людзьмі. І вось прабіла 15 гадзін. У залу ўрачыстым, павольным крокам уваходзіць адзін з выкладчыкаў у чорнай тозе і нясе жэзл, за ім ідуць выпускнікі таксама ў чорных тогах і чорных чатырохвугольных шапачках з кістачкамі. Іх ідзе больш як 300 чалавек, яны займаюць адведзеныя для іх месцы з левага боку залы. Затым уваходзяць выкладчыкі, адзін са старэйшых нясе выкладчыцкі жэзл, за ім у чорных тогах, але з рознакаляровай афарбоўкай на доўгіх шарфах ідуць прафесары, дэканы і рассаджваюцца на крэслах справа. За імі ідзе яшчэ вышэйшае начальства: рэктар, галоўны рэктар Вашынгтонскага Мэрылендскага універсітэта, рэктары філіялаў, галоўны спонсар універсітэта, амерыканскі пасол у Германіі, якія займаюць месцы на сцэне.

Пачынаюцца ўрачыстыя, традыцыйныя прамовы рэктараў, галоўнага спонсара, пасля — уручэнне дыпломаў выпускнікам, разам з якімі яны атрымліваюць і цудоўна выдадзеную кнігу па гісторыі Мэрылендскага універсітэта, дзе ёсць прозвішчы ўсіх яго выпускнікоў, прафесараў, выкладчыкаў, ганаровых прафесараў. Цырымонія адбываецца ў хуткім, зладжаным тэмпе, у зале стаіць цішыня, нягледзячы, што ў ёй шмат дзяцей (многія выпускнікі маюць сем'і, якія абавязкова прыходзяць на ўрачыстасць).

Цырымонія канчаецца ў адваротным парадку: спачатку выходзіць прафесура, потым — шаноўныя госці і па-аднаму, як і ўваходзілі, — выпускнікі — людзі самых розных нацыянальнасцей і ўзростаў. Дарэчы, на кожным такім акце ўручаецца і Ганаровы дыплом прафесара універсітэта аднаму з высокіх гасцей, хто сваёй дзейнасцю спрыяў росквіту навукі, культуры, палітыкі, мастацтва. У гэтай сувязі мне прыгадваецца выпадак з уручэннем акадэміку Паўлаву Ганаровага дактарату Кембрыджскага універсітэта. Калі ён вось так, як і нашы прафесары, ішоў у доктарскай тозе і чатырохвугольнай шапачцы па праходу ў акружэнні выкладчыкаў, студэнты своеасаблівым спосабам выказалі яму сваё захапленне. Яны спусцілі з балкона на тонкай нітачцы цацачную сабачку. Паўлаў быў незвычайна ўсцешаны. Ён

сказаў, што для яго гэта большы гонар, чым Ганаровы дактарат, бо добра памятаў, як у гэтым самым месцы ішоў вялікі Дарвін і студэнты спусцілі яму цацачную малпачку, а гэта значыла, што студэнты прызналі Паўлава вучоным такога ж маштабу, што і Дарвін.

Мне наогул з гістарычнай літаратуры вельмі цікава вычытваць малавядомыя факты з жыцця вялікіх людзей. Быў такі выпадак з Леанардам Эйлерам (1707-1783; варта адзначыць, што Барыс Уладзіміравіч без усялякіх намаганняў называе даты, імёны, розныя падрабязнасці эпохі, пераказвае змест некалі прачытаных кніг. — Л. С.). Эйлер нарадзіўся ў Швейцарыі (Базель), быў прафесарам Базельскага універсітэта. Вядома, што ён быў запрошаны ў Пецярбург, на працу ў Пецярбургскую акадэмію навук, дзе працаваў з 1725 па 1741 г. Стаў славутым вучоным. У 1741 годзе па запрашэнню Фрыдрыха Вялікага прыехаў у Берлін. Фрыдрых быў задаволены, шчаслівы прымаць вучонага, зрабіў урачысты прыём у гонар госця. Эйлера пасадзілі каля каралевы, якая спытала, чаму ён увесь час маўчыць, а гаворыць толькі яна адна? Эйлер адказаў, што ён прыехаў з краіны, дзе за адно неасцярожнае слова вешаюць.

Вядома, што Фрыдрых Вялікі пісаў вершы і заўсёды клікаў Эйлера паслухаць, пасля пытаўся, што ён пра іх думае. Эйлер стрымана хваліў, але калі аднойчы кароль папрасіў яго сказаць праўду пра яго паэтычныя здольнасці, Эйлер шчыра адказаў: "Ваша вялікасць, вашы вершы трэба выкінуць на сметнік". На гэтым нямецкая кар'ера Эйлера была скончана, і ён зноў вярнуўся ў Расію, дзе і памёр.

Адзін час я вельмі захапляўся раманамі амерыканскай пісьменніцы Барбары Тачмен. Яна пісала на гістарычную тэму. Асабліва мне цікава было прачытаць яе раман «Гарматы жніўня» пра першую сусветную вайну (па аналогіі ў А. Салжаніцын ёсць твор «Август 14»). Тут паўстае гісторыя бітвы пад Таненбергам у Прусіі, дзе Расія пацярпела паражэнне. Галоўны герой — генерал Самсонаў, які не паслухаў свайго начальніка, галоўнакамандуючага Паўночным рускім фронтам генерала Рэненкампфа (ён быў на рускай службе) адступаць, і быў разбіты. Нядобразычлівыя адносіны Самсонава і Рэненкампфа мелі даўнюю гісторыю — яны пасварыліся на станцыі Чыта ў Сібіры, вяртаючыся з вайны ў Кітаі. Гэта адыграла трагічную ролю і пры бітве каля Таненберга, калі немцы разбілі войска Самсонава, а ён сам застрэліўся. Цар адклікаў і Рэненкампфа, які пазней быў расстраляны бальшавікамі ў Таганрогу.

Адзін з яго блізкіх крэўных — унук — пазней апынуўся ў Амерыцы, студыяваў электронную інжынерыю. І вось Леанід Іванавіч Рэнен-

кампф аказаўся маім непасрэдным начальнікам, калі я працаваў у Вашынгтоне, у аддзеле пабудовы сатэлітаў сувязі.

У Амерыцы існуе правіла: перад тым, як прыняць чалавека на працу, ён павінен прайсці субяседванне. Я якраз і трапіў да Леаніда Іванавіча на такое субяседванне. Высветлілася, што мы добра гаворым па-руску, а калі ён даведаўся, што я нарадзіўся ў Пецярбургу (дзе жылі ягоныя продкі, абрусеўшыя немцы, якія аселі ў Расіі яшчэ пры Кацярыне II) і дзе нарадзіўся сам Леанід Іванавіч, ён вельмі ўзрадаваўся, што сустрэў земляка. Гэта зблізіла нас, я пачаў працаваць у кампаніі, у якой Рэненкампф займаў пасаду віцэ-прэзідэнта, без ніякіх праблем.

## Юры Попка

Перад пераездам з Амерыкі ў Германію я ўжо ведаў, што там жыве Юры Попка, добры знаёмы і паплечнік Хведара Ільяшэвіча па беларускай справе. І калі ў 1972 годзе я пасяліўся ў Франкфурце-на-Майне, то адразу паехаў да яго ў Ляймэн, каб пазнаёміцца. Ляймэн невялікі гарадок, побач з Гайдэльбергам — старажытным універсітэцкім горадам, дзе знаходзіцца замак курфюрстаў (XVI-XVII ст.), з вышыні якога адкрываецца незвычайна прыгожая панарама на горад, раку, масты, чырвоныя дахі старых гарадскіх кварталаў і універсітэта, якому 600 гадоў. Тут некалі жылі і тварылі гайдэльбергскія рамантыкі: фон Арнім, Брэнтана, браты Грым, фон Эйхендорф — заснавальнікі міфалагічнай школы ў літаратуры (1805-1809), дзейнічаў рускі студэнцкі саюз (1862-1873), звязаны з "Колоколом" Герцэна (В.І.Бакст, В.Ф. Лугінін, А.Л. Лінёў і інш.). І Гайдэльберг і Ляймэн з трох бакоў акружаны невысокімі лясістымі гарамі, куды так і цягне схадзіць па грыбы і ягады, як у нас, у Беларусі. Пабываўшы тут першы раз, я зразумеў, чаму Попка пасяліўся ў гэтых мясцінах. Яны вельмі нагадвалі Бацькаўшчыну, якую ён вымушаны быў пакінуць, як і ўсе мы, пры канцы другой сусветнай вайны. Да пенсіі Юры Попка працаваў у адміністрацыі амерыканскага армейскага лагеру, але ўвесь час не пакідаў задуму стварыць беларускі музей. І вось цяпер пачаўся найбольш прадуктыўны час для яго беларускай дзейнасці. Ён заснаваў у Ляймэне беларускі музей — першы ў Германіі, выдаваў часопіс «Беларусаведы», дзе змяшчаліся самыя розныя матэрыялы пра Беларусь, музейныя справы. Адначасна Юры Попка ўласным коштам на могілках у Ляймэне збудаваў помнік для беларусаў, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны і палеглі па ўсёй Еўропе і Германіі.

Дзеля таго, што ў Нямеччыне мала асела беларусаў-эмігрантаў, я дапамагаў Попку ўсім, чым мог, часта заязджаў да яго, калі чытаў лекцыі ў Гайдэльбергу. Ён жыў у звычайнай трохпакаёвай кватэры шасціпавярховага дома. Яна і была ператворана ў музей. Кватэра знаходзіцца на другім паверсе. Як заходзіш у яе — быццам трапляеш у прыгожую беларускую хату, поўную нацыянальных рэчаў, столькі тут карцін, фотаздымкаў, кніг, рукапісаў. (Дарэчы, я вельмі шмат прывозіў з Вашынгтона розных беларускіх рэчаў, асабліва кніг і часопісаў, якія там прасцей можна было набыць.) У невялічкай кухні развешаны вышываныя беларускія кашулі, на століках саламяныя падносы з мноствам размаляваных велікодных яек. У адным з невялікіх пакояў кніжная і часопісная экспазіцыя, кнігі беларускіх пісьменнікаў: Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага, Я. Лёсіка, М. Шчакаціхіна, А. Мрыя, У. Ігнатоўскага, Б. Тарашкевіча, А. Гаруна, «Дабрасельцы» А. Кулакоўскага, і, вядома ж, творы беларускіх пісьменнікаў-эмігрантаў: Н. Арсенневай, М. Сяднёва, А. Салаўя, В. Адважнага (Я. Германовіча), Я. Пятроўскага, Р. Крушыны, У. Клішэвіча, У. Случанскага, К. Акулы, Я. Станкевіча, П. Сыча, Я. Золака, А. Змагара, Я. Юхнаўца, У. Глыбіннага, розныя чытанкі, беларускія лемантары, зборнікі прыказак, камплекты часопісаў: «Конадні», «Шыпшына», «На варце», «Голас беларуса», «Баявая ўскалось», «Бацькаўшчына», альманах «Ля чужых берагоў» і шмат іншых. На сценах партрэты Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Ф. Багушэвіча, К. Каліноўскага, В. Цяпінскага, Ф. (Акарыны, Х. Ільяшэвіча, Б. Кіта, М. Сяднёва, Я. Золака.

Другі невялікі пакой (былая спальня) таксама застаўлены і завешаны фотаздымкамі, партрэтамі, шафамі з кнігамі, над ложкам вялікі партрэт Юрыя Попкі, на пісьмовым стале машынка «Уніс», рукапісы, паперы — быццам гаспадар выйшаў і зараз вернецца. Дарэчы, вялікая заслуга Юрыя Попкі, што ён сабраў і на гэтай самай машынцы перадрукаваў пісьменніцкую спадчыну Хведара Ільяшэвіча ў адзін вялікі зборнік, напісаў прадмову да яго. Прымаў у сябе ягоную дачку Марылю, яны разам наведвалі магілу Хведара Ільяшэвіча, які пахаваны ў Германіі.

У вялікім пакоі-гасцёўні стаіць канапа, крэслы, стол, тэлевізар, шафа з кнігамі, на прасторным балконе цвітуць кветкі. Каля тэлевізара стойка з беларускай вопраткай — світкі, паліто з грубага даматканага сукна. У пярэднім пакоі ўсе сцены завешаны карцінамі і фотаздымкамі з краявідамі Беларусі.

У гэтай кватэры-музеі мы не раз пры жыцці Попкі бывалі з Тамарай, карысталіся яго беларускай гасціннасцю. У тыя гады пра Юрыя Попку і ягоны музей бургамістр Ляймэна не меў ніякіх звестак,

і я ад імя беларусаў і сябе, як прафесара Мэрылендскага універсітэта, паслаў яму падзяку і паведамленне пра існаванне музея. Гэта падняло музей і яго заснавальніка ў вачах мясцовых уладаў. Пазней было наладжана афіцыйнае адкрыццё музея і сам бургамістр Ляймэна пераразаў стужку на гэтай урачыстасці.

Калі Юры Попка памёр, я быў адзіным з беларусаў, хто ішоў за яго труной, хоць на пахаванні было шмат людзей. Я вельмі паважаў гэтага чалавека, які ўдалечыні ад Радзімы нёс яе ў сэрцы, збіраў, назапашваў усё, што нагадвала яе воблік. Ён можа і не спадзяваўся, што пацячэ ў Ляймэн, да гэтага беларускага куточка, спачатку тоненькі ручаёк беларусаў-эмігрантаў, энтузіястаў беларускай справы, навукоўцаў, а потым і студэнты цэлым аўтобусам завітаюць, як гэта здарылася ў чэрвені 1994 года. Беларускія хлопцы і дзяўчаты, маладыя, прыгожыя, прыехалі сюды, каб праспяваць свае песні (гэта камерны хор Мінскага лінгвістычнага універсітэта) гораду, які даў прытулак сапраўднаму беларусу. Ці мог ён прадбачыць, што не зарасце сцяжына да яго беларускага музея, што будуць ехаць сюды і суайчыннікі, і беларусы-эмігранты, і моладзь, каб пакланіцца зробленаму і памяці гэтага самаадданага патрыёта. Цяпер гэта справа ўзнята на дзяржаўны ўзровень. У маі 1995 года на Беларусі пабывала дэлегацыя горада Ляймэна на чале з бургамістрам панам Эрберам. Іх запрасілі на маю радзіму — у Наваградак. І пасля вяртання бургамістар Ляймэна прыслаў мне ліст падзякі і спытаў дазволу, як у ганаровага грамадзяніна Наваградка, на тое, каб Ляймэн парадніўся з Наваградкам і запрасіць дэлегацыю Наваградка ў Ляймэн, тым больш, што і Юры Попка быў бы гэтым вельмі задаволены. А я ўсцешаны тым, што справа Попкі будзе жыць, спрыяць больш цесным сувязям паміж нашымі краінамі, тым больш, што і мой сціплы ўклад унесены ў гэту справу, за што я быў узнагароджаны «Залатым медалём» ад горада Ляймэна за заслугі ў развіцці прыязні паміж Рэспублікай Беларусь і горадам Ляймэнам.

Добрым сябрам Барыс Уладзіміравіч застаецца кожнаму, хто хоць адзін раз сустрэнецца, пагаворыць з ім. Цяпер, калі ён стаў вядомым на Беларусі, суайчыннікі, якіх тыя або іншыя справы прыводзяць у Франкфурт, не мінаюць яго гасціннасці. Па сутнасці, гэта адзіны беларускі асяродак у Германіі, свайго роду музей, тым больш, што Барыс Кіт адзіны, хто пасля смерці Ю. Попкі мае непасрэдныя адносіны да беларускага музея ў Ляймэне і падтрымлівае цесныя сувязі з беларускім пасольствам у Боне.

І многіх, нашмат маладзейшых за яго людзей, цікавіць сакрэт маладосці Барыса Кіта, погляды на сучаснае становішча Беларусі.

Гэтыя пытанні найбольш яскрава раскрываюцца ў матэрыялах карэспандэнтаў газет «Звязда» (Валер Каліноўскі) і «Культура» (Ягор Фядзюшын), якія пабывалі ў Франкфурт ў першай палове 1995 года.

## «Я — хадзячы сведка стагоддзя»

«Амерыканскаму акадэміку беларускага паходжання, які жыве ў нямецкім Франкфурце-на-Майне, Барысу Кіту ніяк не дасі ягоныя 85 гадоў. Вельмі жвавы, рухавы, эмацыянальны, усмешлівы. Ён надзвычай абаяльны, але я канчаткова зачараваўся гэтым чалавекам, калі выпадкова падслухаў ягоную размову па тэлефоне з яго спадарожніцай жыцця Тамарай. Барыс Уладзіміравіч «буркаваў», як галубок, быў пяшчотны з жанчынай, як дваццацігадовы юнак, а потым, здабыўшы вялізны букет ружаў, заспяшаўся на спатканне, прычым бягом даганяў адыходзячы трамвай... Так што Тамары можна толькі пазайздросціць...

У ліпені 1995 года Барыс Уладзіміравіч запланаваў зрабіць настальгічнае падарожжа ў Вільню, наведаць тыя мясціны, дзе ён жыў і працаваў. У жніўні ў Франкфурце ён прымае маскоўскага беларуса, прафесара Яўгена Шыраева, у верасні сюды ж прыедзе дэлегацыя з Наваградка, якой ён будзе садзейнічаць у падпісанні дагавора аб супрацоўніцтве. У кастрычніку Барыс Кіт адбудзе ў Осла, на чарговы Міжнародны кангрэс астранаўтыкі і пасяджэнне Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі, паўнапраўным членам якой ён з'яўляецца. У лістападзе Барыс Кіт прыбудзе ў Мінск на пасяджэнне Міжнароднай акадэміі Еўразіі, віцэ-прэзідэнтам якой ён з'яўляецца. Вось такі прыблізна план у Барыса Кіта, які сведчыць аб незвычайна актыўным ладзе жыцця.

### Пра лад жыцця

— Барыс Уладзіміравіч, у чым сакрэт вашага актыўнага даўгалецця, падзяліцеся, калі ласка.

— Прычын шмат. Галоўная — прыродная падстава, беларускія гены. Па-другое, я меў вельмі цікавае і прыгожае жыццё. Я працаваў на вышэйшым інтэлектуальным узроўні. Відаць, акрамя мяне, сярод нашых старэйшых беларускіх эмігрантаў у Амерыцы мала хто так працаваў, хіба што цяпер іх дзеці, малодшая генерацыя, вывучыліся. А так нашы эмігранты пераважна працавалі фізічна, цяжка, хто-ніхто выпіваў пасля працы, седзячы ў хаце... Так яны пахварэлі, пагінулі ўжо многія. Я ж круціўся, круціўся на ўсю моц. Я быў спачатку хімікам, сем гадоў працаваў у індустрыі, пазней пайшоў у знакамітую амерыканскую фірму, што вырабляе самалёты і касмічныя караблі... Я вельмі цешуся, што быў удзельнікам першых сустрэч паміж ЗША і СССР у Вашынгтоне, дзе мы абгаворвалі супрацоўніцтва ў касмічнай

галіне, я нават вёў першы сход, бо акрамя таго, што я быў ракетным экспертам, я ведаў рускую мову...

Нікому не было салодкім жыццё ў Амерыцы. Я таксама спачатку цяжка фізічна працаваў. Потым мяне паклікалі на хімічную фабрыку. Мяне «выцягнула» матэматыка. Я матэматык-філосаф, я заўсёды любіў чыстую матэматыку.

— Як вам удалося зрабіць кар'еру?

— Працай і працай. Праўда, і шанцавала трохі. Я працаваў у сваёй фірме, калі з'явілася патрэба ў новым ракетным паліве, і мне далі заданне сабраць усе веды пра вадкі вадарод і вылічыць, як яго можна ўжыць у якасці ракетнага паліва. Я зрабіў гэты даклад, і ўсё пайшло ўгору. Я трапіў у той момант, калі ўсё толькі пачыналася, і вырашыў напісаць падручнік па ракетным паліве, па якім потым вучыліся генерацыі ракетных інжынераў свету.

— Як вы лічыце, ці ёсць шанц для беларусаў, што хацелі б эмігрыраваць, паўтарыць ваш вопыт?

— Цяпер выехаць цяжэй, атрымаць дазвол, знайсці працу... Увесь свет цяпер пхнецца ў Нямеччыну, Амерыку, і зараз не прымаюць эміграцыю так, як раней, калі пры Трумане была спецыяльная квота для ста тысяч вартасных людзей. Цяпер куды цяжэй. Можа, усё-такі лепш, каб яны засталіся дома, на Беларусі, і арганізавалі там нармальнае жыццё. Трэба вучыцца, перш за ўсё тэхнічным навукам. Развіваць рамяство — гэта ў Амерыцы і Нямеччыне высока стаіць — рамантаваць трубы, боты, тэлевізары...

### Аб дэмакратыі

Размаўляючы з Барысам Кітам, заўважаеш, што апроч патрыятычных пачуццяў да Беларусі ён выказвае свой шчыры патрыятызм да Злучаных Штатаў Амерыкі. Ён ганарыцца сваім амерыканскім пашпартам, з якім можна вольна ездзіць па ўсім свеце, ён ганарыцца амерыканскай астранаўтыкай, амерыканскім ладам жыцця і больш за ўсё — амерыканскай дэмакратыяй. «Дэмакратый», як вымаўляе гэта слова Барыс Уладзіміравіч, якая і яму асабіста дала шанц выбіцца ў людзі.

— Напачатку Польшча была больш дэмакратычная,— гаворыць Барыс Кіт аб міжваеннай Рэчы Паспалітай, — тады, як толькі яна заснавалася, было нават шмат беларускіх паслоў у сейме. Але пазней польская дэмакратыя дэградавала ў таталітарную дзяржаву. Асабліва прычыніўся да гэтага сам Пілсудскі. Ён не мог цярпець гэтай дэмакратыі, бо трэба было слухацца партыяў, трэба было ісці ў сейм...

Дэмакратыя — вельмі добры інструмент, але яна павольная, бо патрабуе спачатку грунтоўнага абмеркавання, а ўжо потым выканання планаў... І ўсім гэтым аўтарытарным асобам гэта не падабалася. Таму Пілсудскі хоць і не разагнаў сейма, але абмежаваў яго дзейнасць... Можа, напачатку і добра, што нехта такі моцны пакіруе. Лідэры заўсёды патрэбны, і ў дэмакратыі таксама. Толькі ёй патрэбен разумны і праўдзівы кіраўнік, які дасць людзям поўную свабоду, але будзе падтрымліваць парадак, каб не дапусціць ніякай анархіі. Дэмакратыя дае людзям самае важнае — вольнасць, і гэтым пабуджае асабістую дзейнасць усіх грамадзян, якія належаць да пэўнай нацыі. І гэта, урэшце, узбагачае ўвесь народ. Так гэта здарылася, напрыклад, у Амерыцы. Там усе людзі вольныя, адчуваюць сябе спакойна, і кожны думае, як найлепей арганізаваць сваё жыццё, як найлепш, найцікавей працаваць, а не слухае, хто і што загадае... У таталітарнай дзяржаве ўсе чакаюць загаду, у дэмакратычнай жа — запрашэння. Дзяржава, арганізоўваючы нейкі праект, пасылае запрашэнні ў сотні розных фірмаў, і тыя паказваюць, як яны гатовы яго выконваць. І выбіраюць лепшае. Гэтага не было ў СССР, не было канкурэнцыі, якая выклікае жывучасць людзей...

— Барыс Уладзіміравіч, але і пасля першай, і пасля другой сусветных войнаў, ды ўжо і пасля «халоднай вайны» ў раней паняволеных народаў хутчэй узнікае аўтарытарны рэжым, чым дэмакратыя. Ці заканамерна гэта, як вы, як філосаф, мяркуеце?

— Так, гэта заканамерна. Але на працягу тысячы гадоў развіццё грамадства ідзе ўсё ж у кірунку дэмакратыі, а таталітарныя сістэмы з'яўляюцца і знікаюць. Усе працэсы, палітычныя і эканамічныя, маюць пэўныя законы, якія не залежаць ад кіраўнікоў, што загадваюць, а ўсё ідзе само па сабе. І ў прыродзе, і ў чалавечай гісторыі. Вельмі павольна, але змены ідуць на лепшае... Ёсць матэматыка прамалінейная і крывалінейная. Гэта можна аднесці і да грамадства ў цэлым. Прамалінейная — напралом, так рабіў камунізм. Крывалінейная — натуральныя законы паступовасці ў прыродзе і ў грамадстве. Нельга нічога рабіць гвалтам.

— Але часам за дзесяткі гадоў гвалту людзі развучваюцца адрозніваць, што добра, а што кепска...

— Так, не ўсё адразу. Заходнееўрапейская цывілізацыя, напрыклад, — вынік падзей на працягу тысячагоддзя. Былі ўзрывы, але ўсё пайшло да лепшага такім паступовым, павольным спосабам. Не гвалтам.

**Аб надзённым**

Апошнія падзеі ў Беларусі: рэферэндум, адмова ад гістарычнай сімволікі, новая хваля русіфікацыі — выклікалі ў Барыса Кіта вялікае расчараванне, смутак і занепакоенасць далейшым лёсам Бацькаўшчыны, лёсам дэмакратыі ў Беларусі. Да Франкфурта, да яго кватэры, даходзіла, што ў гарачцы перад рэферэндумам некаторыя сілы называлі нацыянальную сімволіку Беларусі фашысцкай, і Барыс Кіт, ніякавеючы ад такіх выказванняў, гаварыў, як бы даказваючы відавочнае: «Хто ж былі гэтыя людзі, што прызналі ў 1918 годзе бел-чырвона-белы сцяг і «Пагоню» дзяржаўнымі сімваламі? Ды гэта былі тыя ж, што залажылі першую Беларускую сацыялістычную грамаду ў Пецярбургу. Яны не былі фашыстамі, яны былі сацыялістамі, рэвалюцыянерамі...»

— Беларусі была дадзена магчымасць развівацца як незалежнай дзяржаве ў супрацоўніцтве з Расіяй, Украінай і ўсімі іншымі краінамі. Але яна, відаць, паварочвае назад... Я хацеў бы, каб Беларусь пайшла па той дэмакратычнай дарозе, якая пачалася ў 1991 годзе, каб яна забыла ўсе гэтыя 70 гадоў страшэннай камуністычнай няволі. Гэта ўжо скончылася ва ўсім свеце, увесь свет прызнаў, што камунізм больш ніколі не вернецца, а беларускі народ разам з уладамі ўсё яшчэ аб нечым марыць... Гэта немагчыма, гэта нелагічна і ненармальна, бо жыццё ідзе наперад і нічога не вяртаецца назад. Трэба Беларусі, як і іншым, узяць гатовы прыклад з Заходняй Еўропы.

— Ведаеце, Барыс Уладзіміравіч, у нас вам запярэчылі б: а хто нас там, на Захадзе, чакае, хто там нам дасць рынкі?

— Трэба ўсё самім рабіць. Трэба вырабляць добрыя прадукты. У Беларусі ёсць шмат якіх рэчаў, якіх няма на Захадзе. Трэба добра думаць, што вырабляць для продажу. А гэта толькі тады магчыма, калі сістэма вольная, калі людзі вырашаюць самі, чым займацца. Толькі вольны чалавек можа нешта прыдумаць, нявольнік жа робіць толькі тое, што яму загадаюць...»

Валер Каліноўскі. Франкфурт-на-Майне — Мінск,
(газ. «Звязда», 3 жніўня 1995 г.)

## Грамадзянін планеты

«Вясна ў Франкфурце наступае раней, чым на Беларусі, і нам вельмі прыемна ў гэтыя сонечныя дні сустрэцца з ветлівым, энергічным, абаяльным суразмоўцам Барысам Уладзіміравічам Кітам, якому 6 красавіка спаўняецца 85 гадоў, і перадаць яму прывітанне з радзімы і ад усіх тых, хто ведае ягоны ўклад у сусветную навуку, а таксама ў беларускае асветніцтва.

Дом, у якім ён займае невялікую кватэру, стаіць ля вакзала, і вечарам тут адкрываецца дзівосная панарама асветленага рознакаляровай рэкламай горада. Сюды прыходзяць яму лісты з Беларусі, тут ён працуе над архівам, частку якога перадаў два гады таму ў Наваградскі краязнаўчы музей. Там ёсць сапраўды унікальныя матэрыялы, як унікальнае і ўсё жыццё Барыса Уладзіміравіча, у якім былі гады адданай працы на ніве беларускага асветніцтва, праследаванні немцаў і падазрэнні савецкіх энкэведзістаў, эміграцыя, вялікая навуковая праца і поспех у ёй.

Агульныя ўспаміны, якія ў нас ёсць — падарожжа па ягоных родных мясцінах летась у верасні, — даюць падставы для доўгай гаворкі пра Карэліччыну і Наваградчыну, пра гістарычны лёс гэтага краю, які, нягледзячы на доўгае гістарычнае забыццё, мае ўсе магчымасці для ўздыму сусветнай турыстычнай вядомасці. Калісьці, будучы дырэктарам Беларускай Наваградскай гімназіі, Барыс Уладзіміравіч шмат зрабіў для таго, каб ягоныя вучні захапляліся гісторыяй роднага краю, зразумелі, што беларусы — не горшыя за іншых, што яны маюць свае адметныя карані. Святло ягонай душы, выпраменёнае ў 30-40-я гады, захавалася ў вучнях. Усё сваё жыццё, гнаныя і рэпрэсіраваныя за любоў да Бацькаўшчыны, яны засталіся беларусамі — беларусам адчувае сябе і акадэмік Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі Барыс Кіт. І таму з хваляваннем сочыць за ўсім, што дзеецца на Беларусі.

— Першае, з чаго пачынаецца незалежнасць, гэта ўласная нацыянальная школа, — гаворыць ён.

— Асвета на Беларусі павінна мець ярка выражаны нацыянальны характар, выхоўваць нацыю, якая апошнія стагоддзі не мела магчымасці выказаць сябе. Найважнейшая задача на сёння — гэта каб Беларусь выкарыстала атрыманую ёю незалежнасць, свабоду для ўмацавання беларускай нацыі, безумоўна, разам з дэмакратычнымі рэформамі, каб беларусы па-сапраўднаму ўвайшлі ў сям'ю еўрапейскіх нацый. Трэба браць прыклад з нашых суседзяў — Польшчы, Венгрыі, Чэхіі, а таксама найбліжэйшых — Літвы, Латвіі. Мы ж

бачым, што гэтыя дзяржавы хутка развіваюцца і сітуацыя ў іх паляпшаецца. І іх паважаюць ва ўсім свеце. Трэба, каб гэтак жа паважалі і нас. Гэта, безумоўна, залежыць ад беларускага ўрада і найперш прэзідэнта, якія павінны кіравацца Канстытуцыяй. Дарэчы, у ёй сказана, што дзяржаўная мова на Беларусі — беларуская. Трэба і трымацца гэтага, а не хістацца ў розныя бакі і ўводзіць дадатковыя дзяржаўныя мовы...

Адчуваецца, што нашы апошнія падзеі выклікаюць у яго горыч. Што ж, гэта і не дзіўна — яшчэ пры немцах ён сядзеў у турме за тое, што пераступіў адведзеную імі мяжу для адукацыі беларусаў — толькі пачатковую дазвалялі яны мець «унтэрмэншам». Барыс Уладзіміравіч жа, які працягваў сваю высакародную працу настаўніка як пры паляках, пры Саветах, так і падчас нямецкай акупацыі, думаў аб адным — ягоны народ павінен мець сваю інтэлігенцыю. Ягоны народ павінен мець сваю мову і высока ўздымаць яе аўтарытэт. Як радаваўся ён, калі Беларусь аб'явіла аб сваім суверэнітэце! З якой трапяткой радасцю ступіў першы раз на родную зямлю пасля амаль пяцідзесяцігадовага перапынку!

### Фрагмента з гутаркі

**Ягор Фядзюшын:** Я ведаю, як Вас паважаюць на Беларусі. У Мінску дзейнічае «Таварыства па развіццю ідэй Кіта». Вас добра ведаюць у Маладзечне, Глыбокім, Паставах, Гродне, Карэлічах. Вы — ганаровы грамадзянін горада Навагрудка і г. д. І гэта не толькі таму, што Вы сусветна вядомы вучоны і філосаф, але і таму, што Вы, нягледзячы на тое, што амаль пяцьдзесят гадоў як вымушаны былі пакінуць сваю радзіму, захавалі родную мову, свой гонар за Бацькаўшчыну, свой боль за яе лёс. І гэта ў той час, калі шмат беларусаў на Беларусі не толькі не размаўляюць на роднай мове, а нават абражаюць яе, лічаць па-старому «мужыцкай». Як Вы да гэтага ставіцеся?

**Барыс Кіт**: Я іх не разумею. Мне здаецца, іх трэба пашкадаваць, бо ім невядома пачуццё гонару за радзіму, невядомая цяжкая шматпакутная гісторыя, у якой, тым не менш, ёсць шмат чым ганарыцца. І, зразумела, трэба ўлічваць, што дзесяцігоддзямі з беларусаў вытраўлівалі іх мову. Мне шмат разоў даводзілася сустракацца з гэтым і пры паляках, і пры савецкім часе, і пры немцах. Пры ўсіх уладах мне даводзілася сядзець у турмах за тое, што я вучыў дзяцей беларускай мове і яе гісторыі.

**Я. Ф.**: Барыс Уладзіміравіч, а як Вы зараз, знаходзячыся ў добраўпарадкаванай Еўропе, можна сказаць, «здалёку», адчуваеце становішча ў нас, на Беларусі? Вам тут немагчыма глядзець наша тэлебачанне, асабліва пасяджэнні нашага Вярхоўнага Савета і шматгадзінныя прамовы нашага прэзідэнта. Вы не маеце магчымасці таксама чытаць шмат якія газеты, слухаць наша радыё, сустракацца штодзень з суайчыннікамі і абмяркоўваць усе нашы праблемы. Вядома, Вы вельмі цікавіцеся ўсім гэтым, але ж інфармацыя аб жыцці на Беларусі ў Вас абмежаваная. Дык як Вы адчуваеце Беларусь «здалёку»?

**Б. К.**: Мне здаецца, там складваецца вельмі нядобрае становішча. Але гэта таксама зноў залежыць ад прэзідэнта, ад урада і, безумоўна, залежыць ад грамадзян, перш за ўсё — ад інтэлігенцыі. Яна ў асноўным і падтрымлівае адраджэнне, незалежнасць. Але ж у вас страшэнна многа і такіх людзей, якія выступаюць супраць гэтага. Каб усе рабілі адно, дык прэзідэнт слухаў бы нацыю, а зараз ён слухае іншых, тых, хто не паважае ўсё беларускае, хто яшчэ думае старымі катэгорыямі. Ім так «прамылі мазгі», так завярнулі іх, што яны не могуць думаць ні пра што іншае, новае, лепшае. Яны дасюль разважаюць катэгорыямі «гома савецікус». Яны не могуць згадзіцца з тым, што час ідзе наперад, усё мяняецца, развіццё чалавецтва ідзе да лепшага. Прыходзяць новыя сістэмы, новыя ідэі. Гэта і ёсць самае галоўнае ў развіцці чалавецтва. Не трэба трымацца старых сістэм, якія даўно ўжо праваліліся. Камунізм не апраўдаў свайго прызначэння, ён праваліўся таму, што быў антычалавечным і не прыняў да ўвагі ніякіх асноўных чалавечых каштоўнасцей. Ён пабудаваны быў на падмане, на абмежаванні чалавека ва ўсёй яго дзейнасці. Прырода стварыла чалавека, каб ён сам нешта ствараў, а ён можа рабіць гэта толькі ва ўмовах, калі ён вольны чалавек, шчаслівы чалавек. А калі ён не шчаслівы, не вольны, дык нічога добрага і не зробіць. Вось гэта разбурыла камунізм, бо камуністы хацелі зрабіць з людзей камп'ютэры...

**Я. Ф.**: А як Вам здаецца, выберамся мы з гэтай багны, у якую нас зноў цягнуць?

**Б. К.**: Напэўна, але ж гэта зойме доўгі час. У вас змена сістэм і ўладаў прайшла вельмі лёгка, на шчасце, без усялякага праліцця крыві. Вось можа таму гэта працягнецца крыху далей. У вас прайшла так званая «аксамітавая рэвалюцыя», а не такая, якая грунтоўна мяняе ўсё, нават урад. Урад у вас застаўся амаль той самы, што і быў.

**Я. Ф.**: А каго з грамадскіх дзеячаў, з тых, каго Вы ведаеце, можна было б прапанаваць у новы склад Вярхоўнага Савета, каб быў прагрэс?

**Б. К.**: Я думаю, гэта павінны быць перш за ўсё дзеячы беларускага адраджэння. З сённяшняга, можна сказаць, ужо былога складу заканадаўчага органа ўлады маглі б працягваць працаваць найперш патрыёты беларускасці, якія паказалі ўжо сябе ў парламенцкай, урадавай і грамадскай дзейнасці.

**Я. Ф.**: Гавораць, што чалавек моцны сваімі «каранямі», традыцыямі свайго роду і г. д. Вам давялося жыць у розных краінах, пры розных рэжымах. Вы шмат бачылі і пакатвалі ў сваім жыцці. Як вы адчуваеце гэтую сувязь са сваімі «каранямі»? Што мог бы сказаць зараз Ваш бацька?

**Б. К.**: Сапраўды, я люблю свой народ, я з яго выйшаў. Я люблю сваю мову, бо найлепшую частку свайго жыцця я правёў на Беларусі. Маё жыццё складаецца з дзвюх вялікіх частак: першая — калі я рос, быў моцным, маладым і гэта было на Беларусі, а другая частка — у эміграцыі, ва ўзросце пасля сарака гадоў. Падчас свайго жыцця на Беларусі я служыў ёй, Бацькаўшчыне, як гавораць, верай і праўдай. Я быў дырэктарам некалькіх гімназій, школах, я закладаў і будаваў школы, я ўвесь час вучыўся і вучыў. Я быў калісь акруговым школьным інспектарам у Баранавіцкай вобласці — гэта сотні школ.

Маці сваю я трошкі памятаю, яна памерла, калі мне было ўсяго дзесяць гадоў. А бацьку вельмі добра памятаю, я яго моцна любіў, бо ён быў надта разумны чалавек, і ён любіў мяне і падтрымліваў, чым мог. На жаль, шмат чым ён не мог дапамагчы, бо быў бедным беларускім селянінам з адным гектарам зямлі. Так што, калі я паступаў у гімназію, ён казаў: «Сынок, прабач, я болей нічым табе не магу дапамагчы». І толькі завёз мяне на фурманцы ў Навагрудак. Мне было тады шаснаццаць... А потым, як я казаў раней, вучыўся сам, вучыў дзяцей у школах і гімназіях, студэнтаў ва універсітэтах. Усё жыццё я займаўся асветніцтвам...

Ён распытвае пра знаёмых яму людзей, якія рыхтуюцца на Бацькаўшчыне адзначыць яго юбілей. Восемдзесят пяць гадоў — гэта доўгае, часам пакутлівае жыццё адарванага ад радзімы чалавека, аднак яно адначасна і шчаслівае, напоўненае адкрыццямі і славай, якою яго так шчодра адарыла чужына. Светлая душа, адкрытая людзям і свету, мабыць, дае яму гэтую незвычайную лёгкасць, энергію, з якою ён рухаецца, гаворыць, смяецца, водзіць нас па Франкфурт, каб паказаць ягоныя старажытнасці, яшчэ раз падзівіцца з таго, што там, на Беларусі, маюцца такія замкі і палацы, такія рарытэты і

гістарычныя каштоўнасці, якія б маглі б прыцягваць турыстаў з усяго свету, а мы іх не цэнім. Мы ходзім з ім каля рымскіх руінаў, каля старой гаўптвахты, дзе збіраліся ахоўнікі, каб кожную ноч вартаваць свой горад, а ўсё гаворым і гаворым пра яе, нашу Беларусь, пра яе гістарычныя шляхі, пра лёс народа.

Сын селяніна — Барыс Кіт — проста класічны ўзор, кім і чым можа стаць наш беларус. І гледзячы на яго, ужо не дзівішся таму, што ён ведае шэсць моваў і што ён высокаадукаваны інтэлігент. А можа, падсвядома дзівішся гэтаму, але ўсё перабівае пачуццё гонару. Гонару за сына сваёй Бацькаўшчыны, які пераадолеў усе выпрабаванні, што можа паслаць лёс, і сёння папаўняе сабою нашу скарбонку — тую, якую будуць адчыняць нашы нашчадкі і ганарыцца сваёй Беларуссю...

(Ягор Фядзюшын. Газ. «Культура»,
5 красавіка 1995 г.)

1995 — юбілейны год Барыса Кіта. Яго 85-годдзе шырока адзначала беларуская грамадскасць на Радзіме. Акрамя юбілейных артыкулаў у газетах («Літаратура і мастацтва», «Культура», «Голас Радзімы», «Чырвоная змена», «Навіны Акадэміі навук», «Сталіца», «Имя», «Пагоня», «Новае жыццё» і інш.) праводзіліся выстаўкі да юбілею вучонага (у Маладзечне, Гродне, Паставах, Глыбокім, у Дзяржаўным архіве тэхнічнай і навуковай дакументацыі ў Мінску). Адбыліся вечарыны ў Дзяржаўнай нацыянальнай бібліятэцы, у бібліятэцы імя Янкі Купалы, дзе з успамінамі выступіў былы вучань Барыса Кіта прафесар Пётр Маркавіч Кузюковіч, чытала свае вершы Вольга Іпатава, у Рэспубліканскім інстытуце праблем культуры. У Доме ветэрана 6 красавіка адбылася прэм'ера фільма «Душа не падарожніца» (рэжысёр Рычард Ясінскі, аператар Леў Слобін).

Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» і Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны правялі вечарыну да 85-годдзя Барыса Кіта якраз у дзень яго нараджэння 6 красавіка ў зале Скарынаўскага цэнтра, дзе разгорнуты выстаўка «Беларусы ў свеце». Немалое месца ў ёй адведзена жыццю і дзейнасці нашага знакамітага суайчынніка. Акрамя вядучых, Ганны Сурмач і Адама Мальдзіса, слова бралі акадэмік Радзім Гарэцкі, рэктар Беларускага універсітэта культуры Ядвіга Грыгаровіч, аўтар кнігі пра юбіляра Лідзія Савік, былы пасол Беларусі ў Германіі дэпутат Вярхоўнага Савета Пятро Садоўскі, пісьменнікі Вольга Іпатава, Арсень Ліс, Яўген Лецка. Гучалі вершы, прысвечаныя Барысу Кіту, беларускія народныя песні.

Юбіляру было падрыхтавана спецыяльнае пасланне з запісам гэтай вечарыны.

Вось што пісала гарадзенская газета «Пагоня» ў артыкуле А. Майсяёнка «Акадэміку Барысу Кіту — 85 гадоў»: «...Цяжка ўявіць сабе, што гэтаму энергічнаму, поўнаму планаў і праектаў, няўрымсліваму руплівцу беларускага дзяржаўнага іміджа і нацыянальнай годнасці ўжо 85! Масціты вучоны атрымаў у 1991 годзе сусветна вядомы тытул акадэміка Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі. Летась ён стаў адным з заснавальнікаў і віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, дзейнасць якой адпавядае галоўнай ідэі жыцця юбіляра — Беларусь павінна заняць пачэснае месца ў Еўропе, якое ёй належыць па праву. І гэта дамінанта сённяшняй дзейнасці Барыса Уладзіміравіча, яго настойлівых штодзённых пошукаў новых шляхоў і крыніц рэалізацыі навуковых і педагагічных праектаў на Бацькаўшчыне, далучэння беларускіх навукоўцаў да агульнаеўрапейскага навукова-культурнага супольніцтва, разважлівы аналіз сваёй педагагічнай і навуковай спадчыны і падкрэсленае асэнсаванне свайго высокага навуковага рэйтынгу, як сына зямлі беларускай.

Тым самым сёння Барыс Кіт дапамагае нам выжыць, не згубіць веру ў свае сілы і магчымасці, не заблытацца ў пошуках «лепшай долі», бо ў нялёгкім кітаўскім шляху да навуковага Алімпу заўсёды была вера ў беларускую ідэю, любоў да роднай зямлі...

Нам, гарадзенцам, ёсць чым ганарыцца ў адносінах да гэтай магутнай постаці. Першай беларускай ВНУ, якая надала В. Кіту тытул ганаровага доктара навук, стаў Гарадзенскі дзяржуніверсітэт імя Я. Купалы. З ініцыятывы рэктара універсітэта прафесара Л. Ківача ў мінулым годзе ўпершыню адбыўся візіт Б. Кіта ў наш старажытны горад. А напярэдадні юбілею акадэміка прыйшла прыемная навіна ад мастачкі Раісы Сіплевіч з Мінска, якая намалявала партрэт Б. У. Кіта для Гарадзенскага гісторыка-археалагічнага музея. Будзем спадзявацца, што тым самым зроблены пачатак стварэнню галерэі славутых людзей Гарадзеншчыны, у якой пачэснае месца зойме гатаўская экспазіцыя — адлюстраванне жыццёвага і навуковага шляху чалавека, які быў не астатнім сярод выдатнейшых навукоўцаў, стварыўшых магчымасць апанавання сынамі зямлі касмічнай прасторы».

Адбыліся святкаванні юбілею Барыса Кіта і на яго малой радзіме, у Навагрудку, пра якія пісала газета «Новае жыццё»:

«6 красавіка споўнілася 85 гадоў Барысу Уладзіміравічу Кіту — грамадзяніну ЗША, які жыве ў Германіі і адначасова з'яўляецца ганаровым грамадзянінам Наваградка, вучонаму, які ўнёс значны ўклад у развіццё сучаснай амерыканскай і сусветнай астранаўтыкі, бліскуча

рэалізаваў свае веды ў галіне матэматыкі, фізікі і хіміі, прадэманстраваўшы тым самым, на што здольны прадстаўнік беларускай нацыі.

У апошні час імя Б. У. Кіта часта сустракаецца, калі ідзе гаворка пра Міжнародную акадэмію навук Еўразіі, віцэ-прэзідэнтам якой ён быў абраны ў мінулым годзе і якая ставіць сваёй мэтай аб'яднаць дзейнасць вучоных краін Еўропы і Азіі дзеля вырашэння найбольш актуальных праблем. Імя яго гучыць таксама ў сувязі са стварэннем Гуманітарнага беларускага універсітэта са шматлікімі філіяламі па ўсёй краіне, у тым ліку і ў Навагрудку. А гэта сведчыць аб тым, што ў свае 85 гадоў Барыс Уладзіміравіч шукае новыя сферы прымянення сваіх ведаў на практыцы, як ён рабіў гэта ўсё сваё жыццё, на гэты раз на Беларусі, на радзіме, якая заўсёды ў яго сэрцы.

У сярэдняй школе, дзе некалі знаходзілася беларуская гімназія, у якой ён быў дырэктарам у 1939 годзе, прайшла вечарына з нагоды юбілею славутага земляка з праглядам тэлефільма «Душа не падарожніца» пра яго жыццёвы шлях і навуковыя дасягненні. На сустрэчы адбылося больш блізкае знаёмства з цікавымі матэрыяламі з архіва Б. У. Кіта, што захоўваецца ў фондах гісторыка-краязнаўчага музея.

Для тых, хто сустракаў Барыса Уладзіміравіча раней, гэта была магчымасць яшчэ раз адчуць яго непаўторную абаяльнасць, веліч духу, глыбіню і сілу характару, а для вучняў-старшакласнікаў — урок таго, як можа чалавек распарадзіцца сваім жыццём і чаго дасягнуць, калі ён пастаянна працуе, пашыраючы свае веды, сферу дзейнасці, павышаючы ўзровень кваліфікацыі, не спыняючыся ў пошуку новага для рэалізацыі сваіх магчымасцей...»

Што можа быць важней для Настаўніка, калі яго жыццёвы, педагагічны, навуковы вопыт перадаецца новаму, маладому пакаленню, з'яўляецца прыкладам служэння Айчыне, чалавецтву? І нават, калі сярод школьнікаў, якія прысутнічалі на гэтай вечарыне, знойдзецца хоць адзін падрастаючы талент, які захопіцца справай Барыса Кіта, пойдзе ягоным шляхам, праслаўляючы Беларусь, то можна сказаць, што Настаўнік жыў недарэмна, пераемнасць адбылася, эстафета падхоплена...

А што эстафета падхоплена сведчыць хаця б тое, што тры гады таму пра Барыса Кіта амаль нічога не ведалі на Бацькаўшчыне, а сёння ён з поўным правам увайшоў у кагорту яе слаўных сыноў, яго жыццё стала неад'емнай часткай духоўнага жыцця беларускай нацыі. Пра яго пішуць артыкулы, складаюць вершы, малююць партрэты, здымаюць фільмы, збіраюць архіўныя матэрыялы, наладжваюць выстаўкі і вечарыны. Таленавіты беларускі скульптар Іван Якімавіч Міско, які захоплены тэмай космасу, аўтар скульптурных помнікаў і

партрэтаў амаль усіх касманаўтаў Зямлі, вылягаў памятны скульптурны медаль Барыса Кіта і выношвае задуму стварыць яго скульптурны бюст. Васіль Быкаў назваў яго найпершым Беларусам...

На прэзентацыі першага варыянта кнігі «Вяртанне», на якой прысутнічалі навукоўцы, творчая інтэлігенцыя, студэнты Беларускага універсітэта культуры, выступалі многія беларускія вучоныя (А. Мальдзіс, В. Рагойша, М. Грынчык, тыя, хто асабіста ведаў і сустракаўся з Б. У. Кітам), адзначалі яго вялікі ўклад у сусветную навуку, садзейнічанне вядомасці Беларусі ў свеце. А часовы паверанны ў справах ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Джордж Альберт Крол сказаў: «Барыс Кіт — вядомы ў ЗША вучоны з бліскучай рэпутацыяй. І гісторыя яго жыцця — багатая і трагічная адначасова — вельмі важная не толькі для вас, але і для амерыканцаў. Амерыка ганарыцца сваім грамадзянінам».

Так што з поўным правам пачуцця гонару за здзейсненае мог чытаць Барыс Уладзіміравіч шматлікія юбілейныя віншаванні, якія прыслалі яго шчырыя прыхільнікі або павіншавалі праз газетныя артыкулы (некаторыя прыводзяцца на гэтых старонках).

Якія думкі апаноўвалі Барыса Уладзіміравіча ў ягоныя 85-я ўгодкі ў нямецкім Франкфурце? Пра гэта расказвае Вераніка Чаркасава, таленавітая беларуская журналістка, якая двойчы сустракалася з Барысам Уладзіміравічам у Германіі. Яе вялікі матэрыял, прысвечаны юбілею Барыса Кіта, быў змешчаны ў мінскай газеце «Имя» (рускамоўнай):

В свой 85-й день рождения небелорусский академик говорил о Беларуси...

«Вспоминая самых известных в истории Беларуси людей, большинство, скорее всего, назовет Франциска Скорину, Кастуся Калиновского, Купалу и Коласа. Кто-то, подумав, добавит к этому списку Ефросинью Полоцкую, космонавтов, несколько писателей из школьной программы и, совершенно справедливо, Василя Быкова. Между тем, сам Быков 6 апреля этого года на титульном листе своей книги «В тумане» написал следующие слова: «Найпершаму Беларусу з беларусаў у свеце, шаноўнаму спадару Барысу Кіту. З нізкім паклонам — аўтар». Таким образом, едва ли не самый известный в мире белорус передает титул «найпершага» человеку, фамилию которого большинство прочитало сейчас впервые.

Между тем, именно благодаря Борису Владимировичу Киту многие и многие люди сегодня знают о том, что на свете есть такая страна — Беларусь, и, в общем, наверное, неплохая страна, если способна она дать миру таких людей, как он.

## 85-летний «юноша» неизлечимо болен ностальгией...

В этом году мы приехали в Германию 30 марта, и я была рада поздравить Бориса Владимировича 6 апреля с его 85-летием. Вскоре после этого он позвонил мне и пригласил на обед в знаменитый гамбургский отель «Четыре времени года». Отель и ресторан действительно очень знамениты, ибо здесь обедали Индира Ганди, Ричард Никсон, Конрад Аденауэр, Аристотель Онасис, Софи Лорен, Кристиан Диор и множество других людей, чьи имена не нуждаются в комментариях. Все остались довольны кухней и обслуживанием, и мы с удовольствием присоединились к этой компании. На встречу Борис Владимирович приехал вместе с Тамарой, очень элегантной, изящной и прекрасно образованной женщиной, которая уже долгие годы является яго неизменной спутницей. Борис Владимирович удивительно энергичный и моложавый человек. Глядя на него, никогда не поверишь, что ему 85 лет и что все эти годы время медленно и безучастно проходило сквозь его жизнь, а он сам через тяжелейшие препятствия продирался сквозь это время. Но если в прошлом году встреча наша была очень радостной и Борис Кит с огромным энтузиазмом говорил о наконец-то независимой Беларуси, то в этом году в его словах сквозила печаль и непонимание того, что происходит на Родине. Быть может, кому-то это покажется странным, но по-настоящему любить человек может лишь то, что теряет или может потерять, и вынужденный жить много лет вне Беларуси Борис Кит любит ее той трепетной и зависимой любовью, которую нам, прописаным здесь навсегда, никогда не понять.

— Я думал, что Беларусь будет идти вперед по пути, начатом три года назад, — растерянно говорил он, — а она снова возвращается в неволю. Что же касается объединения Беларуси с Россией, то цивилизованные страны в своих отношениях практикуют лишь сотрудничество на равных, а поскольку в данной ситуации такое невозможно, то для Беларуси это обернется лишь потерей независимости и новым витком ассимиляции. В истории и философии есть положение, согласно которому только свободный человек имеет возможность реализовать себя и свои способности.

На мой вопрос, чем он занимается сейчас, Борис Владимирович улыбнулся: «Ищу деньги для Беларуси, — и уже серьезно сказал: — у меня есть друг, очень хороший адвокат, он по всему свету рассылает письма с просьбой помочь Беларуси. Со многими связываюсь я сам. Кстати, это я впервые обратил внимание Джорджа Сороса на

Беларусь... Не все, конечно, бросаются помогать, но иногда отзываются. Надеюсь, что еще чем-то смогу помочь своей родине. Все, что я делал в своей жизни, я делал для моей родины и ее славы...»

«Имя», 31 мая 1995 г.

Свае ўражанні ад сустрэч з Барысам Кітам у год ягонага юбілею выказвае і музыказнаўца Вольга Дадзіемава ў сваім артыкуле "У беларускай музыкалогіі паболела сяброў..."

«...Перад апошняй «вандроўкай па ноты» я хвалявалася ці не ўдвая болей, чым звычайна: упершыню ў жыцці даводзілася выпраўляцца ў Германію — краіну, куды вядуць многія нашы музычна-гістарычныя сцяжынкі. У XIX ст. тут жыў і пісаў свайго «Фаўста» Антон Радзівіл, тут вучыліся Манюшка ды Ельскі. Яшчэ раней — у другой палове XVIII ст. — сюды часта прыязджаў будучы лібрэтыст «Агаткі» Мацей Радзівіл, наведваліся Міхаіл Казімір ды Міхаіл Клеафас Агінскія. Нарэшце, менавіта з Германіі трапіў у Нясвіж, каб стварыць тут музыку «Агаткі», балета «Арфей у пекле», іншыя кампазіцыі ды назаўсёды застацца на Беларусі, Ёган (Ян) Голанд...

Германія ўразіла перш за ўсё неверагоднай адладжанасцю штодзённага жыцця, у якім усё нібыта прыстасавана спецыяльна і менавіта для вас. Вы не мусіце хаваць галаву ў плечы пад жорсткім, нібыта экзаменуючым на жывучасць, позіркам прадаўца, швейцара ці афіцыянта. Не трэба выкарыстоўваць той адпрацаваны ўжо гадамі механізм самаадхілення ад знешняга свету, які дапамагае захаваць свет унутраны...

Зрэшты, усё гэта можна было прадбачыць. Ашаламіла іншае: цалкам «марсіянская» дзяржаўная бібліятэка Берліна — неверагодная па сваіх памерах, тэхнічным абсталяванні і нават «гучанні» — ціхім, лагодным, нібы шэпт дрэў у лесе, гучанні асвятляльных і кварцуючых прыбораў... У вялізных, прамяністых залах усё аўтаматызавана. Кожны чытач мае на стале персанальны камп'ютэр і можа выкарыстаць капіравальны аўтамат. Літаральна на працягу паўгадзіны для цябе знаходзяць і прыносяць рукапісы з самых далёкіх сховішчаў, а для нас, іншаземцаў, гэта рабілі яшчэ хутчэй. Сам загадчык аддзела — доктар Янэцке, даведаўшыся пра мэты нашага візіту, вызваўся дапамагаць у пошуках. Заўважу, гаворка ішла не пра каштоўнасці, што калісьці былі вывезены з Беларусі ў Нямеччыну, а пра матэрыялы, якія захоўваліся тут спрадвеку — рукапісы і старадрукі Радзівіла, Голанда, Русо. Нам хутка прынеслі і дазволілі скапіраваць не толькі нотныя выданні XVIII стагоддзя, але й — што ўжо зусім неверагодна — старадаўнія рукапісы!

Тое ж — у Франкфурце-на-Майне: паўсюль зялёнае святло ў працы і. добразычлівасць. Але з гэтым, цалкам амерыканізаваным горадам, у якім мадэрн люстраных небаскробаў суседнічае з сівой даўнінной касцёлаў і кірхаў, звязаны ў нашай памяці падзеі не менш цікавыя, чым уласна навуковыя знаходкі. Маю на ўвазе сустрэчу з Барысам Кітам. Думаю, няма патрэбы прадстаўляць яго, колішняга навагрудскага хлопца, змагара за беларускую культуру, вязня фашысцкіх засценкаў, потым — эмігранта і нарэшце — гордасць амерыканскай і сусветнай астранаўтыкі, вынаходцу матэматычнай мадэлі паліва для ракеты, што панесла чалавека да Месяца. Яго сапраўды трэба бачыць — жвавага, зусім маладога ў свае 85 гадоў чалавека, які шчыра радуецца сустрэчы з землякамі і імкнецца дапамагчы ім ва ўсім.

Ніколі не забуду, як Барыс Уладзіміравіч, даведаўшыся, што я захварэла ў дарозе, адразу прынёс усе неабходныя лекі. Як прыйшоў уначы на вакзал, каб праводзіць на цягнік Святлану, як яшчэ раней вызваўся быць нашым гідам у Франкфурце і правесці нас у Міжнародны цэнтр нотных рукапісаў. Трэба было бачыць, як уразіла супрацоўнікаў гэтага цэнтра з'яўленне на парозе іхняга офіса самога Кіта! Яго ведаюць на Захадзе не толькі тэхнары, але й гуманітарыі, і гэта не дзіўна: доктар філасофіі ў галіне матэматыкі, энцыклапедыям адукаваны чалавек, знаўца ўсіх еўрапейскіх моў, ён мае глыбокія веды ў галіне сусветнай літаратуры, жывапісу, нават музыкі. Ягоныя меркаванні пра музычную культуру — менавіта культуру ў розных яе праявах — падаліся мне настолькі ж дакладнымі, наколькі парадаксальнымі. А калі Барыс Уладзіміравіч даведаўся пра некаторыя факты з гісторыі старадаўняй музыкі Беларусі, ён усхвалявана ўсклікнуў: «Я ўсім пра гэта буду распавядаць, лічыце, што вы знайшлі сапраўднага сябра беларускай музыкалагічнай навукі!» і потым, на расстанне: «Пабачыце, у Еўропе вам паўсюль будуць дапамагаць у пошуках, бо карціна еўрапейскай культуры павінна быць адноўлена цалкам і максімальна поўна, а без беларускай культуры — неад'емнай часткі агульнаеўрапейскай — тое аднаўленне немагчыма».

Сапраўды, ягоныя словы аказаліся прарочымі...

Газета "Літаратура і мастацтва"
11 жніўня 1995 г.

*У Вільні —*
*Гняздоўі крывіцкага духу —*
*Душой супыніўся*
*Ля Вострае Брамы...*

Гэтыя радкі Рыгора Барадуліна надзвычай трапна вызначылі духоўны стан Барыса Кіта, які ў год свайго 85-гадовага юбілею наведаў горад далёкага незабыўнага юнацтва — Вільню (ліпень 1995).

Барыс Уладзіміравіч быў запрошаны віленскімі беларусамі і сваімі былымі вучнямі ў горад, якога не бачыў больш за паўвека. Сустракалі яго ў Віленскім аэрапорце прадстаўнікі беларускага пасольства ў Вільні, дырэктар Беларускага культурнага цэнтра ў Салечніках Пётра Малафей, беларускі грамадскі дзеяч Расціслаў Мілюк, аўтар манаграфіі пра Наваградскую беларускую гімназію Аляксей Анішчык і іншыя асобы.

Прыезд Барыса Кіта супаў са святкаваннем Дня Незалежнасці Беларусі, якое адбывалася ў Віленскай філармоніі. На гэтую ўрачыстасць Барыс Уладзіміравіч быў запрошаны беларускім паслом у Літве сп. Яўгенам Вайтовічам. На свята Незалежнасці прыбылі прадстаўнікі беларускага ўраду і артысты з Мінску, прысутнічалі мэр Вільні і вядомыя беларускія дзеячы Хведар Нюнька і Лявон Луцкевіч — былы вучань Барыса Кіта па Віленскай Беларускай гімназіі, які ўзяў інтэрв'ю ў вучонага для літоўскага тэлебачання.

У першую палову дня 28 ліпеня Барыс Кіт наведаў пасяджэнне Таварыства беларускай культуры ў Вільні, на якое сабралася шмат беларусаў: настаўнікаў, дзеячаў беларускай культуры, гасцей з Мінску. Сходам кіраваў сп. Хведар Нюнька. Напачатку выступілі спадар Анатоль Бутэвіч — міністр культуры Рэспублікі Беларусь, іншыя ўрадоўцы з Мінску, паведаміў аб сваёй дзейнасці і адказаў на пытанні пасол Беларусі спадар Яўген Вайтовіч.

Другая частка пасяджэння была прысвечана сустрэчы з Барысам Кітам. Калі ён, крыху спазніўшыся, увайшоў у залу, усе прысутныя, нягледзячы на прамову А. Бутэвіча, стоячы, гарачымі воплескамі віталі славутага беларуса. Пра гэту сустрэчу пісаў настаўнік беларускай школы ў Вільні Павел Саўчанка ў артыкуле «Сустрэча з Барысам Кітамі, дасланым у газету «Голас Радзімы» (7 верасня 1995):

«...Нядаўна Таварыства беларускай культуры ў Вільні сустракала вядомага ў свеце навукоўца — гонар беларускай нацыі — Барыса Кіта, які наведаў Вільню, горад, дзе ён вучыўся ва універсітэце і выкладаў сам у былой беларускай гімназіі, дзе ён пачынаўся як навуковец.

Пакой ТБК не змог умясціць прыйшоўшых на сустрэчу з Кітай. Тут былі старыя віленчукі, цяперашнія вучні беларускай школы, супрацоўнікі беларускага пасольства. Барыс Кіт нагадаў той час, калі ён працаваў выкладчыкам у гімназіі і кіраваў гэтай установай, пра ўклад які ўнесла гімназія ў выхаванне беларускай інтэлігенцыі. Сярод

прысутных былі колішнія вучні Кіта, якія таксама бралі слова і дзякавалі выкладчыку і настаўніку за тое, што ён зрабіў не толькі для іх, але і для ўсяго беларускага руху. Гэта былі вельмі шчырыя і пранікнёныя словы Лявона Луцкевіча і Лявона Караля, Веры Шостак, Аляксея Анішчыка, Жэні Навумчык. Дарэчы, А. Анішчык піша кнігу пра Кіта. І хоць спадар Кіт ужо ў сталым узросце, але ўсіх нас здзівіла яго маладосць, рухавасць і абаяльнасць, яго прыгожая беларуская мова і асабліва адданасць адраджэнню Бацькаўшчыны і беларускасці. Так склаўся лёс гэтага чалавека-патрыёта, што большую частку свайго жыцця ён правёў у замежжы і сваім талентам узбагачаў навуку ў тых краінах, дзе жыў. Гэтым ён праслаўляў і беларускую нацыю, якая дала свету шмат навукоўцаў і вядомых людзей у розныя часы сваёй гісторыі. Некаторыя з іх сёння жывуць за мяжой, але цікавяцца і дапамагаюць суайчыннікам, дапамагаюць адраджэнню нашай Бацькаўшчыны.

Іх падтрымка, як маральная, так і матэрыяльная, вельмі дапамагае нам, асабліва беларусам Віленшчыны, якія, хоць і жывуць спрадвеку тут, у калысцы беларускай культуры і адраджэнскага цэнтра, але зараз мы далёка ад сваёй зямлі, ад дарагой Беларусі, бо мяжа не дае магчымасці часта бываць на радзіме. Ды і сродкі масавай інфармацыі даходзяць да кас нерэгулярна.

Нам асабліва прыемна бачыць у сябе людзей, якія цікавяцца нашым жыццём, дапамагаюць адраджэнню беларускай школы, якая на сёння з'яўляецца адзінай поўнай сярэдняй школай у блізкім і далёкім замежжы, якая будзе гонарам беларускага народа і якую павінны падтрымаць беларусы свету. Магу зазначыць, што ўсе выпускнікі нашай школы 1995 года ў колькасці і I чалавек паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Літвы і Беларусі.

З такой нагоды нам прыемна дзякаваць за лісты і дапамогу не толькі Барысу Кіту, але і Юрыю Весялкоўскаму, айцу Надсану, К. Акулу, спадарам Ганько, А. Алехніку, М. Гузу, Т. Лемяшонку і многім іншым.

А сустрэча з Барысам Кітам закончылася тым, што ён паабяцаў сустрэць сваё 90-годдзе тут, у Вільні, сярод сваіх сяброў юнацкіх год, сярод сваіх вучняў.

Шчырае яму дзякуй і доўгіх год плённага жыцця, як і ўсім прыгаданым вышэй беларусам...»

Затым, у гэты ж дзень (28 ліпеня) адбылася паездка ў горад Салечнікі (Шальчынінкай) на адкрыццё мясцовага Беларускага культурнага цэнтра, якому беларусы вырашылі надаць імя Барыса Кіта. Быў цудоўны летні дзень, па-святочнаму ярка свяціла сонца. Машына

імчала па дарозе, абсаджанай беластвольнымі бярозамі, за якімі зелянелі квадраты палёў, зубчаты недалёкі лес. І вось з'явіліся будынкі ўтульнага, чыстага гарадка Салечнікі, у якім некалі, па паданню, знаходзіліся саляныя сховішчы, адкуль і пайшла назва гэтага літоўскага горада.

У невялікай, прыгожа абсталяванай зале Беларускага цэнтра сабраліся беларусы, якія жывуць у Салечніках, мясцовыя жыхары, прысутнічалі мэр горада і кіраўнік раёна Іосіф Рыбак... Пасяджэнне адкрыў старшыня беларускага зямляцтва ў Салечніках П. Малафей, які звярнуўся да Барыса Кіта з пытаннем: ці згодны ён, каб ягонае імя было прысвоена Беларускаму культурнаму цэнтру? Барыс Уладзіміравіч не меў ніякіх пярэчанняў.

Пачалася зацікаўленая размова беларусаў са сваім славутым земляком, яго распытвалі пра жыццё ў Амерыцы, падзеі беларускага адраджэння 20-30-х гадоў, калі Барыс Кіт вучыўся і працаваў у Вільні. Затым былі фотаздымкі на добры ўспамін пра сённяшні дзень, непрацяглая экскурсія па Салечніках. А калі зноў вярнуліся да Беларускага цэнтра, то дзверы яго былі апаясаны стужкай. Барысу Уладзіміравічу, як ганароваму госцю і патрону цэнтра было даручана перарэзаць стужку і адкрыць цяпер ужо Беларускі культурны цэнтр імя Барыса Кіта ў Салечніках. Барысу Уладзіміравічу быў уручаны сімвалічны ключ, а на ўваходных дзвярах, дзе былі надпісы палітоўску і па-беларуску «Беларускі культурны цэнтр» з'явіўся дадатак: «... імя Барыса Кіта». Зноў былі прамовы, выступалі госці і гаспадары. Дзелавая, зацікаўленая гутарка завязалася ў Барыса Кіта з мэрам горада Іосіфам Рыбаком, прычым размова нязмушана пераходзіла з беларускай на рускую, польскую мовы. Мэр расказаў пра становішча ў раёне і горадзе, пра тую дапамогу, якую аказваюць мясцовыя ўлады нацыянальным меншасцям, пра перспектывы далейшага развіцця і ўзаемадзеяння. Адчувалася, што Іосіф Рыбак шчыра зацікаўлены ў плённым і добразычлівым супрацоўніцтве з беларусамі.

Неафіцыйная частка адбывалася на зваротным шляху ў Вільню ў прыгожым рэстаране над возерам, дзе ўдзельнікі ўрачыстасці ўжо ў меншай колькасці адсвяткавалі прыезд госця і падзею, якая адбылася ў Салечніках.

Суправаджаў Барыса Кіта, спецыяльна прыехаўшы з Рыгі на сустрэчу, беларус, прафесар, доктар хіміі Мікалай Ярчак з жонкай. Не маглі, вядома ж, паміж прысутнымі не ўзнікнуць размовы пра сённяшняе становішча на Беларусі, калі зменена нацыянальная сімволіка, адчуваецца адкат назад у духоўным і гістарычным адраджэнні Бацькаўшчыны, пагаршэнне эканамічнага, матэрыяльнага жыцця

большасці людзей, простых беларусаў, якія апынуліся па-за рысай беднасці. Свой трывожны настрой, нягледзячы на святочныя мерапрыемствы ў яго гонар, Барыс Кіт выказаў, прычытаўшы на памяць «Пагоню» Максіма Багдановіча.

Толькі ў сэрцы трывожны пачую
За краіну радзімую жах,
Успомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях.
Ў белай пене праносяцца коні, —
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.
У бязмежную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі — гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце ?
Дзе шляхі вашы н дуць і куды ?
Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі ўздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон ?
Біце ў сэрцы іх — біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...
Маці родная, Маці-Краіна!
Не ўсцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..
Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

Гэтыя цудоўныя, балюча-трывожныя радкі вялікага паэта быццам суправаджалі Барыса Уладзіміравіча, калі ён хадзіў па Вільні ў апошні дзень свайго прабывання, калі стаяў ля Вострай Брамы, Базыяльянскіх Муроў, дзе калісьці была Віленская беларуская гімназія, да стомы вандраваў па вуліцах старога горада, наведаў Свята-Духаўскі манастыр, саборы, мясціны сваёй маладосці і ўвесь час гучалі паэтавы словы: «Маці родная, Маці-Краіна... Ты прабач, Ты прымі свайго сына...»

Вандроўкі па Вільні былі дапоўнены незвычайна цікавымі расказамі Лявона Луцкевіча, які запрасіў Барыса Уладзіміравіча да сябе дамоў, дзе зноў пачаліся ўспаміны вучня і настаўніка пра Віленскую беларускую гімназію, яе заснавальніка Івана Луцкевіча, выкладчыкаў А. Станкевіча, Л. Чарняўскага, А. Сакалову, М. Кахновіча, М. Гарэцкага, А. Луцкевіча, І. Дварчаніна, Х. Ільяшэвіча, Я. Драздовіча, пра той перыяд, калі там працаваў Барыс Кіт. Лявон Луцкевіч паказаў госцю ўнікальны фотаальбом з выключна рэдкімі здымкамі вучняў і выкладчыкаў Віленскай беларускай гімназіі, шмат іншых не менш цікавых матэрыялаў і дакументаў пра былую і цяперашнюю беларускую Вільню.

Гасцінна прымала беларуская Вільня славутага земляка. Пра ягоны прыезд пісалі літоўскія газеты («Эхо Літвы», «Вечерние новости») і інш. Аляксей Анішчык прысвяціў Барысу Кіту вялікі артыкул «Шестьдесят лет спустя. Академик Борис Кит в Литве» («Вечерние новости», 8 августа 1995 г.), у якім пісаў: "У каждого из нас сильнее забьется сердце и в памяти воскреснут моменты давно ушедших дней при долгожданной встрече с родной школой, с юношеским взлетом чудесных университетских лет в незабываемой альма-матер. Тем более, если разлука была безнадежной и чрезвычайно длительной. А именно все так и произошло на жизненном пути питомца Виленского университета — академика астронавтики, доктора философии Бориса Кита. О его поразительной научной карьере писали «Вечерние новости» в прошлом году. А сегодня (вернее, в последние дни июля) мы с ним встретились в нашей столице.

Долгих и тягостных шестьдесят лет прошло со времени окончания университета Стефана Батория. Калейдоскоп исторических и личных событий неизменно выводил талантливого математика на путь большой науки и великих свершений...

И вот после посещения родных мест, отцовского дома и школы, в которой провел детские и юные годы, академик прибыл к нам. В аэропорту его встретили бело-красно-белыми цветами самые близкие, дождавшиеся этого дня друзья, собратья по учебе и бывшие ученики. Большинство из них уже седые. Восторженные возгласы, искренние, радостные слова приветствий, горячие объятия и слезы... Не только у женщин..."

Хутка праляцелі гэтыя радасныя, хвалюючыя дні сустрэчы. І вось ужо смутак развітання з горадам маладосці, блізкімі людзьмі, былымі вучнямі. Зноў аэрапорт, самалёт на Франкфурт, ўспамінамі, але і працягваць сваю навуковую дзейнасць: у канцы верасня ён накіроўваецца на чарговы Міжнародны кангрэс астранаўтыкі ў сталіцу

Нарвегіі Осла, у лістападзе мяркуе прыехаць у Мінск на пасяджэнне Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, а перад гэтым пабываў у Маскве, потым прымаў у сябе ў Франкфурце прэзідэнта Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі акадэміка Я.Шыраева, акадэміка У.Платонава — былога прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі, які жыў у Злучаных Штатах Амерыкі, а цяпер вярнуўся на радзіму.

***А вось хроніка найбольш выдатных здарэнняў у жыцці Барнет Кіта ў юбілейным 1995 гадзе, напісаная ім самім***

**1. Студзень, 1995**

Па дарозе ў Нью-Йорк, праз Франкфурт заязджаў праф. Адам Мальдзіс. Спаткаў яго ў аэрапорце Франкфурт. Дапамог яму ў атрыманні нямецкай візы і ўладжанні ў гатэлі "Шэратон". Дыскутавалі беларускія і сусветныя справы, урачыста спатыкалі Новы 1995 год.

**2. Люты, 1995**

Прыязджала група супрацоўнікаў «Беларусьфільма» з Менску: сп.сп. Ясінскі Рычард Здзіслававіч, Слобін Леў Навумавіч і Палякоў Самсон Гершанавіч, рабілі фільмавыя здымкі ў Франкфурце, Боне і Ляймэне для біяграфічнага фільма пра Барыса Кіта. Жылі ў Франкфурце ў гатэлі.

**3. Снежань, 1995**

Прыезд спадара Ягора Фядзюшына, намесніка галоўнага рэдактара «Культуры» і яго спадарожніка-фатографа Генадзя Жынкова. Мэта прыезду — зрабіць інтэрв'ю з Барысам Кітам з нагоды ягонага 85-годдзя.

**4. Красавік, 1995**

Шмат віншаванняў з прычыны 85-гадовага юбілею, браў удзел у спатканні беларускіх «банкаўцаў», якія прыехалі ў Франкфурт на за просты Нямецкага Дзяржаўнага банку. Сярод іх былі: С.С. Якушэвіч — Беларускі нацыянальны банк, М. А. Кавалеўскі — выдавецтва «Беларусь», В. Н. Дашук —"Беларусьфільм", А. І. Валожын.

Разам з Тамарай адбылася паездка ў Гамбург, дзе было спатканне з графіняй Розмары Кальман сек (апякункі сям'і Чаркасавых у Нямеччыне), Веранікай Чаркасавай, яе бацькам і маленькім сынам. Сустрэча адбылася ў гатэлі «Чатыры пары году» — «Viev jahresaciten».

**5. Травень, 1995**

Падарожнічаў у Маскву на чарговую асамблею Міжнароднай Еўразійскай акадэміі, дзе садзейнічаў абранню новымі членамі акадэміі наступным асабістасцям: Л. Н. Півач, Н. П. Ерчак, В. У. Букс, П. Т.

Кузюковіч, А. Г. Майсяёнак, А. К. Краўцэвіч, Л. С. Савік, О. М. Іпатава, Джон Сассар, І. Сяднёў.

Разам з Тамарай наведалі фатаграфічную выстаўку Анатоля Клешчука ў Дармштаце, Нямеччына. Спатыкаў сп. Тамару Кіт — супрацоўніцу “Голаса Амерыкі" падчас яе службовага падарожжа з Вашынгтону, ЗША, у Сафію, Балгарыя.

**6. Чэрвень, 1995**

Спатыкаў у Франкфурт сп. В. Ф. Каліноўскага, супрацоўніка «Звязды» падчас яго падарожжа ў Страсбург, Францыя. Разам з Тамарай падарожнічаў цягнікам у Іену, ФРГ, адведаць там праф. В. У. Буко.

**7. Ліпень, 1995**

Падарожнічаў разам з Тамарай у Гарміш-Партэнкірхен, Баварыя, на астранаўтычны сход Нямеччыны, дзе атрымаў Залаты медаль Германа Обэрта са стужкай за ўклад у развіцьцё астранаўтыкі.

Падарожнічаў у Вільню, Літва, дзе наведаў сход Беларускага таварыства культуры і Салечнікі, дзе згадзіўся даць сваё прозвішча Беларускаму культурнаму цэнтру, а таксама ўдзельнічаў у святкаванні абвяшчэння незалежнасці Беларускай Рэспублікі, дзе між іншымі спаткаў: Я. К. Вайтовіча — бел. пасла ў Літве, Лаўрынавічюса — рэдактара радыё і тэлевізіі ў Літве, Шчураваса — прэзыдэнта горада Вільні, Сцяпана Душ-Душкоўскага і шмат іншых. Адведаў Лявона Луцкевіча.

**8. Жнівень, 1995**

Уладзімір Мікалаевіч Скварцоў — саветнік беларускага пасольства прывозіў на спатканне са мною сп. У. Платонава былога прэзыдэнта АН РБ і прафесара Ельскага універсітэта ў ЗША.

Прыязджаў у Франкфурт і жыў у гатэлі з жонкай Я. Я. Шыраеў — прэзыдэнт АН Еўразіі. На працягу 10 дзён прабывання ў Франкфурце было шмат наладжана спраў акадэміі Еўразіі.

**9. Верасень, 1995**

Ніякіх падарожжаў. Найбольш часу пайшло на тэлефоны і карэспандэнцыі для падрыхтоўкі маіх 12 выбраных членаў акадэміі. Іх прыезду 10 лістапада ў Менск.

**10. Кастрычнік, 1995**

Падарожжа ў Осла, Нарвегія, дзе я ўзяў удзел у паседжанні Сусветнай акадэміі астранаўтыкі і ўручаў дыпломы акадэміі Еўразіі пяці асабістасцям, вядомым еўрапейскім вучоным, якія раней былі выбраны ў Акадэмію навук Еўразіі. Урачыстасць уручэння дыпломаў адбылася ў памяшканні Акадэміі навук Нарвегіі.

Я адведаў беларускі аддзел сусьветнай выстаўкі кнігі ў Франкфурт, дзе спатыкаў: Л. Пятрову — выдавецтва «Навука і тэхніка», С.

Нічыпаровіча — намесніка міністра культуры, А.Анціпенку, прадстаўніка фундацыі Сораса на Беларусі.

23-га адбылося падарожжа ў Ляймэн, у якім бралі ўдзел: А. М. Рухля — беларускі дыпламат у Боне, Ул. М. Скварцоў — беларускі дарадчык пасольства ў Боне і Б. Кіт.

**11. Лістапад, 1995**

Ездзіў у Шчэцін, Польшча, да прафесара Марліча.

**12. Снежань, 1995**

Ад 5-га да 20-га адбылося падарожжа ў ЗША да дзяцей.

Жыццё працягваецца...

Любоў, якую Барыс Кіт аддаваў людзям, вяртаецца. Вяртаюцца яго справы, слаўнае імя на Беларусь, дзеля якой ён здзяйсняў сваё чалавечае прызванне.

## Вершы, прысвечаныя Барысу Уладзіміравічу Кіту

### Вольга Іпатава

### *У полі ён не адзін...*

Восеньскі дзень кароткі.
Нябёсаў цямнее блакіт.
Ідзе на спатканне да продкаў
Амерыканец Кіт.
Іголкай прашыў стагоддзе
Ягоны зайздросны лёс.
Ідзе ён у вечар золкі
Да саджаных бацькам бяроз.
Карэліцкая зямелька
Ляжыць на грудзях, як пух,
У тых, хто на ёй і ў нядзельку
Не пераводзіў дух,
Хто кідаў у яе зярняты,
Сядзеў пастухом ля агню,
І дзетак, як птушанятак,
Падкідваў у вышыню...

Кругі рабіліся шырай...
Ды толькі старэйшы брат
Зляцеў аднойчы ў вырай
І вось прыляцеў назад.
Туды, дзе, як спелы колас,
У полі ён не адзін,
Дзе бацькаў далёкі голас
Адно толькі вымавіць: «Сын...»

### *Настаўнік*

Доктар Кіт запальвае свечку ў Майнцкім саборы.
Заблудзілася рэха ў вышынях каменных прысад.
Змрочна біскупы з нішаў глядзяць. Можа клікаў каторы
«На Усход, на язычнікаў» колькі стагоддзяў назад?
За высокім ілбом — таямнічыя формулы веку,
Што на Месяц узняў чалавечыя дзёрзкасць і тло.
Ззяе зорка над ім (ці анёл, што трымае апеку),

Над жыццём і нябытам яна,
і над лёсам вандроўным,
Над усім, што прайшло — ды й сягоння жыве,
Над карэліцкім хлопчыкам,
што выганяе карову
І бяжыць басанож па асенняй пякучай траве.
Ён запальвае свечку, і цемра
ў куткі адступае.
Як асілак, у доўгім жыцці ён адужваў яе
Дзе як мог... А найбольш на радзіме, якая,
Ачмурэлая прышлымі, толькі
чужых прызнае. Толькі не — ён вяртаецца ў сінія далі.
І выстуквае сэрца: яшчэ... чым змагу... памагчы...
Як усе, што ў чужыне душой не прапалі
(А сябры на радзіме прапалі ў вечнай ночы).
Дык запальвайце свечку,
Настаўнік, асветнік, вучоны...
Колькі год паміж намі калолася дротам сцяна.
Зараз разам ідзём —
хай дарогаю гразкай і чорнай,
Ратаваць Беларусь.
А яна ў нас, як доля, адна...

Франкфурт-на-Майне, 3 снежня 1993 г.

## ***Вяртанне***

«Паклон Радзіме» — і ўзляцелі птахі,
Нібы журбою неба аплялі.
Як вартаўнік, на гэтай «Hauptwache»
Вы засталіся.
Воблакі плылі,
Гудзеў арган,
блішчэў жывот анёла,
Што граў на парцалянавай трубе,
Кірмаш калядны еў і піў наўкола...
Я ж несла нешта светлае ў сабе.
Што не раскласці сэрцу на адценні...
Душа з душой, свабодна гавары!
Хай вечаровыя кладуцца цені,
Жыццё ідзе, нясе свае дары.

Выгнаннікі вяртаюцца акрасай
Суровай і няласкавай зямлі.
...А банкаў гмахі, быццам стрэлкі Часу,
Цягнуліся ўвысь, ажно гулі...

Франкфурт-на-Майне.

***

На зямлі тэўтонаў абярогам
Мова — незарослая ралля.
Чым бліжэй да вечнага парогу,
Тым мілей бацькоўская зямля.
Колькі раз на вулачках зацішных,
Дзе прылізаны любы куток,
Выклікалі ў памяці вусцішна
Вы дзяцінства дарагі куток.
Засыпае лісце залатое
Вуліцу Карэліч, дзе калісь
Бацька дрэвы пасадзіў — на тое,
Каб яны да неба падраслі,
Каб бліжэй да сонца — і да долі,
Ад якой далёка беларус...
Сніцца Вам, я ведаю, да болю
Гэтых ніў засмужаны абрус.
Роўным не было жыццё ніколі.
Падсумоўка зробіцца пасля:
Чым чысцейшы чалавек душою,
Тым мілей бацькоўская зямля...

5 верасня 1995

**Рыгор Барадулін**

***Трэці Кіт***

Я не здрадзіў Беларускаму Народу ані кроплі, ніколі.
*Барыс Кіт,*
акадэмік Сусветнай акадэміі астранаўтыкі,
грамадзянін ЗША

Да Наваградка на фурманцы
З Агароднікаў
Бацька вёз.
Сын жа выдумаў
Гэткі авёс.
Што на Месяц цікаўных вёз
На ракеце,
Як на ліхаманцы.
Агароднікі...
Як і Дубоўка,
Сэрца на адчай накалоў...
Ад Наваградскіх дужых муроў
Рэштка літарай А,
Каб зноў
Маладзіла Айчыну абноўка.
Кітаваць трэба гэтак вокны
Беларускае хаты,
Каб
Воўкам вечар сіберны зяб,
Каб з суседскіх галодных зяп
Вырываўся зайздросны войкат.
Беларусам ды беларускам
Запрашаў
Неба думкі на дол.
...Як на Месяцы,
Пуста наўкол...
...Сцішыўся ў рыштаваннях
Касцёл,
Што касмічны воз
Перад пускам...
Па міжзорнай раллі разбрыліся
Мроі.

А Беларушчыны птах
Да руінаў не згубіць шлях.
Як зямля ўся
На трох кітах,
Беларуская —
На Барысе!

**Самсон Пярловіч**

***Славуты наваградзец***

Слыннаму вучонаму
Барысу Уладзіміравічу Кіту
Прысвячаецца

Без Беларусі паўстагоддзя
Твая душа балюча ные,
Бо дзе ты ездзіш, дзе ты ходзіш, —
Шляхі-сцяжынкі ўсе чужыя.
Снягі зямлю чужую пудраць,
Над Майнам парк румяніць восень.
А твая сонечная мудрасць
Чужыне славу ўсё прыносіць.
Барыс Кіт — беларус вучоны,
Вядомым стаў усяму свету —
Святлом твой разум пранікнёны
Сягнуў аж на Месяц-планету.
Дык нават воблакі ў нябёсах
Дзе лайнеры цябе праносяць,
Пабыць з Айчынай твайго лёсу,
Здаецца, у Бога ласкі просяць.
І вось такое спачуванне
Нарэшце наяве збылося, —
З Радзімай любаю спатканне,
Хоць і на момант, дорыць восень.
Наваградцы душой і словам
Цябе ў трыумфе прывіталі,
Грамадзянінам ганаровым
Вянком дубовым увянчалі.
Вянком дубовым, каб магутным,
Як дуб, заўсёды заставаўся.
І між чужых настрой пакутны
Каб слабасці не паддаваўся.
Праз акіян пад сабой кладку
Адчуў у гэтыя хвіліны.
Усё жыццё тваё спачатку
Імчаць, нахлынуўшы, успаміны.
Ад Агароднікаў з Карэліч

Аж да наваградскага бруку
Ты, босы хлопчык, выйшаў мерць
Вёрсты пакутныя ў навуку.
І след твой славяць астранаўты.
Табе ж Навагрудак наш сніцца:
Гімназію тут збудаваў ты,
Каб землякі маглі вучыцца.
Тады татуля мой таксама
На гнедым коніку з Католыж
Сюды прывозіў жвір і камень,
Каб і я трапіў да той школы.
Мне бачыцца: у далёкім годзе
Урок у класе нам дзесятым
Уладзіміравіч праводзіць,
Як непаўторны матэматык.
А ўжо ж сусветны акадэмік
Ты, наш настаўнік незвычайны,
Гляджу на сонечнае цемя,
Ажно да слёз усхваляваны.
Яшчэ ж нараджваецца дума
У галаве славутай гэтай, —
Прыўзняць Навагрудак ты ўздумаў
Святыняй універсітэта.
Дык і прырода тут лістоту
З тых клёнаў, што пазалацелі,
Бы матка, цёплую пяшчоту
Перад табою сцеле, сцеле...
Да родных барваў, як да дзіва,
Гатоў ты і грудзьмі прыпасці
З малітвай, што Бог літасцівы
Даруе гэтакае шчасце.
І хоць валодаеш свабодна
Гучаннем многіх іншых моваў,
З зямлёй развітваешся роднай
Гаючым беларускім словам.
Развітваешся, ды ў музеі,
Як скарб, архіў свой пакідаеш,
А ён жа гонарам нас грэе,
Што земляка такога маем.
Хоць і жывеш мо на выгодзе,
Балюча сэрца тваё ные,

Бо там, дзе ездзіш ты, дзе ходзіш,
Дарогі-сцежкі ўсе чужыя.
Глядзіш са смуткам, як да гнёздаў
З нябёсаў птушкі ўсе імкнуцца,
І прагне сэрца незаўсёды
На Бацькаўшчыне апынуцца.

г. Наваградак. Восень 1994 года. (Вершы апублікаваны ў газеце «Новае жыццё» 12 лістапада 1994 г., г. Наваградак.)

**Уладзімір Сіўко**

***Прафесару Барысу Кіту — прысвячаю***

Ля Наваградка, Карэліч
І другіх нашых паселішч
Колькі бегала іх босых
Ньютанаў і Ламаносавых.
Гойсалі сабе на волі,
Бацькі ж думалі пра школу.
Усім хацелася, каб дзецям
Крыху лепш жылось на свеце,
Бо ў вачах у іх навука
Лепшых дзён была зарукай,
Толькі паны-акупанты
Не давалі нам гарантый
На навуку ў роднай мове,
Бо ўсе гэтыя панове
Бедны край наш дружна-згодна
Ахрысцілі «Крэсы ўсходне»,
А жыхар яго «тутэйшы»
За мазура паляк лепшы.
Што б яны не гаварылі,
Усё ж гімназію адкрылі
І без панскай дапамогі.
Хоць народ наш быў убогі,
Часам неставала хлеба,
За навуку плаціць трэба
За дачушку ці за сына.
Гэта важкая прычына
Часта таленты губіла,
І ў навуку свет закрыла.
І не ўсім свяціла шчасце
У гімназію папасці.
А яна вось тут пад бокам,
На Наваградскіх пагорках,
У старэнькай камяніцы
Знайшла месца прытуліцца.
Хоць было і цеснавата,
Ды вучыліся заўзята
У ёй хлопцы і дзяўчата.

Атрымаўшы тут матуру,
Пакідалі яе муры,
І ляцелі ў свет шырокі
Хто бліжэй, а хто далёка.
А хто здольны ды ўпарты
Даказаў чаго ён варты,
З гімназійнай школьнай лавы
Дасягнуў сусветнай славы.
Вось такі выбраннік лёсу,
Што ў дзяцінстве бегаў босы
У Агародніках забытых,
З сялянскага роду Кітоў.
Добра паслужыў навуцы,
Каб у мантыю апрануцца,
І вучоным знакамітым
Стаў наш хлопец — БАРЫС КІТА.

Любча, 5.07.1993

## *Навагрaдку — 950*

Дні птахамі лятуць. Гады скачуць Пагоняй.
Марудна цягнуцца стагоддзі і вякі.
Буяе маладняк. У старых сівеюць скроні.
Замковыя муры стаяць як маякі.
Грымелі славы дні. Міналі ліхалецці.
Ламалі злыдні зубы аб твае муры.
Твой люд не раз глядзеў у вочы смерці
І дым пажараў над табой курыў.
А ты, як казачная птушка Фенікс
Зноў з папялішчаў ажываў на свет,
Выпростваўся і паднімаўсь з каленяў
Залізваў на сабе крывавых ранаў след.
Табе калісь было чым ганарыцца.
Хоць лёс быў часам для цябе круты
Каля стагоддзя ты квітнеў сталіцай
З 'яднаных Беларусі і Літвы.
Марскімі хвалямі ўзгоркі і даліны
Удаль плывуць ад замкавай гары
Да Нёмана, што быццам стужкай сіняй
Апаясаў пятлёй сасновыя бары.
Зямля твая на таленты багата

Суседзям лепшых раздала сыноў,
А мовы тваёй выракліся магнаты
Узяўшы сабе назву літвінаў.
Няхай сабе хоць і чужою мовай
Яны тваю навек праславілі красу,
І ясны свет Міцкевічавага слова
Пра край Наваградскі я ў сэрцы панясу.
Наваградскі куток! Твае сыны-героі
Жыцця не шкадавалі для цябе.
Каб не цярпець чужацкае няволі
Сталі ахвярамі ў няроўнай барацьбе.
Шануюць іх у Францыі і Чылі,
У свеце слынныя — нашы Адам, Ігнат.
У бронзе іх там вобразы застылі,
Хвалы вышэйшай быў з іх кожны варт.
І сёння ёсць табе кім ганарыцца.
Не абдзяліў разумнымі людзьмі нас Бог.
Не высахла яшчэ ў нас геніяў крыніца
Для нас яе ўсявышні прыбярог.
Успомнім сёння мы Барыса КІТА,
Што ў забыцці быў пяцьдзесят гадоў.
І імя, што ў нас было калісь забыта
Вярнулі мы на бацькаўшчыну зноў.
А колькі ты пасеяў па ўсім свеце
Прафесараў і дактароў навук ?
Каб палічыць, дзе сёння твае дзеці,
Не хопіць пальцаў на дзесятку рук.
Дзе мы ў жыцці сваім не пабывалі?
Куды не кідаў нас няўдзячны лёс?
З калыскі ўраслі ў цябе мы каранямі,
А ў нашы сэрцы ты навекі ўрос.

Любча. 30.08.1995 (Верш упершыню быў прачытаны аўтарам на святкаванні 950-годдзя г. Наваградка і 400-годдзя герба горада 22 верасня 1995 г.)

© OCR: Камунікат.org, 2014
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2014
© PDF: Камунікат.org, 2014

## Дадаткі

Кароткае рэзюме дзейнасці Барыса Кіта ў галіне астранаўтыкі ЗША

I. Браў удзел:

1. У пачатковых дасьледваннях і пабудове ў ЗША першых міжкантынентальных стратэгічных ракетных сістэм (Navaho-Rockweil International , Каліфорнія, ЗША, 1956).

2. У развіцці далейшых праектаў астранаўтычнай дзейнасьці ў ЗША. Вынікамі былі: праект "Apollo", "Shuttle" і шмат іншых. (Rockwell International, Каліфорнія, ЗША, 1958).

3. У даследваннях і пабудове амерыканскіх сатэлітаў сувязі (ITT , Вашынгтон, ЗША, 1963).

4. Ва ўстанаўленні стандартных вымаганняў для амерыканскай астранаўтычнай індустрыі (ЗША, нацыянальнае Бюро стандартаў, Вашынгтон, ЗША, 1968).

5. У першых гістарычных перамовах паміж ЗША і СССР аб супрацоўніцтве ў галіне астранаўтычных даследванняў (Вашынгтон, ЗША, 1961).

II. Публікацыі

1. «Rocket Propellant Handbook», Macmillan Company, New Jork, N. V. USA, 1960 (350 pp) - гістарычны першы падручнік па ракетных паливах для ракетных інжынераў.

2. «USSR Space Reseorck and Development» University of Mory land, College Pank, Maryland, USA, 1964 (650 pp). Прагляд і аналіз савецкіх дасягненняў у галіне астранаўтыкі.

3. Значная колькасць артыкулаў і дакладаў, якія былі надрукаваны ў астранаўтычных журналах альбо прачытаны на міжнародных астранаўтычных кангрэсах.

III. Браў удзел:

У мнагалікіх кангрэсах міжнароднай федэрацыі астранаўтыкі (IAF), дзе выступаў з дакладам.

IV. Браў актыўны ўдзел:

спачатку ў амерыканскіх астранаўтычных таварыствах, а пазней у нямецкім астранаўтычным таварыстве імя Германа Обэрта, дзе на працягу доўгіх гадоў быў дырэктарам.

V. Супрацоўнічаў:

з Тэадорам фон Карманам, Кернерам фон Браўнам і Германам Обэртам.

**Барыс Кіт**
**Гонары і становішчы ў прафесійных арганізацыях**
**1958—1995**
**(Пераклад часткі з біяграфіі Б. Кіта ў ангельскай мове)**

1953 Ліст падзякі і павышэнне ў становішчы за выдатныя дасягненні ў працы. North American, Inc. (сёння Rockwell International), Лос-Анжэлес. Каліфорнія, ЗША.

1960 NASA. Навуковы каардынатар і дарадчык падчас першых гістарычных перамоў паміж ЗША і СССР аб супрацоўніцтве ў галіне астранаўтычных даследаванняў. Вашынгтон, ЗША.

1963 Пасведчанне падзякі Міністэрства Паветраных Сілаў ЗША. Вашынгтон, ЗША.

1967 ЗША. Дзяржаўны прадстаўнік і сакратар у Тэхнічным камітэце № 51 (стандартызацыя электронных кампанентаў) Сусветнай электрычнай камісіі (Міжнародная арганізацыя стандартызацыі). Прага, Чэхія.

1968 Удзельнік ў падрыхтоўцы даведкі (даклада) для прэзідэнта Ліндана Джонсана аб становішчы развіцця навукі і тэхнікі ў ЗША, Еўропе і Японіі. Вашынгтон, ЗША.

1969 Пасведчанне падзякі Міністэрства Арміі ЗША. Вашынгтон. ЗША.

1970 ЗША. Дзяржаўны прадстаўнік і сакратар Тэхнічнага Камітэта № 51 Міжнароднай Камісіі па электрычных і электронных прадуктах (сусветная арганізацыя стандартызацыі). Горген, Швайцарыя.

1971 Прадстаўнік нацыянальнай Акадэміі навук ЗША ў Польшчы. Варшава, Польшча.

1971 Пасведчанне падзякі ад нацыянальнага Камітэту Міжнароднай электрычнай камісіі ЗША. Нью-Йорк, ЗША.

1972 ЗША. Дзяржаўнае пасведчанне падзякі ў сувязі з адыходам на пенсію. Вашынгтон, ЗША.

1976 Абранне членам-дырэктарам астранаўтычнага таварыства Нямеччыны імя Германа Обэрта. Гановер, ФРГ.

1983 Пасведчанне падзякі за выдатную педагагічную дзейнасць, універсітэт тэрылянду, Еўрапейскі аддзел. Гайдэльберг, ФРГ.

1986 Залатая ўзнагарода ад Таварыства імя Германа Обэрта Нямеччыны за ўклад у развіццё астранаўтыкі. Гарміш-Партэнкірхен, ФРГ.

1987 Дыплом заслужанага прафесара ад еўрапейскага аддзела Мэрылендскага унівэрсытэта. Гайдэльберг, ФРГ.

1990 Дыплом ганаровага прафесара ад еўрапейскага аддзела Мэрылендскага унівэрсітэта. Гайдэльберг, ФРГ.

1991 Выбар членам-карэспандэнтам Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі. Парыж, Францыя.

1993 Адчыненне аддзела Барыса Кіта ў Гістарычна-краязнаўчым музеі, Наваградак, Беларусь.

1993 Залаты медаль за ўклад у развіццё супрацоўніцтва і прыязні паміж горадам Ляймэнам ФРГ і Рэспублікай Беларусь. Ляймэн, ФРГ.

1993 Выбар у ганаровыя члены Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Мінск, Беларусь.

1993 Заснаванне сябрыны выдатнейшых беларускіх культурных дзеячаў з мэтай падтрымкі ідэй Барыса Кіта, у першую чаргу пабудову Беларускага гуманітарнага універсітэта на Беларусі. Мінск, Беларусь.

1994 Тытул Ганаровага доктара навук. Беларускі Дзяржаўны Унівэрсітэт імя Янкі Купалы. Гродна, Беларусь.

1994 Публікацыя кнігі пісьменніцы Лідзіі Савік пад назовам «Вяртанне» (біяграфія Б. Кіта). Мінск, Беларусь.

1994 Выстаўленне партрэта Б. Кіта ў «Залі Славы» Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага унівэрсітэта. Мінск, Беларусь.

1994 Абранне Барыса Кіта ганаровым грамадзянінам горада Наваградка. Наваградак, Беларусь.

1994 Адчыненне аддзела Б. Кіта ў Дзяржаўным архіве Рэспублікі Беларусь. Мінск, Беларусь.

1994 Выбар паўнапраўным членам і віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, Мінск, Беларусь.

1994 Абранне паўнапраўным членам Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі. Парыж, Францыя.

1995 Заканчэнне біяграфічнага фільма пра Барыса Кіта на кінастудыі "Беларусьфільм". Мінск, Беларусь.

1995 Заканчэнне працы пісьменніцы Лідзіі Савік над другім пашыраным варыянтам кнігі-біяграфіі Барыса Кіта. Мінск, Беларусь.

1995 Абранне Барыса Кіта ганаровым членам Таварыства беларускай культуры ў Літве. Вільня, Літва.

1995 Узнагароджанне Барыса Кіта залатым медалём Германа Обэрта на стужцы за ўклад у разьвіццё астранаўтыкі праз Міжнароднае таварыства астранаўтыкі імя Германа Обэрта і Вернера фон Браўна. Горміш-Портэркірхен, ФРГ.

## Бібліяграфія прац пра Барыса Кіта


1. Андрэева Е., Лыч Л. Марныя спадзяванні. «Беларускі Дайджэст» красавік 1994.

2. Анішчык А. Такім я ведаў Барыса Кіта. «Новае жыццё» 22.8.1992

3. Анішчык А. Ліст у рэдакцыю «Наш дзень» 24.7.1992.

4. Анішчык А. Дырэктар гімназіі.«Літаратура і мастацтва» 19.11.1993

5. Анішчык А. Чалавек, які вырашыў праблему. «Голас Радзімы» 16.6.1994.

6. Анішчык А. Сустрэча з Васілём Быкавым. «Голас Радзімы» 1.12.1994.

7. Анішчык А. Его имя миру известно. «Вечерние новости» 10.10.1994 (Вільнюс).

8. Анішчык А. Вице-президент Международной академии — воспитанник Вильнюсского университета. «Эхо Москвы» 13.10.1994.

9. Анішчык А. Шестьдесят лет спустя. Академик Борис Кит в Литве. «Вечерние новости» 8.8.1995.

10. Анішчык А. Наваградская гімназія. Мн., 1995.

11. Анішчык А. Клуб імя Б. Кіта. «Голас Радзімы» 7.9.1995.

12. Антонава Т. Яго дыпломы — наш гонар. «Звязда» 16.2.1993.

13. Антонава Т. Па слядах свайго першага кахання. «Звязда» 8.10.1994.

14. Барадулін Р. Трэці Кіт. «Звязда» 24.2.1995.

15. Барыс Кіт. «Новае жыццё» 25.7.1992.

16. Барыс Кіт вярнуўся ў Наваградак. «Звязда» 13.5.1994

17. Барыс Кіт на Радзіме. «Голас Радзімы» 9.8.1992

18. Белавусава А. Вечарына, прысвечаная Барысу Кіту. «Голас Радзімы» 18.5.1995.

19. Бельскі А., Ткачоў М. Вялікае мастацтва артылерыі. Мн., «Навука і тэхніка», 1992.

20. Брылеўскі У. Барысу Кіту — 70 гадоў. «Беларусь», красавік 1980.

21. Варынец Я. Дзеля дабра роднага краю. «Голас Радзімы» 3.3.1994.

22. Весткі з Беларусі. «Kurier wileński» 23.9.1994.

23. Весткі з Беларусі. «Эхо Москвы» 23.9.1994.

24. Вечарына ў інстытуце культуры. «Культура» 13.4.1993.

25. Віленская Беларуская гімназія. «Эхо Москвы» 4.2.1994.

26. Віншуем з юбілеем! Барысу Кіту — 85 гадоў. «Голас Радзімы» 6.4.1995.

27. Вяртанне Барыса Кіта. «Літаратура і мастацтва» 1.04.1994.

28. Вяртанне. Жыццяпіс Барыса Уладзіміравіча Кіта, нашага патрона. «Наша старонка» 18.6.1994.

29. Вяршыцкая Т. Вяртанне на Радзіму. «Новае жыццё» 3.2.1992.

30. Вяршыцкая Т. Барыс Кіт. «Новае жыццё». 4.11.1992.

31. Вяршыцкая Т. Архіў Барыса Кіта ў фондах музея. «Навагрудскія чытанні», кн. 3, 1993.

32. Вяршыцкая Т. Viva, Academia! «Новае жыццё» 12.3.1994.

33. Вяршыцкая Т. Ад наваградцаў — з усяго свету. «Голас Радзімы» 20.4.1995.

34. Гайба М. Пра славутага земляка. «Новае жыццё» 30.4.1994.

35. Гаткевіч А. Сустракайце земляка. «Наш дзень» 29.5.1992.

36. Дадзіёмава В. У беларускай музыкалогіі паболела сяброў. «Літаратура і мастацтва» 11.8.1995.

37. Др. Барыс Кіт — акадэмік. «Беларус», снежань 1991.

38. Jensen Ron. Boris Kit's Contribution. «DAILS Magazine». 3-9 ліпеня 1993.

39. Дрозд С. Агледзіны былога. «Літаратура і мастацтва». 3-9 ліпеня 1993.

40. Жыць сваім розумам. «Голас Радзімы» 7.4.1994.

41. З нагоды юбілею. «Новае жыццё» 3.6.1995.

42. І на Беларусі ёсць... кіты. «Літаратура і мастацтва» 23.4.1993.

43. Ігнатовіч В. Визит Бориса Кита в Шальчининкай ожидается в мае 1995 года. «Шальчя» 7.10.1994.

44. In das Kuratorium der HOG berufen. «Astronautik», 1976.

45. Іпатава В. Гэта — толькі пачатак. «Культура» 29.12.1993.

46. Іпатава В. Знітаваць свет любоўю. « Культура» 15.6.1994.

47. Іпатава В. Тут бліжэй да Беларусі. «Добры вечар» 28.2.1994.

48. Іпатава В. Я спадзяюся на новыя сустрэчы. «Культура» 12.10.1994.

49. Іпатава В. У полі ён не адзін. «Чырвоная змена» 8.4.1994.

50. Іпатава В. Настаўнік. «Голас Радзімы» 27.1.1995.

51. Іпатава В. Вяртанне. «Полымя», №12, 1994.

52. Каліноўскі В. «Я — хадзячы сведка стагоддзя». Размовы з Барысам Кітам. «Звязда» 3.8.1995.

53. Карачун Р. «Цешуся сустрэчай з Бацькаўшчынай»."Гродзенская праўда" 11.10.1994.

54. Калодка А. Адміністрацыйна-гандлёвы інстытут у Маладзечне. «Беларус» 1993, студзень-люты.

55. Калодка А. Барысу Кіту — 75 гадоў. «Беларус» сакавік 1985.
56. Кананові́ч А. Кіравалася ўсё жыццё. «Літаратура і мастацтва» 24.1.1992.
57. Капыловіч М. Ганаровы амерыканец Барыс Кіт. «Настаўніцкая газета» 7.7.1993.
58. Касцень А. Магістр батанікі з еўрапейскім дыпломам. «Звязда» 10.2.1994.
59. Катковіч А. Мае ўспаміны. «Беларуская думка» № 38, 1994.
60. Качаткоў Р. Я шчаслівы табою, Беларусь... «Культура» 22.3.1993.
61. Качаткоў Р. Вяртанне. «Культура» 16.3.1994.
62. Кіт Б. У. Успаміны з майго жыцця. «Наваградскі чытанні» кн. 2, 1993.
63. Кіту Барысу — ганаровыя званні. «Голас Радзімы» 8.9.1994.
64. Клемянок А. Ростань даўжынёй у паўстагоддзе. «Наш дзень» 24.7.1992.
65. Кляшчу к А. Свет ушаноўвае беларуса. «Звязда» 23.6.1995.
66. Кулікова С. Профессор Борис Кит — Скорининскому центру. «Добры вечар» 31.5.1993.
67. Кулікова С. Дасягненні — на карысць амерыканскай навукі. «Акадэмічныя весткі», 1992.
68. Kral Werner. In das Kuratovin der HOS berufen. «Astronautik», 1976.
69. Kral Werner. Wir Gratuliren. «Astronautik», 1990.
70. Краўцэвіч А. Гэтай зямлі не хапае святла. «Літаратура і мастацтва» 13.11.1992.
71. Краўчанка П. Беларуская гімназія ў Вільні: адраджэнне традыцый. «Звязда» 25.5.1994.
72. Лагада Ю. Пошук рук. «Літаратура і мастацтва» 19.2.1993.
73. Лецка Я. Беларус — акдэмік астранаўтыкі. «Літаратура і мастацтва» 13.12.1991.
74. Лецка Я. Галасы далёкага замежжа. «Літаратура і мастацтва» 3-9 ліпеня 1993.
75. Лепка Я. «Я, Барыс Кіт — беларус з Наваградчыны». «Беларусь» № 6, 1993.
76. Лецка Я. Хто мы і куды ідзём? «Літаратура і мастацтва» 7.2.1995.
77. Лецка Я. Наваградцы, збірайцеся. «Голас Радзімы» 16.6.1994.
78. Лецка Я. Створана новае згуртаванне. «Голас Радзімы» 30.6.1994.
79. Лецка Я. Зямля вячыстай славы. «Народная газета» 21.6.1995.

80. Лужымскі М. Яшчэ аб Адміністрацыйна-гандлёвым інстытуце ў Маладзечне. «Беларус», N° 83.
81. Лука С. І тым бліжэй бацькоўская зямля. «Полымя» 1.10.1994.
82. Лукавец Г. Возвращение Бориса Кита. «Вечерний Минск» 5.2.1993.
83. Луцкевіч Л. Віленская беларуская гімназія і яе лёс. «Эхо Москвы» 20.5.1994.
84. Лыч Л. Ідэя незалежнасці жыла тут адвеку. «Літаратура і мастацтва» 22.9.1995.
85. Лявіцкі Ф. Беларускаму гуманітарнаму быць? «Чырвоная змена» 2.7.1992.
86. А. М. Наваградцы ўсіх краін, яднайцеся. «Літаратура і мастацтва» 15.7.1994.
87. Мазуркевіч В. За что такие почести? «Рэспубліка» 30.7.1992.
88. Майсяёнак А. Праз церні да горак. «Пагоня» 30.7.1993.
89. Майсяёнак А. Пастаўскі сюжэт у жыцці акадэміка астранаўтыкі. «Калосьсе» № 1 1993.
90. Майсяёнак А. Барыс Кіт аддае свой архіў Наваградку. «Пагоня» 30.7.1994.
91. Майсяёнак А. Акадэмік Барыс Кіт упершыню наведаў Гародню. «Грамада» 7—13 кастрычніка 1994.
92. Майсяёнак А. Акадэміку Барысу Кіту — 85 гадоў. «Пагоня» 21—27 кастрычніка 1995.
93. Мальдзіс А. Зроблена нямала. «Голас Радзімы» 17.11.1994.
94. Мікалаеў У. Еўропа і Азія зноў сустрэліся ў Мінску. «Навіны Акадэміі навук Беларусі» 14.10.1994.
95. Мікуліч М. Калі дыхаць і жыць немагчыма. «Літаратура і мастацтва» 19.5.1995.
96. Мілюк Р. І вабяць успаміны юнацкіх дзён. «Эхо Литвы» 4, 18.3.1994.
97. Мілюк Р. В красивых стенах... «Шальчя» 3.1.1994.
98. Мілюк Р. Dva czego Białoruś — Kiemu Osrodkuowi Kulturalnemu postaowiono nadać imie Borysa Kita? «Szalcza» 20.9.1994.
99. Мілюк Р. Kodel baltarusian Kulturos centui nutarta Suteikti Boriso Kito varda? «Szalcza» 1994.
100. Мірачыцкі Л. Светлым ценем Адама Міцкевіча. Мн., 1994.
101. Навгран В. Ці быць Наваградскаму універсітэту? «Новае жыццё» 13.8.1992.
102. Наваградак зважае на Кембрыдж «Свабода» № 12 1994.
103. Навіцкі У. Юбілей беларускай гімназіі. «Голас Радзімы» 9.6.1994.

104. Нікалайчук В. Если сухопутный город облюбовал Кит, значит, это не тот Кит, о котором вы думаете. «Республика» 6.2.1993.

105. Памятаюць амерыканскага вучонага на радзіме. «Народная газета» 17.5.1995.

106. Паўлава В. Сустрэча на роднай зямлі. «Новае жыццё» 28.9.1994.

107. Савік Л. Вяртанне. Жыццяпіс Барыса Уладзіміравіча Кіта. «Голас Радзімы». 3 чэрвеня — 29 ліпеня 1994. (№ 22-29).

108. Савік Л. Адзін з пачынальнікаў амерыканскай астранаўтыкі — наш зямляк. «Першыя карэліцкія краязнаўчыя чытанні» 1993.

109. Савік Л. Вяртанне. Жыццяпіс Барыса Уладзіміравіча Кіта. Мн., 1993.

110. Савік Л. Беларус з сусветным імем. «Літаратура і мастацтва» 14.4.1995.

111. Савік Л. Космас Барыса Кіта. «Сталіца» 21.4.1995.

112. Савік Л. Ці шчаслівы Вы чалавек? «Голас Радзімы» 10.11.1994.

113. Савік Л. Барыс Кіт. "Беларусь. Энцыклапедычны даведнік". Мн., 1995.

114. Садоўскі П. Пагадненне па культуры пакуль няма. «Культура» 10.8.1993.

115. Саўчанка П. Мае ўражанні з нагоды ўгодкаў гімназіі. «Эхо Москвы» 10.6.1994.

116. Саўчанка П. Сустрэчы з Барысам Кітай. «Голас Радзімы» 7.9.1995.

117. Сачанка Б. Сняцца сны аб Беларусі. Мн., 1990.

118. Сачанка Б. Беларуская эміграцыя. Мн., 1991.

119. Стэльмак М. Хто ён, Барыс Кіт? «Республика» 18.7.1992.

120. Сяднёў М. Раман Карзюк. Мюнхен, 1987.

121. Сяднёў М. Барыс Кіт. Да 80-годдзя жыцця. «Беларус», сакавік 1990.

122. Сяднёў М. Масеева кніга. Мн., 1994.

123. Сяргеева Г. Куды ні трапяць беларусы! «Літаратура і мастацтва» 9.7.1993.

124. Траццякоў У. «Я самы шчаслівы чалавек». «Навіны Акадэміі навук Беларусі» кастрычнік 1994.

125. Тут выток і вяршынны ўзлёт. «Літаратура і мастацтва» 18.8.1995.

126. Усцінаў А. Беларус з сусветна вядомым імем вучонага. «Веснік Глыбоччыны» 19.4.1994.

127. Ученый Кит — почетный гражданин. «Советская Белоруссия» 13.7.1994.
128. Фядзюшын Я. Беларусь можа ганарыцца. «Навіны Акадэміі навук Беларусі» красавік 1995.
129. Фядзюшын Я. Грамадзянін планеты. «Культура» 5.4.1995.
130.Хамянкоў У. Зямляк адгукнуўся. «Культура» 13.4.1993.
131. Харашэвіч К. Барыс Кіт прыехаў з ідэяй новага універсітэта на Беларусі. «Звязда» 21.7.1992.
132. Харашэвіч К. Беларус — акадэмік астранаўтыкі. «Наш дзень» 4.7.1991.
133. Чараповіч Д. Вярнуць Барыса Кіта ў нашу Акадэмію. «Голас Радзімы» 18.2.1993.
134. Чаркасава Д. Добрая ідэя каштуе дорага. « Голас Радзімы» 11.11.1993.
135. Чаркасава Д. Нават пушчы ад болю галосяць. «Голас Радзімы» 10.3.1994.
136. Чаркасава Д. Найвялікшае здарэнне XX стагоддзя. «Голас Радзімы» 29.9.1994.
137. Чаркасава Д. З аднаго народа. «Голас Радзімы» 17.3.1994.
138. Чаркасава Д. Барыс Кіт — госць «Голасу Радзімы». «Голас Радзімы» 29.9.1994.
139. Чаркасава В. З вяртаннем Вас, Барыс Кіт! «Голас Радзімы» 17.3.1994.
140. Чаркасава В. Жыць сваім розумам. «Голас Радзімы» 7.4.1994.
141. Чаркасава В. В свой 85-й день рождения небелорусский академик говорил о Беларуси. «Имя» 31.5.1995.
142. Чэмер А. Факты сведчаць. «Культура» 10.8.1993.
143. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. I, с. 355, т. 2, с. 279-280.

Аналіз
доктарскай працы Барыса Кіта,
зроблены прафесарамі Гродзенскага
універсітэта імя Янкі Купалы
А. Г. Майсяёнкам,
А. П. Садоўскім, А. А. Пякарскім

**Доктарская дысертацыя Барыса Кіта**

Імя Барыса Уладзіміравіча Кіта — педагога і матэматыка, гісторыка навукі, дзеяча беларускай эміграцыі — стала вядомым сучасным даследчыкам у астатнія гады дзякуючы намаганням таварыства «Бацькаўшчына» (I) і ініцыятыве акадэміка Ю. М. Астроўскага, які прапанаваў выбраць Б. У. Кіта замежным членам АН Беларусі (2). Аднак гэты навуковец ужо на пачатку 80-х гадоў быў добра вядомы ў навуковых колах Захаду, аб чым сведчыць прысутнасць яго біяграфіі ў прэстыжных даведніках і энцыклапедыях, такіх, як: «Who's wiio in Space» (ЗША), «Leaders of American Science» (ЗША), «American men of Science» (ЗША), «Two Thousand men of Achievement» (Англія) і інш. У лістападзе 1991 г. інфармацыйны бюлетэнь матэматычнага факультэта Мэрылендскага універсітэта (ЗША) у хроніцы падзей паведаміў'. «Барыс Кіт, ветэран лектарскай працы ў галіне матэматыкі, быў нядаўна адзначаны за сваю піянерскую даследчыцкую працу ў вывучэнні сусвету на працягу 1950-х гадоў, за публікацыі і доўгатэрміновую дзейнасць у міжнародным астранаўтычным руху, стаўшы выбраным сябрам Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі (МАА) у Парыжы. У кастрычніку на Міжнародным астранаўтычным кангрэсе ў Манрэалі ён прэзентаваў працу «Дзейнасць былых навукоўцаў з Пенямюнда, якія засталіся ў Германіі», і на спалучанай сесіі МАЛ і Канадскага Каралеўскага таварыства ён быў узнагароджаны прэстыжным дыпломам акадэміка» (3).

Больш падрабязныя звесткі аб Б. Кіце годам раней друкуе часопіс «Astropautik», якія змяшчаюць кароткі агляд навуковай дзейнасці да 80-годдзя прафесара Кіта (4). Паведамляецца, што з 1965 г. юбіляр з'яўляецца сябрам гісторыка-астранаўтычнага таварыства Германа Обэрта ў Германіі і з 1976 г. уваходзіць у яго кіраўніцтва, а за актыўную дзейнасць таварыствам узнагароджаны залатым памятным знакам. Інфармацыя пра папярэднюю дзейнасць Б. Кіта наступная: «Прафесар Кіт больш як 25 гадоў працаваў у ЗША ў галіне вывучэння сусвету, у якасці матэматыка і аналітыка сістэм прымаў удзел у большасці важкіх амерыканскіх ракетных і спадарожнікавых

праграм, як, напрыклад, у распрацоўцы міжкантынентальнай ракетнай сістэмы фірмай North American Aviation (цяпер: Rockwell International) і спадарожніка сувязі ITT (International Telegraphand Telephone Corporation).

Ён аўтар шматлікіх рэфератаў і навуковых прац. Падкрэслім агляд гісторыі касмічных доследаў у СССР (1964), а таксама яго кнігу пра ракетнае паліва (1960). Ён быў тэхнічным кансультантам і каардынатарам на першых гістарычных перагаворах аб савецка-амерыканскім супрацоўніцтве ў даследаванні касмічнай прасторы. У сучасны момант праф. Барыс Кіт з'яўляецца ганаровым прафесарам матэматыкі Мэрылендскага універсітэта ў Гайдэльбергу...» (4). Вядома, што з 1972 г. Барыс Кіт пераязджае ў Еўропу, пачынаючы працу ў амерыканскім універсітэце на пасадзе выкладчыка і, пазней, прафесара матэматыкі. Універсітэцкая пасада і вялікая зацікаўленасць гісторыяй, у прыватнасці гісторыяй навук, паступова прыводзяць Б. Кіта да неабходнасці атрымання навуковай ступені. У 1963 г. на 73-м годзе жыцця ён абараняе дысертацыю на ступень доктара філасофіі ў галіне матэматыкі і гісторыі навукі пры Універсітэце Рэгенсбург (Заходняя Нямеччына).

Дысертацыйная праца Барыса Кіта мае назву «Антоні Зыгмунд. Яго жыццё і яго ўклад у развіццё матэматыкі XX стагоддзя» (5). Зварот да постаці А. Зыгмунда ў дысертанта не выпадковы, бо менавіта Зыгмунд узначальваў матэматычную школу універсітэта Стэфана Баторыя ў Вільні, калі там вучыўся і складаў сваю магістэрскую працу Барыс Кіт. У дысертацыі змешчаны агляд развіцця польскай матэматычнай школы паміж сусветнымі войнамі (1919-1939), гісторыя гарманічнага аналізу, жыццяпіс Антоні Зыгмунда і агляд яго ўкладу ў развіццё матэматычных навук.

Антоні Зыгмунд (1900-1991) нарадзіўся ў Варшаве, дзе скончыў пачатковую і сярэднюю школы. Падчас першай сусветнай вайны ён разам з бацькамі знаходзіўся на Палтаўшчыне. Пасля вяртання ў Варшаву ў 1919 г. быў прыняты на матэматычны факультэт універсітэта. Навуковым кіраўніком А. Зыгмунда быў вядомы польскі матэматык С. Сакс (1897-1943), які пазней стаў яго калегам па навуковай працы. У 1929-30 гг. знаходзіўся ў Оксфардскім універсітэце ў якасці стыпендыята фонда Ракфелера, дзе супрацоўнічаў з вядомымі матэматыкамі Хардзі і Літлвудам. У 1930 г. Зыгмунд пачынае працу ў Вільне як выкладчык універсітэта Стэфана Баторыя, а пасля пачатку другой сусветнай вайны пераязджае ў ЗША, дзе застаецца працаваць да канца жыцця.

Галоўныя навуковыя інтарэсы А. Зыгмунда, як і яго вучыцеля С. Сакса, належаць да тэорыі функцый сапраўднага і комплекснага пераменных і функцыянальнага аналізу. Вынікі яго даследаванняў зрабілі ўплыў як і надалей уплываюць на развіццё розных раздзелаў сучаснага матэматычнага аналізу. Менавіта ў канструктыўнай тэорыі функцый вядомы клас функцый Зыгмунда і няроўнасць Зыгмунда для вытворнай трыганаметрычнага паліномa; у метрычнай тэорыі функцый — тэарэма Зыгмунда аб спалучаных функцыях; у тэорыі сінгулярных інтэгралаў — метад Кальдэрона-Зыгмунда; у функцыянальным аналізе — тэарэма Зыгмунда аб інтэрпаляцыі аператараў.

Кніга А. Зыгмунда «Трыганаметрычныя рады» стала своеасаблівай энцыклапедыяй вынікаў і метадаў розных раздзелаў тэорыі функцый. Першае выданне гэтай кнігі было ў 1935 г. у Варшаве, а другое, значна перапрацаванае і дапоўненае,— у 1959 г. у Кембрыджы. За мінулы час гэта кніга неаднаразова перавыдавалася ў розных краінах, у тым ліку ў СССР. Да сённяшняга часу гэта кніга застаецца актуальнай і звычайна цытуецца ў артыкулах, прысвечаных тэорыі функцый.

Пад кіраўніцтвам А. Зыгмунда абаронена 38 дысертацый. Яго вучнямі з'яўляюцца такія вядомыя матэматыкі, як Й. Марцінкевіч, М. Б. Цэйс, Р. Ж. Коэн, Б. Макенхаўпт, А. Кальдэрон, Ф. М. Стэйн і іншыя. Пералічаныя матэматыкі сусветна вядомыя па наступных выніках доследаў. Тэарэмы Й. Марцінкевіча і Рысса-Торына сталі асноватворнымі рэзультатамі тэорыі інтэрпаляцыі аператараў. На жаль, лёс Й. Марцінкевіча, таленавітага віленскага матэматыка, званага польскім Эварыстам Галуа, быў вельмі трагічны. Ва ўзросце 30 год ён быў знішчаны ў Катыні разам з польскімі афіцэрамі і інтэлігентамі ў 1940 г. Вучні Зыгмунда Е. М. Стэйн і М. Б. Вэнс шмат зрабілі для развіцця гарманічнага аналіза функцый многіх пераменных. А. П. Кальдэрон разам з Зыгмундам распрацавалі рэчыўную тэорыю сінгулярных інтэгралаў аднаго і некалькіх пераменных. У тэорыі сінгулярных інтэгралаў добра вядома ўмова Б. Макенхаўпта. Р. Ж. Коэн вырашыў вядомую праблему кантыніуму гіпотэзы.

Як сведчаць гэтыя звесткі, прыведзеныя ў дысертацыі Б. У. Кіта, аўтару ўдалося гістарычна і шматбакова раскрыць жыццёвы і творчы шлях А. Зыгмунда, яго навуковай школы, навуковыя дасягненні яго шматлікіх вучняў і супрацоўнікаў. Не выпадкова дысертацыйная праца Б. Кіта, якую, дарэчы, можна ўбачыць у бібліятэках амаль што ўсіх універсітэтаў Заходняй Еўропы, была прызнана найлепшай працай матэматычнага факультэта ў Рэгенсбургу за 1983 год (6). Дысертацыя Б. У. Кіта мае безумоўную каштоўнасць для ўсіх, хто зацікаўлены гісторыяй матэматыкі, а таксама студэнтаў, аспірантаў,

навуковых супрацоўнікаў, яе навуковыя доследы блізкія інтарэсам А. Зыгмунда.

*Літаратура і крыніцы:*

1. Я. Лецка. Беларус — акадэмік астранаўтыкі, «Літаратура і мастацтва», 13 снежня 1991 г., Мінск, Беларусь

2. Ліст акадэміка Ю. М. Астроўскага ад 31 снежня 1991 г. на імя прэзідэнта АЙ Беларусі У. П. Платонава (Інстытут біяхіміі АН Беларусі, вых. № 101/925 ад 31.12.91 г.), Гродна, Беларусь

3. University of Maryland, Information for Faculty, November, 1991, Heidelberg, BRO

4. Prof. Boris Kit zum 80. Geburstag, Astronautik, 1990, Heft I, S. 25, Bremen, BRD

5. Boris Kit — Antoni Zygmund. Sein Leben und sein Beitrag zu der Entwicklung der Mathematik im 20. Jahrhundert, Johann Wolfgang Goethe Universität in Frankfurt am Main, 1983, s. 1-166, BRD

6. Ліст праф. д-ра філ. Барыса Кіта ад 19 студзеня 1993 г. (рукапіс)

## Пра аўтара

Савік Лідзія Сымонаўна — пісьменніца, крытык, літаратуразнаўца, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі, дацэнт Беларускага універсітэта культуры, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. З сям'і карэнных беларусаў — маці паходзіць з Полаччыны, бацька са Случчыны. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, аспірантуру Інстытута літаратуры, кандыдацкую дысертацыю абараніла па праблемах развіцця сучаснай беларускай прозы. Займаецца вяртаннем творчай спадчыны рэпрэсіраванай і эміграцкай беларускай літаратуры. Выдала манаграфіі: «Адчуванне часу», «Пад мірным небам Бацькаўшчыны», «Вяртанне», брашуру «Каб не астыла цяпло зямлі», сааўтар кніг «Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20-30-х гадоў», «Культура беларускага замежжа». Выступае на старонках рэспубліканскай перыёдыкі з праблемнымі артыкуламі, рэцэнзіямі па творчасці Я. Нёманскага, С. Баранавых, Б. Мікуліча, С. Грахоўскага, Я. Скрыгана, І. Мележа, А. Асіпенка, У. Караткевіча, В. Быкава, Б. Сачанкі, Я. Сіпакова, А. Кудраўца, В. Казько, А. Жука, М. Сяднёва, Н. Арсенневай, У. Дудзіцкага, Х. Ільяшэвіча, У. Случанскага, іншых пісьменнікаў, аўтар шматлікіх (звыш 200) артыкулаў для энцыклапедычных выданняў. Актыўна ўдзельнічае ў працэсах нацыянальнага Адраджэння, выступае з лекцыямі перад самымі рознымі аўдыторыямі, сябра і сакратар Рады Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», у 1995 г. абрана ганаровым акадэмікам Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі. Жыве ў Мінску.

© OCR: Камунікат.org, 2014
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2014
© PDF: Камунікат.org, 2014